Мікола Волкаў

ЗАМКІ І ФАРТЭЦЫІ РАДЗІВІЛАЎ

на беларускіх землях у XVI – пачатку XVIII ст.

Памяці Юрыя Бохана

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
Інстытут гісторыі

Мікола Волкаў

ЗАМКІ І ФАРТЭЦЫІ РАДЗІВІЛАЎ

на беларускіх землях у XVI – пачатку XVIII ст.

2-е выданне

Мінск
«Беларуская навука»
2021

УДК [94+728.8](476)"15/17"
ББК 63.3(4Беи)4
В67

Рэкамендавана да друку Вучоным саветам Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі 24 чэрвеня 2019 г. (пратакол № 8)

Рэцэнзенты:

доктар гістарычных навук А. А. Мяцельскі,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт А. А. Скеп'ян,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт У. А. Падалінскі

Манаграфія падрыхтавана ў рамках выканання Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2016–2020 гады «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» (навуковы кіраўнік – член-карэспандэнт, доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Каваленя), падпраграмы № 1 «Гісторыя і культура» (навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт В. В. Даніловіч)

Волкаў, М. А.

В67 Замкі і фартэцыі Радзівілаў на беларускіх землях у XVI – пачатку XVIII ст. / М. А. Волкаў. – 2-е выд. – Мінск : Беларуская навука, 2021. – 215 с.

ISBN 978-985-08-2700-5.

Радзівілы, якія лічацца адным з самых уплывовых магнацкіх родаў у гісторыі Вялікага Княства Літоўскага, мелі значную колькасць замкаў і фартэцый. З іх 16 знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі – самымі вядомымі з'яўляюцца Мір, Нясвіж і Слуцк. У кнізе на аснове аналізу абарончай архітэктуры, узбраення і гарнізонаў даследуецца іх ваенны патэнцыял. Першасная ўвага нададзена раскрыццю прычын будаўніцтва і ўмоў функцыянавання ўмацаваных рэзідэнцый Радзівілаў.

Разлічана на прафесійных гісторыкаў, выкладчыкаў, студэнтаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі і Вялікага Княства Літоўскага.

УДК [94+728.8](476)"15/17"
ББК 63.3(4Беи)4

ISBN 978-985-08-2700-5

© Волкаў М. А., 2020
© Афармленне. РУП «Выдавецкі дом «Беларуская навука», 2020

ЗМЕСТ

Уводзіны 6

Глава 1. **Гістарыяграфія і крыніцы** 11

Глава 2. **Прычыны будаўніцтва і ўмовы функцыянавання ўмацаваных рэзідэнцый Радзівілаў** 33

2.1. Ваенны тэатр Вялікага Княства Літоўскага 35
2.2. Эвалюцыя ваеннай справы 40
2.3. Афармленне зямельных латыфундый Радзівілаў 49
2.4. Гаспадарчае развіццё маёнткаў 57
2.5. Сімвалы самасцвярджэння 62

Глава 3. **Абарончая архітэктура** 75

3.1. Традыцыйныя драўляныя ўмацаванні 78
3.2. Мураваныя замкі 91
3.3. Мадэрнізаваныя дрэва-земляныя ўмацаванні 100
3.4. Бастыённыя ўмацаванні новаітальянскай сістэмы 114
3.5. Бастыённыя ўмацаванні старагаландскай сістэмы 119

Глава 4. **Узбраенне** 131

4.1. Артылерыя 132
4.2. Ручная агняпальная зброя 151
4.3. Боепрыпасы 157

Глава 5. **Гарнізоны** 169

5.1. Ваеннаабавязанае насельніцтва 171
5.2. Найманыя жаўнеры 179

Заключэнне 187

Спіс скарачэнняў 191

Крыніцы і літаратура 192

Архіўныя крыніцы 192
Апублікаваныя крыніцы 193
Літаратура 194

УВОДЗІНЫ

У канцы XIV – XV ст. у Вялікім Княстве Літоўскім паступова ўзрасло значэнне вузкай групы знатных родаў, якія атрымалі шырокія палітычныя і эканамічныя правы. Вонкавым праяўленнем гэтага працэсу стала пашырэнне будаўніцтва прыватнаўласніцкіх умацаваных рэзідэнцый. З пачатку XVI ст. магнацкія замкі сталі адыгрываць значную ролю ў палітычным, ваенным, эканамічным і культурным жыцці нашых зямель, а ў XVII ст. прыватнаўласніцкія фартэцыі сталі важнейшым элементам у сістэме абароны дзяржавы.

Шматпланавасць функцый умацаваных рэзідэнцый вызначала спецыфіку іх архітэктуры і практыкі забеспячэння. Адной з асноўных задач сядзіб у XVI – пачатку XVIII ст. была абарона ўласніка і яго маёмасці. Таму абарончы патэнцыял прыватнаўласніцкіх рэзідэнцый з'яўляецца адным з важнейшых пытанняў, якім задаюцца даследчыкі пры вывучэнні гэтых аб'ектаў. Асноўнымі крытэрыямі, якія даюць магчымасць яго ацаніць, з'яўляюцца якасць фартыфікацый, а таксама забяспечанасць умацаванняў узбраеннем і гарнізонамі. Разам з тым моцны ўплыў на выгляд рэзідэнцый аказвалі фактары неваеннага характару і, у першую чаргу, высокі сімвалізм рэзідэнцый як жылля феадальнай эліты, а таксама значная знакавая нагрузка абарончай архітэктуры самой па сабе. Гэтыя аспекты вельмі важныя пры даследаванні ўмацаваных рэзідэнцый і ацэнцы іх абарончага патэнцыялу.

У XVI – пачатку XVIII ст. найбольшай колькасцю ўмацаваных рэзідэнцый на землях Беларусі валодалі Радзівілы. Дзякуючы знаходжанню на вышэйшых дзяржаўных пасадах Вялікага Княства Літоўскага, прадуманай шлюбнай палітыцы і эканамічным захадам прадстаўнікі роду змаглі сканцэнтраваць у сваіх руках вялізныя зямельныя ўладанні. Таму Радзівілы мелі патрэбу і рэсурсы для ўтрымання абарончых рэзідэнцый у сваіх землях. Паводле нашых падлікаў, у XVI – пачатку XVIII ст. на беларускіх землях яны валодалі 16 умацаванымі замкамі і фартэцыямі (Глуск, Давыд-Гарадок, Капыль, Клецк, Койданава, Копысь, Любча, Магільна, Мір, Мядзел, Нясвіж, Пячкоўскі Гарадок, Свержань, Свіслач, Слуцк, Старое Сяло). Некаторыя з іх знаходзіліся ў цэнтрах вялікіх зямельных уладанняў і для асобных галін роду ў пэўныя перыяды выконвалі ролю галоўных рэзідэнцый, іншыя мелі выразна другасны характар.

Пачынаючы з другой паловы XIX ст. і да цяперашняга часу даследчыкамі розных спецыяльнасцей (гісторыкамі, археолагамі, мастацтвазнаўцамі) на-

запашаны і апрацаваны значны матэрыял па гісторыі радзівілаўскіх замкаў і фартэцый. Пры гэтым рабіліся спробы вызначэння іх абарончага патэнцыялу, абапіраючыся галоўным чынам на вывучэнне і аналіз архітэктуры. Аднак праблема абароназдольнасці рэзідэнцый Радзівілаў дасюль застаецца нявырашанай, а дыскусіі адносна абарончага патэнцыялу асобных помнікаў далёкія ад завяршэння. Магчымасць прасунуцца далей у вырашэнні гэтага пытання дае вывучэнне практыкі забеспячэння ўмацаваных рэзідэнцый узбраеннем і гарнізонамі, што раскрывае рэальную карціну функцыянавання ўмацаванняў. Акрамя таго, да цяперашняга часу ў навуковы ўжытак не ўведзена значная колькасць пісьмовых і іканаграфічных крыніц па гісторыі радзівілаўскіх рэзідэнцый. Таму комплексны аналіз фактараў, якія вызначалі ўзровень абароназдольнасці ўмацаванняў, разам з прыцягненнем шырокага кола апублікаваных і раней невядомых крыніц дазваляе выйсці на новы ўзровень у вывучэнні гэтай праблемы.

Такім чынам, мэтай гэтай працы з'яўляецца вывучэнне практыкі забеспячэння абароназдольнасці замкаў і фартэцый Радзівілаў на беларускіх землях у XVI – пачатку XVIII ст. Для гэтага нам неабходна, па-першае, разгледзець асноўныя прычыны будаўніцтва і ўтрымання ўмацаваных рэзідэнцый, а таксама фактары, якія ўплывалі на іх характар і форму; па-другое, ахарактарызаваць тыпы абарончых умацаванняў і прасачыць іх эвалюцыю ў залежнасці ад развіцця ваеннай тэхнікі і значэння рэзідэнцый у структуры зямельнай уласнасці Радзівілаў; па-трэцяе, выявіць уплыў колькаснага і якаснага складу ўзбраення на абарончы патэнцыял рэзідэнцый; па-чацвёртае, вызначыць прынцыпы забеспячэння замкаў і фартэцый гарнізонамі і ролю ваенных падраздзяленняў розных тыпаў у падтрыманні іх абароназдольнасці.

Геаграфічна даследаванне ахоплівае сучасныя беларускія землі, дзе знаходзілася большасць рэзідэнцый Радзівілаў. Сярод іх меліся рэзідэнцыі ўсіх вядомых тыпаў, таму абмежаванне геаграфічнага арэала даследавання не ўплывае на яго глыбіню. Разам з тым для параўнання мы прыцягвалі матэрыялы па рэзідэнцыях роду Радзівілаў, якія знаходзіліся на землях сучасных Літвы, Польшчы, Украіны і Расіі.

Храналагічна праца ахоплівае перыяд з XVI да пачатку XVIII ст. З пачатку XVI ст., калі ў Радзівілаў з'явіліся першыя абарончыя ўмацаванні, прадстаўнікі роду пачалі праводзіць мэтанакіраваную і паслядоўную палітыку па ўзвядзенні і забеспячэнні ўмацаваных рэзідэнцый. У далейшым значэнне замкаў і фартэцый Радзівілаў у сістэме абароны краіны няўхільна ўзрастала. Верхнюю мяжу вызначыла Паўночная вайна 1700–1721 гг., у час якой усе фартэцыі Радзівілаў былі разрабаваны ці знішчаны. У XVIII ст. у выніку эвалюцыі ваеннай справы прыватнаўласніцкія абарончыя ўмацаванні страцілі сваё значэнне.

Важным для нашай працы з'яўляецца паняцце *рэзідэнцыя*. Даследчыкамі яно ўжываецца ў двух асноўных значэннях: у шырокім сэнсе – як паселішча,

у якім пражываў дзяржаўны ўраднік ці магнат, і ў вузкім сэнсе – як будынак ці архітэктурны комплекс, які выконваў рэпрэзентацыйныя функцыі[1]. У нашай працы гэтае паняцце выкарыстоўваецца ў шырокім сэнсе, гэта значыць мы паставілі сабе на мэце разглядзець меры па забеспячэнні абароноздольнасці не толькі замкаў ці сядзіб магнатаў, аднак і гарадоў, якія развіваліся пад іх сценамі і пры спрыяльных умовах ператвараліся ў магутныя фартэцыі. Разам з тым па-за увагай засталіся гарадскія рэзідэнцыі і двары, размешчаныя ў сельскай мясцовасці. У XVI–XVII стст. іх маглі так ці інакш выкарыстоўваць для абароны, аднак ваенны патэнцыял такіх сядзіб быў невялікі, а жылая, гаспадарчая і адміністрацыйная функцыі пераважалі.

Асаблівай увагі патрабуе азначэнне *замак*, якое характарызуе асноўны тып абарончых рэзідэнцый позняга Сярэднявечча і ранняга Новага часу. Слова *замак* фактычна з'яўляецца перакладам нямецкага азначэння *Schloß* і прыйшло ў старабеларускую мову праз чэшскую і польскую мовы. У Вялікім Княстве Літоўскім тэрмін *замак* з XV да XVII ст. ужываўся для абазначэння ўмацаванняў, што забяспечвалі абарону значных тэрытарыяльных адзінак (валасцей, княстваў) ці кантралявалі важныя шляхі зносін. Фактычна паняцце *замак* выцесніла старажытнаславянскі тэрмін *град*, ці *горад*. Як і старажытнарускія гарады, замкі апроч абароны выконвалі яшчэ шэраг важных функцый: рэзідэнцыянальную, публічную, адміністрацыйную, гаспадарчую, культурную і рэлігійную[2].

З другой паловы XVI ст. у Вялікім Княстве Літоўскім пачало выкарыстоўвацца запазычанае з італьянскай мовы азначэнне *фартэцыя*. Яго з'яўленне выразна маркіруе пераход да новай эпохі ў фартыфікацыйным будаўніцтве, што выявілася ў распаўсюджанні земляных, дрэва-земляных ці мураваных умацаванняў з бастэямі і бастыёнамі, прыстасаванымі для выкарыстання артылерыі новага тыпу. Ужо з сярэдзіны XVII ст. замкі, якія былі выцеснены фартэцыямі са сферы ваеннай архітэктуры, пачалі ўспрымацца найперш як рэзідэнцыі з пераважна гаспадарчымі, адміністрацыйнымі і судовымі функцыямі. А ў XVIII ст. азначэнне *замак* цалкам згубіла прывязку да абарончай архітэктуры і выкарыстоўвалася ў значэнні архітэктурнага комплексу з рэзідэнцыянальнымі функцыямі. Па традыцыі замкамі называлі ўмацаваныя бастыённыя рэзідэнцыі, разам з тым гэтае азначэнне пашырылася і на адкрытыя сядзібы. У крыніцах XVII ст. фартэцыямі называліся радзівілаўскія Слуцкі, Нясвіжскі і Глускі замкі, якія захоўвалі значны абарончы патэнцыял.

Пераходным тыпам абарончых рэзідэнцый ранняга Новага часу былі так званыя *бастыённыя замкі*. Гэтае паняцце з'яўляецца шмат у чым штуч-

[1] *Bania Z.* Pojęcie rezydencji w architekturze polskiej XVII i XVIII w. na przykładzie Podhorzec i Brodów // Sztuka ziem wschodnich Rzeczypospolitej XVI–XVIII w. Lublin, 2000. S. 381–392.

[2] *Заяц Ю. А.* Паняцце «замак», тыпы замкаў // Археалогія Беларусі : у 4 т. Мінск, 2001. Т. 4. С. 66–72; *Дзярновіч А.* Замак // Вялікае княства Літоўскае : энцыкл. : у 2 т. Мінск, 2007. Т. 1. С. 643–646.

ным і пашырылася ў другой палове XX ст. у асяроддзі польскіх і нямецкіх даследчыкаў (польск. *zamek bastionowy*, ням. *bastionierte Schloß*)[3]. Тым не менш азначэнне *бастыённы замак* вельмі ўдала характарызуе сутнасць феномена рэзідэнцый ранняга Новага часу: з аднаго боку, іх імкнуліся прыстасаваць да абароны з дапамогай навейшых бастыённых фартыфікацый, а з іншага – максімальна павысіць іх рэпрэзентацыйныя ўласцівасці і камфортнасць пражывання ўладальнікаў.

На працягу ўсёй гісторыі архітэктура мела важнае значэнне ў функцыянаванні грамадства і яго інстытутаў. Пры гэтым найбольшую вагу мелі будынкі сакральнага, рэзідэнцыянальнага і абарончага прызначэння, якія ўвасаблялі структурную арганізацыю чалавечай супольнасці. Змены эпох прыводзілі да эвалюцыі архітэктурных форм і стыляў, а таксама мадыфікацыі знакавай нагрузкі будынкаў, аднак іх сімвалічнае значэнне заўжды заставалася высокім. Гэта пацвярджае прыклад замка Радзівілаў у Міры (мал. 1). Ён быў узведзены ў пачатку XVI ст., за доўгі час свайго існавання шматразова перабудоўваўся, прычым змяняліся яго функцыянальнае прызначэнне і знакавая нагрузка. Аднак дзякуючы адметнасці сваёй архітэктуры Мірскі замак захоўваў высокае сімвалічнае значэнне для ўсіх уласнікаў. На цяперашні час помнік належыць беларускай дзяржаве, інтарэсам якой ён служыць. Пасля абвяшчэння незалежнасці ў 1991 г. беларускае грамадства шукае шляхі для ўмацавання

Мал. 1. Мірскі замак. К. Русецкі. 1846 г. LMAVB. F. 320. B. 55.

[3] *Gruszecki A.* Bastionowe zamki w Małopolsce. Warszawa, 1962. 309 s.; *Biller T.* Das «bastionierte Schloß» als Bautypus des 16. Jahrhunderts. Zur Einordnung von Schloß und Festung Homburg // Festung, Ruine, Baudenkmal. Wesel, 1984. S. 25–48.

сваёй тоеснасці. Для гэтага найбольш прыдатныя архітэктурныя помнікі, размешчаныя ў розных мясцінах краіны і найперш Мірскі замак, які з'яўляецца найбольш вядомым і папулярным сімвалам Беларусі. Падобнае значэнне мае і радзівілаўскі замак у Нясвіжы. Невыпадкова выявы Мірскага і Нясвіжскага замкаў былі змешчаны на грашовых білетах Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь узораў 2000 і 2009 гг. Апроч агульнанацыянальнай каштоўнасці гэтыя аб'екты маюць сусветнае значэнне, таму яны былі ўключаны ў Спіс аб'ектаў Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Выключнае значэнне гэтых помнікаў з'яўляецца важным стымулам для паглыбленага даследавання іх гісторыі і архітэктуры.

Рэшткі многіх рэзідэнцый Радзівілаў захаваліся як помнікі археалогіі і на цяперашні момант знаходзяцца ў цэнтрах гарадоў і мястэчак. У такіх умовах даследаванне гісторыі гэтых помнікаў, акрамя павышэння турыстычнай прывабнасці мясцін, стварае падмурак для распрацоўкі праграм па рэгенерацыі гістарычных цэнтраў гарадоў. Найбольш востра гэтая праблема стаіць у Слуцку, які ў XVII–XVIII стст. з'яўляўся адным з найбольш значных гарадоў-фартэцый Радзівілаў. У 2016 г. горад адсвяткаваў 900-гадовы юбілей, аднак на цяперашні час ад яго архітэктурнай спадчыны захаваліся нязначныя рэшткі, а гістарычны цэнтр пазбаўлены прыцягальнасці як для мясцовых жыхароў, так і для турыстаў. Таму праблема рацыянальнага выкарыстання былых рэзідэнцый Радзівілаў становіцца важнай задачай для развіцця паселішчаў і павышэння якасці жыцця іх жыхароў.

Вывучэнне абарончага патэнцыялу радзівілаўскіх рэзідэнцый намі было пачата ў 2011 г. у межах напісання дысертацыі на саісканне ступені кандыдата гістарычных навук. Паспяховае завяршэнне гэтай працы і абарона дысертацыі ў 2016 г. сталіся магчымымі дзякуючы каштоўным кансультацыям і моцнай падтрымцы Юрыя Бохана, які ўзяў на сябе абавязак навуковага кіравання. Таму гэтую кнігу мы б хацелі прысвяціць Юрыю Мікалаевічу, якога, на вялікі жаль, цяпер няма з намі. Умовы для плённай навуковай працы для аўтара былі створаны ў аспірантурах Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы і Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Асабістую падзяку хацелася б выказаць гісторыкам Валянціну Голубеву, Анастасіі Скеп'ян, Аляксандру Доўнару, Кірылу Карлюку, Ягору Сурскаму, Аляксею Мартынюку, Аляксандру Ярашу, якія не засталіся абыякавымі да нашых навуковых пошукаў і дапамагалі парадамі. Важнай перадумовай для паспяховай працы сталі стажыроўкі ў архівах і бібліятэках Польшчы, Германіі, Літвы і Расіі, якія былі здзейснены пры падтрымцы Стыпендыяльнай праграмы польскага ўрада для маладых навукоўцаў, Інстытута інтэрдысцыплінарных даследаванняў «Artes Liberales» Варшаўскага ўніверсітэта, Нямецкай службы акадэмічных абменаў, Фонда падтрымкі адукацыйных праектаў Літвы і Нямецкага гістарычнага інстытута ў Маскве. Асабліва важнай для аўтара была падтрымка з боку польскіх гісторыкаў Міраслава Нагельскага, Конрада Бабятыньскага і Кшыштафа Касажэцкага. Урэшце, паспяховая навуковая праца была б немагчымая без вялікай падтрымкі з боку жонкі Волі, перакананай у важнасці абранай намі навуковай тэмы і мэтазгоднасці гэтага даследавання.

Глава 1

Гістарыяграфія і крыніцы

Абарончы патэнцыял фартэцый у XVI – пачатку XVIII ст. залежаў ад многіх крытэрыяў, а найперш ад якасці іх умацаванняў, наяўнага ўзбраення і гарнізонаў. Разам з тым рашэнне аб будаўніцтве ці перабудове ўмацаваных рэзідэнцый часта мела суб'ектыўны характар і залежала ад волі асобных уласнікаў, іх пазіцыі на палітычнай арэне дзяржавы і поглядаў на стратэгію ўмацавання роду. Таму для вывучэння праблемы забеспячэння абароназдольнасці рэзідэнцый Радзівілаў неабходна звярнуць увагу на вялікую колькасць праблем. Дзякуючы працы айчынных і замежных даследчыкаў да сённяшняга часу створаны значны комплекс навуковай літаратуры, у якой разглядаюцца розныя пытанні, звязаныя з будаўніцтвам і функцыянаваннем фартэцый у XVI – пачатку XVIII ст. на беларускіх землях. Гэта дае магчымасць паспяхова працаваць над вырашэннем узнятай праблемы. Адзначым, што даследчыкі па-рознаму падыходзілі да вывучэння і ацэнкі абарончых якасцей фартэцый, што вынікала з розніцы ў прадмеце даследавання, навуковай спецыялізацыі, метадалогіі і крыніц. Пры гэтым усе падыходы заслугоўваюць пільнай увагі, а іх разнастайнасць дае магчымасць больш глыбока зразумець феномен прыватнаўласніцкіх абарончых рэзідэнцый.

Для распрацоўкі праблемы абарончага і рэзідэнцыянальнага будаўніцтва Радзівілаў вялікае значэнне мае корпус літаратуры, прысвечанай агульным пытанням гісторыі рэзідэнцый роду. Да гэтай тэмы даследчыкі пачалі звяртацца ўжо з XIX ст., што тлумачыцца важнасцю рэзідэнцый Радзівілаў для гісторыі і культуры Рэчы Паспалітай. Першапачаткова яны цікавілі гісторыкаў як аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны, а праблема іх абарончага патэнцыялу не разглядалася. Тым не менш у гістарычных працах навуковага і навукова-папулярнага характару можна знайсці шмат цікавых звестак і дэталяў, што праліваюць святло на абарончы патэнцыял радзівілаўскіх рэзідэнцый. У другой палове XIX ст. з'явіліся працы М. Баліньскага, У. Сыракомлі і А. Ельскага, прысвечаныя гісторыі галоўнай рэзідэнцыі Радзівілаў – Нясвіжу[4]. Пазней, у міжваеннай Польшчы, пабачыла свет манаграфія

[4] *Baliński M.* Nieśwież do czasów księcia Karola Radziwiłła zwanego Panie Kochanku // Niezapominajki. R. 8. 1847. S. 283–333; *Syrokomla W.* Wędrówki po moich niegdyś okolicach : wspomnienia, studja historyczne i obyczajowe. Wilno, 1853. 248 s.; *Jelski A.* Nieśwież Radziwiłłowski przed ćwierć wiekiem a dziś : (rok 1905). Petersburg, 1908. 16 s.

Б. Таўрагіньскага па гісторыі Нясвіжа[5]. У пачатку XX ст. з'явіліся першыя абагульняльныя працы па гісторыі Слуцка аўтарства расійскіх даследчыкаў Ф. Ф. Серна-Салаўевіча і І. А. Глебава[6]. І для польскіх, і для расійскіх гісторыкаў гэтага часу характэрна імкненне даказаць «польскасць» альбо «рускасць» гэтых паселішчаў. Гэта наклала выразны адбітак на інтэрпрэтацыю гістарычных падзей. Значна больш вытрыманым у гэтым плане з'яўляецца шматтомнае выданне польскага даследчыка Р. Афтаназы, у якім сабрана інфармацыя па вялікай колькасці магнацкіх і шляхецкіх рэзідэнцый на ўсходніх зямлях былой Рэчы Паспалітай[7]. Сярод гісторыка-краязнаўчай літаратуры пасляваеннага часу варта адзначыць працы А. П. Грыцкевіча і М. Ф. Гурына па гісторыі Слуцка і Міра[8]. У другой палове XX ст. з пашырэннем колькасці навуковых прац і кола ўведзеных ва ўжытак крыніц гісторыка-краязнаўчая літаратура страціла сваё пазнавальнае значэнне.

Гісторыя роду Радзівілаў і біяграфіі асобных яго прадстаўнікоў маюць істотнае значэнне для разумення гісторыі абарончых рэзідэнцый роду. Значны ўнёсак у распрацоўку гэтага пытання зрабілі польскія даследчыкі, якія традыцыйна прылічваюць Радзівілаў да польскіх магнацкіх родаў. Сярод найбольш важных пытанняў, на якія звярталі ўвагу даследчыкі, з'яўляюцца наступныя: фарміраванне зямельных латыфундый роду, вайсковая дзейнасць і замежная адукацыя яго прадстаўнікоў. Першае пытанне ў сваіх працах сярод іншых разглядалі М. Мальчэўская, Г. Люлевіч і А. Рахуба[9]. Паглыбленне ў гэтую праблему для нас важнае тым, што памеры і размяшчэнне маёнткаў Радзівілаў натуральным чынам уплывалі на інтэнсіўнасць абарончага будаўніцтва ў іх (праблематыку вайсковай дзейнасці Радзівілаў вывучалі М. Нагельскі, М. Пляўчыньскі і В. Арганісцяк[10], заграніччную адукацыю – М. Хахай, А. Сай-

---

[5] *Taurogiński B.* Z dziejów Nieświeża. Warszawa, 1937. 268 s.

[6] *Глебов И. А.* Город Слуцк. Вильна, 1904. 31 с.; *Серно-Соловьевич Ф. Ф.* Древне-русский город Слуцк и его святыни. Вильна, 1896. 38 с.

[7] *Aftanazy R.* Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej: w 11 t. Cz. 1. Wielkie Księstwo Litewskie, Inflanty, Kurlandia. T. 1. Województwa mińskie, mścisławskie, witebskie. Wrocław, 1993. 335 s.; T. 2. Województwa brzesko-litewskie, nowogródzkie. Wrocław, 1992. 472 s.; T. 3. Województwo trockie, Księstwo Żmudzkie, Inflanty Polskie, Księstwo Kurlandzkie. Wrocław, 1992. 410 s.; T. 4. Województwo wileńskie. Wrocław, 1993. 547 s.

[8] *Грицкевич А. П.* Слуцк: историко-экономический очерк. Минск, 1970. 112 с.; *Яго ж.* Древний город на Случи : исторический очерк. Минск, 1985. 158 с.; *Гурин М. Ф.* Мир. Историко-экономический очерк. Минск, 1985. 80 с.

[9] *Malczewska M.* Latyfundium Radziwiłłów w XV do połowy XVI wieku. Warszawa, 1985. 169 s.; *Lulewicz H.* Walka Radziwiłłów z Chodkiewiczami o dziedzictwo słuckie // MHA. 1989. T. 3. S. 201–215; *Rachuba A.* Sprawa dóbr Radziwiłłów birżańskich w latach 1655–1662 // MHA. 1997. T. VII. S. 51–70.

[10] *Nagielski M.* Służba wojskowa przedstawicieli rodu Radziwiłłów w XVI–XVIII w. na podstawie zachowanych archiwaliów archiwum warszawskiego Radziwiłłów // MHA. 1997. T. VII. S. 37–44; *Plewczyński M.* Wkład Radziwiłłów w rozwój staropolskiej sztuki wojennej XVI w. // MHA. 1997. T. VII. S. 27–36; *Organiściak W.* Radziwiłłowie jako prawodawcy wojskowi w okresie od XVII do XVIII wieku // Radziwiłłowie : obrazy literackie, biografie, świadectwa historyczne / red. K. Stępnik. Lublin, 2003. S. 337–346.

коўскі і К. І. Карлюк[11]). Вайсковая служба, а таксама замежная адукацыя прадстаўнікоў роду ўплывалі на іх далейшую дзейнасць у ваеннай сферы, у тым ліку на будаўніцтва і забеспячэнне ўласных умацаванняў.

У плане біяграфічных даследаванняў найбольшая ўвага надавалася Багуславу Радзівілу, над біяграфіяй якога працавалі А. Папліньскі, Б. Каліцкі і Ё. Якобі[12]. А ў 1979 г. польскі гісторык Т. Васілеўскі выдаў аўтабіяграфію магната[13]. Значны аб'ём пісьмовых крыніц дае магчымасць грунтоўна даследаваць ваенную, палітычную і гаспадарчую дзейнасць Б. Радзівіла і яго ўраднікаў. Так, М. Мілуньскі звярнуў увагу на сістэму кіравання маёнткамі магната[14]. Вывучэнне біяграфіі і дзейнасці гэтага магната з'яўляецца важным для разумення практыкі і спецыфікі выкарыстання абарончых рэзідэнцый і фартыфікацыйнага будаўніцтва на беларускіх землях. Значны след у гісторыі роду і ўсяго краю, у тым ліку праз інтэнсіўнае рэзідэнцыянальнае і абарончае будаўніцтва пакінулі таксама Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка і Януш Радзівіл, біяграфіі якіх даследавалі Т. Кемпа і Г. Віснер[15]. У шэрагу біяграфічных прац неабходна адзначыць таксама даследаванні Р. Рагаўскене і М. Ферэнца, прысвечаныя М. Радзівілу Рудому, і працу У. Аўгустыняк, якая сканцэнтравала сваю ўвагу на вывучэнні механізму функцыянавання двара Крыштафа II Радзівіла[16].

Важны ўнёсак у распрацоўку праблемы абароназдольнасці ўмацаванняў зрабілі гісторыкі ваеннай справы. У сваіх даследаваннях яны, як правіла, спалучалі вывучэнне асобных ваенных канфліктаў з аналізам структуры і памераў войска. Першае дазваляе рабіць высновы аб ролі ўмацаванняў у тых ці іншых войнах, а другое дапамагае ацэньваць узровень забяспечанасці фартэцый гарнізонамі. Пры гэтым адной з перавагаў прац гісторыкаў ваеннай справы з'яўляецца імкненне да максімальна дэталёвага апісання падзей у тым ліку звязаных з функцыянаваннем абарончых умацаванняў.

---

[11] *Sajkowski A.* Zagraniczne wyjazdy Radziwiłłów po naukę (początek XVII wieku) // MHA. 1989. T. 3. S. 191–200; *Chachaj M.* Zagraniczna edukacja Radziwiłłów : od początku XVI do połowy XVII wieku. Lublin, 1995. 171 s.; *Карлюк К.* Пад штандарам дома Аранскіх. Першае «кавалерыйскае падарожжа» Багуслава Радзівіла (1637–1640 гг.) і яго ўдзел у галандскай аблозе Хюлста 1640 г. // Arche. 2012. № 6. С. 403–439.

[12] *Popliński A.* Żywot Jaśnie Oświeconego Księcia Bogusława Radziwiłła, Świętego Pánstwa Rzymskiego książęcia... : z rękopismów Hr. T. Działyńskiego. Poznań, 1844. 211 s.; *Kalicki B.* Bogusław Radziwiłł koniuszy litewski : szkic historyczny. Kraków, 1878. 194 s.; *Jacoby J.* Boguslaus Radziwill – der Statthalter des grossen Kurfürsten in Ostpreussen. Marburg ; Lahn, 1959. 310 s.

[13] *Radziwiłł B.* Autobiografia / oprac. T. Wasilewski. Warszawa, 1979. 379 s.

[14] *Miłuński M.* Zarząd dóbr Bogusława Radziwiłła w latach 1636–1669 // Administracja i życie codzienne w dobrach Radziwiłłów XVI–XVIII wieku / red. U. Augustyniak. Warszawa, 2009. S. 195–283.

[15] *Wisner H.* Janusz Radziwiłł 1612–1655: wojewoda wileński, hetman wielki litewski. Warszawa, 2000. 269 s.; *Kempa T.* Mikołaj Krzysztof Radziwiłł Sierotka (1549–1616) – wojewoda wileński. Warszawa, 2000. 381 s.; *Kempa T.* Urzędnicy i klienci Mikołaja Krzysztofa Radziwiłła Sierotki // Lituano-Slavica Posnaniensia : studia historica. 2003. № 9. S. 193–221.

[16] *Augustyniak U.* Dwór i klientela Krzysztofa Radziwiłła: (1585–1640) : mechanizmy patronatu. Warszawa, 2001. 386 s.; *Ragauskienė R.* Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės kancleris Mikalojus Radvila Rudasis. Vilnius, 2002. 448 p.; *Ferenc M.* Mikołaj Radziwiłł «Rudy» (ok. 1515–1584) : działalność polityczna i wojskowa. Kraków, 2008. 571 s.

Найбольш значных поспехаў у вывучэнні войнаў, якія вяла Рэч Паспалітая на тэрыторыі ВКЛ і яго памежжы, дасягнулі польскія гісторыкі. Ужо ў 1960–1970-я гг. у Польшчы з'явіўся шэраг грунтоўных прац па ваеннай гісторыі ВКЛ, у тым ліку першы артыкул, прысвечаны прыватнаму войску Радзівілаў[17]. Сапраўдным цэнтрам ваенна-гістарычных даследаванняў стаў часопіс «Studia i materiały do historii wojskowości», у якім у згаданы час з'явіліся найбольш значныя працы па гэтай праблематыцы: артыкулы Г. Катарскага, прысвечаныя Інфлянцкай вайне, Г. Віснера пра войска ВКЛ у першай палове XVII ст. і ваенныя дзеянні супраць шведаў у 1625–1629 гг., а таксама артыкулы Я. Вімера, які сканцэнтраваў увагу на вывучэнні сістэмы фінансавання ваеннай справы ў Рэчы Паспалітай[18]. Вялікую каштоўнасць для нашай тэмы маюць таксама даследаванні А. Рахубы, які вывучаў войска ВКЛ у XVII ст.[19]

Моцная і ўплывовая школа гісторыкаў ваеннай справы сфарміравалася пры Варшаўскім універсітэце. Яе прадстаўнікі надаюць вялікае значэнне вывучэнню гісторыі ваеннай справы на землях ВКЛ. Заснавальнікам гэтай школы стаў М. Нагельскі, а многія яго вучні, у тым ліку П. Кроль, К. Касажэцкі і К. Бабятыньскі, засяродзіліся на ваенна-гістарычнай праблематыцы ўсходніх зямель Рэчы Паспалітай і закраналі пытанні функцыянавання фартэцый Радзівілаў у ваенны час. К. Касажэцкі распрацоўваў праблему функцыянавання і забеспячэння фартэцый у Слуцку і Копысі, К. Бабятыньскі спрабаваў ацаніць патэнцыял дзяржаўных і прыватнаўласніцкіх фартэцый і звярнуў увагу на забеспячэнне гарнізонам Нясвіжа. Да пытання аб ролі Нясвіжскай фартэцыі ў вайне 1654–1667 гг. звяртаўся таксама К. Жойдзь[20]. Каштоўным для на-

---

[17] *Lech M. J.* Milicje Radziwiłłów jako oręż feudałow w walce z ruchami chłopskimi na Białorusi i Litwie // Rocznik Białostocki. 1968. № 3. S. 33–60.

[18] *Wimmer J.* Wojsko i skarb Rzeczypospolitej u schyłku XVI i w pierwszej połowie XVII wieku // SMHW. 1968. T. 14. S. 3–91; *Idem.* Z zagadnień ekonomiki wojskowej XV–XVIII w. Warszawa, 1974. 166 s.; *Kotarski H.* Wojsko polsko-litewskie podczas wojny inflanckiej 1576–1582 // SMHW. 1970. T. 16, cz. 1. S. 63–123; Cz. 2. 1971. T. 17, cz. 1. S. 51–124; Cz. 3. 1971. T. 17, cz. 2. S. 81–151; Cz. 4. 1972. T. 18, cz. 1. S. 3–92; Cz. 5. 1972. T. 18, cz. 2. S. 43–104; *Wisner H.* Wojna inflancka 1625–1629 // SMHW. 1970. T. 16, cz. 1. S. 27–93; *Idem.* Wojsko litewskie I połowy XVII wieku. Cz. 1 // SMHW. 1973. T. 19. S. 61–138; Cz. 2. 1976. T. 20. S. 5–26; Cz. 3. 1978. T. 21. S. 45–148.

[19] *Rachuba A.* Siły zbrojne Wielkiego Księstwa Litewskiego w XVII wieku // Przegląd wschodni. 1994. T. 3, z. 3 (11). S. 380; *Idem.* Litewskie przygotowania do wojny ze Szwecją w 1635 roku // Z dziejów stosunków Rzeczypospolitej Obojga Narodów ze Szwecją w XVII wieku / red. M. Nagielski. Warszawa, 2007. S. 33–43.

[20] *Кроль П.* Беларуская кампанія 1654 г. (да бітвы пад Шапялевічамі) // БГА. 1999. Т. 6, сш. 1–2. С. 7–32; *Idem.* Obrona Smoleńska w 1654 r. // Staropolska sztuka wojenna XVI–XVII wieku. Warszawa, 2002. S. 151–172; *Idem.* Działania zbrojne pułkownika Iwana Nieczaja na Białorusi w latach 1658–1659 // Materiały do historii wojskowości. 2007. № 43. S. 121–138; *Ён жа.* Тактыка барацьбы войска Рэчы Паспалітай з казакамі ў 1591–1638 г. // БГА. 2008. Т. 15, сш. 1–2. С. 67–99; *Idem.* Kampania białoruska Janusza Radziwiłła w 1654 roku // Przegląd wschodni. 2008. T. 10. S. 43–64; *Idem.* Na styku cywilizacji. Wojskowość kozacka i jej przemiany w XVI–XVII wieku // Człowiek w Europie. Migawki z podróży człowieka poprzez dzieje / red. M. Franz i B. Siek. Toruń, 2011. S. 173–191; *Ён жа.* Ваенныя дзеянні палкоўніка Івана Нячая ў Беларусі ў 1658–1659 гг. // Arche. 2012. № 6. С. 315–339; *Bobiatyński K.* Kampania zimowo-wiosenna wojsk Janusza Radziwiłła 1654–1655 // Staropolska sztuka wojenna XVI–XVII wieku : prace ofiarowane profesorowi J. Maciszewskiemu / red. M. Nagielski. Warsza-

шай тэмы з'яўляецца дэталёвае даследаванне гарнізона важнейшай фартэцыі Радзівілаў на тэрыторыі сучаснай Літвы – Біржанскага замка, якое выканаў С. Аўгусевіч[21]. Польскія гісторыкі таксама зрабілі істотны ўнёсак у распрацоўку праблем гістарычнай геаграфіі і ваеннага тэатра Рэчы Паспалітай і ВКЛ. Даследаванні ў гэтым накірунку з'яўляюцца важнымі для разумення сістэмы абароны дзяржавы, ролю ў ёй прыватнаўласніцкіх фартэцый і мэтазгоднасці іх будаўніцтва ў тых ці іншых рэгіёнах. Найбольш важныя працы ў гэтым накірунку належаць С. Гербсту і С. Александровічу[22]. Адной з найвялікшых заслуг апошняга з'яўляецца таксама распрацоўка праблемы гістарычнай картаграфіі ВКЛ[23]. Вялікі ўнёсак у вывучэнне згаданай праблемы зра-

---

wa, 2002. S. 173–198; *Idem.* Działania posiłkowego korpusu koronnego na terenie Wielkiego Księstwa Litewskiego w latach 1654–1655 // SMHW. 2004. T. 41. S. 61–82; *Idem.* Twierdze naddnieprzańskie w systemie obrony wschodniej granicy Wielkiego Księstwa Litewskiego – XVI – połowa XVII wieku // Zamojsko-Wołyńskie Zeszyty Muzealne. 2004. T. II. S. 29–40; *Idem.* Kampania letnia 1664 roku na terytorium Wielkiego Księstwa Litewskiego – nieznany fragment wojny Rzeczypospolitej z Moskwą 1654–1667 // Wojsko, wojskowość, miasta : studia poświęcone prof. S. Herbstowi w stulecie urodzin / red. K. Bobiatyński, P. Gawron, M. Nagielski. Zabrze, 2009. S. 224–246; *Idem.* Prywatne twierdze magnackie w Wielkim Księstwie Litewskim w czasie wojny z Moskwą w latach 1654–1667 – wybrane problemy // Zamki, twierdze i garnizony Opola, Śląska i dawnej Rzeczypospolitej / red. T. Ciesielski. Zabrze, 2010. S. 173–186; *Ён жа.* Выдаткі М. К. Радзівіла на абарону Нясвіжа ў 1655–1660 г. // БГА. 2011. Т. 18, сш. 1/2. С. 43–60; *Ён жа.* Ад Смаленску да Вільні. Вайна Рэчы Паспалітай з Масковіяй (1654–1655 гг.). Вільня, 2011. 171 с.; *Ён жа.* Ваенныя дзеянні дапаможнага кароннага корпуса на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага ў 1654–1655 гг. // Arche. 2012. № 6. С. 223–248; *Kossarzecki K.* Forteca słucka w okresie wojen połowy XVII wieku // Zamojsko-Wołyńskie Zeszyty Muzealne. 2000. T. 2. S. 41–60; *Idem.* Słuck wobec zagrożenia moskwieskiego i kozackiego podczas wojny z Moskwą w latach 1654–1667 // Materiały do historii wojskowości. 2004. № 2. S. 93–112; *Касажэцкі К.* Кампанія 1660 году ў Літве // Arche. 2006. № 6. С. 81–408; *Idem.* Próby tworzenia udzielnego władztwa księcia Bogusława Radziwiłła w oparciu o dobra podlaskie i słuckie w okresie zalewu szwedzkiego i moskiewskiego przełomu 1655 i 1656 r. // SMHW. 2007. T. 43. S. 23–41; *Idem.* Wyprawa korpusu kasztelana połockiego Jana Sosnowskiego pod Stary Bychów (lato-jesień 1659 roku) // W kręgu Hadziacza, A. D. 1658 : od historii do literatury / red. P. Borek. Kraków, 2008. S. 140–156; *Idem.* Fortece i zamki radziwiłłowskie w XVII–XVIII w. na podstawie zachowanych archiwaliów w Archiwum Warszawskim Radziwiłłów // MHA. 2010. T. XV–XVI. S. 53–68; *Idem.* Forteca w Kopysi nad Dnieprem w latach wojny Rzeczypospolitej z Moskwą 1654–1667 // Studia z dziejów wojskowości. 2012. T. 1. S. 129–175; *Ён жа.* Спробы стварэння ўдзельнага княства Багуслава Радзівіла на падставе падляшскіх і слуцкіх уладанняў у перыяд шведскага і маскоўскага «патопу» на мяжы 1655 і 1656 гг. // Arche. 2012. № 6. С. 249–271; *Ён жа.* Слуцк перад аблічам маскоўскай і казацкай пагрозы падчас вайны з Масквой у 1654–1667 гг. // Arche. 2012. № 6. С. 285–314; *Żojdź K.* Zajęcie Nieświeża przez oddziały Bogusława Radziwiłła jako element zabiegów o utworzenie własnego księstwa pod szwedzką protekcją – wybrane problemy // Studia nad staropolską sztuką wojskową. 2013. T. 2. S. 161–168.

[21] *Augusiewicz S.* Garnizon Birż w latach 1659–1687 i jego komendant Karol Karlick von Nezetitz // Ustrój – polityka – kultura : studia ofiarowane prof. S. Ochmann-Staniszewskiej / red. J. Maroń, R. Kołodziej. Wrocław, 2011. S. 261–295.

[22] *Herbst S.* Polski teatr wojny // Potrzeba historii czyli: O polskim stylu życia: wybór pism : w 2 t. T. 2. / S. Herbst. Warszawa, 1978. S. 435–443; *Alexandrowicz S., Olejnik K.* Charakterystyka polskiego teatru działań wojennych // SMHW. 1983. T. 26. S. 27–89.

[23] *Alexandrowicz S.* Kartografia wojskowa Wielkiego Księstwa Litewskiego do połowy XVII w. // Kartografia wojskowa krajów strefy bałtyckiej XVI–XX w. / red. S. Alexandrowicz, Z. Karpus, W. Rezmer. Toruń, 1996. S. 11–22; *Idem.* Kartografia Wielkiego Księstwa Litewskiego od XV do połowy XVIII wieku. Warszawa, 2012. 344 s.

біў беларускі гісторык М. Ф. Спірыдонаў, які апроч аналізу картаграфічных крыніц падрыхтаваў шэраг важных карт[24].

Некаторыя пытанні ваеннай гісторыі беларускіх зямель у сваіх даследаваннях закраналі таксама ўкраінскія і расійскія даследчыкі. З найбольш важных трэба адзначыць працу С. А. Леп'яўка пра казацкія войны канца XVI ст. і даследаванні А. В. Малова, які засяродзіўся на вывучэнні дзеянняў маскоўскіх войскаў на землях ВКЛ у час вайны 1654–1667 гг.[25] Даследаванні згаданых замежных гісторыкаў заснаваны на шырокай крыніцавай базе і выкананы на высокім навуковым узроўні, таму на іх падставе магчыма ацэньваць ролю ўмацаванняў Радзівілаў у ваенных канфліктах.

Да вывучэння гісторыі вайсковай справы і войнаў беларускія даследчыкі звярнуліся адносна нядаўна, што тлумачыцца агульнай скіраванасцю беларускай савецкай гістарыяграфіі на даследаванне сацыяльна-эканамічнай гісторыі. Выключэннем былі выдадзеныя ў 1970-х гг. артыкулы А. П. Грыцкевіча, прысвечаныя міліцыі Радзівілаў і слуцкім выбранцам[26]. Адным з першых у незалежнай Беларусі за вывучэнне гісторыі ваеннай справы ўзяўся Г. М. Сагановіч, які падрыхтаваў манаграфіі, прысвечаныя войску ВКЛ у XVI–XVII стст. і вайне 1654–1667 гг.[27] Аднак, трэба адзначыць, што гэтыя працы ў значнай ступені грунтаваліся на напрацоўках польскіх даследчыкаў. На цяперашні час у беларускай гістарыяграфіі маюцца таксама шэраг прац, прысвечаных гісторыі асобных войнаў: А. М. Янушкевіч даследаваў Інфлянцкую вайну 1558–1583 гг., В. У. Якубаў – войны Рэчы Паспалітай са Швецыяй у першай чвэрці XVII ст., С. А. Чаропка – казацка-сялянскую вайну 1648–1651 гг., Д. В. Віцько – падзеі Паўночнай вайны на землях ВКЛ[28]. Да пытанняў аргані-

---

[24] *Спірыдонаў М. Ф.* Беларусь на карце Вялікага княства Літоўскага 1613 г. // Гіст. альм. 2003. Т. 8. С. 3–55; *Ён жа.* Беларусь у другой палове XVI ст. 1:1 500 000 // Нацыянальны атлас Беларусі. Мінск, 2002. С. 266–267; *Ён жа.* Рэч Паспалітая ў канцы XVI ст. 1:10 000 000 // Нацыянальны атлас Беларусі. Мінск, 2002. С. 267.

[25] *Леп'явко С.* Козацькі війни кінця XVI ст. в Україні. Чернігів, 1996. 286 с.; *Малов А. В.* Московские выборные полки солдатского строя в начальный период своей истории. М., 2006. 624 с.

[26] *Грыцкевіч А.* Беларускія выбранцы // Полымя. 1970. № 11. С. 249–253; *Idem.* Milicje miast magnackich na Białorusi i Litwie w XVI–XVIII w. // Kwartalnik Historyczny. 1970. № 1. S. 47–62; *Ён же.* Материалы из истории слуцких выбранцев как источник по крестианской генеалогии // Сов. славяноведение. 1973. № 5. С. 60–69.

[27] *Сагановіч Г. М.* Войска Вялікага княства Літоўскага ў XVI–XVII стст. Мінск, 1994. 79 с.; *Ён жа.* Невядомая вайна, 1654–1667. Мінск, 1995. 145 с.

[28] *Чаропка С. А.* Казацка-сялянская вайна на Палессі ўлетку 1648 года // Изв. Гом. гос. ун-та им. Ф. Скорины. 2005. № 2 (29). С. 138–141; *Ён жа.* Палескі паход Януша Радзівіла 1649 г. // БГЧ. 2011. № 1. С. 15–22; *Ён жа.* Палессе ў полымі войнаў сярэдзіны XVII стагоддзя // Arche. 2011. № 3 (102). С. 235–269; *Янушкевіч А. М.* Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558–1570 гг. Мінск, 2007. 353 с.; *Віцько Д.* Шведскае наступленне 1702 г. у Вялікім Княстве Літоўскім і спроба рэстаўрацыі Сапегаў // Arche. 2011. № 6. С. 8–62; *Ён жа.* Зборы паспалітага рушэння шляхты ВКЛ у 1702 г. // Вялікае Княства Літоўскае і суседзі: Права. Вайна. Дыпламатыя / рэд. С. Ф. Сокаў, А. М. Янушкевіч. Мінск, 2012. С. 255–288; *Ён жа.* Баявыя дзеянні 1701 года і пачатак супрацоўніцтва Сапегаў са Швецыяй // Arche. 2014. № 6. С. 71–107; *Якубаў В. У.* Склад войска Вялікага княства Літоўскага і Польскага каралеўства ў Інфлянтах 1605–1609 гг. // Весн. Полац. дзярж. ун-та. Серыя А. Гуманіт. навукі. 2009. № 7. С. 13–21; *Ён жа.*

зацыі войска звяртаўся Ю. М. Бохан, які падрыхтаваў манаграфію, прысвечаную найманаму войску ў ВКЛ[29]. Розныя катэгорыі ваеннаабавязанага насельніцтва даследавалі А. Б. Доўнар і В. А. Варонін[30]. Такім чынам, на працягу апошніх дзесяцігоддзяў беларускія даследчыкі змаглі дасягнуць пэўных поспехаў у вывучэнні двух галоўных напрамкаў гісторыі ваеннай справы: гісторыі ваенных канфліктаў і гісторыі войска.

Адным з важнейшых фактараў, які гарантаваў умацаванню непрыступнасць, з'яўляецца якасць яго абарончай архітэктуры, ці фартыфікацый. Першымі да праблемы вызначэння абарончага патэнцыялу ўмацаванняў звярнуліся археолагі, архітэктары і мастацтвазнаўцы, якія займаліся вывучэннем рэшткаў старажытных умацаванняў. Адным з «піянераў» даследавання сярэднявечных мураваных абарончых умацаванняў на тэрыторыі Беларусі стаў археолаг па адукацыі Ю. Ядкоўскі. Яго артыкул аб замку ў Міры, выдадзены ў 1915 г., стаў першай спробай архітэктурна-археалагічнага апісання гэтай рэзідэнцыі Радзівілаў. Апроч грунтоўнай характарыстыкі гэтага зруйнаванага помніка да дасягненняў Ю. Ядкоўскага трэба аднесці апрацоўку пісьмовых крыніц па яго гісторыі[31]. Такога кшталту даследаванні, у якіх археалагічнае і натурнае вывучэнне збудавання спалучаецца з пошукам крыніц па яго гісторыі, у далейшым стала адным з найбольш эфектыўных шляхоў па вывучэнні помнікаў абарончай архітэктуры. Невыпадкова адныя з найбольш вядомых гісторыкаў абарончага будаўніцтва як у Беларусі, так і ў замежжы выйшлі з асяроддзя археолагаў. Пры гэтым працы савецкіх археолагаў сталі асновай для беларускіх даследчыкаў, а напрацоўкі шэрагу замежных археолагаў маюць істотнае значэнне для разумення гісторыі абарончага будаўніцтва на нашых землях[32].

Узнікненне беларускай школы археолагаў і гісторыкаў абарончай архітэктуры звязана з асобай М. А. Ткачова, які лічыцца найбольш аўтарытэтным гісторыкам фартыфікацыйнага мастацтва ў Беларусі. Яго першыя працы паўсталі на аснове вынікаў шматлікіх археалагічных экспедыцый, якія даследчык пачаў праводзіць з канца 1960-х гг., а таксама апрацоўкі літаратуры і крыніц па гісторыі помнікаў[33]. У сваіх даследаваннях М. А. Ткачоў імкнуўся

«Жаўнерскае свавольства» на тэрыторыі ВКЛ у 1600–1604 гг. // БГЧ. 2011. № 1. С. 9–14; *Ён жа.* Забеспячэнне войска Вялікага княства Літоўскага падчас вайны ў Інфлянтах 1600–1611 гг. // Arche. 2012. № 6. С. 211–222.

[29] *Бохан Ю. М.* Наёмнае войска ў Вялікім княстве Літоўскім у XV–XVI стст. Мінск, 2004. 91 с.

[30] *Варонін В.* Полацкія путныя слугі ва ўрадавай палітыцы ВКЛ (XV – сярэдзіна XVI ст.) // БГА. 2000. Т. 7, сш. 2. С. 305–324; *Доўнар А. Б.* Сяляне-слугі Беларусі другой паловы XVI – сярэдзіны XVIII ст. Мінск, 2007. 193 с.

[31] *Иодковский И. И.* Замок в Мире // Древности. 1915. Т. 6. С. LIV–LXXII, 13–25.

[32] *Раппопорт П. А.* Военное зодчество западно-русских земель X–XIV вв. Ленинград, 1967. 275 с.; *Kajzer L.* Zamki i społeczeństwo: przemiany architektury i budownictwa obronnego w Polsce w X–XVIII wieku. Łódź, 1993. 265 s.; *Durdík T.* Kastellburgen des 13. Jahrhunderts in Mitteleuropa. Wien, 1994. 259 S.; *Idem.* Burgen des mitteleuropäischen Kastelltyps // Burgenbau im späten Mittelalter / red. H. Hofrichter, G. U. Großmann. Berlin ; München, 1996. S. 177–184.

[33] *Ткачоў М. А.* Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII–XVIII стст. Мінск, 1978. 141 с.; *Ён жа.* Замкі Беларусі (XIII–XVII ст.). Мінск, 1977. 82 с.

ахапіць усе вядомыя на тэрыторыі Беларусі ўмацаванні Сярэднявечча і ранняга Новага часу, таму яго працы з'яўляюцца асновай для пазнейшых даследчыкаў праблемы гісторыі абарончай архітэктуры. Гэта стала прычынай перавыдання кніг даследчыка ў пазнейшы час[34]. Паказальная для разумення эвалюцыі падыходу М. А. Ткачова да вывучэння абарончай архітэктуры з'яўляецца манаграфія «Замкі і людзі», якая з'явілася ў друку ў 1991 г.[35] У ёй аўтар у значна большай ступені, чым раней, абапіраўся на пісьмовыя крыніцы, а таксама сабраў і прадставіў звесткі па ўзбраенні і гарнізонах замкаў і фартэцыі. Гэта дазволіла яму больш абгрунтавана падысці да праблемы ацэнкі іх абарончага патэнцыялу. Разам з тым вялікі маштаб працы, якую імкнуўся выканаць М. А. Ткачоў, прывёў да шэрагу недакладнасцей у апісанні асобных помнікаў, у тым ліку рэзідэнцый Радзівілаў. Таму высновы, да якіх прыйшоў аўтар, патрабуюць дадатковай верыфікацыі на падставе крыніц.

У другой палове 1970 – 1980-я гг. археалагічныя даследаванні на тэрыторыі шэрагу беларускіх замкаў правёў А. А. Трусаў. Па іх выніках была падрыхтавана абагульняльная праца па гісторыі манументальнага дойлідства і будаўнічай тэхнікі на беларускіх землях[36]. Акрамя таго, у асобнай публікацыі былі прадстаўлены вынікі археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Міра і Мірскага замка[37]. Раскопкі ў Мірскім замку далі магчымасць вывучыць храналогію і гісторыю будаўніцтва і перабудоў, а таксама асаблівасці функцыянавання помніка ў розныя перыяды, што дазваляе рабіць высновы аб абароназдольнасці гэтай рэзідэнцыі.

З другой паловы 1980-х гг. цікавасць да помнікаў абарончай архітэктуры Сярэднявечча і ранняга Новага часу з боку археолагаў павялічылася. Даследаванні на тэрыторыі абарончых умацаванняў, у тым ліку радзівілаўскіх замкаў у Любчы і Нясвіжы, праводзіў І. М. Чарняўскі. На аснове археалагічных матэрыялаў ім была прапанавана канцэпцыя эвалюцыі замкавых пабудоў на беларускіх землях[38]. Дадзеная канцэпцыя патрабуе пэўнай дапрацоўкі, паколькі яна заснавана выключна на мясцовым матэрыяле і ў ёй не ўлічваецца гісторыя развіцця абарончых рэзідэнцый у суседніх землях. Археалагічнаму вывучэнню паселішчаў Панямоння, у тым ліку Нясвіжа, Міра і Любчы, прысвяціў сваю працу А. К. Краўцэвіч. У межах вывучэння на аснове археала-

---

[34] *Ткачев М. А.* Замки Белоруссии. Минск, 1987. 220 с.; *Ён жа.* Загінуўшыя абаронцы // Страчаная спадчына: Загінуўшыя абаронцы. Зруйнаваныя святыні. Па колішніх маёнтках. Гарады і час / уклад. Т. Габрусь. Мінск, 2003. С. 8–54; *Ён жа.* Замки Беларуси. Минск, 2007. 200 с.

[35] *Ткачоў М. А.* Замкі і людзі. Мінск, 1991. 182 с.

[36] Трусов О. А. Памятники монументального зодчества Белоруссии: XI–XVII вв. : архитектурно-археологический анализ. Минск, 1988. 157 с.; *Ён жа.* Манументальнае дойлідства Беларусі XI–XVIII стагоддзяў: Гісторыя будаўнічай тэхнікі. Мінск, 2001. 203 с.

[37] *Здановіч Н. І., Краўцэвіч А. К., Трусаў А. А.* Матэрыяльная культура Міра і Мірскага замка. Мінск, 1994. 72 с.

[38] *Чарняўскі І. М.* Развіццё палацава-замкавых комплексаў Беларусі ў канцы XV – XVII ст. // Сярэдневяковыя старажытнасці Беларусі : Новыя матэрыялы і даследаванні. Мінск, 1993. С. 66–73.

гічнага матэрыялу гісторыі развіцця паселішчаў даследчык таксама звярнуў увагу на іх абарончыя ўмацаванні[39].

Усе значныя рэзідэнцыі роду Радзівілаў на тэрыторыі Беларусі былі даследаваны археолагамі, а асноўныя вынікі іх працы былі апублікаваны. Унікальнымі ў сваім родзе былі даследаванні Глускага замка пад кіраўніцтвам І. У. Ганецкай. Шматгадовыя працы на помніку дазволілі археолагу грунтоўна вывучыць рэшткі сярэднявечнага драўлянага замка, а таксама валы і мураваную браму пазнейшага бастыённага замка, які ў канцы XVII ст. трапіў у рукі Радзівілаў[40]. Да сённяшняга дня вывучэнне Глускага замка І. У. Ганецкай з'яўляецца адным з найбольш поўных і маштабных даследаванняў бастыённай фартэцыі ў Беларусі. Акрамя таго, увагі заслугоўваюць працы Л. У. Калядзінскага, які вывучаў Слуцк і Капыль; В. С. Паздняковa, які даследаваў Клецк; А. А. Мяцельскага, які праводзіў археалагічныя раскопкі ў Нясвіжскім замку[41]. Напрацоўкі беларускіх археолагаў па гісторыі абарончай архітэктуры і асаблівасцях умацаванняў Радзівілаў таксама знайшлі месца ў шэрагу абагульняльных і энцыклапедычных выданняў[42]. Археалагічныя крыніцы дазваляюць датаваць і апісаць абарончыя ўмацаванні, а таксама ўдакладніць спецыфіку іх выкарыстання, што з'яўляцца актуальным для помнікаў, аб якіх адсутнічае інфармацыя ў пісьмовых крыніцах. Пачынаючы з XVII ст. колькасць пісьмовых крыніц, у якіх апісваецца будаўніцтва і ўтрыманне ўмацаванняў, значна ўзрастае. Таму пры вывучэнні помнікаў гэтага перыяду найбольшых

---

[39] *Краўцэвіч А. К.* Гарады і замкі Беларускага Панямоння XIV–XVIII стст. : Планіроўка, культурны слой. Мінск, 1991. 171 с.; *Краўцэвіч А. К., Якшук Г. М.* Стары Мір. Мінск, 1993. 85 с.

[40] *Ганецкая І. У.* Археалагічнае вывучэнне Глускага замка ў 1996/98 гадах : вынікі і перспектывы // Глуская зямля : дыялог з гісторыяй / рэд. І. У. Ганецкая. Б. м., 1999. С. 42–59; *Яна ж.* Вежа-брама Глускага замка па дадзеных археалогіі і пісьмовых крыніц // Badania archeologiczne w Polsce północno-wschodniej i na zachodniej Białorusi w latach 2000–2001 / red. M. Karczewska, M. Karczewski. Białystok, 2002. S. 401–407; *Ён жа.* Стратыграфія і храналогія культурнага пласту Глускага замка // МАБ. Мінск, 2005. Вып. 9. С. 42–56; *Ганецкая І. У., Волкаў М. А.* Глуская фартэцыя // МАБ. Мінск, 2011. Вып. 20. С. 209–226; *Ганецкая І. У.* Глускі замак у святле археалагічных даследаванняў і пісьмовых крыніц. Мінск, 2018. 415 с.

[41] *Паздняковa В. С.* Клецк X–XVIII стст. Матэрыяльная і духоўная культура беларускага феадальнага горада. Мінск, 2008. 286 с.; *Колединский Л. В.* Городище средневекового Слуцка (предварительные итоги исследований 1985–1986 гг.) // ГАЗ. 1994. № 4. С. 134–139; *Ён жа.* Археалагічныя дасьледаваньні дзядзінца летапіснага Случаска // Случчына : мінулае і сучаснасць: да 885-годдзя заснавання г. Слуцка / уклад. В. Відлога. Слуцк, 1995. Вып. 1. С. 32–37; *Ён жа.* Верхні замак у Слуцку // БГЧ. 1996. № 1. С. 52–57; *Ён жа.* Капыль – 2007: вынікі палявых даследаванняў // ГАЗ. 2009. № 24. С. 246–256; *Ён жа.* Археологические источники о раннем, долетописном периоде истории Копыля (IX–XIII вв.) // Гістарыяграфія і крыніцы па гісторыі гарадоў і працэсаў урбанізацыі ў Беларусі: зб. навук. арт. Гродна, 2009. С. 63–70, 474–475; *Ён жа.* Археалагічнае вывучэнне Капыля ў 1996–2007 гг. (хроніка палявых работ, асноўныя вынікі і магчымая перспектыва) // Капыль : гісторыя горада і рэгіёна : да 360-годдзя надання Капылю прывілея на магдэбургскае права / уклад. : А. А. Скеп'ян, А. Б. Доўнар, І. В. Соркіна. Мінск, 2012. С. 335–344; *Мяцельскі А.* Пачаткі Нясвіжа // Białoruskie Zeszyty Historyczne. 2010. № 12. S. 5–19; *Ён жа.* Знаходкі агнястрэльнай зброі ў Нясвіжскім замку // БГЧ. 2011. № 2. С. 43–44; *Metel'skij A. A.* Fortyfikacje zamku w Nieświeżu z końca XVI – początku XVIII wieku // AHP. 2012. T. 20. S. 161–189.

[42] Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыкл. Мінск, 1993. 702 с.; Археалогія Беларусі: у 4 т. Т. 4. Мінск, 2001. 596 с.

поспехаў дасягнулі археолагі, якія пры інтэрпрэтацыі археалагічных знаходак імкнуліся абапірацца і на пісьмовыя крыніцы.

Іншы падыход да вывучэння помнікаў абарончага будаўніцтва практыкуюць мастацтвазнаўцы і архітэктары. Іх метадалогія грунтуецца на аналізе формы збудавання і асобных яго дэталяў, што дае магчымасць у шэрагу выпадкаў больш дакладна датаваць помнікі. Акрамя таго, мастацтвазнаўчая метадалогія дазваляе прааналізаваць асаблівасці архітэктуры і яе знакавую нагрузку, што ў сваю чаргу дае магчымасць крытычна ацэньваць абарончыя якасці ўмацаваных рэзідэнцый і асобных фартыфікацыйных элементаў. Таму як у Беларусі, так і ў замежжы з асяроддзя мастацтвазнаўцаў і архітэктараў выйшаў шэраг вядомых гісторыкаў абарончай архітэктуры.

Адным з першых вывучаць абарончыя ўмацаванні на беларускіх землях з пункту гледжання гісторыі архітэктуры пачаў гісторык і мастацтвазнавец М. М. Шчакаціхін, які працаваў у міжваенны перыяд[43]. Падобным па сутнасці да метадалогіі мастацтвазнаўцаў з'яўляецца падыход спецыялістаў з архітэктурнай адукацыяй. Адной з пераваг іх працы з'яўляецца падрыхтоўка і ўжыванне дакладных абмерных чарцяжоў архітэктурных помнікаў ці іх рэшткаў. Пасля заканчэння Другой сусветнай вайны на архітэктуру абарончых умацаванняў Беларусі як прадмет даследавання звярнуў увагу архітэктар А. Я. Міцянін. Ён зрабіў абмер і падрабязнае апісанне архітэктуры Мірскага замка[44]. На гэты ўнікальны для Беларусі па ступені захаванасці і мастацкіх якасцях помнік звярталі ўвагу многія беларускія гісторыкі архітэктуры. Сярод іх найперш трэба адзначыць В. В. Калніна, які прадставіў матэрыялы сваіх даследаванняў у шэрагу манаграфій і артыкулаў[45]. Некалькі навукова-папулярных артыкулаў на тэму гісторыі і архітэктуры замка ў Міры апублікаваў таксама архітэктар Д. С. Бубноўскі, які з'яўляўся навуковым кіраўніком рэстаўрацыі помніка[46].

У сваіх працах да апісання архітэктуры мураваных замкаў Радзівілаў звярталіся мастацтвазнаўцы А. Д. Квітніцкая, У. А. Чантурыя і Т. В. Габрусь[47]. Для

---

[43] *Шчакаціхін М.* Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва. Мінск, 1993. 330 с.

[44] *Митянин А. Я.* Замок в Мире : автореф. дис. на соискание уч. степени канд. архит. Минск, 1954. 15 с.; *Ён жа.* Оборонительные сооружения Белоруссии XII–XVI вв. // Сб. науч. работ Ин-та строительства и гражданской архит. АН БССР. 1958. Вып. 1. С. 135–164.

[45] *Калнін В. В., Трэпет Л. В.* Мірскі замак // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1975. № 1. С. 26–32; *Калнин В. В.* Мирский замок. Минск, 1986. 51 с.; *Калнін В. В.* Мірскі замак: Гісторыка-архітэктурны нарыс. Мінск, 1995. 128 с.; *Ён жа.* Мірскі замак. Мінск, 2002. 160 с.; *Ён жа.* Хто будаваў Мірскі замак? // Мірскі замак як гісторыка-культурны феномен XV – пачатку XX стагоддзя. Новыя даследаванні / рэд. Н. Ф. Высоцкая. Мінск, 2004. С. 35–59; *Ён жа.* Замак у гарадскім пасёлку Мір : архітэктурна-гістарычныя даследаванні. 26.V.1994, папраўкі 10.I.2009 і 28.VI.2009 (рукапіс). 139 с.

[46] *Бубновский Д., Кравцевич А., Трусов О.* Мир // Неман. 1985. № 8. С. 141–146; *Бубноўскі Д. С.* Готыка і рэнесанс Мірскага замка // Помнікі мастацкай культуры Беларусі эпохі Адраджэння / рэд. С. В. Марцэлеў. Мінск, 1994. С. 160–169; *Ён жа.* Феномен Мірскага замка // Мірскі замак як гісторыка-культурны феномен XV – пачатку XX стагоддзя. Новыя даследаванні / рэд. Н. Ф. Высоцкая. Мінск, 2004. С. 6–17.

[47] *Квитницкая Е. Д.* Архитектура [Белоруссии] XIV–XVI вв. // Всеобщая история архитектуры : в 12 т. М., 1968. Т. 6. С. 453–468; *Яна ж.* Архитектура [Белоруссии] XVII вв. // Всеобщая

іх прац характэрна імкненне да тыпалагізацыі помнікаў архітэктуры па стылявой прыкмеце, вызначэнне гісторыі эвалюцыі формы збудаванняў і асобных яго элементаў. Урэшце, найбольш поўнае на сённяшні момант апісанне мураваных абарончых збудаванняў Вялікага Княства Літоўскага ў XIII–XVI стст. належыць А. М. Кушнярэвічу. Разам з выкарыстаннем археалагічных даных і натурным вывучэннем помнікаў даследчык актыўна карыстаўся мастацтвазнаўчай метадалогіяй, што дазволіла яму зрабіць крок наперад у даследаванні абарончай архітэктуры. У прыватнасці, ім была прапанавана класіфікацыя помнікаў абарончага будаўніцтва на аснове аналізу іх формы[48]. Найбольш поўна вынікі даследаванняў А. М. Кушнярэвіча прадстаўлены ў манаграфіі, выдадзенай у 2011 г., якая на цяперашні час з'яўляецца найбольш грунтоўным даследаваннем мураванай абарончай архітэктуры ВКЛ XIII–XVI стст.[49] Аднак, трэба адзначыць, што імкненне да тыпалагізацыі і вывучэння «генеалогіі» архітэктурных формы з апорай на мастацтвазнаўчую метадалогію, характэрнае для працы даследчыка, не дае магчымасць грунтоўна даследаваць абарончы патэнцыял умацаванняў. Недахопы мастацтвазнаўчага падыходу пры даследаванні абарончай архітэктуры найбольш выразна ілюструе артыкул А. М. Кулагіна, напісаны для чатырохтомнага выдання «Архітэктура Беларусі»[50]. У ім разгляд развіцця формы збудаванняў зроблены без уліку эвалюцыі ваеннага мастацтва і гістарычных рэаліяў, што адмоўна адбілася на якасці апрацоўкі матэрыялу.

Для разумення кантэксту развіцця абарончай архітэктуры на беларускіх землях важнае значэнне маюць працы замежных мастацтвазнаўцаў і гісторыкаў архітэктуры, якія ў сваіх працах звярталіся і непасрэдна да апісання беларускіх помнікаў. У час Другой сусветнай вайны Беларусь наведаў нямецкі даследчык і знаўца замкавай архітэктуры Б. Шмід, які пакінуў цікавыя заўвагі наконт архітэктуры мураваных замкаў на нашых землях[51]. З сучасных нямецкіх даследчыкаў варта прыгадаць У. Шутэ, які даследаваў праблему эвалюцыі і значэння абарончай архітэктуры замкаў у нямецкамоўных краінах у XVI–XVII стст. Адным з галоўных дасягненняў даследчыка было выяўленне тэндэнцыі па зніжэнні абароназдольнасці феадальных замкаў-рэзідэнцый і набыцці элементамі абарончай архітэктуры сімвалічнага значэння[52]. Падобная

история архитектуры : в 12 т. Т. 6. С. 469–502; *Чантурия В. А.* История архитектуры Белоруссии. Минск, 1977. 319 с.; *Ён жа.* Памятники архитектуры и градостроительства Белоруссии. Минск, 1986. 236 с.; *Габрусь Т.* Протарэнесансныя элементы ў абарончым дойлідстве Беларусі // Мірскі замак і замкі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Праблемы рэстаўрацыі і музеефікацыі. Мінск, 2006. С. 13–23.

[48] *Кушнярэвіч А.* Тыпалогія мураваных гатычных прыватнаўласніцкіх замкаў ВКЛ // БГЧ. 2006. № 9. С. 16–21.

[49] *Кушнярэвіч А. М.* Мураваная дабастыённая фартыфікацыя Вялікага Княства Літоўскага. Мінск, 2011. 230 с

[50] *Кулагін А. М.* Абарончая і палацава-сядзібная архітэктура XV – пачатку XVIII ст. // Архітэктура Беларусі: нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце : у 4 т. Мінск, 2006. Т. 2. С. 392–511.

[51] *Schmid B.* Burgen in Litauen // Der Burgwart. 1942. S. 1–12.

[52] *Schütte U.* Das Schloß als Wehranlage: befestigte Schloßbauten der frühen Neuzeit im alten Reich. Darmstadt, 1994. 430 S.; *Idem.* Zur fiktiven und realen Wehrhaftigkeit hessisch-thüringischer

тэндэнцыя назіралася і на нашых землях, у прыватнасці, у рэзідэнцыях Радзівілаў, а яе выяўленне дае магчымасць больш дакладна суаднесці абарончыя якасці і знакавую нагрузку архітэктуры ўмацаваных рэзідэнцый.

Надзвычай карыснымі для вывучэння ўзнятай праблемы з'яўляюцца напрацоўкі польскіх спецыялістаў, якія засяроджваліся на даследаванні рэзідэнцыянальнага будаўніцтва ў ранні Новы час у Польшчы і ўсёй Рэчы Паспалітай. У апошнім выпадку яны натуральным чынам звярталіся да вывучэння помнікаў на беларускіх землях[53]. З дапамогай гэтых даследаванняў можна выйсці на больш шырокі кантэкст разумення абарончай архітэктуры на беларускіх землях. Асобна варта згадаць працы Т. Бернатовіча, які надаваў значную ўвагу вывучэнню архітэктурнай спадчыны і гісторыі радзівілаўскага Нясвіжа[54]. У сваёй апошняй кнізе даследчык засяродзіўся на праблеме сімвалічнага значэння архітэктуры і яе ролі ў рэалізацыі магнатамі пэўных стратэгій у грамадска-палітычнай сферы[55].

Шэраг вядомых спецыялістаў па гісторыі абарончай архітэктуры паходзяць з асяроддзя польскіх архітэктараў. Асаблівай увагі заслугоўваюць працы Я. Багданоўскага, які прапанаваў строгую сістэму класіфікацыі і тыпалагізацыі абарончых умацаванняў. Ступень абагульнення, на якую выйшаў даследчык, дае магчымасць уявіць агульны ход развіцця абарончай архітэктуры[56]. Разам з тым прапанаваныя агульныя канцэптуальныя напрацоўкі не проста выкарыстаць

Schloßbauten zwischen 1550 und 1750 // Frühneuzeitliche Hofkultur in Hessen und Thüringen. Erlangen, 1993. S. 44–67.

[53] *Miłobędzki A.* Polskie rezydencje wieku XVII – typowe programy i rozwiązania // Architektura rezydencjonalna historycznej Małopolski / red. T. Hrankowska. Łańcut, 1982. S. 7–17; *Mikocka-Rachubowa K.* Rezydencje magnackie w Wielkim Księstwie Litewskim w XVII wieku // Przegląd wschodni. Historia i współczesność Polaków na Wschodzie. 1997. T. 4, z. 3 (15). S. 523–545; *Bania Z.* Pojęcie rezydencji w architekturze polskiej XVII i XVIII w. na przykładzie Podhorzec i Brodów. Lublin, 2000. S. 381–392; *Idem.* «Kazać porobić, byle były jak najmodniejsze». Relacje między inwestorem a budowniczym w polskiej architekturze nowożytnej // Studia nad sztuką renesansu i baroku. T. VI, cz. I. Lublin, 2005. S. 21–28; *Idem.* Nowożytne zamki polskiej magnaterii. Uwagi o reprezentacji na wybranych przykładach // Studia nad sztuką renesansu i baroku. T. IX. Lublin, 2008. S. 111–120; *Lasek P.* Turris fortissima nomen Domini. Murowane wieże mieszkalne w Królestwie Polskim od 1300 r. do połowy XVI w. Warszawa, 2013. 408 s.; *Idem.* Wieża i basteja. Z badań nad wpływem broni palnej na architekturę obronno-rezydencjonalną Królestwa Polskiego w XV–XVI w. // Interdyscyplinarne badania założeń rezydencjonalnych i obronnych. Warszawa, 2013. S. 158–175.

[54] *Bernatowicz T.* «Nesvisium metropolis ducatus». Nieznany przykład urbanistyki manierystycznej // Artes atque humaniora: Studio Stanislao Mossakowski sexagenario dicata. Warszawa, 1998. S. 161–167; *Idem.* Miles Christianus et peregrinus: fundacje Mikołaja Radziwiłła «Sierotki» w ordynacji nieświeskiej. Warszawa, 1998. 234 s.; *Idem.* Monumenta varii Radivillorum: wyposażenie zamku nieświeckiego w świetle źródeł archiwalnych. Cz. 1, XVI–XVII wieku. Poznań, 1998. 94 s.

[55] *Bernatowicz T.* Mitra i buława: królewskie ambicje książąt w sztuce Rzeczypospolitej szlacheckiej, 1697–1763. Warszawa, 2011. S. 557.

[56] *Bogdanowski J.* Basteje ziemne Małopolski w świetle traktatu Rei tormentariae... (XV–XVI w) // Bastejowe fortyfikacje w Polsce / red. E. Małachowicz. Wrocław, 1975. S. 25–34; *Idem.* Fortyfikacje łańcuckie na tle małopolskiej sztuki obronnej. Łańcut, 1976. 298 s.; *Idem.* Feldbefestigungen in Polen zur Zeit der Schwedischen Kriege im 17. Jahrhundert // Sicherheit und Bedrohung – Schutz und Enge: Gesellschaftliche Entwicklung von Festungsstädten – Beispiel Stade. Wesel, 1987. S. 149–166; *Bogdanowski J., Holcer Z., Kornecki M.* Architektura obronna. Słownik terminologiczny architektury.

для тлумачэння ўзроўня абароназдольнасці канкрэтных умацаванняў. Больш прадметна да вывучэння абарончых умацаванняў падышоў А. Грушэцкі, які, акрамя натурнага вывучэння, правёў таксама археалагічныя даследаванні на шматлікіх польскіх помніках[57]. Цікавай для нашай тэмы з'яўляецца дыскусія даследчыка з гісторыкам архітэктуры Ф. Маркоўскім аб абарончай архітэктуры Нясвіжскага замка. Нягледзячы на розныя погляды адносна характару ўмацаванняў помніка, абодва апаненты адзначалі іх унікальнасць[58].

Цэнтральныя рэзідэнцыі Радзівілаў уяўлялі сабой вялікія комплексы і ўключалі ў свой склад умацаваныя сядзібы ўласнікаў, а таксама гарады і мястэчкі з больш ці менш моцнымі фартыфікацыямі, якія аказвалі значны ўплыў на прасторавае развіццё паселішчаў. Таму пры вывучэнні ўмацаванняў гарадоў і мястэчак карыснымі з'яўляюцца працы па гістарычнай тапаграфіі і гісторыі горадабудаўніцтва[59]. Станоўчым бокам гэтых даследаванняў з'яўляецца шырокае выкарыстанне і публікацыя іканаграфічных матэрыялаў па гісторыі гарадоў (малюнкаў, планаў), а таксама гіпатэтычных рэканструкцый іх выгляду ў розныя перыяды. Разам з тым апора выключна на мастацтвазнаўчую метадалогію пры ацэнцы формы ўмацаванняў і недастатковае вывучэнне гісторыі фартыфікацыйнага будаўніцтва прывялі даследчыкаў да некаторых недакладнасцей. Так, удакладненняў патрабуюць рэканструкцыі планаў і фартыфікацый Нясвіжа і Слуцка, прапанаваныя Ю. У. Чантурыяй і Т. Бернатовічам[60]. Да праблемы горадабудаўнічага развіцця і абарончай архітэктуры радзівілаўскіх гарадоў і мястэчак таксама звярталіся гісторыкі С. Александровіч і В. С. Паздняковў[61].

Перавага гісторыкаў над іншымі спецыялістамі ў вывучэнні праблемы забеспячэння абароназдольнасці ўмацаванняў палягае ў веданні спецыфікі

Warszawa, 1994. 69 s.; *Bogdanowski J.* Architektura obronna w krajobrazie Polski: od Biskupina do Westerplatte. Gdańsk, 2002. 454 s.

[57] *Gruszecki A.* Bastionowe zamki w Małopolsce. 309 s.; *Idem.* Zamki i pałace małopolskie w XVI wieku : (cechy reprezentacyjno-mieszkaniowe i obronne). Warszawa, 1986. 126 s.; *Idem.* Zamosc – Italienischer Festungsbau des 16. Jahrhundert in Polen // Festungsforschung International. 2000. V. 14. S. 109–124.

[58] *Markowski F.* Zamek Mikołaja Krzysztofa Radziwiłła Sierotki w Nieświeżu // Kwartalnik architektury i urbanistyki. 1964. T. IX, z. 2. S. 185–192; *Gruszecki A.* Fortyfikacja zamku w Nieświeżu // Kwartalnik architektury i urbanistyki. 1965. T. X, z. 2. S. 141–145.

[59] *Егоров Ю. А.* Градостроительство Белоруссии. М., 1954. 281 с.; *Слюнькова И. Н.* Архитектура городов Верхнего Приднепровья XVII – середины XIX в. Минск, 1992. 143 с.; *Чантурыя Ю.* Гарады і час // Страчаная спадчына : Загінуўшыя абаронцы. Зруйнаваныя святыні. Па колішніх маёнтках. Гарады і час / уклад. Т. Габрусь. Мінск, 2003. С. 236–345; *Ён жа.* Градостроительное искусство Беларуси второй половины XVI – первой половины XIX в. : средневековое наследие, Ренессанс, барокко, классицизм. Минск, 2005. 375 с.; *Ён жа.* Градостроительство XV – начала XVIII в. // Архітэктура Беларусі: нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце : у 4 т. Мінск, 2006. Т. 2. С. 58–135.

[60] *Волкаў М.* Абарончы комплекс Нясвіжа ў XVI–XVIII стст. // Прыватнаўласніцкія гарады Вялікага Княства Літоўскага: лёс праз стагоддзі / уклад. З. Л. Яцкевіч. Мінск, 2014. С. 179–181.

[61] *Pazdniakou W.* Założenia urbanistyczne miast Białorusi Południowej w XVI–XVIII wieku // АНР. 1996. Т. 3. S. 273–288; *Alexandrowicz S.* Studia z dziejów miasteczek Wielkiego Księstwa Litewskiego. Toruń, 2011. 442 s.

ваеннай справы і грамадска-палітычнага ладу, што дазваляе больш дакладна вызначаць прычыны будаўніцтва і ўтрымання фартэцый. Таксама веданне гістарычных рэалій дазваляе аналізаваць і ацэньваць дзейнасць асобных прадстаўнікоў роду Радзівілаў, якія надавалі значную ўвагу абарончаму будаўніцтву. Разам з тым прыцягненне шырокага кола пісьмовых крыніц дазваляе гісторыкам больш слушна ацаніць абарончы патэнцыял умацавання ў розныя перыяды яго існавання, а часам і вызначыць час яго будаўніцтва і перабудоў.

У 1930-я гг. адным з першых у беларускай гістарыяграфіі да гісторыі абарончых умацаванняў звярнуўся Б. Брэжго, які сабраў звесткі па замках паўночнай Беларусі, у тым ліку Себежа і Невеля, якія належалі Радзівілам[62]. Асобныя аспекты падтрымання абароназдольнасці радзівілаўскіх рэзідэнцый закраналі ў сваіх працах гісторыкі З. Ю. Капыскі і А. П. Грыцкевіч, якія займаліся праблематыкай сацыяльна-эканамічнай гісторыі беларускіх гарадоў у ранні Новы час[63].

Доўгі час пісьмовыя крыніцы, у якіх можна знайсці інфармацыю аб абароназдольнасці радзівілаўскіх фартэцый, выкарыстоўваліся не сістэматычна і без належнай крытыкі, што адмоўна ўплывала на вынікі працы з імі. Адным з першых мэтанакіравана збіраць і апрацоўваць пісьмовыя звесткі па рэзідэнцыянальнай і абарончай архітэктуры на беларускіх землях у XVI – першай паловы XVII ст. пачаў Ю. А. Якімовіч[64]. Сваімі працамі даследчык засведчыў, што пісьмовыя крыніцы маюць вялікае значэнне для вывучэння гісторыі архітэктуры. Тым не менш у апісанні абарончых умацаванняў і архітэктуры рэзідэнцый Радзівілаў быў дапушчаны шэраг памылак, якія бачны пры верыфікацыі высноў Ю. А. Якімовіча на падставе дадатковых крыніц.

Адным з лепшых прыкладаў вывучэння гісторыі фартыфікацыйнага мастацтва Беларусі на аснове пісьмовых крыніц з'яўляюцца працы Ю. М. Бохана, які ў межах даследавання вайсковай справы ў ВКЛ у XIV–XVI стст. звярнуў увагу і на гісторыю абарончай архітэктуры[65]. Такога кшталту працу на асобным помніку зрабіў У. М. Пярвышын, які на аснове пісьмовых апісанняў Нясвіжскага замка падрыхтаваў артыкул аб яго фартыфікацыі[66]. Унёсак у вывучэнне абарончых рэзідэнцый у ВКЛ зрабіла Н. А. Скеп'ян, якая звяр-

---

[62] *Брэжго Б.* Замкі Віцебшчыны. Вільня, 1933. 38 с.

[63] *Hryckiewicz A.* Warowne miasta magnackie na Białorusi i Litwie // Przegląd Historyczny. 1970. Z. 3. S. 428–443; *Ён жа.* Частновладельческие города Белоруссии в XVI–XVIII вв.: социально-экономическое исследование истории городов. Минск, 1975. 248 с.; *Ён жа.* Социальная борьба горожан Белоруссии (XVI–XVIII вв.). Минск, 1979. 152 с.; *Копысский З. Ю.* Социально-политическое развитие городов Белоруссии в XVI – первой половине XVII в. Минск, 1975. 188 с.

[64] *Якімовіч Ю. А.* Драўляныя замкі Беларусі // Помнікі мастацкай культуры Беларусі : новыя даследаванні : зб. арт. Мінск, 1989. С. 120–124; *Ён жа.* Зодчество Белоруссии XVI – середины XVII в.: справ. пособие. Минск, 1991. 366 с.

[65] *Бохан Ю. М.* Вайсковая справа ў Вялікім княстве Літоўскім у другой палове XIV – канцы XVI ст. Мінск, 2008. 448 с.; *Бохан Ю., Скеп'ян А.* Побыт феадалаў Вялікага Княства Літоўскага ў XV – сярэдзіне XVII стагоддзя. Мінск, 2011. 270 с.

[66] *Пярвышын У.* Фартыфікацыі Нясвіжскага замка ў канцы XVI–XVIII стст. // Нясвіжскі палац Радзівілаў : гісторыя, новыя даследаванні. Вопыт стварэння палацавых музейных экспазіцый. Нясвіж, 2010. С. 113–124.

нула ўвагу на сувязь пачатку шырокага рэзідэнцыянальнага мураванага будаўніцтва ў ВКЛ з умацаваннем магнатэрыі[67].

Вялікую каштоўнасць для вывучэння гісторыі абарончага будаўніцтва на нашых землях у XVI–XVIII стст. маюць працы польскіх гісторыкаў С. Гербста, З. Пілярчыка і Е. Адамчыка, якія займаліся пытаннямі фартыфікацыйнага будаўніцтва на землях Польшчы і Украіны, а таксама звярталіся да гісторыі фартэцый на тэрыторыі ВКЛ[68]. Сярод іх варта адзначыць працы Б. Дыбася, які ў сваіх даследаваннях акцэнтаваў увагу на ўплыве спецыфічных грамадска-палітычных умоў Рэчы Паспалітай на развіццё фартыфікацыі і эвалюцыю фартэцый[69]. Поруч з польскімі гісторыкамі варта згадаць украінскага даследчыка А. Е. Мальчанка, які вывучаў гісторыю фартыфікацыйных умацаванняў на ўкраінскіх землях у часы Рэчы Паспалітай. Набольш каштоўнымі ў яго працы з'яўляюцца тыпалогія ўмацаванняў і характарыстыка сістэмы абароны ўкраінскіх зямель[70].

У Расіі гісторыю абарончай архітэктуры пачалі даследаваць з XIX ст. У 1858 г. з'явілася грунтоўная праца Ф. Ф. Ласкоўскага, прысвечаная развіццю

---

[67] *Скеп'ян Н.* Пачаткі будаўніцтва прыватнаўласніцкіх мураваных замкаў у Вялікім княстве Літоўскім // Магнацкі двор і сацыяльнае ўзаемадзеянне (XV–XVIII стст.) / рэд. А. М. Янушкевіч. Мінск, 2014. С. 54–63.

[68] *Herbst S.* Stan badań nad fortyfikacją nowożytną w Polsce // SMHW. 1966. T. 12, cz. 1. S. 7–37; *Idem.* Historia fortyfikacji: treść, dzieje, metodyka // Potrzeba historii czyli O polskim stylu życia: wybór pism : w 2 t. T. 2. Warszawa, 1978. S. 77–90; *Idem.* Urbanistyka i architektura obronna XV–XVII wieku // Potrzeba historii czyli O polskim stylu życia: wybór pism : w 2 t. Warszawa, 1978. T. 1. S. 158–166; *Pilarczyk Z.* Organizacja obrony Poznania od połowy XIII do końca XVIII w. // SMHW. 1988. T. 30. S. 43–59; *Idem.* Fortyfikacje na ziemiach koronnych Rzeczypospolitej w XVII wieku. Poznań, 1997. 368 s.; *Adamczyk J. L.* Fortyfikacje stałe na polskim przedmurzu od połowy XV do końca XVII wieku. Kielce, 2004. 249 s.; *Idem.* Fortyfikacje stałe na obszarze Wielkiego Księstwa Ruskiego // W kręgu Hadziacza, A. D. 1658: od historii do literatury / red. P. Borek. Kraków, 2008. S. 253–271.

[69] *Dybaś B.* Problematyka budowy i utrzymania fortyfikacji stałych w opiniach i działaniach sejmików województw krakowskiego i ruskiego w okresie wojen w połowie 17 w. // Rzeczpospolita w latach potopu / red. J. Muszyński, J. Wijaczek. Kielce, 1996. S. 109–131; *Idem.* Projekt budowy manufaktury zbrojeniowej w dobrach radziwiłłowskich w okolicach Słucka w 1670 roku // Europa orientalis: Polska i jej wschodni sąsiedzi od Średniowiecza po współczesność : studia i materiały ofiarowane prof. S. Alexandrowiczowi w 65 rocznicę urodzin / red. Z. Karpus, T. Kempa, D. Michaluk. Toruń, 1996. S. 289–292; *Idem.* Fortece Rzeczypospolitej : studium z dziejów budowy fortyfikacji stałych w państwie polsko-litewskim w XVII wieku. Toruń, 1998. 381 s.; *Idem.* Twierdza czy rezydencja? Militarne znaczenie siedzib magnackich w XVII wieku // Rezydencje w średniowieczu i czasach nowożytnych / red. E. Opaliński, T. Wiślicz. Warszawa, 2001. S. 69–93; *Idem.* Znaczenie wojen polsko-szwedzkich dla rozwoju fortyfikacji stałych w Rzeczypospolitej w XVII wieku (na przykładzie wielkich miast Prus Królewskich) // Z dziejów stosunków Rzeczypospolitej Obojga Narodów ze Szwecją w XVII wieku / red. M. Nagielski. Warszawa, 2007. S. 201–214.

[70] *Мальченко О. Є.* Типологія замкових та міських фортифікаційних систем на південно-східному українському порубіжжі (кінець XIV – середина XVII ст.) // Наукові записки : зб. пр. молодих вчених та аспірантів. Т. 1. Київ, 1997. С. 5–23; *Ён жа.* Проблематика оборони українських земель в польській військовій та політичній літературі XVI – середини XVII ст. // Наукові записки : зб. пр. молодих вчених та аспірантів. Т. 2. Київ, 1997. С. 66–99; *Ён жа.* Укріплені поселення Брацлавського, Київського і Подільського воєводств (XV – середина XVII ст.). Київ, 2001. 378 с.

фартыфікацыі ў Расіі ў Сярэднявеччы і ранні Новы час, якая па сваім маштабе, высновах і аб'ёме выкарыстаных крыніц не страціла сваёй актуальнасці да цяперашняга часу[71]. У першай палове – сярэдзіне XX ст. былі падрыхтаваны і выдадзены манаграфіі ваенных інжынераў В. В. Якаўлева і В. Ф. Шперка, у якіх вельмі абагульнена разглядалася гісторыя фартыфікацыйнага мастацтва[72]. На пачатку XXI ст. у друку з'явіліся некалькі прац гісторыка К. С. Носава, які з апорай на пісьмовыя крыніцы паспрабаваў даць ацэнку абарончаму патэнцыялу расійскіх крэпасцяў дабастыённага тыпу і эфектыўнасці сістэмы абароны дзяржавы ўвогуле[73]. Аднак пры выкарыстанні вынікаў даследаванняў расійскіх гісторыкаў трэба ўлічваць, што характар будаўніцтва і функцыянавання абарончых умацаванняў у Расійскай дзяржаве значна адрозніваўся ад умоў, якія склаліся ў Рэчы Паспалітай.

Істотным фактарам, які ўплываў на ўзровень абароназдольнасці ўмацавання, з'яўляецца наяўнае ў яго арсенале ўзбраенне. Гісторыя артылерыі і праблема забеспячэння замкаў і фартэцый ВКЛ артылерыйскім узбраеннем у беларускай гістарыяграфіі дасюль застаецца слабараспрацаванай праблемай. З айчынных даследчыкаў да гісторыі артылерыі і ручной агняпальнай зброі звяртаўся толькі Ю. М. Бохан[74]. На падставе пісьмовых і археалагічных крыніц даследчык вывучаў тыпы ўзбраення, распаўсюджанага ў ВКЛ у XIV–XVI стст., што стварае магчымасць для характарыстыкі арсеналаў умацаванняў.

Значных поспехаў у даследаванні гісторыі ўзбраення дасягнулі польскія гісторыкі. Іх напрацоўкі з'яўляюцца вельмі важнымі для нашай працы, улічваючы шчыльныя сувязі ВКЛ з Польшчай. Ужо ў пачатку XX ст. К. Горскім была выдадзена абагульняльная праца, прысвечаная гісторыі артылерыі ў Польшчы[75]. У ёй даследчык выкарыстаў і апублікаваў крыніцы, якія на працягу XX ст. пры розных абставінах былі страчаны, што павялічвае каштоўнасць гэтай працы. У міжваенны час з'явілася манаграфія М. Брэнштэйна, які ў межах апісання гісторыі развіцця ліцейнай справы ў ВКЛ закранаў многія пытанні з гісторыі артылерыі[76]. Найбольшы ўнёсак у даследаванне гісторыі артылерыі ў Рэчы Паспалітай зрабіў Т. Новак, які на працягу доўгага часу

---

[71] *Ласковский Ф. Ф.* Материалы для истории инженернаго искусства в России. СПб., 1858. Ч. 1. 322 с.

[72] *Яковлев В. В.* Эволюция долговременной фортификации. М., 1931. 397 с.; *Шперк В. Ф.* Фортификация. Очерки истории и развития. М., 1940. 80 с.; *Ён жа.* Фортификационный словарь. М., 1956. 280 с.; *Ён жа.* История фортификации. М., 1957. 320 с.

[73] *Носов К. С.* Русские крепости и осадная техника VIII–XVII вв. М., 2003. 173 с.; *Ён жа.* Русские крепости конца XV–XVII в. СПб., 2009. 248 с.

[74] *Бохан Ю. М.* Узбраенне войска ВКЛ другой паловы XIV – канца XVI ст. Мінск, 2002. 335 с.; *Ён жа.* Вайсковая справа ў Вялікім княстве Літоўскім у другой палове XIV – канцы XVI ст.; *Ён жа.* Асаблівасці фарміравання Нясвіжскага арсенала князёў Радзівілаў у XVI ст. // Нясвіжскі палац Радзівілаў: гісторыя, новыя даследаванні. Вопыт стварэння палацавых музейных экспазіцый. Нясвіж, 2010. С. 56–62.

[75] *Górski K.* Historia artylerii polskiej. Poznań, 2004. 324 s.

[76] *Brensztejn M.* Zarys dziejów ludwisarstwa na ziemiach b. Wielkiego Księstwa Litewskiego. Wilno, 1924. 226 s.

займаўся вывучэннем матэрыяльнай часткі артылерыі, эвалюцыі тыпаў гармат і спосабаў іх выкарыстання пры аблозе ўмацаванняў. Важным для нашага даследавання з'яўляецца той факт, што вельмі часта даследчык звяртаўся да крыніц і матэрыялаў, што характарызуюць стан развіцця артылерыі ў ВКЛ. У прыватнасці, ён дэталёва прааналізаваў забеспячэнне памежных замкаў ВКЛ узбраеннем з віленскага арсенала ў сярэдзіне XVI ст.[77] Вартымі ўвагі з'яўляюцца напрацоўкі З. Стэфаньскай, якая даследавала пытанні тыпалогіі артылерыі і ручной агняпальнай зброі ў XVI–XVII стст.[78] Вялікую карысць мае каталог бронзавых гармат, якія да цяперашняга часу захаваліся ў польскіх музеях, падрыхтаваны М. Градзіцкай[79]. У ім можна знайсці інфармацыю аб радзівілаўскіх гарматах, якія зберагаюцца ў музеях Польшчы. З польскіх даследчыкаў апошняга часу трэба адзначыць Я. Шымчака, які вывучаў працэс развіцця і распаўсюджання агняпальнай зброі ў Польшчы ў XIV – пачатку XVI ст. У прыватнасці гісторык даказаў, што на зломе XV–XVI стст. ручная агняпальная зброя выцесніла зброю кідальнага тыпу (лукі і арбалеты) і стала асноўным сродкам пры абароне ўмацаванняў[80].

Паколькі ад самага з'яўлення артылерыі і ручной агняпальнай зброі ў ВКЛ вялікую ролю адыгрывалі спецыялісты з нямецкіх зямель, асаблівай увагі заслугоўваюць працы нямецкіх гісторыкаў артылерыі, у прыватнасці Э. Эга, Г. Мюлера і Ф. Шмітхена[81]. Іх напрацоўкі дапамагаюць удакладніць тыпалогіі ўзбраення і яго характарыстыкі, што ў сваю чаргу дае магчымасць рабіць больш абгрунтаваныя высновы адносна развіцця артылерыі на землях ВКЛ.

---

[77] *Nowak T. M.* Zagadnienie ujednolicenia sprzętu artylerii i zasady obliczania kalibrów dział w Polsce w połowie XVII w. // SMHW. 1960. T. 5. S. 268–294; *Idem.* Sprzęt artylerii polskiej XVI wieku w świetle inwentarza z lat 1551–1565 // SMHW. 1963. T. 9, cz. 2. S. 281–302; *Idem.* Problem stosowania broni palnej przy obronie i zdobywaniu umocnień przez wojska polskie w XVI–XVII w. // SMHW. 1966. T. 12, cz. 1. S. 50–69; *Idem.* Arsenały artylerii koronnej w latach 1632–1655 // SMHW. 1967. T. 13, cz. 2. S. 92–135; *Idem.* Polska technika wojenna XVI–XVIII w. Warszawa, 1970. 399 s.; *Idem.* Rysunki dział zdobytych przez szwedów w Polsce w XVII i na początku XVIII w. // SMHW. 1976. T. 20. S. 285–333; *Idem.* Problematyka dziejów i główne etapy rozwoju dawnej artylerii polskiej // SMHW. 1984. T. 27. S. 225–254; *Idem.* Inwentarz artylerii Wielkiego Księstwa Litewskiego 1676 r. / Zeszyty Naukowe Muzeum Wojska w Białymstoku. 1988. T. 1. S. 107–117; *Idem.* Polska technika wojskowa XVI–XVII wieku. Teoria i praktyka artylerii i inżynierii // Technika a wojna X–XX w / red. P. Matusak, J. Piłatowicz. Siedlce, 2000. S. 52–89.

[78] *Stefańska Z.* Działo «orszańskie» // Muzealnictwo wojskowe. 1959. T. 1. S. 359–366; *Eadem.* Próba ustalenia typów i nazw dział artylerii polskiej XVI i XVII wieku // Muzealnictwo wojskowe. 1959. T. 1. S. 177–228; *Eadem.* Arkiebuz, hakownica, muszkiet (artykuł dyskusijny) // Muzealnictwo wojskowe. 1989. T. 4. S. 215–237.

[79] *Grodzicka M.* Zabytkowe działa spiżowe w zbiorach polskich // SMHW. 1960. T. 6, cz. 2. S. 358–414.

[80] *Szymczak J.* Od samostrzelników do grzebieniarzy w Krakowie, czyli rzecz o zmierzchu znaczenia kuszy na przelomie XV i XVI wieku // Aetas media, aetas moderna. Warszawa, 2000. S. 122–128; *Idem.* Początki broni palnej w Polsce (1383–1533). Łódź, 2004. 424 s.

[81] *Egg E.* Der Tiroler Geschützguss 1400–1600. Innsbruck, 1961. 212 S.; *Schmidtchen V.* Bombarden, Befestigungen, Büchsenmeister. Düsseldorf, 1977. 213 S.; *Müller H.* Gewehre, Pistolen, Revolver : europäische Jagd- und Kriegswaffen des 14. bis 19. Jahrhunderts. Berlin, 1997. 225 S.; *Idem.* Das Heerwesen in Brandenburg und Preussen 1640–1806. Die Bewaffnung. Berlin, 2001. 240 S.

Пры вывучэнні пытання забеспячэння ўзбраеннем фартэцый Радзівілаў карыснымі з'яўляюцца звесткі пра арсеналы іншых умацаванняў. Параўнанне забяспечанасці ўзбраеннем розных фартэцый стварае магчымасць для больш дакладнага вызначэння ўзроўня іх абароназдольнасці. Мэтанакіравана арсеналы фартэцый ВКЛ вывучаў польскі гісторык М. Савіцкі. У прыватнасці, ён апісаў артылерыю фартэцый у Ляхавічах, Быхаве і Смаленску[82]. Маштабную працу па вывучэнні арсеналаў замкаў на землях Украіны ў XV – першай палове XVII ст. выканаў А. Мальчанка[83]. Арсеналы прыватнаўласніцкіх фартэцый на тэрыторыі Польскага каралеўства даследаваў П. Шлэзінгер[84].

Для вывучэння праблемы забеспячэння абароназдольнасці рэзідэнцый Радзівілаў прыцягваліся пісьмовыя, іканаграфічныя і рэчавыя крыніцы. Выяўленыя пісьмовыя крыніцы па функцыянальнай прыкмеце можна падзяліць на наступныя тыпы: 1) уліковая дакументацыя; 2) дакументы асабістага паходжання; 3) арганізацыйна-распараджальная дакументацыя; 4) справаздачныя дакументы; 5) гаспадарчыя дакументы.

Найбольш папулярнай групай крыніц, якія выкарыстоўваюцца ў даследаваннях па гісторыі рэзідэнцый Радзівілаў, з'яўляюцца інвентарныя апісанні, якія адносяцца да тыпу ўліковых крыніц. Значная ўвага да інвентароў публікацыі іх або ў асобных выданнях, або ў якасці дадаткаў да манаграфій ці артыкулаў[85]. Пры відавочнай зручнасці выкарыстання інвентарных апісанняў для вывучэння архітэктуры рэзідэнцый іх каштоўнасць для даследавання абарончага патэнцыялу рэзідэнцый абмежаваная. Асноўнай мэтай стварэння гэтых дакументаў быў пералік наяўнай у рэзідэнцыі маёмасці і фіксацыя стану, у якім знаходзіліся розныя памяшканні. На агульны выгляд будынкаў і ўмацаванняў звярталася мала ўвагі. Тым не менш як крыніца па гісторыі архітэк-

---

[82] *Sawicki M.* Artyleria litewska w latach osiemdziesiątych XVII wieku. Organizacja i finansowanie // Artyleria polska. Historia – teraźniejszość – przyszłość (myśl wojskowa, szkolnictwo artyleryjskie, technika i uzbrojenie) / red. W. Rezner, M. Giętkowski, J. Ślipiec. Toruń, 2008. S. 161–174; *Ён жа.* Артылерыя, замак і цэйхгаўз у крэпасці Стары Быхаў у 1692–1707 г. // Гіст. альм. 2009. Т. 15. С. 45–74; *Ён жа.* Артылерыя Жолкаўскага замка ў XVII ст. // Архіварыус. Мінск, 2010. Вып. 8. С. 184–200; *Ён жа.* Артылерыя і смаленскі цэйхгауз (1654 г.) // Архіварыус. Мінск, 2011. Вып. 9. С. 142–154; *Idem.* Artyleria i cekhauz twierdzy Lachowicze w 1658 roku // Людзі і ўлада Навагрудчыны: гісторыя ўзаемадзеяння: (да 500-годдзя надання Навагрудку прывілея на магдэбургскае права) / уклад. А. А. Скеп'ян, В. В. Даніловіч, А. Б. Доўнар. Мінск, 2013. С. 191–201.

[83] *Мальченко О. Є.* Арсенали українських замків XV – середини XVII ст. Київ, 2004. 398 с.

[84] *Szlezynger P. S.* Inwentarze cekhauzów i armaty zamkowej z XVII i XVIII wieku w magnackich fortecach w Wiśniczu, Połonnem, Dubnem i Żółkwi // SMHW. 1988. T. 30. S. 283–330.

[85] *Иодковский И. И.* Замок в Мире. С. LXXI–LXXII; *Bernatowicz T.* Monumenta variis Radivillorum: wyposażenie zamku nieświeckiego w świetle źródeł archiwalnych. S. 31–69; *Mikulski W., Zawadzki J.* Opisy zamków białoruskich z inwentarzy dóbr przechowywanych w Archiwum Radziwiłłów w Archiwum Głównym Akt Dawnych. Warszawa, 1999. 88 s.; *Zawadzki J.* Siedziby Kiszków i Radziwiłłów na Białorusi w XVI–XVIII wieku : opisy z zasobu Archiwum Głównego Akt Dawnych. Warszawa, 2002. 130 s.; *Грыцкевіч А.* Інвентар Мірскага замка 1688 года як гістарычная крыніца // Мірскі замак і замкі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Праблемы рэстаўрацыі і музеефікацыі. Мінск, 2006. С. 33–35.

туры інвентары маюць выключнае значэнне, што выразна бачна на падставе даследаванняў Ю. А. Якімовіча[86]. Да ўліковых крыніц, прыдатных да вывучэння праблемы забеспячэння абароноздольнасці рэзідэнцый Радзівілаў, таксама адносяцца інвентары гарадоў і мястэчак. Асноўнай мэтай іх стварэння была фіксацыя памераў падаткаў, якія накладваліся на жыхароў. Разам з тым логіка пераліку жыхароў дапамагае ў вывучэнні планіроўкі паселішчаў і спецыфікі іх абарончых умацаванняў[87].

Як правіла, у склад інвентарных апісанняў рэзідэнцый ці цэлых маёнткаў уключаліся рэестры ўзбраення. Арсеналы вялікіх фартэцыях, як Нясвіж і Слуцк, маглі апісвацца асобна. Рэестраў арсеналаў замкаў Радзівілаў XVI ст. выяўлены адзінкі. Аднак захавалася вялікая колькасць такога кшталту дакументаў за XVII ст., што дазваляе дэталёва рэканструяваць забеспячэнне фартэцый Радзівілаў узбраеннем у гэты час. Так, па інвентарах арсенала Нясвіжскага замка XVII ст. можна даволі дакладна рэканструяваць артылерыйскі парк гэтай фартэцыі. Храналагічна гэтыя крыніцы падзяляюцца на тры групы: інвентары другой чвэрці XVII ст., апісанні сярэдзіны XVII ст. ці перыяду вайны 1654–1667 гг. і інвентары апошняй чвэрці XVII ст. Такі храналагічны падзел абумоўлены спецыфікай інвентарных апісанняў і паўнатой звестак у іх, а таксама адноснай стабільнасцю колькасці ўзбраення фартэцыі ў вызначаныя перыяды. Напрыклад, калі ў другой чвэрці XVII ст. гарматы або пералічваліся па ўласных назвах, або абагульняліся ў тыпы, то з сярэдзіны XVII ст. абсалютная большасць гармат згадвалася па ўласных назвах, а ў іх апісанні абавязкова фігураваў год ліцця. Дзякуючы ўласным назвам, якія мела большасць гармат Нясвіжскага замка, магчыма дакладнае супастаўленне звестак з розных апісанняў і дакладная атрыбуцыя большасці гармат (вызначэнне года вытворчасці, вагі, майстра, калібру, тыпу гарматы і інш.), якія не захаваліся да нашага часу. Для параўнання, у XVIII ст. гарматы часта проста пералічваліся па калібрах, што ўскладняе іх атрыбуцыю, а значыць, і вывучэнне змен у развіцці артылерыі ў згаданы перыяд[88].

Адной з найбольш каштоўных крыніц для вывучэння пытання забеспячэння абароноздольнасці рэзідэнцый Радзівілаў з'яўляецца карэспандэнцыя, якая адносіцца да дакументаў асабістага паходжання. Рознага кшталту інвентары і гаспадарчыя дакументы даволі дакладна фіксуюць стан фартэцый і ўзровень іх забеспячэнне ўзбраеннем, аднак у іх цяжка знайсці канкрэтныя ацэнкі абарончага патэнцыялу ўмацаванняў. У сваю чаргу, пры напісанні лістоў часта,

---

[86] *Якімовіч Ю. А.* Драўляныя замкі Беларусі. С. 120–124; *Ён жа.* Зодчество Белоруссии XVI – середины XVII в. : справ. пособие. 366 с.

[87] *Сергачев С. А.* Эволюция пространственной организации Копыля в XVII в. // Капыль: гісторыя горада і рэгіёна: да 360-годдзя надання Капылю прывілея на магдэбургскае права / уклад. А. А. Скеп'ян, А. Б. Доўнар, І. В. Соркіна. Мінск, 2012. С. 40–46; *Сергачев С. А.* Хозяйственные документы как источник исследования планировочной структуры городов Беларуси XVI–XVII вв. // Архитектура : сб. науч. тр. Минск, 2014. Вып. 7. С. 40–46.

[88] *Волкаў М.* Артылерыя Нясвіжскага замка ў канцы XVI – пачатку XVIII стст. // Arche. 2012. № 6. С. 41–91; *Ён жа.* Артылерыя Нясвіжскага замка. Мінск, 2015. 188 с.

акрамя апісання тых ці іншых спраў і падзей, людзі спрабавалі даць ім інтэрпрэтацыю. У карэспандэнцыі можна знайсці тлумачэнне абставін, звязаных з функцыянаваннем рэзідэнцый як ваенных аб'ектаў. Да дакументаў асабістага паходжання адносяцца таксама мемуары, аўтабіяграфіі і дзённікі[89]. На падставе іх можна рабіць высновы адносна прычын, якімі кіраваліся Радзівілы ў справе абарончага будаўніцтва ў сваіх землях.

Адной з найбольш важных крыніц сярод эпісталярнай спадчыны з'яўляецца карэспандэнцыя ўраднікаў. Паколькі Радзівілы мелі шмат рэзідэнцый у розных месцах Вялікага Княства Літоўскага, а таксама па розных палітычных і публічных справах доўгі час праводзілі ў Вільні, Варшаве і іншых гарадах, кіраванне маёнткамі вялося праз ліставанне з ураднікамі, якія знаходзіліся на месцах. Праз асабістую карэспандэнцыю аддаваліся загады і распараджэнні адносна розных спраў, звязаных з функцыянаваннем рэзідэнцый. Лісты ўласнікаў да сваіх ўраднікаў па сутнасці маюць характар арганізацыйна-распараджальнай дакументацыі. Асобна варта згадаць лісты да афіцэраў, якія маюць характар прамых загадаў уласніка адносна арганізацыі ваеннай справы і абароны рэзідэнцый. Асобнай формай арганізацыйна-распараджальнай дакументацыі з'яўляюцца запісы пастаноў сесій гарадскіх магістратаў. Найбольш цікавы комплекс дакументаў такога кшталту захаваўся па Слуцку. У розных архівасховішчах на цяперашні час выяўлены пратаколы сэсій магістрата горада за 1654–1674 гг.[90] Комплекс запісаў за 1654–1660 гг. вядомы ў літаратуры пад назвай «Лаўда, альбо Ухвала пра абарону, парадак і аздобу горада Слуцка». Ён выкарыстоўваўся многімі даследчыкамі для вывучэння практыкі арганізацыі абароны ў Слуцку. Акрамя ўласна пастаноў, скіраваных на забеспячэнне абароны горада, у ім знаходзіцца апісанне абароны Слуцка ад маскоўскіх і казацкіх войскаў у 1655 г.

У комплексе карэспандэнцыі розных асоб да Радзівілаў захавалася значная колькасць лістоў ураднікаў, якія кіравалі асобнымі маёнткамі. Яны маюць характар справаздачнай дакументацыі, паколькі змяшчаюць справаздачы аб выкананні даручэнняў уласніка і паведамленні аб розных падзеях, якія адбываліся ў дадзенай мясцовасці. Тэмы, якія закраналіся службоўцамі, залежалі ад спецыфікі іх дзейнасці. Найбольш каштоўнымі для нас з'яўляюцца справаздачы ўраднікаў, якія адказвалі за забеспячэнне абароназдольнасці рэзідэнцый, а таксама архітэктараў ці вайскоўцаў, што займаліся справамі абарончага будаўніцтва. У адрозненне ад загадаў і распараджэнняў магнатаў, якія, як правіла, былі даволі агульнымі, у лістах ураднікаў указвалася тое, што дакладна было зроблена за справаздачны перыяд, і апісвалася становішча, якое было на месцы.

Вывучаць дзейнасць па забеспячэнні абароназдольнасці рэзідэнцый Радзівілаў магчыма па спісах выдаткаў, у якіх фіксуецца выдача грошай на роз-

[89] Przyczynki do historyi domowej w Polsce: (Samuel Korecki, Adam Tarło, Bogusław Radziwiłł) / W. Syrokomla. Wilno, 1858. S. 43–60; *Radziwiłł B.* Autobiografia / oprac. T. Wasilewski. Warszawa, 1979. 379 s.

[90] AGAD. AR. Dz. II. Ks. 69/14; Dz. XXIII. T. 134. Pl. 2; BCzart. Rkps. 389; LMAVB. F. 9. B. 1873.

ныя патрэбы. Такога кшталту крыніцы адносяцца да гаспадарчых. У спісах выдаткаў асобных магнатаў ці прыходна-расходных кнігах маёнткаў часта трапляюцца імёны спецыялістаў, задзейнічаных на будаўніцтве і пры направе і вытворчасці зброі. У асобных выпадках захаваліся рэестры выдаткаў на будаўніцтва абарончых умацаванняў, як, напрыклад, выдаткі на рабочых, задзейнічаных пры будаўніцтве фартыфікацый у Нясвіжы ў 1686–1687 гг.[91] Да гэтай групы крыніц можа аднесці таксама рэестры выплат найманым жаўнерам гарнізонаў, якія пачалі складаць з сярэдзіны XVII ст. З іх дапамогай магчыма даследаваць структуру і памеры гарнізонаў.

Асаблівую важнасць для вывучэння ўзнятай у гэтым даследаванні тэмы маюць іканаграфічныя крыніцы, гэта значыць планы, чарцяжы і выявы рэзідэнцый Радзівілаў і іх умацаванняў. Наяўнасць іканаграфічных і пісьмовых крыніц па тых ці іншых рэзідэнцыях дазваляе з высокай ступенню дакладнасці рэканструяваць іх выгляд, а таксама ацэньваць абарончы патэнцыял іх умацаванняў. Найбольш раннія выявы рэзідэнцый Радзівіла (Клецк, Нясвіж) належаць прыдворнаму гравёру Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі Тамашу Макоўскаму. Вялікую цікавасць уяўляе альбом чарцяжоў і накідаў сярэдзіны XVII ст., які захаваўся ў архіве Радзівіла ў Мінску і належыць руцэ Януша Радзівіла. Сярод іх ёсць планы гарадоў магната, якія выкарыстоўваліся для праектавання абарончых умацаванняў вакол гэтых паселішчаў[92]. Да цяперашняга часу ў розных замежных архівах захавалася ажно пяць планаў Слуцка першай трэці XVIII ст., што дазваляе з высокім узроўнем дакладнасці рэканструяваць абарончыя ўмацаванні гэтага горада ў XVII – пачатку XVIII ст.[93]

Асобным відам крыніц з'яўляюцца рэчавыя артэфакты, найперш зброя і рэшткі саміх рэзідэнцый Радзівілаў. Так, да сённяшняга часу ў музеях Беларусі, Польшчы, Расіі і Швецыі захавалася 9 гармат з Нясвіжскага замка[94]. Зброя была выяўлена таксама ў час археалагічных даследаванняў на помніках. Напрыклад, у рове Нясвіжскага замка былі знойдзены гакаўніцы[95]. Гэта дае магчымасць для натурнага вывучэння ўзбраення і верыфікацыі інвентарных апісанняў нясвіжскага арсенала. Самі рэзідэнцыі Радзівілаў ці іх рэшткі з'яўляюцца крыніцай для вывучэння абарончай архітэктуры.

---

[91] AGAD. AR. Dz. XV. T. 19. Pl. 1.

[92] НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 287; *Волкаў М.* Да пытання аб аўтарстве калекцыі малюнкаў сярэдзіны XVII ст. з архіва князёў Радзівілаў // БГЧ. 2012. № 7. С. 34–38.

[93] *Волкаў М. А.* Слуцк на старых планах / нав. рэд. Д. В. Лісейчыкаў. Мінск, 2017. С. 26–32.

[94] *Волкаў М.* Артылерыя Нясвіжскага замка. С. 167.

[95] *Мяцельскі А. А.* Знаходкі агнястрэльнай зброі ў Нясвіжскім замку. С. 43–44.

Глава 2

Прычыны будаўніцтва і ўмовы функцыянавання ўмацаваных рэзідэнцый Радзівілаў

† Ваенны тэатр Вялікага Княства Літоўскага

† Эвалюцыя ваеннай справы

† Афармленне зямельных латыфундый Радзівілаў

† Гаспадарчае развіццё маёнткаў

† Сімвалы самасцвярджэння

Прыватнаўласніцкія ўмацаваныя рэзідэнцыі ў Вялікім Княстве Літоўскім і Рэчы Паспалітай у XVI – пачатку XVIII ст. выконвалі шэраг важных для жыццядзейнасці грамадства і дзяржавы функцый. Адной з асноўных задач, што ўскладваліся на іх, была абарона ўласніка, яго маёмасці і зямельнага ўладання. Таму забеспячэнню абароназдольнасці рэзідэнцый надавалася значная ўвага. Разам з тым яны з'яўляліся адміністрацыйнымі, эканамічнымі, культурнымі і рэлігійнымі цэнтрамі прыватнаўласніцкіх зямельных латыфундый. Таму для выяўлення прычын і характару абарончага будаўніцтва і ўтрымання прыватнаўласніцкіх умацаваных рэзідэнцый трэба разгледзець не толькі ваенны аспект іх функцыянавання, але таксама звярнуць увагу на пытанні грамадска-палітычнага, сацыяльнага і культурнага характару.

Найбольш значны ўплыў на абарончае будаўніцтва і форму ўмацаваных рэзідэнцый аказвалі фактары ваенна-тэхнічнага характару, а таксама гістарычныя і ваенна-лагістычныя рэаліі. Па меркаванні Я. Багданоўскага, кожнае ўмацаванне рэпрэзентуе сабою пэўную абарончую сістэму, якая мае вартасць і прыдатнасць у адпаведны гэтаму аб'екту гістарычны перыяд. Сама абарончая сістэма складаецца з абарончых элементаў, што падабраны адпаведна з магчымым спосабам атакі і абароны, узбраеннем абаронцаў і нападнікаў, тактычна-стратэгічнай сітуацыі і характару канкрэтнай мясцовасці[96]. Комплексны разгляд гэтых фактараў дае магчымасць зразумець як архітэктуру асобных умацаванняў, так і спецыфіку фартыфікацыйнага будаўніцтва цэлых рэгіёнаў. Напрыклад, характар праціўніка быў адной з прычынаў таго, што нягледзячы на значнае развіццё ваеннай архітэктуры ў Еўропе на ўсходніх землях ВКЛ і Рэчы Паспалітай доўгі час захоўвалі актуальнасць традыцыйныя дрэва-земляныя ўмацаванні.

Істотны ўплыў на форму ўмацаваных рэзідэнцый аказвалі фактары неваеннага характару. Гэта ў значнай ступені было абумоўлена сур'ёзнай сімвалічнай нагрузкай манументальнай архітэктуры ўвогуле і абарончай архітэктуры ў прыватнасці. Адным сваім выглядам абарончыя ўмацаванні ўвасаблялі вярхоўную ўладу ўласніка над навакольнымі землямі і суб'ектывізавалі асобу і моц гаспадара ў вачах падданых. Разам з тым трэба ўлічваць, што на рэалі-

[96] *Bogdanowski J.* Fortyfikacje łańcuckie na tle małopolskiej sztuki obronnej. S. 64, 86; *Bogdanowski J., Holcer Z., Kornecki M.* Architektura obronna. Słownik terminologiczny architektury. S. 12.

зацыю таго ці іншага праекта абарончай рэзідэнцыі істотны ўплыў аказвалі магчымасці гаспадара і значэнне канкрэтнага паселішча ў комплексе яго зямельных уладанняў.

Такім чынам, пры вывучэнні прычын будаўніцтва абарончых рэзідэнцый Радзівілаў мы не можам засяродзіцца толькі на даследаванні ваенна-гістарычных, ваенна-тэхнічных і геаграфічных рэалій. Улічваючы іх шматбаковую сутнасць, значную увагу трэба звярнуць таксама на фактары неваеннага характару, якія моцна ўплывалі на іх канчатковы выгляд і форму. Гэта, з аднаго боку, дасць магчымасць больш дакладна інтэрпрэтаваць форму тых ці іншых рэзідэнцый, а з іншага – дазволіць правільна ацаніць іх абарончы патэнцыял.

2.1. Ваенны тэатр Вялікага Княства Літоўскага

Актыўнасць абарончага будаўніцтва Радзівілаў напрамую залежала ад ваенна-стратэгічнай і ваенна-палітычнай сітуацыі ў рэгіёне, дзе знаходзіліся іх землі. Для разгляду гэтых фактараў скарыстаемся паняццем *тэатр вайны*, або *ваенны тэатр* Вялікага Княства Літоўскага. Ён уключаў землі ВКЛ і памежныя тэрыторыі, на якіх дзейнічала армія дзяржавы ў час войнаў з суседзямі. У ваенным тэатры ВКЛ можна выдзеліць шэраг *тэатраў ваенных дзеянняў*. Паводле К. Клаўзевіца, так называлі адасобленыя часткі ваеннага абшару, якія ўтваралі пэўную цэласнасць і не мелі непасрэднага ўплыву на сумежныя часткі ваеннага тэатру дзяржавы[97]. З канца XV да пачатку XVIII ст. у розны час актуалізаваліся тры асноўныя кірункі, на якіх армія ВКЛ мусіла стрымліваць ворага або сама пераходзіла ў наступ: паўночны (інфлянцкі), усходні (маскоўскі) і паўднёва-ўсходні (татарска-казацкі). Такім чынам, можна казаць аб існаванні трох асноўных тэатраў ваенных дзеянняў.

Паўночны тэатр ваенных дзеянняў сфарміраваўся пасля ўключэння зямель Інфлянцкага ордэна ў сферу ўплыву ВКЛ у 1557 г. На гэтым кірунку армія Вялікага Княства Літоўскага супрацьстаяла маскоўскім і шведскім войскам. З канца XVI ст. да пачатку XVIII ст. наймацнейшай фартэцыяй, якая абараняла землі дзяржавы на гэтым напрамку, быў радзівілаўскі бастыённы замак у Біржах. Найбольш цяжкім для ВКЛ быў усходні тэатр ваенных дзеянняў, на якім Вялікае Княства Літоўскае з канца XV ст. мусіла супрацьстаяць Маскоўскай дзяржаве. З паўднёвага ўсходу ВКЛ у пачатку XVI ст. пагражалі крымскія татары, а пазней – казакі, якія ў канцы XVI – XVII ст. падымалі паўстанні, і, як правіла, уздоўж рэчышча Дняпра, Прыпяці і іх прытокаў нападалі на землі ВКЛ. Менавіта ў сістэму абароны ўсходняга і паўднёва-ўсходняга тэатраў ваенных дзеянняў была ўключана большасць умацаваных рэзідэнцый Радзівілаў, якія знаходзіліся на беларускіх землях ВКЛ. Заходні і паўднёва-заходні кірункі былі найбольш бяспечнымі для Вялікага Княства, бо тут яно межавала з саюзнай Польшчай і леннай ад Польшчы Прусіяй. Толькі ў другой палове 1650-х гг., калі Польскае Каралеўства на кароткі час было амаль цал-

[97] *Клаузевиц К.* О войне. М., 1998. С. 328.

кам захоплена шведамі, для ВКЛ актуалізавалася небяспека з захаду. У 1657 г. шведы, сяміградцы і казакі нават зладзілі паспяховы сумесны паход на Берасце. Адной з мацнейшых прыватнаўласніцкіх рэзідэнцый у гэтым рэгіёне быў замак Радзівілаў у Белай.

Істотны ўплыў на фарміраванне ваеннага тэатру ВКЛ аказалі геаграфічныя і прыродныя ўмовы. Тэрыторыя, якую займала краіна (сучасныя Беларусь і Літва), знаходзіцца ва Усходне-Еўрапейскай раўніне. Шэраг пасляледавіковых узвышшаў (Аршанскае, Мінскае, Навагрудскае і інш.) аб'ядноўваюцца ў Беларускую граду, што займае значную частку паўночнай і цэнтральнай Беларусі, а на ўсходзе пераходзіць у Смаленскае ўзвышша. Значныя абшары на поўнач і на поўдзень ад гэтых узвышшаў займалі шырокія, пераважна забалочаныя даліны рэк. Сярод іх найбольш вядомымі з'яўляюцца багны Прыпяці і яе прытокаў. Вялікія абшары балот меліся таксама ў раёне верхняга цячэння Бярэзіны. Акрамя таго, вузкія, але доўгія паясы багнаў расцягнуліся ўздоўж Друці, Бярэзіны, Шчары, Зэльвянкі, Бабра і Нарвы. На поўначы Беларусі перашкоды для правядзення ваенных аперацый стваралі шматлікія азёры. Акрамя водных перашкод, значны ўплыў на ваенную лагістыку аказвалі лясныя масівы, асобныя з якіх, як, напрыклад, Белавежская пушча, захавалі ваенна-стратэгічнае значэнне да XIX ст. У разгляданы перыяд лясы займалі каля 50 % зямель, а ў памежных абшарах, дзе яны выконвалі функцыю абароны граніцы, – да 70 %. Такім чынам, вялікія абшары балот, азёраў і забалочаных далін рэк, а таксама неабсяжныя лясныя пушчы разам з адносна няразвітай сеткай сухапутных дарог значна абмяжоўвалі магчымасці правядзення вайсковых аперацый і вызначалі іх галоўныя кірункі. У войнах з Маскоўскай дзяржавай найчасцей выкарыстоўваліся так званая *Смаленская брама*, якая вяла ў бок Вязьмы і Масквы; *Полацкая брама* – у бок Пскова і Ноўгарада і *Слуцкі калідор* – у бок Старадуба і Бранска. У паўднёвай Беларусі вялікае значэнне для перамяшчэння войскаў мелі рэкі, якія выкарыстоўваліся для перавозу жывой сілы, узбраення, ваеннай амуніцыі і боепрыпасаў. Таму асаблівае значэнне ў войнах ВКЛ з казакамі меў кантроль над рэчышчам Дняпра і яго прытокаў[98]. Большасць беларускіх рэзідэнцый Радзівілаў была задзейнічана ў абароне Слуцкага калідора (Глуск, Клецк, Мір, Нясвіж, Свіслач, Слуцк).

Абарончыя ўмацаванні з'яўляліся элементам падрыхтоўкі тэатраў ваенных дзеянняў да ваенных аперацый. Фарміраванне іх сеткі на тэрыторыі ВКЛ ішло паступова і залежала ад шэрагу фактараў. Большасць замкаў і ўмацаваных гарадоў, якія мелі істотнае значэнне ў сістэме абароны дзяржавы, паўсталі ў выглядзе абарончых градаў яшчэ ў старажытнарускі час. Пераважная большасць з іх знаходзілася на вялікіх рэках (Дняпро, Дзвіна, Нёман, Прыпяць і іх прытокі), якія з'яўляліся асноўнымі транспартнымі і гандлёвымі шляхамі на працягу Сярэднявечча і ранняга Новага часу. Значныя змены ў сістэме рассялення адбыліся ў XVI ст. У гэты час дасягнула вялікіх маштабаў ініцыяванае цэн-

[98] *Herbst S.* Polski teatr wojny. S. 439; *Alexandrowicz S., Olejnik K.* Charakterystyka polskiego teatru działań wojennych. S. 46–50.

тральнай уладай і магнатамі ўпарадкаванне раней засвоеных зямель і каланізацыя лясных масіваў, у тым ліку ў памежных абласцях[99]. Гэта, з аднаго боку, рабіла краіну больш адкрытай для нападаў звонку, бо пушчы ў памежных абшарах, што гарантавалі надзейную абарону ад уварванняў звонку, пачалі высякаць. З іншага боку, асваенне новых зямель прыводзіла да павялічэння дэмаграфічнага патэнцыялу дзяржавы і асобных рэгіёнаў, што дазваляла закладваць і ўтрымліваць новыя крэпасці. Вынікам значнага дэмаграфічнага росту стала павелічэнне насельніцтва ВКЛ да сярэдзіны XVII ст. да 4,5 млн чалавек[100]. Разам з тым шчыльнасць засялення ўсходніх рэгіёнаў дзяржавы, за выключэннем міжрэчча Дзвіны і Дняпра, у XVI–XVII стст. заставалася даволі нізкай. Дыспрапорцыя ў гаспадарчым асваенні і засяленні тэрыторыі ВКЛ адмоўна адбівалася на арганізацыі абароны дзяржавы, таму ваенная небяспека адчувалася нават у цэнтральных рэгіёнах ВКЛ, што стымулявала абарончае будаўніцтва, у тым ліку ў рэзідэнцыях Радзівілаў, якія знаходзіліся далёка ад граніц дзяржавы.

Важныя звесткі аб сістэме абароны ВКЛ у трэцяй чвэрці XVI ст. дае рэестр ўзбраення, высланага з віленскага цэйхгаўза ў памежныя замкі на першым этапе Інфлянцкай вайны ў 1551–1566 гг. Дзякуючы гэтай крыніцы нам вядомыя замкі, што былі ўключаны ў сістэму агульнадзяржаўнай абароны. Некаторыя з іх пазней перайшлі ў рукі Радзівілаў. Апошнія, такім чынам, як прыватныя ўласнікі памежных замкаў былі вымушаны браць на сябе абавязкі абароны межаў дзяржавы. Паводле згаданага рэестра, узбраеннем былі забяспечаны 5 замкаў з боку Інфлянт (Браслаў, Друя, Дрыса, Мядзел, Упіта), 4 замкі на Дзвіне і яе прытоках (Полацк, Лепель, Азярышча, Віцебск). Пасля страты Полацка ў 1563 г. для забеспячэння прарванай лініі абароны дадаткова былі збудаваны яшчэ 3 замкі (Дзісна, Варонеч, Чашнікі). Глыбокая сістэма абароны існавала на ўсходзе. Яе прыкрывалі замкі, сканцэнтраваныя на трох лініях па рэках Сож, Дняпро і Бярэзіна. На Сожы і яго прытоках стаяла 6 замкаў (Мсціслаў, Крычаў, Радамль, Прапойск, Чачэрск, Гомель), на Дняпры і яго прытоках – 4 (Орша, Магілёў, Рэчыца, Любеч), на Бярэзіне – 2 (Барысаў, Свіслач). Апроч іх з поўдня тэрыторыю ВКЛ прыкрывалі 3 замкі, што стаялі на Прыпяці і яе прытоках (Мазыр, Чарнобыль, Оўруч)[101]. У канцы XVI–XVII стст. у валоданне біржанскіх Радзівілаў трапіла Свіслач у Менскім павеце, а таксама ў часовае трыманне – Барысаў. Акрамя таго, у сістэму абароны ўсходняй мяжы была ўключана Копысь, якая ў сярэдзіне XVI ст. ужо была прыватным уладаннем, а з канца таго ж стагоддзя адышла да Радзівілаў. У сярэдзіне XVII ст. Янушу Радзівілу былі перададзены замкі Невель і Себеж на самай мяжы з Маскоўскай дзяржавай.

У XV–XVII стст. Радзівілы, як і іншыя магнацкія роды, мэтанакіравана набывалі землі ў цэнтральных абласцях краіны. Большасць іх маёнткаў зна-

[99] *Alexandrowicz S.* Studia z dziejów miasteczek Wielkiego Księstwa Litewskiego. S. 53–54.

[100] *Morzy J.* Kryzys demograficzny na Litwie i Białorusi w 2 połowie XVII wieku. Poznań, 1965. S. 153.

[101] *Nowak T. M.* Sprzęt artylerii polskiej XVI wieku w świetle inwentarza z lat 1551–1565. S. 290–293.

ходзілася ў межах Віленскага, Троцкага, Наваградскага, Менскага ваяводстваў і ў Падляшшы. Аднак жыхары гэтых рэгіёнаў не адчувалі сябе ў поўнай бяспецы. Паслабленне ВКЛ на знешнепалітычнай арэне, якое пачалося з канца XV ст., прывяло да змянення сітуацыі. Актывізацыя Крымскага ханства ў канцы XV ст. выявіла неэфектыўнасць сістэмы абароны паўднёвых межаў ВКЛ, што паставіла пад пагрозу цэнтральныя рэгіёны дзяржавы[102]. Акрамя таго, вялікі непакой стваралі глыбокія рэйды войскаў Маскоўскай дзяржавы, якая на працягу XVI ст. некалькі разоў ваявала з ВКЛ. З канца XVI ст. патэнцыйнай і даволі сур'ёзнай пагрозай з паўднёвага ўсходу для ВКЛ сталі казакі. Гэта пасеяла страх і прымусіла задумацца аб сваёй бяспецы землеўласнікаў цэнтральных рэгіёнаў дзяржавы. Менавіта казакі ў канцы XVI – сярэдзіне XVII ст. уяўлялі найбольшую пагрозу для рэзідэнцый Радзівілаў у Міры, Нясвіжы, Слуцку і Глуску.

На працягу другой паловы XVI – першай паловы XVII ст. абарончая лінія з замкаў і ўмацаваных гарадоў на Дзвіне і Дняпры з-за сталага недахопу сродкаў на яе ўтрыманне пачала страчваць свой патэнцыял. Састарэлыя дрэва-земляныя фартыфікацыі занепадалі, а слабое забеспячэнне артылерыяй, амуніцыяй і залогамі не дазваляла выкарыстаць патэнцыйныя магчымасці ўмацаванняў[103]. Тым не менш да сярэдзіны XVII ст. палітычныя эліты Рэчы Паспалітай і ВКЛ былі перакананы ў надзейнасці лініі абароны па Дзвіне і Дняпры, а таксама ў моцы ўласнага войска, якое здолее стрымаць непрыяцеля на граніцы. Поспех у вайне 1632–1634 гг., калі ўдалося адбіць напад вялізнага маскоўскага войска на Смаленск, аслабіў увагу дзяржаўных ураднікаў і шляхецкага грамадства да патрэбы абароны ўласнай тэрыторыі і стварыў ілюзію таго, што войны ў будучым будуць мець перыферыйны характар, а цэнтральныя вобласці дзяржавы атрымаецца захаваць у бяспецы[104]. Гэта прывяло да катастрафічных наступстваў, калі на працягу 1654–1655 гг. велізарная маскоўская армія змагла заняць амаль усю тэрыторыю краіны. Пры гэтым, пачынаючы з апошняй чвэрці XVI ст., умацаваныя прыватнаўласніцкія рэзідэнцыі, для будаўніцтва і мадэрнізацыі якіх прыцягваліся значныя матэрыяльныя рэсурсы, набылі вялікае значэнне ў сістэме абароны дзяржавы. Асабліва выразна гэта праявілася ў час вайны 1654–1667 гг. З пачаткам вайны маскоўскія войскі з дапаможнымі казацкімі палкамі здолелі даволі хутка захапіць дзяржаўныя крэпасці на Дняпры і Дзвіне, што адкрыла ім шлях унутр краіны. Аднак моцны адпор захопнікам здолелі аказаць магутныя прыватнаўласніцкія фартэцыі Сапегаў у Быхаве і Ляхавічах і Радзівілаў у Слуцку і Нясвіжы.

Такім чынам, будаўніцтва прыватных фартэцый вынікала з інтарэсаў магнацкіх родаў, якія клапаціліся найперш пра бяспеку сваіх уладанняў. Ума-

---

[102] *Кананові́ч У. І.* Случчына і напады крымскіх татараў // Случчына: мінулае і сучаснасць: да 885-годдзя заснавання г. Слуцка: замалёўкі гіст. мясцін, помнікаў, вуліц, асобных будынкаў / уклад. В. Відлога. Слуцк, 1995. Вып. 1. С. 52–53.

[103] *Alexandrowicz S., Olejnik K.* Charakterystyka polskiego teatru działań wojennych. S. 70.

[104] Ibidem. S. 73.

цаванні звычайна паўставалі ў цэнтрах прыватных зямельных комплексаў, якія, як гэта мела месца ў выпадку Радзівілаў, знаходзіліся пераважна ў цэнтры дзяржавы. Таму найноўшыя ўмацаванні, як, напрыклад, Нясвіжскі замак ці горад-фартэцыя Слуцк, паўсталі далёка ад межаў дзяржавы. Аднак у тым выпадку, калі землі магнатаў размяшчаліся ў памежнай зоне, прыватны інтарэс супадаў з агульнадзяржаўным. Так, з сярэдзіны XVI ст. змянілася становішча на паўночным тэатры ваенных дзеянняў ВКЛ, якое было ўцягнута ў змаганне са Швецыяй і Маскоўскай дзяржавай за землі Інфлянцкага ордэна. Гэта стала адной з прычын будаўніцтва Радзівіламі ў канцы XVI ст. бастыённага замка ў Біржах. Гэтаксама яго перабудова і мадэрнізацыя ў 1630-я гг. ажыццяўлялася ў значнай ступені з-за неабходнасці абароны межаў дзяржавы. Урэшце да пачатку XVIII ст. Біржанскі замак заставаўся фактычна адзінай моцнай фартэцыяй на паўночнай мяжы ВКЛ[105]. Акрамя таго, у якасці прыкладу варта згадаць пра Копысь, якая прыкрывала межы ВКЛ на паўночным усходзе. Таму яе ўмацаванні былі мэтанакіравана мадэрнізаваны ў 1660-я гг.

Праблемы з абаронай граніц дзяржавы сталі вынікам развіцця грамадска-палітычнага ладу ВКЛ і Рэчы Паспалітай, калі цэнтральная ўлада не мела сродкаў для падтрымання і мадэрнізацыі памежных крэпасцей, а магнаты скіроўвалі свае намаганні на будаўніцтва новых фартэцый на сваіх землях у глыбіні краіны. Разам з тым трэба адзначыць, што палітычная эліта Рэчы Паспалітай рабіла эпізадычныя захады для выпраўлення хібаў такога стану рэчаў шляхам выкарыстання магчымасцей асобных магнатаў. Прыкладам для ілюстрацыі гэтага меркавання з'яўляюцца зямельныя наданні, якія атрымаў польны гетман Януш Радзівіл у 1649 г. Соймам яму былі перадзены ў спадчыннае валоданне Невель, Себеж і Краснае на памежжы з Маскоўскай дзяржавай, а ад караля ён атрымаў у пажыццёвае трыманне Барысаўскае староства. Сярод чарнавікоў магната, якія захаваліся да нашага часу, маецца накід плана Барысава, на якім бачна, што абазнаны ў ваеннай справе магнат разважаў над праектам разбудовы ўмацаванняў Барысава. Акрамя таго, вядома, што Януш Радзівіл пачаў узводзіць бастыённыя фартыфікацыі ў Свіслачы, якая магла быць задзейнічана пры абароне ўсходніх граніц дзяржавы[106].

Актыўнасць абарончага будаўніцтва ў рэзідэнцыях Радзівілаў у шэрагу выпадкаў залежала ад ваенна-стратэгічнай і ваенна-палітычнай сітуацыі ў рэгіёнах, дзе яны знаходзіліся. У XVI–XVII стст. прадстаўнікі гэтага роду мэтанакіравана набывалі землі пераважна ў цэнтральных рэгіёнах ВКЛ, але і там яны не былі ў поўнай бяспецы. Глыбокія рэйды крымскіх татараў, маскоўскіх і казацкіх войскаў стымулявалі абарончае будаўніцтва і ў глыбіні краіны. Таму большасць умацаваных рэзідэнцый Радзівілаў на беларускіх землях так ці інакш былі ўключаны ў сістэму абароны і забеспячэння ўсходняга і паўд-

[105] *Dybaś B.* Fortece Rzeczypospolitej: studium z dziejów budowy fortyfikacji stałych w państwie polsko-litewskim w XVII wieku. S. 90.

[106] *Волкаў М.* Да пытання аб аўтарстве калекцыі малюнкаў сярэдзіны XVII ст. з архіва князёў Радзівілаў. С. 34–38.

нёва-ўсходняга тэатраў ваенных дзеянняў (Глуск, Давыд-Гарадок, Клецк, Копысь, Мір, Нясвіж, Свіслач, Слуцк). Пры гэтым пачынаючы з апошняй чвэрці XVI ст. фартэцыі Радзівілаў, у будаўніцтва і мадэрнізацыю якіх укладваліся значныя сродкі, набылі істотнае значэнне ў сістэме абароны дзяржавы, што асабліва выразна праявілася ў час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654–1667 гг.

2.2. Эвалюцыя ваеннай справы

Паводле канцэпцыі *ваеннай рэвалюцыі* (англ. *military revolution*), прапанаванай у 1955 г. Майклам Робертсам, змены ва ўзбраенні і тактыцы вядзення бою ў перыяд з 1560 па 1660 г. аказалі вырашальны ўплыў на развіццё ваеннай справы, што выклікала маштабныя змены ў розных сферах функцыянавання еўрапейскіх дзяржаў і фактычна вызначыла іх далейшы шлях развіцця[107]. Гісторык лічыў, што павелічэнне сілы агню мушкетаў скончыла працяглы перыяд дамінавання кавалерыі на полі бою і пераўтварыла пяхоту ў ядро войскаў дзяржаў Заходняй Еўропы. У сваю чаргу, для дасягнення высокай баяздольнасці ўзброеных агняпальнай зброяй пехацінцаў іх трэба было належным чынам падрыхтаваць, што патрабавала часу і выдаткаў. У такіх умовах распускаць войска ў мірны час, як гэта рабілася раней, стала невыгодным, і еўрапейскія дзяржавы перайшлі да ўтрымання пастаянных армій, памеры якіх паступова ўзрасталі. Гэта вымагала вялікіх рэсурсаў, а разам з тым умацавання цэнтральнай улады і развіцця дзяржаўнага бюракратычнага апарату, што прывяло да фарміравання абсалютных манархій у Еўропе[108]. Гэтыя працэсы кардынальным чынам змянілі ўмовы існавання абарончых умацаванняў. Па шэрагу прычын Рэч Паспалітая не змагла прайсці шлях да ўсталявання абсалютнай манархічнай улады, што ўрэшце прывяло да амаль поўнага заняпаду фартыфікацыйнага будаўніцтва на яе тэрыторыі ў XVIII ст. Такім чынам, эвалюцыя ўзбраення і вайсковай справы аказала як прамы ўплыў на абарончую архітэктуру, вызначаючы накірунак яе эвалюцыі, так і апасродкаваны, паколькі змяняліся ўмовы функцыянавання ўмацаванняў. Гэта добра бачна на прыкладзе рэзідэнцый Радзівілаў, таму варта засяродзіцца на згаданай канцэпцыі, а таксама найбольш важных момантах у развіцці ўзбраення і ваеннай справы больш дэталёва.

Канцэпцыя ваеннай рэвалюцыі знайшла шмат прыхільнікаў і апанентаў. Пры гэтым крытыкаваліся храналагічныя рамкі і асобныя аспекты гэтага феномену, а таксама характар сувязі паміж развіццём ваеннай справы і эвалюцыяй грамадска-палітычнага ладу. Роберт Фрост лічыў, што ваенная рэвалюцыя ахоплівае ўвесь перыяд Паўночных войнаў (1558–1721 гг.), а для Рэчы Паспалітай перадумовы для рэфармавання ваеннай галіны і пераходу да абсалютнай манархіі склаліся пасля войнаў 1648–1667 гг., гэта значыць у дру-

[107] Аўтар выказвае шчырую падзяку К. Карлюку за дапамогу ў падрыхтоўцы гэтага раздзела.

[108] *Roberts M.* The Military Revolution // Essays in Swedich History. London, 1967. P. 195–225.

гой палове XVII ст.[109] У сваю чаргу Джэфры Паркер адзначаў, што, апроч эвалюцыі агняпальнай зброі і ўзрастання колькаснага складу пастаянных армій, важным чыннікам ваеннай рэвалюцыі было з'яўленне новага тыпу фартыфікацыйных умацаванняў, здабыванне якіх патрабавала значнага ўдасканалення арганізацыі і забеспячэння войскаў[110]. Нягледзячы на крытычныя заўвагі, якія выказваліся адносна канцэпцыі ваеннай рэвалюцыі, яе апаненты не ставілі пад сумненне самога пастулата М. Робертса аб уплыве развіцця ваеннай справы на трансфармацыю дзяржаўнай сістэмы[111]. Таму гэтая канцэпцыя да цяперашняга часу захоўвае актуальнасць і вялікую каштоўнасць для вывучэння гісторыі еўрапейскіх дзяржаў у ранні Новы час. У тым ліку яна дае магчымасць раскрыць характар развіцця ваеннай справы і ваеннай гісторыі беларускіх зямель у XVI – пачатку XVIII ст.

Агняпальная зброя з'явілася ў Еўропе яшчэ ў першай палове XIV ст. Аднак доўгі час эфектыўнасць яе выкарыстання была невысокай, і яна не магла карэнным чынам змяніць характар войнаў. Прычынай гэтага была недасканаласць яе канструкцыі. Першыя ручныя стрэльбы мелі вялікую вагу і былі нязручныя, таму іх было цяжка выкарыстоўваць у палявых бітвах. Куды больш прыдатнымі яны былі пры абароне ўмацаванняў. Адным з найбольш эфектыўных варыянтаў стрэльбаў позняга Сярэднявечча сталі гакаўніцы. У канцы XV – XVI ст. былі зроблены вынаходніцтвы, якія павялічылі эфектыўнасць ручной агняпальнай зброі і зрабілі яе прыдатнай для выкарыстання ў палявых бітвах. Удасканаленне тэхналогіі вырабу ствалоў дазволіла зменшыць іх вагу, а вынаходніцтва рознага тыпу замкоў для запальвання зарада зрабіла магчымым вядзенне прыцэльнага агню адным чалавекам. У выніку ручная агняпальная зброя стала больш лёгкай і прыдатнай для страляння з рук. Гэта дало штуршок да разгортвання ваеннай рэвалюцыі. На беларускіх землях агняпальная зброя выцесніла кідальную (лукі і арбалеты) на пачатку XVI ст. Таму, напрыклад, Мірскі замак, пабудаваны ў першай чвэрці гэтага стагоддзя, меркавалася абараняць амаль выключна з дапамогай гакаўніц і ручніц, аб чым сведчаць асаблівасці яго архітэктуры[112].

У сярэдзіне XVI ст. універсальнай ваеннай стрэльбай стаў мушкет, забяспечаны кнотавым замком. Кнот уяўляў сабой шнурок з канопляў, які мог доўга гарэць, а пры спрацоўванні замка запальваў зарад. Першапачаткова мушкет быў даволі цяжкі (6–7 кг), таму пры стральбе яго ўскладвалі на спецыяльную падпорку, ці фаркет. У далейшым вага яго зменшылася (да 4,5–5 кг), што зрабіла магчымым стральбу з рук. Больш дасканалым за кнотавы быў колавы замок. Іскры для запальвання зарада ў ім высякаліся жалезным

[109] *Frost R.* Potop a teoria rewolucji militarnej // Rzeczpospolita w latach potopu / red. J. Muszyński, J. Wijaczek. Kielce, 1996. S. 164–165; *Idem.* The Northern Wars: War, State and Society in Northeastern Europe 1558–1721. Harlow, 2000. P. 310–327.

[110] *Parker G.* The Military Revolution: Military Innovation and the Rise of the West, 1500–1800. Cambridge, 1988. P. 43.

[111] *Frost R.* Potop a teoria rewolucji militarnej. P. 152.

[112] *Волкаў М.* Фартыфікацыя і ўзбраенне Мірскага замка // БГЧ. 2012. № 1. С. 13–16.

колцам аб крэмень. Але з-за складанасць канструкцыі колавы замок быў дарагі і не мог замяніць танны і просты кнотавы, таму кнотавы мушкет заставаўся асноўным відам узбраення пяхоты да канца XVII ст.[113]

Вялікі ўплыў на ваенную справу аказала развіццё артылерыі. У канцы XV – першай палове XVI ст. інавацыі ў артылерыйскай справе значна павысілі яе эфектыўнасць. Пераход ад каменных да металічных ядраў даў магчымасць паменшыць памер ствала гарматы, а разам з тым павялічыць яе разбуральную сілу. Павышэнню мабільнасці і зручнасці выкарыстання артылерыі спрыяла вынаходніцтва ўніверсальнага для ўсіх тыпаў гармат двухсценнага лафета. Іншым важным крокам наперад быў пераход да выкарыстання гранулявана-га пораху, які валодаў нашмат большай выбуховай сілай, чым ранейшы мукападобны. Акрамя таго, у згаданы час былі зроблены захады па ўніфікацыі гармат, што спрасціла практыку забеспячэння іх амуніцыяй і боепрыпасамі. У прыватнасці, у 1530 г. Георг Гартман распрацаваў лінейку калібраў, якая стала ўніверсальнай для большасці краін Еўропы[114]. У выніку паўстала магутная і манеўраная артылерыя, асноўныя характэрныя рысы якой не змяніліся да XIX ст.

Удасканаленне ўзбраення прывяло да грунтоўных змен у тактыцы вядзення бою. Яшчэ ў познім Сярэднявеччы ў бітвах пачало ўзрастаць значэнне пяхоты. У XVI ст. дзякуючы мушкетам і падтрымцы палявой артылерыі сіла агню пешых фармацый значна вырасла, і пяхота канчаткова адцясніла кавалерыю на другі план. Абавязковай умовай для дасягнення высокай эфектыўнасці пяхоты на полі бітвы былі моцная дысцыпліна і зладжанасць дзеянняў жаўнераў, што дасягалася шляхам доўгай падрыхтоўкі і муштры. Калі навучыць жаўнера карыстацца мушкетам ці пікай можна было даволі хутка, то эфектыўнасць яго дзеянняў у складзе пэўнай вайсковай фармацыі залежала ад значна больш складанай практыкі і вопыту[115]. Неабходнасць такога высокага ўзроўню ваеннай арганізацыі падштурхоўвала еўрапейскія краіны да паступовага пераходу да ўтрымання прафесійных армій на пастаяннай аснове, што наклала адбітак і на эвалюцыю іх дзяржаўнага ладу.

Штуршком для развіцця *ars militaris* (лац. 'ваеннае мастацтва'), як правіла, былі войны. Яны вымушалі дзяржавы ўкладваць значныя рэсурсы ў развіццё вайсковай справы, што дазваляла спецыялістам на практыцы ўдасканальваць узбраенне, стратэгію і тактыку ваеннага супрацьстаяння. Адной з найбольш уплывовых у гэтым плане стала вайна за незалежнасць Нідэрландаў супраць Іспаніі ў апошняй трэці XVI – першай палове XVII ст. У гэты час галандская армія намаганнямі Морыца Аранскага была значна мадэрнізавана. Супраць вялікіх іспанскіх тэрцый, у якіх было аб'яднана да 3 000 жаўнераў, галанд-

[113] *Müller H.* Die Bewaffnung: Das Heerwesen in Brandenburg und Preussen von 1640 bis 1806. S. 65.

[114] *Волкаў М.* Артылерыя Нясвіжскага замка. С. 17–23.

[115] *Shawalter D.* Gunpowder and Regional Military Systems // The Military and Conflict Between Cultures: Soldiers at the Interface / ed. J. C. Bradford. College Station, 1997. P. 78–79.

цы выстаўлялі больш мабільныя батальёны, якія налічвалі каля 500 чалавек. Была павялічана колькасць афіцэраў, што павысіла якасць падрыхтоўкі, дысцыпліну і магчымасць кіравання жаўнерамі. Гэта зрабіла пяхотныя аддзелы больш мабільнымі і дзейснымі тактычнымі баявымі адзінкамі. Акрамя таго, была распрацавана тэхніка стральбы залпамі, якая значна павысіла шчыльнасць агню пяхоты. Гэтыя інавацыі даказалі сваю эфектыўнасць у вайне з Іспаніяй, што зрабіла галандскае ваеннае мастацтва надзвычай папулярным у Еўропе, і ў тым ліку ў Рэчы Паспалітай.

Адной з ключавых фігур ваеннай рэвалюцыі ў Еўропе лічыцца шведскі кароль Густаў II Адольф, які ў 1617 г. распачаў рэфармаванне сваёй арміі па галандскім прыкладзе. Пэўныя рэформы рабіліся і раней, аднак яны былі непаслядоўнымі і незавершанымі. Гэта зрабілася відавочным у час бітвы пад Кірхгольмам у 1605 г., калі ваенныя аддзелы Рэчы Паспалітай на чале з Янам Каралем Хадкевічам ушчэнт разграмілі ўтрая большае шведскае войска, якое пераважна складалася з наймітаў. Рэформы Густава II Адольфа закранулі многія сферы ваеннай справы. Быў зменшаны калібр мушкетаў і іх вага, што дазволіла жаўнерам весці стральбу з рук. Былі ўведзены папяровыя патроны, што павялічыла хуткастрэльнасць пяхоты. Гэтыя новаўвядзенні дазволілі зменшыць колькасць шэрагаў у баявым пастраенні мушкецёраў з 10, як гэта практыкавалася ў Нідэрландах, да 6. Шэрагі маглі страляць залпамі па чарзе, а ў выпадку крытычнага набліжэння непрыяцеля яны маглі здвойвацца, што дазваляла ўсім мушкецёрам разам даць залп. Па ўзоры галандцаў шведы ў палявых бітвах актыўна выкарыстоўвалі гарматы, вага якіх была зменшана, а калібр стандартызаваны (3 ці 6 фунтаў). Сквадрону шведскай пяхоты, які быў аналагам галандскага батальёна, дадаваліся 2 гарматы, а пазней 3. Паводле практыкі ранейшых часоў частка пяхоты была ўзброена пікамі і павінна была абараняць стралкоў ад ўдару кавалерыі. Іх ставілі ў цэнтры пяхотнага фармавання[116].

Новаўвядзенні, зробленыя пры Густаве II Адольфе ва ўзбраенні і арганізацыі арміі, прывялі да змены тактыкі вядзення бою. У час Трыццацігадовай вайны шведы пачалі практыкаваць лінейную пабудову арміі падчас бітваў. Пры гэтым пяхота з артылерыяй займалі цэнтр, а кавалерыя ставілася па флангах і павінна была прыкрываць дзеянні пяхоты. Перавагай лінейнай пабудовы была высокая шчыльнасць агню, а таксама магчымасць эфектыўнага кіравання і хуткага манеўравання асобнымі падраздзяленнямі і арміяй у цэлым. Так была закладзена аснова лінейнай тактыкі, якая панавала ў еўрапейскім ваенным мастацтве да XIX ст.

Дзякуючы рэформам шведская армія набыла вялікую магутнасць праломвання непрыяцельскіх шэрагаў і паступова перайшла ад абарончай тактыкі вядзення бітваў да наступальнай[117]. Гэта спрыяла падтрыманню высокага бая-

[116] *Ternsmeden L.* Organizacja bojowych i administracyjnych jednostek szwedzkich i rozwój taktyki walki w XVII wieku (do około 1680 roku) // SMHW. 1978. T. 21. S. 315–327.

[117] Ibidem. S. 322–327.

вога духу арміі. У выніку шведская армія стала адной з найбольш баяздольных і магутных у Еўропе. Найлепш гэта бачна на прыкладзе ваеннага супрацьстаяння з Рэччу Паспалітай. Калі ў 1605 г. войска Рэчы Паспалітай змагло разбіць у тры разы большую шведскую армію, дык праз паўстагоддзі – у час вайны 1655–1660 гг. – польска-літоўскія сілы, нават пры ўмове колькаснай перавагі, не маглі перамагчы шведаў ні ў адной значнай бітве ў адкрытым полі.

Стварэнне магутнай і баяздольнай арміі зрабіла Швецыю ў першай палове XVII – пачатку XVIII ст. наймацнейшай дзяржавай Паўночна-Усходняй Еўропы, якая ставіла перад сабой амбітную задачу пераўтварэння Балтыйскага мора ва ўнутраную акваторыю. Ваенная перавага прывяла да таго, што гэтая скандынаўская краіна з адносна невялікім насельніцтвам і рэсурсамі змагла адсунуць на другі план Рэч Паспалітую і Расію, дэмаграфічны і эканамічны патэнцыял якіх быў у некалькі разоў большы. Разам з тым утрыманне шматлікай баяздольнай арміі Швецыяй было немагчыма без шэрагу рэформ унутры дзяржавы. Дакладней разбудова і ўдасканаленне арміі суправаджаліся зменамі ў палітычнай і эканамічнай сферах: умацоўвалася цэнтральная улада, пабудоваўся бюракратычны апарат, абмяжоўваліся прывілеі дваранства і інш. У гэтым і ёсць сутнасць канцэпцыі ваеннай рэвалюцыі, узорным прыкладам ажыццяўлення якой лічыцца Швецыя.

Да канца XVII ст. узбраенне пяхоты зазнала шэраг змен: жаўнеры перайшлі да выкарыстання стрэльбаў з крамянёвымі замкамі і багінетамі, якія насаджваліся на ствалы стрэльбаў. Гэтыя, як можа падацца, сціплыя тэхнічныя вынаходніцтвы аказалі сур'ёзны ўплыў на ваенную справу.

Крамянёвы замок быў вынайдзены яшчэ ў пачатку XVII ст. Запальванне зарада ў ім адбывалася праз удар крэменю, замацаванага ў курку, аб жалезную плоскасць, ці батарэю. Гэты замок быў больш зручны, чым кнотавы замок, аднак разам з тым даражэйшы ў вытворчасці, таму першапачаткова яго выкарыстоўвалі даволі абмежавана, напрыклад, у паляўнічых стрэльбах. Аднак наладжванне буйнымі еўрапейскімі дзяржавамі масавай вытворчасці зброі дазволіла прымяніць яго для патрэб армій. Напрыклад, у Швецыі пры Густаве II Адольфе было адчынена 7 мануфактур, якія забяспечвалі армію мушкетамі. У час Вялікай Паўночнай вайны яны выпускалі ад 2 да 10 тыс. стрэльбаў штогод. У апошняй чвэрці XVII ст. самыя перадавыя еўрапейскія дзяржавы здолелі ўзброіць свае арміі крамянёвымі мушкетамі, якія сталі асноўнай зброяй Вялікай Паўночнай вайны. Ужыванне мушкетаў з крамянёвымі замкамі дазволіла павялічыць хуткасць стральбы пяхоты, паколькі для перазарадкі патрабавалася менш аперацый, а значыць, і менш часу. Пры гэтым адсутнасць палаючага кноту дазволіла зрабіць шэрагі больш цеснымі. У выніку колькасць шэрагаў у баявым пастраенні мушкецёраў была зменшана да 4, а пазней да 3 чалавек[118].

Багінет уяўляў сабой жалезны штык, які замацоўваўся на дуле стрэльбы, што дазваляла выкарыстоўваць апошнюю ў якасці кап'я. Першапачаткова вы-

[118] *Shawalter D.* Gunpowder and Regional Military Systems. P. 72–73.

карыстоўваўся шпунтавы багінет, які ўстаўляўся ў дула. Але пазней перайшлі да насадачнага багінета, які быў больш зручны, бо яго не трэба было здымаць для вядзення стральбы. Узбройваць багінетамі пяхоту пачалі ў канцы XVII ст., што прывяло да паступовай адмовы ад выкарыстання пікі. Узброены крамянёвым мушкетам з багінетам жаўнер сімвалізаваў завяршэнне ваеннай рэвалюцыі ў Еўропе.

Адным з мацнейшых рухавікоў ваеннай рэвалюцыі было развіццё фартыфікацыі. Значны прагрэс артылерыі і ручной агняпальнай зброі ў канцы XV – пачатку XVI ст. прывёў да таго, што познесярэднявечная абарончая архітэктура страціла сваю актуальнасць. У сувязі з гэтым у еўрапейскіх краінах пачаліся інтэнсіўныя пошукі новых тыпаў умацаванняў, якія б, з аднаго боку, давалі магчымасць забяспечыць абарону ад агняпальнай зброі, а з іншага, былі прыдатныя для яе выкарыстання. У выніку ў Італіі ў XVI ст. былі вынайдзены прынцыпы бастыённай фартыфікацыі (так званы *trace italienne*), якая ў далейшым распаўсюдзілася па ўсёй Еўропе і захоўвала сваю актуальнасць да XIX ст. На беларускіх землях развіты комплекс бастыённых умацаванняў набылі важнейшыя рэзідэнцыя Радзівілаў у Нясвіжы і Слуцку.

Умацаванні, узведзеныя паводле *trace italienne*, дазвалялі весці эфектыўную абарону з дапамогай артылерыі і ручной агняпальнай зброі, і іх было няпроста здабыць. У такіх умовах абаронцы атрымалі перавагу, а здабыванне фартэцый ускладнілася. Гэта стымулявала пераход да армій новага тыпу, якія былі добра арганізаваны і маглі весці аблогу дастаткова доўгі час. Акрамя таго, такая вайна вымагала ўдзелу спецыялістаў і вайсковых інжынераў высокага класу, а значыць, спрыяла прафесіяналізацыі і павышэнню тэхнічнага ўзроўню армій. Адначасова колькасць адукаваных афіцэраў і інжынераў значна павялічыла і кошты ўтрымання войска[119].

У выніку станаўлення новых армій, забяспечаных кваліфікаванымі ваеннымі спецыялістамі і кіроўнымі кадрамі, у XVII ст. былі распрацаваны прынцыпы вядзення рэгулярнай аблогі фартэцый. Найбольшы ўнёсак у гэта зрабіў знакаміты французскі інжынер другой паловы XVII – пачатку XVIII ст. Себасцьен Ле Прэтр дэ Вабан. Паказальным з'яўляецца той факт, што Вабан, які дасягнуў дасканаласці ў распрацоўцы прынцыпаў вядзення аблогі, сам спраектаваў і пабудаваў значную колькасць фартэцый. Але і яны не маглі вытрымаць аблогі, калі тую вялі добра падрыхтаваныя і забяспечаныя вайсковыя злучэнні. Фактычна фартэцыі маглі толькі нейкі час стрымліваць непрыяцеля, пакуль палявая армія не здолее зняць аблогу ці рэалізаваць некую іншую стратэгічную аперацыю. У выпадку адсутнасці надзеі на дапамогу абарона страчвала свой сэнс. Менавіта таму ва ўмовах адсутнасці значных ваенных сіл у Рэчы Паспалітай падчас Вялікай Паўночнай вайны не было магчымасці выкарыстаць патэнцыял магутных бастыённых умацаванняў. Наколькі істотна змяніліся ўмовы функцыянавання фартэцый, ілюструе прыклад мацнейшай

[119] *Landers J.* The Destructiveness of Pre-Industrial Warfare: Political and Technological Determinants // Journal of Peace Research. Vol. 42. No. 4. 2005. P. 459–460.

радзівілаўскай рэзідэнцыі – Слуцка. У 1655 гг. да горада двойчы падыходзіла шматтысячнае расійска-казацкае войска, якое, аднак, не наважылася на адкрыты штурм. А напачатку XVIII ст. слуцкі гарнізон ужо не спрабаваў даць адпор сучасным арміям Расіі і Швецыі.

Артылерыя з'яўлялася адным з ключавых фактараў, які ўплываў на змены ў фартыфікацыі. Таму яе развіццю надавалася значная ўвага. У прыватнасці, распрацоўваліся розныя тыпы снарадаў для гармат. Найбольш распаўсюджанымі былі ядры і бомбы. Радзей ужываліся запальныя снарады. У сярэдзіне XVII ст. пашырыліся ручныя гранаты, якія маглі вырабляцца з жалеза, гліны ці шкла. Пры гэтым шкляныя гранаты лічыліся антыгуманнай зброяй, бо пасля жахлівых раненняў шклянымі аскепкамі жаўнераў было вельмі цяжка выратаваць. Гэта прывяло да паступовай адмовы ад гэтага віду гранат. Іх выкарыстоўвалі пераважна пры абароне і штурме ўмацаванняў. Развіццё артылерыі і фартыфікацыі патрабавала дасведчаных спецыялістаў. Гэта стымулявала пашырэнне адукацыі, а таксама павелічэнне інтарэсу да прыродазнаўчых навук (матэматыкі, фізікі). Характэрным для эпохі ранняга Новага часу сталі кнігі, прысвечаныя артылерыі і фартыфікацыі. Адной з найбольш папулярных у Еўропе была праца нашага земляка Казіміра Семяновіча, выдадзеная на лацінскай мове ў 1650 г. у Амстэрдаме.

Вельмі выразнай тэндэнцыяй ранняга Новага часу стала павелічэнне памераў армій. Гэта было звязана з узрастаннем ролі пяхоты, а ўтрыманне пешых жаўнераў каштавала менш за ўтрыманне кавалерыі. Магчымасць для ўзбуйнення армій стварала таксама практыка рэкруцкага набору, якая была ўведзена ў многіх еўрапейскіх краінах. Найбольшых памераў сярод еўрапейскіх пастаянных армій дасягнула французская. На апошнім этапе Трыццацігадовай вайны, у 1635–1648 гг., у ёй служыла 125 тыс. чалавек, а пасля рэформ Людовіка XIV у час Вайны Аўгсбургскай лігі (1688–1697) – 340 тыс.[120] Падчас Трыццацігадовай вайны армія Швецыі, якая дзейнічала на тэрыторыі Свяшчэннай Рымскай імперыі, дасягнула 125 тыс. жаўнераў (каля паловы складалі найміты з самых розных еўрапейскіх краін). Гэтага ўдалося дасягнуць дзякуючы ўтрыманню жаўнераў за кошт нямецкіх зямель, у якіх яны стаялі. Пазней шведская армія па прычыне абмежаваных рэсурсаў самой Швецыі была зменшана. Толькі на пачатковым этапе Вялікай Паўночнай вайны яна зноў дасягнула 110 тыс. чалавек[121]. Дзякуючы вялікім рэсурсам значную армію магла ўтрымліваць Расія. У 1675–1678 гг. у расійскай арміі служыла 130 тыс. жаўнераў, а на пачатковым этапе Вялікай Паўночнай вайны – 200 тыс.[122]

Зусім своеасаблівым быў выпадак Рэчы Паспалітай. У 1659 г. Польшча і ВКЛ разам мабілізавалі 54 тыс. жаўнераў[123]. Гэтыя сілы з цяжкасцю маглі

---

[120] *Lynn J. A.* The French Army, 1610–1715. Cambridge, 1997. P. 55.

[121] *Frost R.* Potop a teoria rewolucji militarnej. S. 161.

[122] *Luh J.* Kriegskunst in Europa 1650–1800. Köln, 2004. S. 17.

[123] *Nagielski M.* Koncepcje prowadzenia działań przeciwko Szwedom w dobie potopu w latach 1655–1660 // Z dziejów stosunków Rzeczypospolitej Obojga Narodów ze Szwecją w XVII wieku / red. M. Nagielski. Warszawa, 2007. S. 174.

супрацьстаяць арміям Швецыі і Расіі. З-за адсутнасці змен у сістэме кіравання краіны далейшае ўзмацненне і разбудова арміі аказаліся немагчымымі. Гэта было асабліва заўважна ў пачатку Вялікай Паўночнай вайны, калі невялікая армія краіны не мела магчымасці істотным чынам паўплываць на ход вайны.

Тэндэнцыя да ўзбуйнення армій, якая ахапіла еўрапейскія краіны ў ранні Новы час, стала сур'ёзным выпрабаваннем для іх фінансавых сістэм. На працягу XVII ст. еўрапейскія дзяржавы не змаглі стварыць дзейсныя механізмы фінансавання і забеспячэння армій[124]. Найбольш зручным выхадам у такіх умовах быў перанос цяжару ўтрымання жаўнераў на насельніцтва тэрыторый, на якіх вяліся баявыя дзеянні. Паслядоўна гэтым спосабам здабывання сродкаў на патрэбы войска ў XVII – пачатку XVIII ст. карысталіся шведы. Менавіта накладанне вялікіх кантрыбуцый на насельніцтва нямецкіх зямель у час Трыццацігадовай вайны дазволіла Швецыі ўтрымліваць армію ў больш чым 100 тыс. чалавек.

З іншага боку, прыклад Рэчы Паспалітай вельмі добра ілюструе маштаб фінансавых праблем, з якімі сутыкаліся дзяржавы ранняга Новага часу ў сувязі з ваеннымі дзеяннямі. У сярэдзіне XVII ст. войны, якія ішлі на тэрыторыі Рэчы Паспалітай, прывялі да велізарных спусташэнняў і змяншэння падаткаў з насельніцтва. Становішча ўскладнялася доўгай працэдурай зацвярджэння, якая праходзіла праз сойм, і цяганінай у зборы падаткаў з-за неэфектыўнай бюракратыі. У выніку заробкі выплочваліся жаўнерам несвоечасова і не ў поўным памеры, што падрывала баяздольнасць войскаў і было адной з прычын ваенных няўдач. Фактычна дзяржаўны лад, які існаваў у краіне, не дазваляў перайсці да ўтрымання пастаяннай арміі новага тыпу.

Утрыманне пастаяннай баяздольнай арміі паглынала значныя матэрыяльныя рэсурсы, таму еўрапейскія дзяржавы паступова мяняліся. Умацаванне ўлады манарха дазваляла рэфармаваць і разбудоўваць сістэму збору падаткаў для забеспячэння жаўнераў. Дзяржаўны бюракратычны апарат значна разросся і ўмацаваўся, што забяспечыла больш эфектыўнае кіраванне краінай. Змянялася і вайсковая адміністрацыя. Такім чынам, усе інструменты кіравання былі фармальна засяроджаны ў руках манарха, які ўвасабляў у сабе дзяржаўную сістэму.

У эпоху абсалютызму, якая пачалася ў Еўропе ў другой палове XVII ст., ранейшых жаўнераў-наймітаў, што ваявалі за грошы, паступова замяніла дысцыплінаваная пастаянная армія. Яна складалася з рэкрутаў пастаянных ці часовых палкоў, якіх набіралі як на тэрыторыі ўласнай дзяржавы, так і за яе межамі. Усе яны давалі прысягу свайму палку, палкавому сцягу і манарху. Адным з характэрных атрыбутаў сталых армій стала аднастайная ўніформа, увядзенне якой акрамя практычнай карысці мела таксама сімвалічнае значэнне і спрыяла ўмацаванню субардынацыі і дысцыпліны ў войску.

Лакаматывам ваеннай рэвалюцыі ў Паўночна-Усходняй Еўропе была Швецыя, войны з якой стымулявалі рэформы ў Рэчы Паспалітай і Расіі. Аднак

[124] *Frost R.* Potop a teoria rewolucji militarnej. S. 151.

гэтыя краіны ўяўлялі сабой пэўны феномен. Іх палітычныя і ваенныя эліты выдатна разумелі перавагі еўрапейскага ваеннага мастацтва і імкнуліся пераймаць яго дасягненні. Доўгі час гэтак дзейнічала Рэч Паспалітая, што дазваляла ёй да сярэдзіны XVII ст. паспяхова супрацьстаяць Расіі. Аднак асаблівасць ваеннага тэатру Усходняй Еўропы, які характарызаваўся малой шчыльнасцю засялення і слабай урбанізаванасцю, а таксама неабходнасць вядзення войнаў з Турцыяй, наклалі значны адбітак на развіццё ваеннай справы ў абедзвюх краінах. У выпадку Рэчы Паспалітай значны ўплыў аказала таксама спецыфіка грамадска-палітычнага ладу, што перашкодзіла ўмацаванню ўлады манарха і з'яўленню ў краіне вялікай баяздольнай арміі. У той час як у Расіі, дзе ўлада цара традыцыйна была моцнай, комплекс рэформ паводле ўзору дзяржаў Заходняй Еўропы ўдалося рэалізаваць у другой палове XVII – пачатку XVIII ст.

Пры Пятры I Расія выступіла ў Вялікай Паўночнай вайне супраць наймацнейшай дзяржавы рэгіёна таго часу – Швецыі. Таму многія рэформы, якія праводзіў расійскі цар, фактычна былі падпарадкаваны мэтам гэтага вайсковага супрацьстаяння. Паводле ўзору еўрапейскіх краін была створана вялікая армія, заснаваная на рэкруцкай сістэме. Па баяздольнасці яна першапачаткова значна саступала шведскай арміі, што засведчыла паражэнне расійскіх войскаў пад Нарвай у 1700 г. Аднак паглыбленне рэформ, вайсковы вопыт і далейшая рэарганізацыя арміі дазволілі змяніць сітуацыю. Вынікамі недаацэнкі Карлам XII патэнцыялу рэфармаванай расійскай арміі стаў разгром шведаў пад Палтавай у 1709 г. Дзейнасць Пятра I яскрава сведчыць, што для стварэння і забеспячэння магутнай арміі патрабавалася правядзенне комплексу рэформ. Цар удасканаліў сістэму цэнтральнага і тэрытарыяльнага кіравання, правёў адукацыйную рэформу і стымуляваў развіццё прамысловасці. Дзве апошнія ініцыятывы былі напрамую звязаны з арміяй, якой патрабаваліся кваліфікаваныя ваенныя спецыялісты, шмат зброі і рыштунку. Цікава, што Пётр I асабіста вывучаў сістэму кіравання многіх еўрапейскіх краін, але найбольш абапіраўся на вопыт свайго галоўнага праціўніка – Швецыі[125]. Тагачасная расійская армія пераняла нават шведскую тактыку вядзення бою[126]. Сімвалічным стаў тост расійскага цара, які на застоллі ў гонар перамогі ў Палтаўскай бітве ўзняў келіх «за здароўе настаўнікаў – за шведаў». У выніку Вялікай Паўночнай вайны Швецыя саступіла першае месца ў Паўночна-Усходняй Еўропе Расіі, якая, валодаючы значна большымі рэсурсамі, здолела рэалізаваць праграму рэформ і правесці пераўтварэнні паводле дасягненняў ваеннай рэвалюцыі ў Еўропе.

Канцэпцыя ваеннай рэвалюцыі добра тлумачыць прычыны заняпаду Рэчы Паспалітай, адной з буйнейшых еўрапейскіх дзяржаў ранняга Новага

---

[125] *Баггер Х.* Реформа Петра Великого в России // Царь Петр и король Карл. Два правителя и их народы / науч. ред. А. С. Кан. М., 1999. С. 121–155.

[126] *Artéus* G. Szwedzka taktyka walki podczas wielkiej wojny północnej // SMHW. T. XXI. 1978. S. 356–357.

часу. Вядома, што канфлікты звычайна з'яўляюцца крыніцай, інструментам і штуршком для перамен. Негатыўныя наступствы, якія прынеслі войны сярэдзіны XVII – пачатку XVIII ст., былі праявай глыбокага палітычнага, эканамічнага і духоўнага крызісу гэтай дзяржавы і маглі стаць імпульсам для маштабных пераўтварэнняў. Аднак гістарычны шанец быў змарнаваны. Парадаксальным чынам эпоха еўрапейскага тэхналагічнага, эканамічнага і культурнага ўздыму, глыбокіх сацыяльных і палітычных пераўтварэнняў стала часам поўнага заняпаду Рэчы Паспалітай. У пачатку XVIII ст. краіна трапіла ў такую ступень залежнасці ад Расійскай імперыі, што была не ў стане эфектыўна правесці неабходныя рэформы, а ў канцы гэтага стагоддзя была падзеленая паміж суседзямі і цалкам знікла з палітычнай карты Еўропы. Гэта наклала істотны адбітак на ўмовы існавання ўмацаваных рэзідэнцый Радзівілаў. Калі ў канцы XVI – другой палове XVII ст. яны з'яўляліся важным складнікам сістэмы абароны дзяржавы, дык напачатку Вялікай Паўночнай вайны ва ўмовах крызісу вайсковай справы ў Рэчы Паспалітай яны не маглі адыграць колькі-небудзь значнай ролі ў абароне краіны. У новых умовах нават самыя заможныя магнаты не былі здольны ўзводзіць і забяспечваць умацаванні, якія б маглі супрацьстаяць мадэрнізаваным арміям абсалютысцкіх дзяржаў.

2.3. Афармленне зямельных латыфундый Радзівілаў

У XVI–XVIII стст. вялікія зямельныя ўладанні з'яўляліся адной з асноўных перадумоў для захавання высокіх пазіцый сярод палітычнай эліты ВКЛ, а таксама ў яго дзяржаўнай структуры. Узвышэнне па дзяржаўнай лесвіцы аднаго з прадстаўнікоў роду давала яму магчымасць сканцэнтраваць у сваіх руках зямельную ўласнасць, якая ў далейшым станавілася эканамічным падмуркам для нашчадкаў. Прыбыткі з зямельных уладанняў давалі магчымасць для падтрымання высокага статусу ў грамадстве і выканання дзяржаўных абавязкаў, якія патрабавалі значных выдаткаў. У сваю чаргу, забеспячэнне абароны зямельных латыфундый, іх дэмаграфічнага і эканамічнага патэнцыялу было важнейшай прычынай, якая інспіравала будаўніцтва і ўтрыманне ўмацаванняў. Пры гэтым від умацавання і ўзровень яго абароназдольнасці ў значнай ступені залежалі ад памераў і значэння паселішча і зямельнага комплексу, цэнтрам якога яно было. Таму для вывучэння практыкі абарончага будаўніцтва Радзівілаў найперш засяродзімся на працесе фарміравання зямельных латыфундый роду.

Пачынаючы з сярэдзіны XV ст. многія княжацкія і баярскія роды сталі на шлях стварэння вялікіх зямельных латыфундый. Фармальна гэта дазваляў прывілей Ягайлы 1387 г., паводле якога феадалы каталіцкага веравызнання атрымалі права валодання зямельнай уласнасцю. Пазней гэтае права было пашырана і на феадалаў праваслаўнага веравызнання. Працэс стварэння вялікіх магнацкіх латыфундый набыў шырокі размах у першай палове XVI ст.

і ў асноўным завяршыўся ў час кіравання Жыгімонта II Аўгуста[127]. Паводле падлікаў Е. Ахманьскага, калі напрыканцы XIV ст. пад уладай вялікага князя знаходзілася да 80 % насельніцтва, дык да 1528 г. гэтая лічба зменшылася да 30 %[128].

Галоўным шляхам пераходу зямлі ў валоданне прыватных асоб былі вялікакняжацкія наданні за выслугі. Права набываць і прадаваць зямлю доўгі час было абмежавана неабходнасцю атрымання дазволу гаспадара ці яго прадстаўніка, а таксама лімітам на продаж зямлі: дазвалялася прадаваць і даравацъ толькі трэцюю частку родавых ці набытых зямель. Статутам ВКЛ 1566 г., а таксама папраўкамі, унесенымі ў яго ў тым жа годзе на Берасцейскім сойме, гэтыя абмежаванні былі ліквідаваны[129]. Гэта стварыла перадумовы для маштабнага пераразмеркавання зямель сярод магнацкіх родаў і стварэння вялізных прыватных латыфундый. У выніку ў ВКЛ на працягу XV–XVIII стст. сфарміравалася адносна невялікая група заможных магнацкіх родаў, якія з апорай на агромністыя зямельныя латыфундыі дамінавалі на палітычным алімпе дзяржавы. Адным з найбольш паспяховых сталі Радзівілы, якія здолелі сканцэнтраваць у сваіх руках значную зямельную ўласнасць.

Пачынальнікам роду Радзівілаў лічыцца віленскі кашталян Крысцін Осцік (памёр у 1442). Родавым маёнткам Осціка былі Даўклебішкі над ракой Дукштай. Вотчынныя маёнткі яго бацькі даследчыкі лакалізуюць у ваколіцах Кернавы[130]. Сын Осціка Радзівіл (памёр у 1477 г.), які даў імя роду, напрыканцы жыцця займаў пасады віленскага кашталяна і троцкага ваяводы. Высокая пазіцыя ў грамадстве і прыхільнасць гаспадара далі яму магчымасць павялічыць свае зямельныя ўладанні. Яго асноўныя землі былі сканцэнтраваны ў так званай Завілейскай Літве (паўночна-ўсходняй частцы сучаснай Літвы). Толькі асобныя маёнткі Радзівіла Осцікавіча знаходзіліся на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Акрамя таго, у тым жа рэгіёне магнат атрымаў ад вялікага князя у часовае трыманне тры воласці, што, на думку М. Мальчэўскай, сведчыць аб мэтанакіраванай палітыцы па збіранні зямель у Завілейскай Літве[131]. Сама практыка атрымання наданняў, за кошт якіх феадалы атрымлівалі новыя землі ад вялікага князя, верагодна, спрыяла збіранню маёнткаў у пэўным рэгіёне.

---

[127] *Malczewska M.* Latyfundium Radziwiłłów w XV do połowy XVI wieku. S. 5; *Alexandrowicz S.* Studia z dziejów miasteczek Wielkiego Księstwa Litewskiego. S. 31; *Petrauskas R.* Fürsten und Grafen des Heiligen Römischen Reiches: die litauischen Hochadeligen und ihre römischen Titel im Kontext des Wiener Fürstentags // Das Wiener Fürstentreffen von 1515. Beiträge zur Geschichte der habsburgisch-jagiellonischen Doppelvermählung / hrsg. B. Dybaś, I. Tringli. Budapest, 2019. S. 216.

[128] *Ochmański J.* Historia Litwy. Wrocław, 1967. S. 85.

[129] *Dąbkowski P. R.* Dobra rodowe i nabyte w prawie litewskim od XIV do XVI wieku. Lwów, 1916. S. 106.

[130] *Semkowicz W.* O litewskich rodach bojarskich zbratanych ze szlachtą polską w Horodle r. 1413 // Rocznik Towarzystwa Heraldycznego we Lwowie. 1920. T. 5. S. 43–45; *Wasilewski T.* Pochodzenie rodu Radziwiłłów-Ościków // MHA. 1997. T. VII. S. 15–17; *Malczewska M.* Latyfundium Radziwiłłów w XV do połowy XVI wieku. S. 44–45; *Пятраўскас Р.* Літоўская знаць у канцы XIV – XV ст.: склад – структура – улада. Смаленск, 2014. С. 214.

[131] *Malczewska M.* Latyfundium Radziwiłłów w XV do połowy XVI wieku. S. 50.

На думку П. Дабкоўскага, кандыдаты на атрыманне наданняў самі звярталіся да гаспадара з просьбай, на што атрымлівалі альбо згоду, альбо адмову[132]. Такім чынам, маючы прыхільнасць з боку вялікага князя феадал мог разлічваць на пашырэнне зямельнай уласнасці ў пэўнай мясцовасці.

Мікалай I Радзівіл па мянушцы Стары (памёр у 1510 г.) быў адзіным сынам Радзівіла Осцікавіча, таму атрымаў усю спадчыну бацькі. У 1491 г. ён заняў пасады канцлера і віленскага ваяводы і амаль два дзесяцігоддзі знаходзіўся на вяршыні ўладнай іерархіі ВКЛ. За гэты час, у тым ліку праз удалыя шлюбы, ён значна павялічыў свае ўладанні. Маёнткі Мікалая I Радзівіла былі сканцэнтраваны ў асноўным у Завілейскай Літве і Ашмяншчыне. У іх налічвалася 2945 дымоў[133]. Свае землі магнат перадаў тром сваім сынам: Мікалаю II, Яну I і Юрыю I.

Акрамя спадчынных зямель у рукі Мікалая II Радзівіла (1470–1521 гг.) па мянушцы amor Poloniae (лац. 'прыхільнік Польшчы'), які пасля смерці бацькі ў 1510 г. заняў пасады канцлера і віленскага ваяводы, перайшла надзвычай вялікая «фартуна» праз жонку Эльжбэту, дачку і адзіную спадчынніцу троцкага ваяводы Багдана Андрэевіча Саковіча. Гэтая спадчына складала прыблізна 4160 дымоў. Сярод гэтых маёнткаў быў Мядзел з замкам, заснаваным Багданам Саковічам[134]. У далейшым, карыстаючыся прыхільнасцю Жыгімонта I Старога, Мікалай II Радзівіл праз наданне атрымаў вялізныя землі на Падляшшы з замкамі ў Райгарадзе, Гонядзі і Ваневе, а таксама Хоўхлу разам з Пячкоўскім дваром, дзе пазней паўстаў замак. На аснове гонядзка-райгародскіх маёнткаў магнату ўдалося стварыць трывалы зямельны дамен для нашчадкаў. У 1517 г. Жыгімонт I Стары выдаў прывілей, якім гарантаваў шырокі імунітэт уладальніку гонядзка-райгарадскіх маёнткаў і яго спадчыннікам. Гэтым прывілеем «гонядзка-райгародскае гаспадарства» і яго падданыя вызваляліся ад судоў і падпарадкавання мясцовым ураднікам, а таксама ад падаткаў і вайсковай службы ў павятовай харугве[135]. З планамі ўмацавання пазіцый роду былі звязаны клопаты Мікалая II Радзівіла аб атрыманні княжацкага тытула, які быў яму нададзены ў 1518 г. імператарам Свяшчэннай Рымскай імперыі Максіміліянам I на ўладаннях у Гонядзі і Мядзеле[136]. Аднак «гоняндзка-райгарадскае гаспадарства» праіснавала нядоўга, бо гэтая галіна роду ў хуткім часе абарвалася.

Другі сын Мікалая I Радзівіла Старога Ян I (1474–1522) па мянушцы Барадаты, які пры канцы жыцця займаў пасаду маршалка земскага, пасля падзелу

---

[132] *Dąbkowski P. R.* Dobra rodowe i nabyte w prawie litewskim od XIV do XVI wieku. S. 36–37.

[133] *Malczewska M.* Latyfundium Radziwiłłów w XV do połowy XVI wieku. S. 50.

[134] *Волкаў М. А., Плавінскі М. А.* Мядзельскі замак у святле пісьмовых і археалагічных крыніц // Архіварыус. Мінск, 2015. Вып. 13. С. 86.

[135] *Malczewska M.* Latyfundium Radziwiłłów w XV do połowy XVI wieku. S. 65; *Maroszek J.* Pogranicze Litwy i Korony w planach króla Zygmunta Augusta: z historii dziejów realizacji myśli monarszej między Niemnem a Narwią. Białystok, 2000. S. 72; *Скеп'ян Н.* Закладанне родавых традыцый на прыкладзе Мікалая Мікалаевіча Радзівіла // Arche. 2015. № 6 (139). С. 21–23.

[136] *Petrauskas R.* Fürsten und Grafen des Heiligen Römischen Reiches: die litauischen Hochadeligen und ihre römischen Titel im Kontext des Wiener Fürstentags. S. 214–219.

маёнткаў 1520 г. атрымаў у спадчыну землі, большасць якіх ляжала ў Завілейскай Літве. Праз удалыя шлюбы ён набыў маёнткі на Наваградчыне, у Менскім, Браслаўскім і Мазырскім паветах. Сярод найбольш каштоўных набыткаў былі Нясвіж і Алыка, у якіх ужо існавалі замкі. У далейшым яны сталі галоўнымі рэзідэнцыямі нясвіжскай галіны роду.

Трэці сын Мікалая I Радзівіла Юрый I (1480–1541) па мянушцы Геркулес, які з 1531 г. займаў пасаду вялікага гетмана ВКЛ, да бацькоўскіх зямель далучыў маёнткі ў Гарадзенскім, Віленскім, Лідскім і Ашмянскім паветах. Усяго на набыццё новых маёнткаў магнат, паводле падлікаў М. Мальчэўскай, выдаткаваў 8498 ½ коп літоўскіх грошаў. Для параўнання найбагацейшы чалавек краіны канцлер ВКЛ і віленскі ваявода Альбрэхт Гаштольд выдаткаваў на тыя ж мэты 6800 коп літоўскіх грошаў[137]. Ад бацькі Юрый I атрымаў Біржы і Дубінкі, у якіх былі заснаваны дзве галоўныя рэзідэнцыі біржанскай галіны роду.

Сыны Юрыя I і Яна I Радзівілаў, адпаведна Мікалай IV (1512–1584) па мянушцы Руды і Мікалай V (1515–1565) па мянушцы Чорны, абапіраючыся на значныя зямельныя надзелы, сфарміраваныя іх бацькамі, а таксама на прыхільнасць гаспадара здолелі яшчэ больш узмацніць пазіцыі свайго роду. Надзвычай вялікі ўплыў Радзівілаў пятага пакалення быў звязаны з іх асабістымі сувязямі з сынам Жыгімонта I Старога маладым каралевічам Жыгімонтам. У 1550 г. сястра Мікалая Радзівіла Рудога Барбара пабралася шлюбам з Жыгімонтам II Аўгустам і пазней была каранавана. Парадненне з манаршым родам разам з вялікім уплывам на самога вялікага князя вывела братоў Радзівілаў у вышэйшы ранг ва ўладнай іерархіі ў параўнанні з іншымі літоўскімі і польскімі магнатамі. Тады ж Мікалай Радзівіл Руды атрымаў пасаду вялікага гетмана ВКЛ, а Мікалай Радзівіл Чорны – пасаду канцлера ВКЛ.

З другой чвэрці XVI ст. практыка шырокай раздачы зямель у ВКЛ была абмежавана, а павелічэнне зямельнай уласнасці для магнатаў стала магчымым шляхам атрымання зямель праз шлюб ці куплю. Тым не менш, нягледзячы на скарачэнне памераў гаспадарскіх уладанняў, вялікі князь працягваў надаваць Радзівілам землі. Так, у 1550 г. Мікалай Радзівіл Руды атрымаў ад вялікага князя Койданава з мураваным замкам, будаўніцтва якога было распачата яшчэ пры Гаштольдах[138]. Годам пазней, Мікалаю Радзівілу Чорнаму было нададзена Клецкае і Давыд-Гарадоцкае княствы, якія прылягалі да яго нясвіжскіх уладанняў. У Клецку і Давыд-Гарадку на той час ужо меліся драўляныя замкі. Канчаткова гэтыя ўладанні перайшлі ў валоданне сыноў Мікалая Радзівіла Чорнага ў 1558 г.[139] Такім чынам, на прыкладзе першых пяці пакаленняў Радзівілаў выразна бачна імкненне да збірання зямель, што было выклікана імкненнем прадстаўнікоў роду да замацавання свайго высокага статусу сярод палітычнай эліты ВКЛ.

---

[137] *Malczewska M.* Latyfundium Radziwiłłów w XV do połowy XVI wieku. S. 82–92.

[138] *Феранц М.* Каралева і яе брат: адносіны Барбары Радзівіл з Мікалаем Радзівілам Рудым // Arche. 2015. № 6 (139). С. 41–42.

[139] *Скеп'ян А. А.* Дзве ардынацыі – два цэнтры: Клецк і Нясвіж // Мікалай Радзівіл Чорны (1515–1565 гг.): палітык, дыпламат, мецэнат. Нясвіж, 2016. С. 141.

Своеасаблівым адказам на дазвол неабмежаванага продажу зямель, які мог прывесці да страты пазіцый роду, можна лічыць з'яўленне ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай у канцы XVI ст. новай прававой практыкі маярату, ці ардынацыі. Ардынацыямі (ад лац. *ordinatio* – закон, устава, статут) у Рэчы Паспалітай называлі своеасаблівы прававы інстытут, які звязваў пэўныя маёнткі, як непадзельную і непазбывальную цэласнасць, з пэўным родам. Юрыдычнай сутнасцю ардынацыі было забеспячэнне для акрэсленага кола нашчадкаў трывалай маёмаснай базы, якую забаранялася дзяліць. Усталяванне адзінага спадчынніка (ардыната) ішло паводле першародства, ці *primogenitur* (лац. 'прынцып перадачы маёнтку паводле блізкасці крыві і старшынства лініі'). Пры гэтым жанчыны выключаліся з права атрымання спадчыны, каб маёмасць не пераходзіла да іншых родаў. У выпадку адсутнасці нашчадка мужчынскага полу ардынацыя пераходзіла да іншых адгалінаванняў роду. Галоўнай мэтай заснавання ардынацыі было стварэнне асновы для захавання значэння і высокіх пазіцый роду ў доўгай перспектыве. Стварэнне ардынацыі фактычна значыла выманне пэўных маёнткаў з-пад агульнага права, на што патрэбна была згода вышэйшай заканадаўчай інстанцыі Рэчы Паспалітай – сойма[140].

Найбольшае пашырэнне маярат, як практыка захавання цэласнасці родавых маёнткаў, атрымаў у паўднёвай Еўропе, у той час як у нямецкіх землях ён з'явіўся ў пачатку XVII ст. і пашырыўся мала[141]. У Рэчы Паспалітай першымі, хто ўсталяваў ардынацыі на сваіх маёнтках, былі якраз Радзівілы. У 1577 г. сыны Мікалая Радзівіла Чорнага Мікалай Крыштаф (1549–1516), Альбрэхт (1558–1592) і Станіслаў (1559–1599) узгаднілі падзел бацькоўскіх маёнткаў. У 1586 г. яны склалі новае пагадненне, паводле якога на аснове нясвіжскага, алыцкага і клецкага зямельных комплексаў прадугледжвалася стварэнне ардынацый для кожнага з братоў. У тым жа годзе яе пацвердзіў кароль, а ў 1589 г. – сойм Рэчы Паспалітай.

Умовы функцыянавання радзівілаўскіх ардынацый і перадачы іх у спадчыну складваліся паступова. У 1586 г. яшчэ не былі акрэслены прынцыпы перадачы галоўных маёнткаў, аднак забаранялася іх прадаваць і перадаваць «дзеўцы», каб усё маёнткі па бацьку захоўваліся ў родзе Радзівілаў. У 1595 г. М. К. Радзівіл увёў для сваіх сыноў прынцып спадкавання галоўных маёнткаў (Нясвіжа і Міра) паводле прынцыпу першародства, тлумачачы гэта прыкладамі «хрысціянскіх правіцеляў» і патрэбамі сям'і. Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што менавіта М. К. Радзівіл адыграў галоўную ролю ў інстытуцыяналізацыі ардынацый у прававой практыцы Рэчы Паспалітай. З практыкай усталявання маярату ён пазнаёміўся, найверагодней, у Італіі ў 1582–1584 гг.[142]

Пасля ардынацый Радзівілаў сойм Рэчы Паспалітай зацвердзіў стварэнне ардынацый Замойскіх (1589), Мышкоўскіх (1601) і Астрожскіх (1609), але

[140] *Mełeń A.* Ordynacje w dawnej Polsce. Lwów, 1929. S. 7, 20–22; *Zielińska T.* Ordynacje w dawnej Polsce // Przegląd Historyczny. 1977. T. 68. Z. 1. S. 17.

[141] *Zielińska T.* Ordynacje w dawnej Polsce. S. 18–19.

[142] Ibidem. S. 20.

ў ВКЛ больш не было створана ніводнай ардынацыі. Між тым многія магнаты праяўлялі выразнае імкненне да стварэння трывалых родавых зямельных даменаў. Напрыклад, падканцлер Павел Стэфан Сапега імкнуўся заснаваць маярат на аснове сваіх гальшанскіх маёнткаў. Выразным сімвалам гэтага імкнення стала ўзвядзенне магнатам шыкоўнай мураванай рэзідэнцыі ў Гальшанах. Пры гэтым П. С. Сапега не меў магчымасці зацвердзіць сваю ардынацыю на сойме і абмежаваўся ўнясеннем спецыяльнага пункта ў свой тастамент, якім забараняў перадачу гальшанскіх зямель дачцы, каб яны заўжды заставаліся сапежынскімі[143]. Аднак у сярэдзіне XVII ст. з-за вялікіх пазык гальшанскія землі былі падзелены паміж нашчадкамі роду і крэдыторамі. Гэтаксама на аснове быхаўскіх уладанняў стварыць ардынацыю імкнуўся вялікі гетман Ян Караль Хадкевіч. Паколькі ў магната не было сыноў, ён у 1616 г. запісаў Быхаў з воласцю брату Аляксандру, а ў выпадку смерці апошняга – іншаму мужчынскаму прадстаўніку роду Хадкевічаў[144]. Аднак пасля смерці гетмана ў 1625 г. гэты запіс быў скасаваны, паколькі ён быў зроблены з парушэннем правілаў утварэння ардынацыі і не быў зацверджаны соймам[145].

Паводле Т. Зяліньскай, галоўнымі прычынамі закладання ардынацый былі меркаванні прэстыжу. Іншымі словамі, ардынацыі былі своеасаблівай маніфестацыяй актуальнага становішча роду і клопатам аб утрыманні яго пазіцый у будучыні[146]. Такім чынам, у дэманстрацыі сваіх амбіцый Радзівілы апынуліся наперадзе не толькі магнатэрыі ВКЛ, але і ўсёй Рэчы Паспалітай. Збіранне вялікіх зямельных латыфундый і наданне ім права ардынацый сталі моцным стымулам для далейшай разбудовы рэзідэнцый, якія знаходзіліся ў іх цэнтрах.

Пачынаючы з другой паловы XVI ст. асноўным шляхам пераразмеркавання зямель сярод магнатаў у ВКЛ сталі шлюбы і падараванні. Такім чынам пашыралі свае ўладанні і Радзівілы біржанскай і нясвіжскай ліній. Сын Мікалая Радзівіла Рудога Крыштаф I Мікалай (1547–1603) па мянушцы Пярун з біржанскай галіны роду павялічыў свае ўладанні праз шматлікія шлюбы, куплю ці замены. У прыватнасці праз шлюб з Кацярынай Астрожскай ва ўладанне біржанскіх Радзівілаў перайшла Копысь з замкам. Большасць маёнткаў Крыштафа I, якія знаходзіліся пераважна ў Завілейскай Літве (Біржы, Дубінкі, Кейданы і інш.) і Падляшшы, у далейшым адышлі яго сыну Крыштафу II Радзівілу (1585–1640). У дадатак да гэтых маёнткаў у 1606 г. праз шлюб з Ганнай з Кішкаў Крыштаф II Радзівіл атрымаў Любчу з мураваным замкам. Уладанні магната перайшлі да яго адзінага сына Януша XI (1612–1655). Прымаючы пад увагу бліскучую перамогу Януша XI Радзівіла над казакамі пад Лоевам у 1649 г., а таксама значныя выдаткі на войска, якія ён асабіста нёс на пасадзе

[143] *Скеп'ян А.* Інвентар Гальшан 1649 г. // Ашмяншчына: праблемы рэгіянальнай гісторыі Беларусі. Мінск, 2011. С. 206–207.

[144] AGAD. AR. Dz. XXIII. T. 28. Pl. 4. S. 13–15.

[145] VUB. F. 4. B. 39 747.

[146] *Zielińska T.* Ordynacje w dawnej Polsce. S. 27.

польнага гетмана ВКЛ, кароль надаў яму Барысаўскае староства ў пажыццёвае трыманне, а сойм – Невель і Себеж з замкамі ў спадчыннае валоданне.

У 1600 г. біржанскія Радзівілы ўступілі ў востры канфлікт з родам Хадкевічаў за руку і пасаг апошняй прадстаўніцы княжацкага роду Алелькавічаў Соф'і, якая з'яўлялася адзінай спадчынніцай вялізных Слуцкага і Капыльскага княстваў. У выніку дамовы на Соф'і ажаніўся сын Крыштафа I Радзівіла Пяруна ад шлюбу з Кацярынай з Астрожскіх Януш VI (1579–1620), да якога і адышлі згаданыя княствы[147]. Адзіным спадчыннікам усёй фартуны Януша VI стаў яго адзіны сын Багуслаў I Радзівіл (1620–1669). Пасля смерці свайго стрыечнага брата Януша XI Радзівіла Багуслаў стаў апекуном яго няпоўнагадовай дачкі Ганны Марыі, з якой ажаніўся ў 1665 г., пасля чаго сканцэнтраваў у сваіх руках усе землі біржанскіх Радзівілаў абодвух адгалінаванняў. У руках магната, такім чынам, апынулася найвялікшая ў Рэчы Паспалітай зямельная латыфундыя.

Землі Багуслава Радзівіла, паводле польскага даследчыка М. Мілуньскага, можна ўмоўна падзяліць на чатыры вялікія комплексы. Найбольшы асяродак складалі Слуцкае і Капыльскае княствы з найвялікшым у ВКЛ прыватнаўласніцкім горадам Слуцкам. Другі зямельны комплекс месціўся непадалёк ад Менска. Яго цэнтрам было Койданава. У ваколіцах Навагрудка і Ліды быў сфарміраваны трэці комплекс, які не меў выразнага лакальнага цэнтра. У яго ўваходзілі Беліца, Любча і інш. Вакол Біржаў канцэнтраваліся ўсе жамойцкія маёнткі Багуслава Радзівіла, што ўтваралі апошні вялізны зямельны комплекс. Удалечыні ад галоўных маёнткаў знаходзіліся Копысь, Невель і Себеж. Акрамя таго, Багуслаў Радзівіл меў маёнткі ў Польшчы і на Падляшшы[148].

Велізарныя землі Багуслава Радзівіла з-за адсутнасці ў магната нашчадкаў мужчынскага полу адышлі ў пасаг яго адзінай дачцы Людвіцы Караліне (1667–1695 гг.). Усяго на 1690 г. у яе ўласнасці знаходзілася 14 287 дымоў у вёсках і пляцаў у гарадах і мястэчках, якія ў суме прыносілі прыбытку ў 300 тыс. злотых. Палова з іх, ці 7 205 дымоў і пляцаў, знаходзіліся ў Слуцкім і Капыльскім княствах, астатнія былі размеркаваны наступным чынам: 2 718 – у так званых беларускіх маёнтках (Себеж, Невель, Копысь і інш.), 2 654 – у Біржанскім княстве і Жамойці, і яшчэ 1 710 былі раскіданы па Навагрудскім, Лідскім, Гарадзенскім паветах і Віленскім ваяводстве[149]. Такім чынам, амаль ¾ зямель біржанскай галіны Радзівілаў знаходзіліся на тэрыторыі сучаснай Беларусі.

Людвіка Караліна двойчы выходзіла замуж за нямецкіх князёў Людвіка Леапольда Гогенцолерна і Карла Філіпа Вітэльсбаха і сама кіравала землямі на працягу свайго жыцця. Адразу пасля яе смерці прадстаўнікі нясвіжскай лініі Радзівілаў спрабавалі ўзяць землі пад свой кантроль, аднак гэтыя спробы скончыліся няўдала. Канчаткова пытанне з так званымі *нойбургскімі* ўладан-

[147] *Lulewicz H.* Walka Radziwiłłów z Chodkiewiczami o dziedzictwo słuckie. S. 215.
[148] *Miłuński M.* Zarząd dóbr Bogusława Radziwiłła w latach 1636–1669. S. 202–203.
[149] VUB. F. 4. B. 39 747.

нямі (ад тытула апошняга мужа Людвікі Караліны Карла Філіпа пфальцграфа на Нойбургу) было вырашана толькі ў другой чвэрці XVIII ст.[150]

У адрозненне ад біржанскай галіны Радзівілаў лінія князёў на Алыцы і Нясвіжы не перасяклася і захавала высокі статус на палітычнай арэне Рэчы Паспалітай ажно да канца XVIII ст. Шмат у чым гэтаму спрыяла прадуманая і ўдалая зямельная палітыка прадстаўнікоў роду, адным з элементаў якой было заснаванне ў канцы XVI ст. на сваіх землях ардынацый, пра што згадвалася вышэй. Пасля стварэння трох ардынацый у 1586 г. нясвіжская лінія Радзівілаў атрымала тры адгалінаванні: уласна нясвіжскае, алыцкае і клецкае. Пачынальнік нясвіжскай лініі Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка яшчэ да заснавання ардынацыі здолеў павялічыць свае ўладанні за кошт зямель бяздзетнага Юрыя Іллініча, які паводле ліста, складзенага ў 1568 г., перапісаў Сіротку ўсю сваю маёмасць, у тым ліку Мір з мураваным замкам[151]. У 1569 г. Сіротка ўступіў у валоданне гэтымі маёнткамі і ўключыў іх у склад сваёй нясвіжскай ардынацыі. У далейшым М. К. Радзівіл засяродзіўся на скупцы зямель вакол Нясвіжа, Міра, Свержаня і Магільна, каб стварыць значны і замкнуты ў лагічных граніцах комплекс зямель[152]. У далейшым нясвіжская ардынацыя па чарзе пераходзіла сынам Сіроткі: Яну Юрыю (1588–1625), Альбрэхту Уладзіславу (1689–1636), Жыгімонту Каралю (1591–1642) і Аляксандру Людвіку (1594–1654). Толькі апошні з іх пакінуў сыноў, старэйшы з якіх, Міхал Казімір (1625–1680), стаў наступным нясвіжскім ардынатам.

Алыцкая і клецкая лініі перарваліся яшчэ ў XVII ст. Сыны Станіслава Радзівіла Мікалай Крыштаф (1589–1614) і Альбрэхт Станіслаў (1595–1656), якія па чарзе станавіліся алыцкімі ардынатамі, не пакінулі пасля сябе нашчадкаў, і пасля смерці апошняга з іх алыцкая ардынацыя перайшла Міхалу Казіміру як прадстаўніку старэйшай нясвіжскай лініі. Пазней абедзве ардынацыі адышлі сынам Міхала Казіміра Юрыю Юзафу (1668–1689) і Каралю Станіславу (1669–1719), якія былі адначасова нясвіжскімі і алыцкімі ардынатамі. Такім чынам з сярэдзіны XVII ст. землі алыцкай і нясвіжскай ардынацый былі злучаны ў адных руках, што павялічыла эканамічны патэнцыял нясвіжскай лініі Радзівілаў. Клецкая лінія трывала да 1690 г., калі памёр чацвёрты клецкі ардынат Станіслаў Казімір Радзівіл (1648–1690). У далейшым гэтая ардынацыя адышла сыну Аляксандра Людвіка Радзівіла з нясвіжскай лініі Дамініку Мікалаю (1643–1697), які заснаваў другую лінію клецкіх ардынатаў. Праз першую жонку Ганну Палубінскую Дамінік Мікалай у 1679 г. атрымаў Глуск з бастыённым замкам, узведзеным Аляксандрам Гілярыем Палубінскім. Наступным клецкім ардынатам стаў яго сын Ян Мікалай (1681–1729), у той час

[150] *Мацук А.* «Нойбургскія маёнткі» // Вялікае княства Літоўскае: энцыкл. : у 2 т. Мінск, 2006. Т. 2. С. 363–366.

[151] *Аляхновіч Р. А., Рыбчонак С. А., Шаланда А. І.* Род Іллінічаў у Вялікім Княстве Літоўскім у XV–XVI стст.: радавод, гербы, уладанні / склад. А. І. Шаланда, навук. рэд. М. Н. Гальпяровіч. Мір, 2015. С. 323–331.

[152] *Кетра Т.* Mikołaj Krzysztof Radziwiłł Sierotka (1549–1616) – wojewoda wileński. S. 227.

як Глуск адышоў Мікалаю Фаўстыну (1688–1746)[153]. Як і нясвіжскія Радзівілы, прадстаўнікі клецкай лініі з канца XVII ст. уключыліся ў змаганне за «нойбурскія» маёнткі, аднак няўдала.

На працягу XV – першай паловы XVI ст. першыя пакаленні Радзівілаў дзякуючы ўмелай палітыцы прадстаўнікоў роду, а таксама прыхільнасці вялікага князя здолелі сканцэнтраваць у сваіх руках вялікія зямельныя ўладанні. У другой палове XVI – XVII ст. памеры ўладанняў роду, яшчэ больш узраслі дзякуючы ўдалым шлюбам. Гэта стварыла падмурак для захавання высокіх пазіцый роду на палітычнай арэне ВКЛ. Разам з тым збіранне вялікіх зямельных латыфундый стала моцным стымулам для разбудовы рэзідэнцый, што знаходзіліся ў іх цэнтрах. Як і іншыя магнацкія роды, Радзівілы мэтанакіравана набывалі землі ў асноўным у цэнтральных абласцях краіны. Большасць іх маёнткаў знаходзілася ў межах Віленскага, Троцкага, Наваградскага, Менскага ваяводстваў і на Падляшшы. Гэта тлумачылася шэрагам прычын. Па-першае, тут знаходзіліся найбольш развітыя ў гаспадарчым плане землі. Па-другое, аддаленасць ад межаў дзяржавы гарантавала маёнткам бяспеку ад нападаў ворагаў. Па-трэцяе, гэтыя землі знаходзіліся бліжэй да цэнтраў улады (Вільні, Варшавы), што спрашчала кантроль над маёнткамі.

2.4. Гаспадарчае развіццё маёнткаў

Умацаваныя рэзідэнцыі Радзівілаў забяспечвалі абарону ўласнікам і іх маёмасці. Разам з тым не менш важнай іх функцыяй было стварэнне ўмоў для бяспечнай жыццядзейнасці гандлёва-рамесных паселішчаў і сельскіх ваколіц. Асабліва добра залежнасць гаспадарчага развіцця зямель ад абарончага будаўніцтва ў XVI–XVII стст. бачна на прыкладзе лесастэпавых абшараў Правабярэжнай Украіны. Працэс асваення гэтых зямель адбываўся ва ўмовах пастаяннай пагрозы з боку крымскіх татараў, што стымулявала маштабнае абарончае будаўніцтва. Напрыклад, у магнацкага роду Збаражскіх на ўкраінскіх землях было каля 50 замкаў[154]. Магчыма, менавіта таму ў Альцы, размешчанай на ўкраінскіх землях, у другой палове XVI ст. быў узведзены першы бастыённы замак Радзівілаў.

Значэнне ўмацаванняў для абароны і гаспадарчага развіцця прылеглых зямель добра бачна на прыкладзе падзей вайны Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай 1654–1667 гг. Калі ўзнікала пагроза захопу і рабавання гарадоў, якія не мелі сродкаў для паспяховай абароны, значная частка мяшчан дзеля захавання ўласнага жыцця і маёмасці пакідала іх і імкнулася схавацца ў моцных фартэцыях, выехаць за мяжу або збегчы ў лес. Так, у 1655 г. пры набліжэнні маскоўскіх войскаў да Вільні значная частка жыхароў пакінула горад, які не

[153] *Żychliński T.* Złota księga szlachty polskiej. 1889. R. 11. S. 168–175.

[154] *Мальченко О. Є.* Укріплені поселення Брацлавського, Київського і Подільського воєводств (XV – середина XVII ст.). С. 44–46, 71–73.

меў сродкаў для абароны[155]. У той самы час у радзівілаўскі Слуцк, які быў пераўтвораны ў моцную фартэцыю, з'ехалася шмат мяшчан з іншых гарадоў і мястэчак. Гэта стварыла шмат праблем для слуцкіх мяшчан, якія ўсяляк імкнуліся пазбавіцца ад «гасцей». У 1661 г., калі значная частка ўсходніх зямель была вызвалена ад маскоўскіх войскаў, меская рада настойвала на выпраўленні капыскага мешчаніна Цімафея Лапіцкага назад у Копысь, якая, па словах случчакоў, на той час ужо была вызвалена ад непрыяцеля і забяспечана гарнізонам. Іншымі словамі, забеспячэнне абароны для горада на Дняпры, паводле меркаванняў слуцкіх мяшчан, дазваляла яго жыхарам вярнуцца дадому[156]. Падобная логіка бачна і на прыкладзе разрабаванай маскоўскімі войскамі Свіслачы. Напачатку 1660 г. Багуслаў Радзівіл пісаў да губернатара Слуцкага і Капыльскага княстваў Уільяма Патэрсана наконт Свіслачы ў Менскім павеце, наступнае: «*...старацца, каб у той маёмасці які-кольвек парадак усталяваўся, каб тамтэйшыя падданыя збіраліся і сабе абарону маглі мець*»[157]. Іншымі словамі, забеспячэнне абароны для горада дазваляла яго жыхарам вярнуцца дадому. Як адзначае М. Мілуньскі, фартэцыі Б. Радзівіла ў час вайны служылі для захавання збожжа, значная частка якога з ініцыятывы самога ўладальніка размяркоўвалася ў далейшым між сялянамі, каб тыя маглі аднавіць свае гаспадаркі, а не разыходзіліся ў іншыя землі[158].

Акрамя пагрозы з боку знешніх ворагаў, небяспека для развіцця маёнткаў магла зыходзіць ад палітычных канкурэнтаў. Так, аб ролі замка ў Ваневе на Падляшшы сведчыць канфлікт Альбрэхта Гаштольда, якому належаў суседні Тыкоцін, з Мікалаем II Радзівілам. Размешчаныя ў самым цэнтры дуалістычнай манархіі Ягелонаў падляскія замкі Радзівілаў забяспечвалі развіццё паселішчаў і баранілі інтарэсы роду ў рэгіёне ў супрацьстаянні з палітычнымі праціўнікамі. Аднак у адказ на спаленне замка ў Тыкоціне, што ўчынілі радзівілаўскія слугі, падданыя А. Гаштольда ў 1513 г. напалі на радзівілаўскае Ванева, спалілі драўляны замак і панішчылі масты, на якіх М. Радзівіл збіраў мыта. Неўзабаве Ванева прыйшло ў заняпад. З гэтага вынікае, што наяўнасць абарончага ўмацавання стварала перадумовы для росту паселішча, а знішчэнне ўмацавання магло паставіць крыж на развіцці паселішча[159].

Той факт, што неабходнасць гаспадарчага развіцця зямель вымагала забеспячэння абароны паселішчаў, падаецца даволі зразумелым. Разам з тым неабходна звярнуць увагу на тое, што сама стратэгія гаспадарчага развіцця,

---

[155] *Бабятынскі К.* Ад Смаленску да Вільні. Вайна Рэчы Паспалітай з Масковіяй (1654–1655 гг.). С. 152.

[156] AGAD. AR. Dz. XXIII. T. 34. Pl. 2. S. 265.

[157] Ibidem. Dz. VII. Sygn. 678. S. 17.

[158] *Miłuński M.* Zarząd dóbr Bogusława Radziwiłła w latach 1636–1669. S. 204.

[159] *Malczewska M.* Latyfundium Radziwiłłów w XV do połowy XVI wieku. S. 95–96; *Kloza J., Maroszek J.* Dzieje Goniądza w 450 rocznicę praw miejskich. Białystok ; Goniądz, 1997. S. 14, 39; *Maroszek J.* Pogranicze Litwy i Korony w planach króla Zygmunta Augusta: z historii dziejów realizacji myśli monarszej między Niemnem a Narwią. S. 66, 71, 79; *Oleksicki A.* Waniewo, z przeszłości dawnego miasta // Biuletyn Konserwatorski Województwa Podlaskiego. 2001. Z. 7. S. 161, 164.

якой кіраваліся землеўласнікі ў XVI–XVII стст., аказвала значны ўплыў на маштаб абарончага будаўніцтва і характар умацаваных рэзідэнцый.

Ініцыятыва буйных прыватных землеўласнікаў у гаспадарчым развіцці зямель пачынае ўзрастаць з першай паловы XVI ст. Гэта было выклікана значнымі поспехамі магнатаў у стварэнні вялікіх зямельных латыфундый. Паводле С. Александровіча, стварэнне вялікай даменіяльнай уласнасці і звязаная з ім інтэнсіфікацыя ў асваенні зямель адбываліся пад уплывам заходніх суседзяў ВКЛ і найперш Польшчы, дзе гэтыя працэсы пачаліся ў больш ранні час[160]. Польскі ўплыў, па ўсёй верагоднасці, адбіўся на дзейнасці Мікалая II Радзівіла. Магнат, які меў выразную прапольскую арыентацыю, за што і атрымаў прозвішча amor Poloniae, разгарнуў шматбаковую дзейнасць па гаспадарчым асваенні сваёй падляшскай латыфундыі. Дзеля павышэння прыбытковасці маёнткаў М. Радзівіл праводзіў шырокую каланізацыйную дзейнасць: закладваліся новыя вёскі і перабудоўваліся старыя, на гандлёвых шляхах будаваліся корчмы, а самі гандлёвыя шляхі мадэрнізаваліся. У 1510 г. магнат выдаткаваў вялікія сродкі на перабудову камунікацыйнага тракту з Мазовіі ў Літву, які ішоў праз Гонядзь у бок Горадні, пры гэтым насыпаліся грэблі і ўзводзіліся масты. На адной толькі рацэ Яскры былі збудаваны чатыры масты. Акрамя двух гарадоў, якія меліся ў гэтых уладаннях, Мікалай II, атрымаў дазвол на заснаванне мястэчка ў Ваневе[161].

Многія магнаты, у тым ліку найбольш выбітныя прадстаўнікі роду Радзівілаў, прыкладвалі вялікія намаганні для стварэння вялікіх латыфундый. Для эфектыўнага эканамічнага развіцця і зручнага кіравання было неабходна, каб зямельныя комплексы былі замкнуты ў пэўных лагічных межах. Часам гэта былі цалкам штучныя стварэнні, якія не адпавядалі граніцам старых валасцей. Ліквідацыя старых і стварэнне новых тэрытарыяльных адзінак была істотным чыннікам для прагрэсу фартыфікацыйнага будаўніцтва. Новыя буйныя зямельныя комплексы станавіліся асновай для забеспячэння ўзвядзення і функцыянавання дарагіх абарончых умацаванняў новага кшталту. Найбольш выразным прыкладам гэтай з'явы з'яўляецца створанае некалькімі пакаленнямі Радзівілаў Нясвіжскае княства, у цэнтры якога паўстала галоўная родавая рэзідэнцыя.

Цэнтральныя рэзідэнцыі мелі важнае значэнне для функцыянавання вялікіх зямельных латыфундый. З сімвалічнага боку яны выступалі як сталіцы прыватнаўласніцкіх дзяржаў, архітэктура якіх павінна была адпавядаць статусу і амбіцыям магнатаў. Таму ў іх разбудову, у тым ліку ў будаўніцтва фартыфікацый, уласнікі ўкладвалі вялікія сродкі. Разам з тым некаторымі магнатамі пры ўзвядзенні рэзідэнцый і асваенні сваіх зямель кіравалі глыбокія ідэйныя перакананні, што аказвала ўплыў на характар абарончых умацаванняў. Найлепшым прыкладам у дадзеным выпадку з'яўляецца Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка, у дзейнасці якога праглядаюцца падобныя ма-

[160] *Alexandrowicz S.* Studia z dziejów miasteczek Wielkiego Księstwa Litewskiego. S. 31, 95, 109, 267.

[161] *Malczewska M.* Latyfundium Radziwiłłów w XV do połowy XVI wieku. S. 97.

тывы[162]. Так, ідэя размяшчэння храмаў і манастыроў па вуглах новазакладзенага ўрбаністычнага комплексу ў Нясвіжы магла вынікаць не з утылітарных патрэб, а з імкнення да стварэння ідэальнага горада, «краевугольнымі камянямі» якога павінны былі стаць сакральныя аб'екты.

Цэнтральныя рэзідэнцыі ў гаспадарчым плане моцна ўніфікавалі зямельныя латыфундыі, што давала магчымасць атрымліваць з іх большыя прыбыткі. Праз вялікія гарады адкрывалася магчымасць для выхаду на знешнія рынкі, што забяспечвала паспяховы збыт прадуктаў сельскагаспадарчай вытворчасці і лясной прамысловасці. Гэта павышала прыбытковасць фальваркаў, стымулявала развіццё ўнутранага рынку і сялянскіх гаспадарак. Акрамя таго, павышаліся прыбыткі ўладальнікаў з рознага кшталту мытаў, гандлёвых аплат і іншых збораў[163].

Наяўнасць развітых рэзідэнцый давала магчымасць разбудаваць эфектыўную сістэму адміністравання маёнткамі. Праблема кіравання землямі палягала ў тым, што ўласнік проста не меў магчымасці бываць у большасці з іх, каб асабіста сачыць за развіццём маёнткаў і функцыянаваннем адміністрацыі, што адкрывала дарога да злоўжыванняў з боку адміністратараў. Яшчэ ў сярэдзіне XVII ст. Багуслаў Радзівіл імкнуўся змагацца з вандроўным стылем кіравання і палепшыць адміністраванне сваімі землямі. Ён падкрэсліваў неабходнасць развіцця чатырох асноўных гаспадарчых цэнтраў радзівілаўскіх земляў: Біржаў, Слуцка, Нясвіжа і Алыкі. Адносна сваіх уласных рэзідэнцый у Біржах і Слуцку магнат пісаў, што там трэба жыць для іх росту і развіцця. Хаця ў гэтым ён не быў інаватарам і арыентаваўся на прыклад Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі і свайго дзеда Крыштафа Радзівіла. Для павялічэння кантролю над сваімі ўладаннямі магнат стварыў складаную адміністратыўную сістэму і нават заснаваў пастаянную пошту, якая звязвала Слуцк з Вільняй[164].

Дзеянні буйных землеўласнікаў па павелічэнні прыбытковасці маёнткаў праз іх узбуйненне, рэарганізацыю старой структуры, развіццё інфраструктуры і ўдасканаленне адміністрацыі стваралі перадумовы для ўзвядзення і функцыянавання магутных абарончых рэзідэнцый, якія знаходзіліся ў цэнтрах зямельных комплексаў. Пры гэтым увага да другарадных абарончых рэзідэнцый зніжалася, і яны прыходзілі ў заняпад, а ўсе сродкі скіроўваліся на ўтрыманне цэнтральных. Напрыклад, у Слуцкім княстве ўжо ў канцы XVI – пачатку XVII ст. прыйшоў у заняпад замак у Капылі, а ў Нясвіжскім княстве – замкі ў Свержані і Магільне. Да сярэдзіны XVII ст. дзякуючы магутным мураваным фартыфікацыям абарончы патэнцыял захоўваў замак у Міры, які належаў да Нясвіжскай ардынацыі. Аднак пасля вайны 1654–1667 гг. яго пачалі

[162] *Kempa T.* Mikołaj Krzysztof Radziwiłł Sierotka (1549–1616) – wojewoda wileński. S. 160.

[163] *Bania Z.* Pojęcie rezydencji w architekturze polskiej XVII i XVIII w. na przykładzie Podhorzec i Brodów. S. 385–388; *Idem.* Nowożytne zamki polskiej magnaterii. Uwagi o reprezentacji na wybranych przykładach. S. 111–112.

[164] *Miłuński M.* Zarząd dóbr Bogusława Radziwiłła w latach 1636–1669. S. 212–214, 221, 227.

перарабляць пад «адкрытую» рэзідэнцыю, а прадстаўнікі нясвіжскай галіны Радзівілаў засяродзіліся на забеспячэнні абароназдольнасці іх галоўнай рэзідэнцыі ў Нясвіжы.

Найбольш важным складнікам працэсу гаспадарчага развіцця маёнткаў буйных землеўласнікаў было заснаванне, ці лакацыя, гарадоў і мястэчак, што, як правіла, суправаджалася надзяленнем іх правам на самакіраванне. Лакацыяй называлі заснаванне новага гандлёва-рамеснага паселішча альбо карэнную рэарганізацыю горадабудаўнічай структуры старога. Перабудова і падвышэнне прававога статусу паселішча павінна было спрыяць яго росту і павелічэнню прыбытковасці. Гэта выразна дэкларавалася ў прывілеях на самакіраванне, у прыватнасці ў прывілеі Міру 1579 г.[165]

На працягу XVI–XVII стст. пераўтварэнні горадабудаўнічага характару закранулі найбольш значныя рэзідэнцыі Радзівілаў (Любча, Мір, Нясвіж, Слуцк). Пры гэтым будаўніцтва ўмацаванняў праводзілася адначасова з лакацыяй і наданнем права на самакіраванне. З гэтага вынікае, што пры распрацоўцы планаў паселішчаў пад увагу бралася неабходнасць будаўніцтва абарончых умацаванняў вакол іх. Сам жа абавязак будаўніцтва фартыфікацый ускладваўся на мяшчан і мусіў быць рэалізаваны на першым этапе развіцця рэфармаванага паселішча. Напрыклад, Нясвіж атрымаў права на самакіраванне ў 1586 г., а ўжо напачатку XVII ст. вакол горада, як сведчыць гравюра Т. Макоўскага, былі насыпаны земляныя ўмацаванні. Пры гэтым, аднак, трэба заўважыць, што будаўніцтва ўмацаванняў планавалася і рэалізоўвалася толькі вакол найбольш важных паселішчаў, у той час як большасць мястэчкаў, якія мелі характар другарадных гандлёва-рамесных паселішчаў, закладваліся адкрытымі.

Як і ў пытанні надання права на самакіраванне, так і ў горадабудаўнічай дзейнасці маглі прысутнічаць ідэалістычныя ўяўленні, якія былі складнікам культуры вышэйшых слаёў тагачаснага грамадства. Найбольш выразным адлюстраваннем рэнесанснага пераканання аб магчымасці і неабходнасці рацыянальнага пераўтварэння свету з'яўляецца канцэпцыя ідэальнага горада, якая была рэалізавана ў шэрагу паселішчаў Радзівілаў. Гэтая канцэпцыя ўключала і пытанне будаўніцтва ўмацаванняў, гэта значыць непасрэдна ўплывала на абарончую архітэктуру. Найбольш яскравым прыкладам рэалізацыі канцэпцыі ідэальнага горада з'яўляецца радзівілаўскі Нясвіж[166].

Збіранне зямель Радзівіламі і ўтварэнне вялікіх зямельных латыфундый у XVI ст. дало моцны стымул для разбудовы рэзідэнцый, якія знаходзіліся ў іх цэнтрах. З аднаго боку, будаўніцтва рэзідэнцый было неад'емнай часткай працэсу гаспадарчага асваення зямель латыфундый, паколькі сядзібы стваралі

---

[165] *Скеп'ян А.* Самакіраванне Капыля ў другой палове XVI ст. (рэканструкцыя па гарадской уставе Петрыкаву 1582 г.) // Капыль : гісторыя горада і рэгіёна : да 360-годдзя надання Капылю прывілея на магдэбургскае права / уклад. : А. А. Скеп'ян, А. Б. Доўнар, І. В. Соркіна. Мінск, 2012. С. 49.

[166] *Волкаў М.* Абарончы комплекс Нясвіжа ў XVI–XVIII стст. С. 178.

ўмовы для развіцця і жыццядзейнасці гандлёва-рамесных паселішчаў і сельскіх ваколіц. З іншага боку, дзейнасць магнатаў, скіраваная на павелічэнне прыбытковасці сваіх зямель праз іх узбуйненне, рэарганізацыю старой структуры, развіццё інфраструктуры і ўдасканаленне адміністрацыі, стварала перадумовы для ўзвядзення і функцыянавання магутных абарончых комплексаў у іх цэнтрах. Пры гэтым мадэрнізацыя эканамічнай сістэмы вялікіх зямельных комплексаў суправаджалася змяненнем канцэпцыі іх абароны, у выніку чаго ўсе сродкі скіроўваліся на забеспячэнне цэнтральных рэзідэнцый, а другарадныя прыходзілі ў заняпад.

2.5. Сімвалы самасцвярджэння

На працягу ўсёй гісторыі чалавецтва абарончая архітэктура несла значную сімвалічную нагрузку. Фактычна яна ўвасабляла сабой грамадскі інстытут ці асобу, якая кіравала пэўнай тэрыторыяй. Магутны абарончы комплекс з'яўляўся дэманстрацыяй сілы, легітымацыяй улады яго ўласніка і аказваў псіхалагічны ціск на падданых. Таму абарончы выгляд на працягу XVI–XVII стст. заставаўся абавязковым атрыбутам канцэпцыі рэзідэнцыі ўладара. У сваю чаргу, пры разглядзе прыватнаўласніцкіх абарончых умацаванняў мы, як правіла, маем справу з рэзідэнцыямі, якія ў значнай ступені былі падпарадкаваны патрэбе самарэпрэзентацыі ўласніка. Таму фактары неваеннага характару часам выступалі наперад і вызначалі форму ўмацаванняў.

У выпадку, калі не ставілася на мэце стварэнне абарончага аб'екта альбо не было сродкаў для будаўніцтва магутных фартыфікацый, уласнік імкнуўся надаць рэзідэнцыі абарончы выгляд ці стварыць ілюзію абароназдольнасці. Таму ўзвядзенне ўмацаванай рэзідэнцыі магло быць выклікана не столькі неабходнасцю абароны, колькі патрэбай рэпрэзентацыі і жаданнем яго ўласніка прадэманстраваць свае пазіцыі ў дзяржаве. Асаблівую важнасць сімвалічная трактоўка ўмацаванняў мела ў саслоўным грамадстве ВКЛ і Рэчы Паспалітай. З аднаго боку, шляхта імкнулася ўсяляк адасобіцца ад ўсяго астатняга грамадства як адзінае саслоўе, якое мае права на ўжыванне сілы, а, з іншага, магнатэрыя рабіла захады, каб узвысіцца над агульным «шляхецкім народам» і замацаваць сваё дамінаванне на палітычным алімпе дзяржавы. У такіх умовах форма і выгляд абарончых рэзідэнцый набывалі істотнае значэнне ў справе самарэпрэзентацыі палітычнай эліты. Таму, каб больш глыбока пранікнуць у спецыфіку архітэктуры абарончых умацаванняў Радзівілаў, варта ўважліва разгледзець іх сімвалічны змест. Гэта, па-першае, дасць магчымасць больш дакладна інтэрпрэтаваць форму тых ці іншых рэзідэнцый, а па-другое, дазволіць правільна ацаніць іх рэальны абарончы патэнцыял, а таксама прычыны іх узвядзення і функцыянавання.

На думку Н. А. Скеп'ян, штуршком да будаўніцтва магнатамі мураваных рэзідэнцый стала пашырэнне кантактаў з дваром імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі і знаёмства вышэйшага саслоўя з культурай паўночнага Рэ-

несансу[167]. Уплыў імперыі на вышэйшыя пласты грамадства ВКЛ у ідэйным плане быў вельмі моцны і адбіўся, напрыклад, у імкненні многіх магнатаў, якія не мелі тытулаў, атрымаць іх з рук імператара. Адным з першых княжацкага тытула ў 1518 г. дамогся Мікалай II Радзівіл. Той жа стратэгіі па павышэнні статусу роду прытрымліваліся і яго пляменнікі. У 1547 г. Мікалай V Радзівіл Чорны атрымаў тытул князя на Нясвіжы і Алыцы для сябе і тытул князя на Дубінках і Біржах для свайго стрыечнага брата Мікалая IV Радзівіла Рудога. Таму на нямецкія землі варта звярнуць увагу для пошуку аналогій у грамадска-палітычным развіцці і рэзідэнцыянальным будаўніцтве ў ВКЛ.

З другой паловы XV ст. у Свяшчэннай Рымскай імперыі пачынаецца ўмацаванне ўлады найбольш значных курфюрстаў і князёў. З аднаго боку, яны падпарадкоўваюць сабе дробных і сярэдніх феадалаў, а з іншага – умацоўваюць свае пазіцыі адносна імператара. Гэта праявілася ў ліквідацыі аднаго з асноўных правоў, што належала ўсім феадалам, а менавіта права на вядзенне войнаў. У 1555 г. было канчаткова забаронена ініцыяваць і весці войны дробным і сярэднім феадалам, а права ўжывання ваеннай сілы было сканцэнтравана ў руках курфюрстаў і князёў. Час рыцараў, такім чынам, скончыўся[168]. Працэс умацавання магнацкай алігархіі ў ВКЛ шмат у чым падобны на працэсы, што адбываліся ў імперыі. Спроба абмежаваць уплыў магнатэрыі ў ВКЛ праз ажыццяўленне шырокіх рэформ і пашырэнне правоў сярэдняй і дробнай шляхты ў трэцяй чвэрці XVI ст. не прывяла да жаданых вынікаў, і на канец XVI – першую палову XVII ст. прыпаў небывалы рост палітычнай магутнасці магнатэрыі. У гэты час была ўзведзена значная колькасць шыкоўных магнацкіх рэзідэнцый, у тым ліку новыя бастыённыя замкі Радзівілаў у Алыцы, Біржах і Нясвіжы.

Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што, як і ў Заходняй Еўропе, у ВКЛ абарончыя рэзідэнцыі з пачатку XVI ст. сталі адным з важнейшых элементаў дынастычна-станавага самаўсведамлення вышэйшай праслойкі землеўласнікаў. Пры гэтым ідэйнае сталенне магнацкай эліты і фарміраванне яе культурных арыенціраў выразна адбілася ў рэзідэнцыянальнай архітэктуры. З пачатку XVI ст. сярод прыватнаўласніцкіх рэзідэнцый распаўсюджваецца тып рэгулярнага замка з вуглавымі вежамі (Мір, Геранёны). Такога кшталту пабудовы маюць карані ў абарончым дойлідстве ВКЛ – позднія велікакняжацкія замкі-кастэлі ў Троках і Коўне. Разам з тым кастэлі з вуглавымі вежамі былі шырока распаўсюджаны ў Італіі і Францыі, а таксама ў нямецкіх землях, дзе яны мелі выразны княжацка-імперскі змест[169]. Такім чынам, у рэзідэнцыі такога кшталту ўкладваўся грунтоўны ідэйны і сімвалічны змест, які з лёгкасцю чытаўся і ў кантэксце мясцовай, і ў кантэксце заходнееўрапейскай традыцыі.

---

[167] *Скеп'ян Н.* Пачаткі будаўніцтва прыватнаўласніцкіх мураваных замкаў у Вялікім княстве Літоўскім. С. 63.

[168] *Schütte U.* Das Schloß als Wehranlage: befestigte Schloßbauten der frühen Neuzeit im alten Reich. S. 4, 12.

[169] Ibidem. S. 235.

Для магнацкіх родаў някняжацкага паходжання, якімі былі Радзівілы, такога кшталту замкі былі сродкам сцвярджэння свайго роўнага з «князямі крыві» статусу і спосабам легітымацыі свайго ўваходжання ў склад кіроўных эліт дзяржавы. Іншымі словамі, замкі сталі своеасаблівай заменай старажытнага тытула для маладой магнацкай эліты[170]. Найбольш эфектнай дэманстрацыяй свайго статусу на тэрыторыі ВКЛ, напэўна, стаў узведзены Юрыем Іллінічам замак у Міры. Ніводная з рэзідэнцый магутных Гаштольдаў і Радзівілаў пачатку XVI ст. па маштабах і эфектнасці архітэктурнага вырашэння не магла параўнацца з гэтым замкам.

Хваля Рэнесансу, якая прыйшла ў ВКЛ у першай палове XVI ст., значна ўзрушыла ідэйнае, культурнае і палітычнае жыццё краіны. Гэта ўвасобілася, напрыклад, у імкненні многіх магнацкіх родаў, у тым ліку Радзівілаў, да канструявання родавай міфалогіі і вывядзення продкаў ад міфічных князёў балцкага ці, яшчэ лепш, рымскага паходжання[171]. Нават першапачаткі дзяржаўнасці Вялікага Княства Літоўскага выводзіліся з рымскай традыцыі. Таму не дзіўна, што хваля рэнесансных ідэй закранула і архітэктуру. Тып рэгулярных рэзідэнцыянальных і абарончых умацаванняў актуалізаваўся ў кантэксце абарончай архітэктуры эпохі Антычнасці. Правільная форма абарончага рымскага лагера стала ідэальным правобразам для ўмацавання, рэзідэнцыі і горада. З гэтага часу, акрамя прыгажосці і змястоўнасці знешняга выгляду архітэктурнага комплексу, пачала рабіцца стаўка на матэматычную дасканаласць яго плана, якая грунтавалася не столькі на практычным досведзе, колькі на ідэйных уяўленнях. Ідэальны (ці блізкі да ідэальнага) характар меў драўляны замак XVI ст. у Нясвіжы, які адлюстраваны на гравюры Т. Макоўскага. Пад выразным уплывам рэнесанснай традыцыі быў збудаваны і замак роду Кішкаў у Любчы, які пазней перайшоў да Радзівілаў. Абарончы патэнцыял гэтай рэзідэнцыі быў даволі абмежаваны, чаго нельга сказаць пра яго ідэйнае напаўненне. Традыцыйная для ВКЛ форма кастэлі з вуглавымі вежамі ў дадзеным выпадку была «абноўлена» рэнесансным зместам і асацыіравалася з антычнымі формамі[172]. У выпадку магнатаў ВКЛ наяўнасць такога кшталту рэзідэнцый была дадатковай магчымасцю сцвердзіць сваё «рымскае паходжанне». Падобнымі меркаваннямі мог кіравацца і Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка, які ў 1570–1580-я гг. уклаў значныя сродкі ў перабудову і абнаўленне ў духу Рэнесансу замка-кастэлі ў Міры.

---

[170] *Schütte U.* Das Schloß als Wehranlage : befestigte Schloßbauten der frühen Neuzeit im alten Reich. S. 272.

[171] *Skiepjan A., Skiepjan N.* Drogi kształtowania pamięci historycznej rodów magnackich Wielkiego Księstwa Litewskiego w XVI wieku – początkach XVII w. // Tradycja – metody przekazywania i formy upamiętnienia w państwie polsko-litewskim, XV – I połowa XIX wieku / red. U. Augustyniak. Warszawa, 2011. S. 49.

[172] *Schütte U.* Das Schloß als Wehranlage: befestigte Schloßbauten der frühen Neuzeit im alten Reich. S. 144–145; *Gebuhr R.* Burgen und Festungen in Brandenburg. Kulturhistorische Fragen des Befestigungsbaus in der frühen Neuzeit // Erhalt und Nutzung historischer Zitadellen / H.-R. Neumann. Mainz am Rhein, 2002. S. 7.

Акрамя актуалізацыі формы рэгулярных збудаванняў, новая эпоха, верагодна, надала рэзідэнцыянальным комплексам новае значэнне. У гэты час значная ўвага пачынае надавацца практыкам канструявання памяці[173]. Цалкам верагодна, што рэзідэнцыі маглі пачаць успрымаць як сродак захавання памяці аб іх заснавальніках. Можна прыгадаць, напрыклад, што асоба Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі стала знакамітай сярод нашчадкаў у значнай ступені праз узвядзенне замка ў Нясвіжы. Праз паўстагоддзе пасля яго смерці прадстаўнік біржанскай галіны роду Багуслаў Радзівіл з вялікай пашанай згадваў пра прыклад першага нясвіжскага ардыната як заснавальніка адной з найбольш значных рэзідэнцый роду[174].

Новыя магчымасці для самасцвярджэння магнатаў у сферы рэзідэнцыянальнага будаўніцтва прынесла распаўсюджанне фартыфікацыйных умацаванняў бастыённага тыпу. Найбольш пашыранай на тэрыторыі ВКЛ формай абарончых умацаванняў новага кшталту стаў бастыённы замак, які фактычна быў новай формай феадальнай рэзідэнцыі. У яго архітэктуры мы бачым два асноўныя элементы: пояс бастыённых умацаванняў, якія адпавядалі патрэбам тагачаснай ваеннай тэхнікі, і развітую гаспадарчую і жылую часткі, неабходныя для функцыянавання магнацкага двара. Сама па сабе бастыённая сістэма фартыфікацыі дала магчымасць злучыць гэтыя два элементы, абавязковыя для рэзідэнцыі, у адзіную праграму[175]. Распаўсюджанне рэзідэнцый новай формы ў Еўропе, у прыватнасці ў Італіі і Германіі, далёка не заўжды было звязана з ваеннай неабходнасцю. Многія навейшыя фартэцыі будаваліся ў мірны час і былі аддалены ад найбольш небяспечных напрамкаў. Гэта сведчыць аб тым, што ва ўяўленні палітычнай эліты бастыённы замак быў інтэгральнай формай феадальнай рэзідэнцыі эпохі Рэнесансу і, па сутнасці, з'яўляўся вышэйшай і канчатковай формай развіцця сярэднявечных замкаў[176].

Характэрная для заходнееўрапейскіх краін сімвалічная сутнасць бастыённых рэзідэнцый, на нашу думку, была ўласцівая і магнацкім рэзідэнцыям на нашых землях, у прыватнасці, сядзібам Радзівілаў. Менавіта прадстаўнікі гэтага роду ўзвялі першыя бастыённыя замкі ў ВКЛ (Алыка, Біржы, Нясвіж). Пры гэтым будаўніцтва бастыённых замкаў Радзівіламі не заўсёды можна абгрунтаваць ваеннымі фактарамі. Калі Алыцкі і Біржанскі замкі былі ўзведзены ў рэгіёнах, для якіх была актуальнай пагроза або з боку татараў і казакаў, або з боку шведаў, то ў Нясвіжы, дзе ў апошняй чвэрці XVI ст. паўстаў магутны бастыённы замак, небяспека варожага нападу адчувалася значна менш. З гэтага вынікае, што для нашых зямель бастыённыя рэзідэнцыі сталі не толь-

[173] *Skiepjan A., Skiepjan N.* Drogi kształtowania pamięci historycznej rodów magnackich Wielkiego Księstwa Litewskiego w XVI wieku – początkach XVII w. S. 49–50.

[174] Przyczynki do historyi domowej w Polsce: (Samuel Korecki, Adam Tarło, Bogusław Radziwiłł). S. 54.

[175] *Schütte U.* Das Schloß als Wehranlage: befestigte Schloßbauten der frühen Neuzeit im alten Reich. S. 211–212.

[176] *Burger D.* Die Festungen der Hohenzollern in Brandenburg und Franken // Von Vestungen – Die brandenburgisch-preußischen Festungen Spandau, Peitz und Küstrin. Berlin, 2001. S. 43–44.

кі фартыфікацыйнымі аб'ектамі новага ўзроўню, але і ў значнай ступені новай формай сцвярджэння прэстыжу магнатэрыі і прапаганды новага грамадска-палітычнага парадку, у якім дамінавала магнацкая эліта.

Аб тым, якімі ідэямі кіраваліся магнаты, што закладвалі бастыённыя замкі, дакладна сказаць цяжка, аднак на падставе параўнання з нямецкімі землямі, з якімі меліся шчыльныя кантакты, можна выказаць пэўныя здагадкі. Нямецкі даследчык Д. Бургер праводзіць выразную паралель паміж канверсіяй асобных нямецкіх князёў з каталіцтва ў пратэстантызм і пачаткам актыўнай дзейнасці па пабудове іх рэзідэнцый. Напрыклад, маркграф Ёган фон Кустрын перайшоў у лютэранства ў 1537 г. і адразу пачаў пабудову новых умацаванняў вакол сваёй галоўнай рэзідэнцыі – Кустрына[177]. У гэтым увасобілася імкненне да суверэннай улады на ўласных землях. Фартыфікацыі новага кшталту, з аднаго боку, выразна дэманстравалі моц уласніка, а з іншага – дазвалялі абараніць сваю самастойнасць. Такім чынам, узвядзенне ўмацаванай рэзідэнцыі і змена веры былі элементамі аднаго працэсу – ідэйнага і палітычнага ўмацавання нямецкай княжацкай эліты. Водгукі падобнай стратэгіі можна бачыць і ў ВКЛ. Прыгадаем, што першыя бастыённыя замкі на нашых землях узвялі менавіта пратэстанты: Мікалай Радзівіл Чорны ў Алыцы, Крыштаф Радзівіл Пярун у Біржах і Ян Глябовіч у Заслаўі. У архітэктурным вырашэнні Заслаўскага замка пратэстанцкая ідэалогія была выяўлены найбольш выразна, бо пасярод дзядзінца быў пастаўлены пратэстанцкі збор з высокай вежай.

Аднак дамінаванне тыпу бастыённага замка ў ВКЛ нельга звязваць выключна з уплывам ідэалогіі пратэстанцкай нямецкай эліты. Будаўніцтва бастыённага замка ў Нясвіжы было ініцыятывай Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі, які адрокся ад пратэстантызму, які вызнаваў яго бацька, і вярнуўся ў каталіцтва. Такога кшталту рэзідэнцыі магнат мог бачыць і ў каталіцкіх краінах Еўропы, па якіх падарожнічаў. Для яго было зразумела, што бастыённы замак з'яўляецца ўніверсальнай формай архітэктурнага акцэнтавання высокага статусу кіроўнай эліты. Сам Сіротка меў моцны ўплыў на сваіх сучаснікаў і пазнейшыя пакаленні, у тым ліку ў ідэйным плане. На нашу думку, не без яго ўплыву Ян Караль Хадкевіч вырашыў закласці новы бастыённы замак у блізкіх ад Нясвіжа Ляхавічах[178].

Вельмі цікавым прыкладам з'яўляецца Нясвіж, дзе магнацкая сядзіба пераносілася двойчы. У канцы XV – XVI ст. Кішкі або Радзівілы збудавалі драўляны замак на месцы сучаснага Нясвіжа, куды была перанесена рэзідэнцыя з колішняга цэнтра воласці, які месціўся на гарадзішчы каля вёсак Слаўкава і Качановічы[179]. А ў канцы XVI ст. М. К. Радзівіл Сіротка побач з драўляным замкам збудаваў новы бастыённы. Як бачна на прыкладзе Нясвіжа, перанос абарончай рэзідэнцыі ў новае месца суправаджаўся карэннай зменай яе аба-

[177] *Burger D.* Die Festungen der Hohenzollern in Brandenburg und Franken. S. 30.

[178] *Волкаў М.* Будаўніцтва бастыённага замка Яна Караля Хадкевіча ў Ляхавічах // Магнацкі двор і сацыяльнае ўзаемадзеянне (XV–XVIII стст.) / рэд. А. М. Янушкевіч. Мінск, 2014. С. 351.

[179] *Мяцельскі А.* Пачаткі Нясвіжа. С. 10–16.

рончай і архітэктурнай канцэпцыі, што сведчыць аб значных зрухах у светапоглядзе магнатаў. Іншымі словамі, праз узвядзенне новай рэзідэнцыі ўласнік імкнуўся стварыць і сцвердзіць іншы вобраз сябе і сваёй ролі ў грамадстве.

Падагульняючы развагі наконт распаўсюджання бастыённых замкаў у ВКЛ, прывядзем словы вядомага нямецкага даследчыка У. Шутэ, які пісаў, што бастыённая фартыфікацыя фактычна дазволіла значна размежаваць розныя пласты феадальнага грамадства[180]. Драўляныя і дрэва-земляныя замкі і двары дробнай і сярэдняй шляхты, як, урэшце, і вялікага князя маральна састарэлі з прыходам бастыённай фартыфікацыі. І ні ў шляхты, ні ў манарха, ні ў большасці гарадоў не было сродкаў на будаўніцтва ўмацаванняў новага кшталту. Але такія магчымасці былі ў магнатаў, якія праз будаўніцтва бастыённых рэзідэнцый сцвярджалі сваё выключнае значэнне ў дзяржаве. Новая магнацкая эліта фактычна адмовілася ад ранейшых форм рэзідэнцый у выглядзе кастэляў з нарожнымі вежамі. Яны былі элементам старой грамадска-палітычнай сістэмы, у якой дамінавалі старыя княжацкія дынастыі, найперш нашчадкі Гедыміна. Новы ж тып рэзідэнцыі ў выглядзе бастыённых замкаў стаў выразным сімвалам рэалізацыі новага праекта грамадска-палітычнага ўладкавання ў ВКЛ, у якім сцвярджалася абсалютнае дамінаванне новай магнацкай эліты.

З канца XVI ст. у Заходняй Еўропе распаўсюджваецца старагаландская школа фартыфікацыі, асновай якой былі танныя і ўтылітарныя земляныя ўмацаванні. Выкарыстоўваць іх для ўзвядзення рэпрэзентацыйных рэзідэнцыянальных комплексаў было цяжка. Гэта прывяло да заняпаду з сярэдзіны XVII ст. у Заходняй Еўропе тыпу бастыённага замка як універсальнай формы, што спалучала ўмацаванне і рэзідэнцыю. Значэнне меў яшчэ і той фактар, што бастыённыя замкі былі невялікія па плошчы, і ва ўмовах з'яўлення пастаянных армій і ўдасканалення мастацтва вядзення аблогі згубілі свой абарончы патэнцыял[181]. У ВКЛ старагаландская манера набыла шырокае распаўсюджанне з другой чвэрці XVII ст. Пры гэтым у многіх выпадках выразна бачны ваенны ўтылітарызм умацаванняў (цытадэль і гарадскія ўмацаванні ў Слуцку, замак у Копысі). Разам з тым бастыённы замак як асноўны тып рэзідэнцыі яшчэ не страціў у ВКЛ сваёй актуальнасці. Адным з першых бастыённыя ўмацаванні паводле старагаландскай манеры ў 1630-я гг. атрымаў Біржанскі замак. У час вайны 1654–1667 гг. з дапамогай умацаванняў новай формы былі мадэрнізаваны фартыфікацыі Нясвіжскага замка. Крыху пазней, у 1670–1680-я гг., быў узведзены бастыённы замак у Глуску. Урэшце, на зломе XVII–XVIII стст. бастыённымі ўмацаваннямі была акружана рэзідэнцыя Радзівілаў у Белай. У час Вялікай Паўночнай вайны большасць умацаванняў на землях ВКЛ, у тым ліку ўмацаваныя рэзідэнцыі Радзівілаў, былі дашчэнту знішчаны, пасля чаго яны згубілі значэнне як абарончыя аб'екты.

---

[180] *Schütte U.* Das Schloß als Wehranlage: befestigte Schloßbauten der frühen Neuzeit im alten Reich. S. 213.

[181] *Burger D.* Die Festungen der Hohenzollern in Brandenburg und Franken. S. 42–47.

Фартэцыі, узведзеныя ў старагаландскай манеры, таксама не былі пазбаўлены сімвалічнай нагрузкі. Іх рэгулярная планіроўка і строгая арганізацыя ўнутранай прасторы адпавядалі абсалютысцкім тэндэнцыям, якія развіваліся ў еўрапейскіх краінах, калі строгая геаметрычнасць і выверанасць планаў фартэцый адпавядалі імкненню ўладароў да поўнага падпарадкавання грамадства і ўсталявання адзінаўладдзя[182]. У Рэчы Паспалітай абсалютысцкія тэндэнцыі з-за спецыфікі грамадска-палітычнага ладу не набылі развіцця. Тым не менш спробы ўкаранення мадэлі так званага *княжацкага абсалютызму*, які набыў пашырэнне ў нямецкіх землях, мелі месца і ў Рэчы Паспалітай. Найлепшым прыкладам з'яўляецца дзейнасць Багуслава Радзівіла, якому даследчыкі нават прыпісваюць планы па стварэнні ўласнай дзяржавы на тэрыторыі ВКЛ[183]. Найбольш характэрным прыкладам сацыяльнай геаметрыі ў выпадку Б. Радзівіла з'яўляецца перабудова горада-фартэцыі Слуцка ў 1650–1660-я гг. Адным з дзейсных інструментаў сацыяльнай геаметрыі, які праявіўся тут, была магутная бастыённая цытадэль. Яна была пазбаўлена рэпрэзентацыйнага выгляду, мела выразна ваенны характар і павінна была сцвярджаць абсалютнае дамінаванне ўласніка, трымаючы ў падпарадкаванні мяшчан. Такім чынам, узвядзенне слуцкіх умацаванняў, хаця і чыста ўтылітарных па сваёй сутнасці, было выклікана не толькі ваеннымі патрэбамі, але і ідэйнымі арыенцірамі яго ўласніка. Геаметрычная арганізацыя горада і падпарадкаванне яго цытадэлі не было навінкай для зямель ВКЛ. Падобныя комплексы былі ўзведзены яшчэ ў канцы XVI ст. у Біржах і Нясвіжы. На важнасць цытадэлі як сродку падпарадкавання мяшчан указвалі многія тэарэтыкі Рэнесансу[184].

На нашых землях канцэпцыя абарончай рэзідэнцыі, верагодна, з цягам часу зраслася з ідэалогіяй сарматызму і стала яе важным атрыбутам. Напрыклад, вядомы тэарэтык і практык картаграфіі і фартыфікацыі Юзэф Нарановіч-Наронскі, які быў цесна звязаны з біржанскімі Радзівіламі, у сваім трактаце пісаў, што ні сады, ні палацы так не аздабляюць сядзібу, як умацаванні[185]. Менавіта ваенная справа, згодна з ідэалогіяй сарматызму, з'яўлялася найбольш годным заняткам для шляхціча, таму «аздобленая» абарончымі ўмацаваннямі рэзідэнцыя была найбольш рэпрэзентацыйнай. У такім сэнсе трэба інтэрпрэтаваць і адбудову ў першай палове – сярэдзіне XVIII ст. Нясвіжскага замка, ушчэнт разбуранага шведамі ў 1706 г. Вакол замка спецыяльна былі адноўлены фартыфікацыйныя ўмацаванні, хаця фартэцыі такога кшталту на той час ужо страцілі свой сэнс. Для Міхала Казіміра Радзівіла Рыбанькі, які

[182] *Gebuhr R.* Festung und Repräsentation: zur Sozialgeometrie – These von Henning Eichberg // Technik, Arbeit und Umwelt in der Geschichte / G. Bayerl. Münster, 2006. S. 191–196.

[183] *Kossarzecki K.* Próby tworzenia udzielnego władztwa księcia Bogusława Radziwiłła w oparciu o dobra podlaskie i słuckie w okresie zalewu szwedzkiego i moskiewskiego przełomu 1655 i 1656 r. S. 23–41.

[184] *Schütte U.* Das Schloß als Wehranlage: befestigte Schloßbauten der frühen Neuzeit im alten Reich. S. 149, 160, 167.

[185] *Bogdanowski J.* Fortyfikacje łańcuckie na tle małopolskiej sztuki obronnej. S. 253.

ў 1735 г. атрымаў пасаду польнага, а ў 1744 г. – вялікага гетмана, было важна падкрэсліць свой рыцарскі габітус. Нясвіжскі замак быў для яго «родавым гняздом», сімвалам дынастыі і слаўнай ваеннай гісторыі свайго роду. Таму імкненне Рыбанькі да аднаўлення фартыфікацый вакол сваёй галоўнай рэзідэнцыі, як і ўпрыгожванне залаў яе палаца габеленамі і карцінамі з выявамі ваенных перамог сваіх продкаў былі з'явамі аднаго парадку[186]. Урэшце, менавіта дзякуючы магутнай сармацкай традыцыі на працягу XVII–XVIII стст. не страчваў свайго значэння як рэзідэнцыя архаічны па сваёй архітэктуры Мірскі замак.

Сімвалічна-знакавае напаўненне меў як увесь комплекс рэзідэнцыі, так і асобныя яе дэталі. Гэта варта ўлічваць пры вывучэнні абарончай архітэктуры рэзідэнцый XVI–XVIII стст. Найбольш выразным сімвалічным значэннем валодалі вышынныя дамінанты, ці вежы. Нават пазбаўленыя абарончых функцый, вежы былі характэрным атрыбутам рэзідэнцый шырокага арэала Цэнтральнай і Паўночнай Еўропы[187]. Спецыфікай нашых зямель з'яўлялася дастаткова пашыраная практыка ўзвядзення вежаў над брамамі. У гэтым выпадку можна смела казаць аб пераемнасці трывалай мясцовай традыцыі, бо вежы-брамы былі абавязковым атрыбутам мясцовага абарончага будаўніцтва з пачатку XIV ст. У XVI–XVII стст. яны набылі важнае значэнне для візуалізацыі ідэйнай праграмы рэзідэнцыянальных комплексаў[188]. Зыходзячы з гэтага, можна па-іншаму паглядзець на вежу-браму Мірскага замка (мал. 2). Сапраўды, для кастэлі такога кшталту, дзе дзве суседнія вуглавыя вежы даволі эфектыўна фланкіравалі падыходы да брамы, магутная вежа над брамай не была патрэбная. А вежа-брама Мірскага замка па памерах пераўзыходзіць вуглавыя вежы і гэтым нават стварае перашкоду для вядзення флангавага агню з суседніх вежаў. Іншымі словамі, ужо ў пачатку XVI ст. мы бачым факт акцэнтавання значэння вежы-брамы насуперак патрэбам фартыфікацыі. У бастыённай фартыфікацыі, асабліва ў старагаландскай сістэме, магчымасці для сімвалічнага насычэння абарончых збудаванняў значна зменшыліся. На гэтым фоне істотна ўзрасло значэнне брам. Яны сталі адным з галоўных элементаў, які раскрываў ідэйную канцэпцыю рэзідэнцый. Пры гэтым у абарончай архітэктуры Заходняй Еўропы быў выпрацаваны новы тып брам у выглядзе трыумфальнай аркі. Насуперак гэтаму ў ВКЛ папулярнасцю карысталіся брамы з вежамі. Значэнне брам у бастыённых замках падкрэслівае цікавы прыклад. У час перабудовы Біржанскага замка ў 1630-я гг. яго ўладальнік

[186] *Волкаў М. А.* Карціны і габелены на батальныя сюжэты XVI–XVIII стст. у аздабленні Нясвіжскага замка // Архівары́ус. Мінск, 2016. Вып. 14. С. 132–144.

[187] *Miłobędzki A.* Polskie rezydencje wieku XVII – typowe programy i rozwiązania. S. 9.

[188] *Schütte U.* Das Schloß als Wehranlage: befestigte Schloßbauten der frühen Neuzeit im alten Reich. S. 186, 202; *Augustyniak U.* Drewniane dwory Radziwiłłów birżańskich w pierwszej połowie XVII wieku – rezydencje czy siedziby? // Rezydencje w średniowieczu i czasach nowożytnych / red. nauk. E. Opaliński, T. Wiślicz. Warszawa, 2001. S. 109; *Dybaś B.* Twierdza czy rezydencja? Militarne znaczenie siedzib magnackich w XVII wieku. S. 71; *Bania Z.* Nowożytne zamki polskiej magnaterii. Uwagi o reprezentacji na wybranych przykładach. S. 113.

Мал. 2. Вежа-брама Мірскага замка

К. Радзівіл настойваў на тым, каб была захавана брама як памяць аб яго бацьку, які заклаў замак[189].

Факт захавання старога збудавання ў складзе перабудаванай рэзідэнцыі ў Біржах дае магчымасць звярнуць увагу на прычыну, якая вымушала магнатаў інтэграваць у склад новых комлексаў старыя элементы. Старыя будынкі мелі важную сімвалічную ролю і павінны былі сведчыць, з аднаго боку, пра старажытнасць дынастыі ўладальніка, а з іншага, – пра сувязь з традыцыяй, на якой грунтавалася легітымнасць высокага становішча магната ў грамадстве. Такога кшталту перакананні вымушалі замоўцаў уводзіць у склад новазбудаваных рэзідэнцый архаічныя элементы. У дадзеным выпадку хацелася б звярнуць увагу на тып так званых *дазорных вежаў*, які ўзводзілі ў некаторых бастыённых замках, у тым ліку ў Нясвіжы (мал. 3). Яны маглі выкарыстоўвацца для патрэбы абароны замка і служыць для назірання за наваколлем у час ваеннай небяспекі. Аднак знакавая вартасць такога кшталту вежаў была не менш важнай. Іх традыцыю

[189] *Wasilewski T.* Budowa zamku i rezydencji Radziwiłłów w Birżach w latach 1586–1654 // Podług nieba i zwyczaju polskiego : studia z historii architektury, sztuki i kultury ofiarowane Adamowi Miłobędzkiemu / red. Z. Bania. Warszawa, 1988. S. 263.

Мал. 3. Нясвіжскі замак. Н. Орда. 1876 г.

трэба звязваць з так званымі *вежамі валынскага тыпу* і *бергфрыдамі*, вядомымі на нашых землях з XIII ст. Такога кшталту вежы з'яўляліся выразнымі архітэктурнымі дамінантамі, якія былі бачныя на далёкай адлегласці і сцвярджалі ўладу ўласніка замка над яго землямі. У эпоху Рэнесансу такога кшталту дамінанты выконвалі функцыі лесвічных клетак, як гэта было ў Нясвіжы. Сваё сімвалічнае значэнне вежы захоўвалі і надалей, застаючыся ажно да XIX ст. важнымі сімваламі арыстакратыі[190]. Адным з найбольш яскравых прыкладаў на нашых землях з'яўляецца радзівілаўскі палац у Манькавічах, збудаваны ў канцы XIX ст. Выразнай вышыннай дамінантай гэтага будынка з'яўлялася вежа, спраектаваная па ўзоры вежы Нясвіжскага замка, родавага гнязда Радзівілаў.

У бастыённым замку ў Нясвіжы быў рэалізаваны яшчэ адзін архітэктурны тып збудавання, які мае сувязь з абарончым дойлідствам. Свой палац Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка вырашыў узвесці ў выглядзе шмат'яруснага збудавання з нарожнымі вежамі. Генеалогія такога кшталту пабудоў узыхо-

[190] *Meierink B. O.* Der große Turm: ein Adelssymbol? // Burgen und Schlösser in den Niederlanden und in Nordwestdeutschland / G. von Büren, H. H. Häffner, G. U. Großmann. München ; Berlin, 2004. S. 177–184.

дзіць да французскіх данжонаў[191]. Для Сіроткі такога кшталту будынак мусіў быць сімвалам «дому», дынастыі, ці роду Радзівілаў. Значная вышыня палаца, у сваю чаргу магла падштурхнуць архітэктара спраектаваць і ўзвесці вакол высокія земляныя валы, каб абараніць яго ад абстрэлу. Такім чынам, архітэктурнае вырашэнне рэпрэзентацыйных будынкаў магло паўплываць на абарончую канцэпцыю замка.

Акрамя вежаў і брам, знакавую нагрузку маглі несці і іншыя збудаванні, першасная функцыя якіх была абарончай. Напрыклад, роў вакол рэзідэнцыі сімвалізаваў сацыяльную дыстанцыю паміж уладальнікам рэзідэнцыі і яго падданымі. Важнае значэнне меў будаўнічы матэрыял. Існуе меркаванне, што ў Сярэднявеччы ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе цэгла, апроч трываласці, надавала будынкам таксама выключна эксклюзіўна-рэпрэзентатыўны характар[192]. Такім чынам, найбольш значныя будынкі ўзводзіліся з цэглы і накрываліся дахоўкай, што падкрэслівала ранг іх уласнікаў. Найбольш выразным прыкладам з'яўляецца Мірскі замак, узведзены Юрыем Іллінічам у першай чвэрці XVI ст. Гэты комплекс быў надзвычай дарагім, а па сваім абарончым патэнцыяле, напэўна, не надта пераўзыходзіў дрэва-земляны замак Радзівілаў у Пячкоўскім Гарадку, збудаваны ў той жа час. Аднак у выбары будаўнічага матэрыялу і формы для сваёй рэзідэнцыі Юрый Іллініч кіраваўся найперш пытаннем прэстыжу.

Істотнае значэнне мела і сама геаметрыя комплексу. Лічыцца, што яшчэ ў Антычнасці, найперш праз тэорыі Піфагора, зарадзілася своеасаблівае эстэтычна-матэматычнае ўспрыманне свету. Паводле яго, арыфметычныя канцэпцыі дазвалялі спасцігнуць прынцыпы ўладкавання Сусвету, таму іх ужыванне пашыралася на розныя віды чалавечай дзейнасці і ў тым ліку на архітэктуру, дзе яно было рэалізавана ў рознага кашталту прасторава-геаметрычных канцэпцыях: прынцыпе прапорцый, канцэпцыі ідэальнага горада і г. д. Такім чынам архітэктурнае праектаванне набывала глыбокі сімвалічны і містычны сэнс. Асабліва гэта праявілася ў эпоху Рэнесансу, з яго цікавасцю да антычнай спадчыны. Містычны складнік узмацняўся і павышанай цікавасцю да вучэння Кабалы[193]. Таму будаўніцтва абарончых рэзідэнцый часта давяралі не ваенным, а цывільным архітэктарам, якія з дапамогай цыркуля стваралі ідэальныя ў плане праекты[194].

Аднак на рэальных помніках уплыў такога кшталту ўяўленняў выявіць надзвычай складана. Напрыклад, правільныя ў плане фартэцыі былі больш

---

[191] *Волкаў М.* Абарончыя храмы ВКЛ: меркаванне аб паходжанні тыпа // Історія релігій в Україні : наук. щорічн. Львів, 2009. Кн. 2. С. 390.

[192] *Herrmann C.* Der rote Backstein – Farbe herrschaftlicher Präsentation oder monastischer Bescheidenheit? // Backsteinarchitektur im Ostseeraum: neue Perspektiven der Forschung; Katalog zur gleichnamigen Ausstellung / E. Gierlich, C. Herrmann, M. Müller. Petersberg, 2015. S. 12–13.

[193] *Липа К.* Теорія архітектури, містика і війна. Київ, 2016. С. 45–49.

[194] *Schütte U.* Das Schloß als Wehranlage: befestigte Schloßbauten der frühen Neuzeit im alten Reich. S. 296–297.

абароноздольнымі, паколькі ў іх увесь фронт максімальна ўніфікаваўся, а слабыя месцы, найбольш прыдатныя для штурму, практычна адсутнічалі. Таму выявіць, чым кіраваліся замоўца і архітэктар, абіраючы форму для ўмацавання, – ідэалістычнымі перакананнямі ці ваеннымі абставінамі – амаль немагчыма. Акрамя таго трэба мець на ўвазе два наступныя моманты. Па-першае, для людзей эпохі ранняга Новага часу містычнае і рэальнае не існавалі паасобку, а арганічна спалучаліся, што не заўжды зразумела для нас. Па-другое, эфектыўнасць той ці іншай формы для ўмацавання нельга было праверыць адразу, у тым ліку дакладна пралічыць памеры гарнізона, характар небяспекі і будучага ваеннага канфлікту. Таму замоўцы і архітэктары шмат у чым кіраваліся тэорыямі, на якія аказвалі ўплыў ідэалістычныя ўяўленні і містыка.

Вельмі цікавым з'яўляецца прыклад Нясвіжскага бастыённага замка канца XVI ст. Правільная ў плане фартэцыя мела чатыры дасканалыя бастыёны, што характэрна для бастыённых замкаў ВКЛ другой паловы XVI – сярэдзіны XVII ст. Пры гэтым лічба 4 лічылася адной з ключавых лічбаў у містычнай карціне свету хрысціян: колькасць літар у імені Адама, чатыры бакі свету, чатыры пары года і г. д. Паводле Платона і Арыстоцеля, у прыродзе меліся чатыры стыхіі, ці элементы, а Вітрувій лічыў чатыры лічбай чалавека[195]. Аднак толькі сама форма замка не дазваляе адназначна сцвярджаць, што яго фундатар – Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка – кіраваўся нейкімі містычнымі ўяўленнямі. Пераканацца ў гэтым дазваляе артылерыйскі парк, які магнат вырабіў спецыяльна для новазбудаванай фартэцыі. У першай замове на гарматы мы бачым наступны пералік: дзве цяжкія гарматы «Св. Мікалай» і «Св. Крыштаф», чатыры «каменныя» гарматы з выявамі стыхій («Вада», «Зямля», «Паветра» і «Агонь») і чатыры такія ж з выявамі апосталаў («Св. Ян», «Св. Лука», «Св. Павел», «Св. Марк»). Такім чынам, і стыхіі, і святыя мусілі абараняць чатыры бастыёны Нясвіжскага замка. Аб непадзельнасці рэальнага прызначэння гармат, як зброі, і іх містычнай знакавай нагрузкі яшчэ больш сведчаць гарматы, адлітыя ў самім Нясвіжы Германам Мольцфельтам (4 цяжкія і 8 лёгкіх). Кожная з іх мае развітае дэкаратыўнае аздабленне і форму, якія выцякаюць з канцэпцыі гармат, увасабляюцца ў адмысловым дэвізе і назве («Саламандра», «Кракадзіл», «Георгій», «Аляксандр», «Гідра», «Цэрбер», «Вінаград» , «Цырцэя», «Папугай», «Сава», «Мелюзіна», «Хімера»). Такім чынам, зброя, прызначаная для абароны замка, фактычна з'яўлялася шэдэўрам ліцейнага мастацтва са значнай семантычнай нагрузкай.

З пачатку XVI ст. у значнай ступені ў выніку культурных уплываў краін Цэнтральнай і Заходняй Еўропы абарончыя рэзідэнцыі сталі адным з важнейшых элементаў дынастычна-станавага самаўсведамлення вышэйшай праслойкі землеўласнікаў у ВКЛ. Пры гэтым абарончая архітэктура мела высокае

[195] *Липа К.* Теорія архітектури, містика і війна. С. 49.

сімвалічнае значэнне, бо ўвасабляла магутнасць і становішча ў грамадстве ўласнікаў умацаваных рэзідэнцый. Знакавае напаўненне меў як увесь архітэктурны комплекс, так і асобныя яго дэталі. Таму выгляд рэзідэнцый быў вельмі важны для самарэпрэзентацыі статусу ўласнікаў. Паводле нямецкага даследчыка У. Шутэ, поспеху ў вывучэнні архітэктурных комплексаў рэзідэнцыянальнага прызначэння можна дасягнуць толькі тады, калі архітэктуру разглядаць не проста як адбітак палітычнай і сацыяльнай сітуацыі ці атрыбут панавання, але і як спецыяльную форму праяўлення ўласніка[196]. Калі браць яшчэ больш шырока, то архітэктуру трэба разглядаць у агульным сэнсе як сродак пераўтварэння навакольнага свету. У сваю чаргу рэзідэнцыянальныя аб'екты мелі велізарнае значэнне для стварэння каштоўнасных арыенціраў і ўладкавання жыццядзейнасці соцыуму.

[196] *Schütte U.* Das Schloß als Wehranlage: befestigte Schloßbauten der frühen Neuzeit im alten Reich. S. 10.

Глава 3

Абарончая архітэктура

† Традыцыйныя драўляныя ўмацаванні

† Мураваныя замкі

† Мадэрнізаваныя дрэва-земляныя ўмацаванні

† Бастыённыя ўмацаванні новаітальянскай сістэмы

† Бастыённыя ўмацаванні старагаландскай сістэмы

Фармальна пачатак прыватнаўласніцкага абарончага будаўніцтва ў ВКЛ можа быць звязаны з прывілеем Ягайлы 1387 г., які дазволіў прыватным асобам валодаць землямі з замкамі. Да гэтага часу валодаць значнымі ўмацаваннямі, якія кантралявалі вялікія воласці, акрамя манарха, маглі толькі князі з дынастый Гедымінавічаў і Рурыкавічаў, якія кіравалі ўдзельнымі княствамі пад уладай вялікіх князёў, а таксама група літоўскіх князёў, якія мелі спадчынныя ўладанні на тэрыторыі гістарычнай Літвы і Жамойці. Паводле прывілея 1387 г., права на валоданне землямі з замкамі было пашырана на баярства гістарычнай Літвы, ахрышчанае ў каталіцкую веру. Адной з прычын гэтага новаўвядзення было імкненне Ягайлы стварыць аснову для сваёй улады ў ВКЛ у супрацьвагу старой эліце і найперш Гедымінавічам, якія маглі прэтэндаваць на велікакняжацкі прастол. Адным з баярскіх родаў, узвышэнне якога пачалося ў выніку гэтай рэформы, былі Радзівілы. Паводле прывілеяў Ягайлы 1432 г. і Жыгімонта Кейстутавіча 1434 г., права на валоданне землямі з замкамі было пашырана на князёў і баяр праваслаўнага веравызнання. У 1447 г. гэтае права было замацавана агульназемскім прывілеем Казіміра Ягелончыка[197]. Атрыманыя ад гаспадара замкі ўласнікі маглі перабудоўваць, пераносіць на іншае месца альбо закладваць у сваіх землях новыя больш дасканалыя ўмацаванні.

У пісьмовых крыніцах да цяперашняга часу не ўдалося выявіць колькінебудзь пераканаўчых сведчанняў аб існаванні ў ВКЛ практыкі рэгулявання прыватнаўласніцкага абарончага будаўніцтва з боку цэнтральнай улады. Прычынай гэтаму, па ўсёй верагоднасці, была дэцэнтралізацыя сістэмы кіравання дзяржавай, якая была закладзена ў яе аснову яшчэ пры ўтварэнні ВКЛ. Гэта значыць, права на валоданне землямі з замкамі з самага пачатку мелі князі з дынастыі Гедымінавічаў і Рурыкавічаў, а таксама прадстаўнікі некаторых іншых княжацкіх родаў. З іншага боку, утрыманне абарончага ўмацавання ці замка магло разглядацца як натуральны абавязак землеўласніка па забеспячэнні абароны сваіх зямель і падданых. Для параўнання, справы з продажам ці набыццём зямлі доўгі час вымагалі дазволу вялікага князя. Таксама магнатам і шляхце забаранялася без згоды з боку манарха засноўваць у сваіх

[197] *Бохан Ю. М.* Вайсковая справа ў Вялікім княстве Літоўскім у другой палове XIV – канцы XVI ст. С. 396.

землях гарады і мястэчкі з правам вольнага гандлю і збірання мыта і надаваць ім прывілеі на самакіраванне. Характэрным прыкладам з'яўляецца прывілей вялікага князя Аляксандра на пабудову замка і заснаванне мястэчка каля возера Іказнь, выдадзены ў 1504 г. на імя Івана Сапегі[198]. Замак у дадзеным выпадку згаданы ў сувязі з планаваным стварэннем новага прыватнаўласніцкага паселішча, якое набывала статус горада і ўсе звязаныя з гэтым правы і абавязкі. З прыняццем у 1588 г. Статута ВКЛ прыватным уласнікам было дазволена засноўваць гарады, аднак права надання прывілеяў на самакіраванне засталося за гаспадаром да канца існавання Рэчы Паспалітай[199].

На зломе XV–XVI стст. у ВКЛ узрасло значэнне вузкай групы заможных баярскіх родаў літоўскага і рускага паходжання, у склад якой уваходзілі і Радзівілы. У далейшым з гэтай групы фарміруецца магнатэрыя, якая да канца XVIII ст. захоўвала эканамічнае і палітычнае дамінаванне ў дзяржаве. Працэс нараджэння новай эліты выразна адлюстроўвае ўсплёск будаўніцтва прыватнаўласніцкіх замкаў у канцы XV – пачатку XVI ст. На месцы старых сядзіб буйныя землеўласнікі пачалі ўзводзіць новыя, больш дасканалыя ў рэпрэзентатыўным і абарончым плане рэзідэнцыі. Часам іх проста пераносілі на новыя месцы і будавалі «на сырым корані». Верагодна, адным з першых стаў мураваны замак Багдана Саковіча ў Мядзеле, збудаваны ў канцы XV ст. Пасля смерці магната ён перайшоў у валоданне Радзівілаў і стаў фактычна першай мураванай рэзідэнцыяй роду[200]. У 1504 г. І. Сапега атрымаў дазвол на будаўніцтва замка ў Іказні. У 1510–1520 гг. Альбрэхт Гаштольд узвёў мураваныя замкі ў Геранёнах і Койданаве, а Юрый Іллініч – у Міры[201].

У выніку велікакняжацкіх наданняў, праз шлюб, куплю ці абмен у валоданне розных галін Радзівілаў перайшла значная колькасць умацаваных рэзідэнцый. Усяго, па нашых падліках, у XVI – пачатку XVIII ст. у валоданні Радзівілаў на землях Беларусі знаходзіліся 16 абарончых умацаванняў, якія выконвалі ці маглі выконваць рэзідэнцыянальныя функцыі. З іх 7 знаходзіліся ў цэнтрах найбольш значных зямельных уладанняў і для асобных галін роду ў розны час выконвалі ролю цэнтральных рэзідэнцый (Глуск, Клецк, Мір, Мядзел, Нясвіж, Слуцк, Пячкоўскі Гарадок), а іх забеспячэнню надавалася найбольшая ўвага. Астатнія 9 мелі выразна другасны характар (Давыд-Гарадок, Капыль, Койданава, Копысь, Любча, Магільна, Свержань, Свіслач, Старое Сяло).

---

[198] Собрание государственных и частных актов, касающихся истории Литвы и соединенных с ней владений (от 1387 до 1710 г.). / ред. М. Крупович. Вильно, 1858. Ч. 1. С. 32.

[199] *Alexandrowicz S.* Studia z dziejów miasteczek Wielkiego Księstwa Litewskiego. S. 12, 23.

[200] *Волкаў М. А., Плавінскі М. А.* Мядзельскі замак у святле пісьмовых і археалагічных крыніц. С. 67–69, 85–86.

[201] *Ткачоў М. А.* Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII–XVIII стст. С. 63, 94; *Baronas D.* Fortifications innovations of the Great Dutch of Lithuania during the reign of Sigismundus Augustus (1548–1572) // Zamek i dwór w średniowieczu od XI do XV wieku / red. J. Wiesiołowski. Poznań. S. 80; *Скеп'ян Н.* Пачаткі будаўніцтва прыватнаўласніцкіх мураваных замкаў у Вялікім княстве Літоўскім. С. 54–63.

Розная ўвага Радзівілаў да асобных рэзідэнцый адбівалася на іх архітэктуры і абарончым патэнцыяле. У выніку ў кожным асобным выпадку сфарміраваўся шмат у чым адметны абарончы комплекс. Таму для вывучэння характару ўмацаванняў і абарончага патэнцыялу рэзідэнцый Радзівілаў на розных этапах іх існавання мэтазгодна ўжыць пэўную класіфікацыю. Асноўным яе прынцыпам з'яўляецца характар абарончай архітэктуры. Мы выдзелілі пяць тыпаў умацаванняў, якія маюць выразныя асаблівасці: традыцыйныя драўляныя і мадэрнізаваныя дрэва-земляныя фартыфікацыі, мураваныя замкі, бастыённыя фартыфікацыі новаітальянскай і старагаландскай сістэмы. Паслядоўны разгляд гэтых тыпаў дазваляе зрабіць высновы аб абароназдольнасці асобных рэзідэнцый Радзівілаў у розныя перыяды іх існавання.

3.1. Традыцыйныя драўляныя ўмацаванні

Значная частка замкаў, якімі валодалі Радзівілы ў XVI – першай палове XVII ст., мелі традыцыйныя для рэгіёна драўляныя ўмацаванні (Давыд-Гарадок, Капыль, Клецк, Копысь, Свержань, Свіслач, Слуцк, Старое Сяло). Гэта тлумачыцца тым фактам, што ў сваёй большасці яны бралі свой пачатак ад абарончых гарадоў старажытнарускага часу. Ад умацаванняў папярэдняга часу яны перанялі планіровачнае вырашэнне і многія характэрныя асаблівасці абарончых збудаванняў. Таму ў гэтым выпадку можна казаць аб прамой пераемнасці сярэднявечнай абарончай архітэктуры, якая на нашых землях захоўвала актуальнасць да XVII ст.

Як правіла, гэта былі невялікія па плошчы і няправільныя па форме ўмацаванні. Выбар планіровачнага вырашэння, якім кіраваліся яшчэ ў старажытнарускі час, тлумачыўся імкненнем замкнуць найбольшую па плошчы тэрыторыю з дапамогай як мага меншай па працягласці абарончай лініі. Таму, наколькі дазваляла тапаграфія мясцовасці, форма гэтых замкаў набліжалася да правільнага кола. Часта такога кшталту замкі знаходзіліся на мысах ля ўпадзення невялікіх рэк у большыя (Давыд-Гарадок, Клецк, Копысь, Свіслач, Слуцк). Гэта дазваляла максімальна выкарыстаць умовы мясцовасці для павышэння абароназдольнасці ўмацаванняў.

Побач з невялікімі дзядзінцамі, як правіла, яшчэ з сярэднявечча існавалі большыя па плошчы ўмацаваныя пасады, вядомыя ў літаратуры пад тэрмінам *вакольны горад*. У далейшым гандлёва-рамеснае насельніцтва было выціснута з іх тэрыторыі, і яны ў форме прадзамчаў, або ніжніх замкаў, былі ўключаны ў склад рэзідэнцыянальных комплексаў. Такога кшталту двухчасткавыя замкі меліся ў Давыд-Гарадку, Капылі, Клецку і Слуцку. Першапачаткова прадзамчы выконвалі пераважна гаспадарчыя функцыі і мелі другаснае значэнне ў параўнанні з верхнімі замкамі, якія валодалі значна больш магутнымі ўмацаваннямі і змяшчалі на сваёй тэрыторыі галоўныя будынкі рэзідэнцый (мал. 4). Аднак з XVI ст. жыллёва-рэпрэзентацыйную частку рэзідэнцый пачалі пераносіць на большае па плошчы прадзамча, што тлумачылася пашырэннем яе



Мал. 4. Замак у Рэчыцы. А. Вестэрфельт. Сярэдзіна XVII ст. MWP. Nr inw. 16613A*

функцый і ўскладненнем архітэктурнай праграмы. Такая сітуацыя характэрна для найбольш значных рэзідэнцый Радзівілаў (Клецк і Слуцк). Пры гэтым верхнія замкі яшчэ пэўны час заставаліся цэнтрамі абароны, аб чым сведчыць, напрыклад, наяўнасць на іх тэрыторыі арсеналаў, у якіх захоўваўся ваенны рыштунак. Акрамя замкаў, традыцыйныя па форме драўляныя ўмацаванні мелі таксама найбольш значныя гарады (Копысь, Свіслач, Слуцк).

Для павышэння абароназдольнасці ўмацаванняў натуральныя тапаграфічныя ўмовы мясцовасці дапаўняліся штучнымі перашкодамі – валамі і рвамі. Пры гэтым роля валоў як абарончага элемента, па ўсёй верагоднасці, першапачаткова не была значнай. Валы, як правіла, існавалі яшчэ са старажытнарускага часу і ўяўлялі сабою рэшткі папярэдніх умацаванняў, а іх выкарыстанне дазваляла павялічыць вышыню абарончых умацаванняў. Значэнне земляных валоў істотна ўзрасло са з'яўленнем артылерыі новага тыпу ў XVI ст.

Асноўным абарончым элементам гэтага тыпу замкаў былі драўляныя сцены, якія цалкам ахоплівалі абарончы перыметр. Найбольш простым варыянтам канструкцыі сцяны быў вастракол з пастаўленых вертыкальна завостраных бярвенняў. Такога кшталту сцены ў крыніцах XVI–XVII стст. фігуруюць пад тэрмінамі «паркан» і «астрог». Больш моцнымі і надзейнымі былі сцены са зрубаў-гародняў, наверсе якіх праходзіла баявая галерэя з брустверам з вонкавага боку і дахам. Самі гародні выкарыстоўвалі як гаспадарчыя ці

Мал. 5. Рэчыца. А. Вестэрфельт. Сярэдзіна XVII ст.



Мал. 6. Гарадскія ўмацаванні Рэчыцы. К. Эйгірд, 1649 г.

жылыя памяшканні, або для ўмацавання сцяны яны маглі засыпацца зямлёй і камянямі. Для большай трываласці і прадухілення падпалу драўляныя сцены абмазваліся глінай[202]. Калі ўмацаванне мела некалькі ліній абароны, тады, як правіла, з дапамогай гародняў умацоўвалася галоўная частка комплексу, ці верхні замак, а ніжні замак атрымліваў больш слабыя ўмацаванні ў выглядзе вастракола[203]. Больш простымі былі ўмацаванні гандлёва-рамесных гарадоў (мал. 5–6). Зрэшты такое ранжыраванне абарончых ліній па ўзроўні іх абароназдольнасці – агульнавядомая з'ява[204].

[202] *Бохан Ю. М.* Вайсковая справа ў Вялікім княстве Літоўскім у другой палове XIV – канцы XVI ст. С. 408–409.

[203] *Якімовіч Ю. А.* Драўляныя замкі Беларусі. С. 122.

[204] *Bogdanowski J.* Fortyfikacje łańcuckie na tle małopolskiej sztuki obronnej. S. 139, 172.

Адпаведна з познесярэднявечнымі прынцыпамі фартыфікацыі важна было максімальна павялічыць вышыню ўмацаванняў. Таму высокія сцены з гародняў лічыліся больш надзейнымі за нізкі вастракол. Вялікае значэнне для павышэння абароназдольнасці ўмацаванняў мелі вежы, якія дасягалі значнай вышыні. Ва ўмацаваннях познесярэднявечнага тыпу галоўная стаўка рабілася на франтальную абарону перыметра, таму першапачаткова вежы служылі месцам канцэнтрацыі абаронцаў, якія маглі працягваць змагацца нават пры прарыве праціўнікам абарончага перыметра[205]. Але на працягу XVI ст. значэнне вежаў як фланкіравальнага элемента адносна сумежных сцен істотна ўзрасло. Пры гэтым у XVII ст., нягледзячы на шырокае выкарыстанне ў абарончым будаўніцтве традыцыйных форм драўляных умацаванняў, назіраецца адмаўленне ад высокіх вежаў на карысць больш нізкіх башт, асноўнай функцыяй якіх было фланкіраванне. Таксама адмаўляюцца ад высокіх сцен з гародняў на карысць невысокіх вастраколаў, спалучаных з моцнымі землянымі ўмацаваннямі.

Адной з найбольш значных рэзідэнцый нясвіжскай галіны роду ў другой палове XVI ст. быў Клецк (мал. 7). Крыху пазней ён стаў цэнтрам асобнай ардынацыі. Таму Клецк у пачатку XVII ст. ва ўсёй сваёй велічы быў адлюстраваны на гравюры Тамаша Макоўскага. Верхні, ці Высокі, замак меў форму, блізкую да круга памерам 90 × 100 м, і плошчу 0,75 га. Па яго перыметры

Мал. 7. Клецк. Т. Макоўскі. Пачатак XVII ст.

[205] *Ласковский Ф. Ф.* Материалы для истории инженернаго искусства в России. Ч. 1. С. 118.

быў насыпаны вал, які, па даных археалогіі, пачалі ўзводзіць яшчэ ў XI ст., а ў XII–XIII стст. падсыпалі. Гэтаксама яшчэ ў старажытнарускі час земляны вал атрымаў вакольны горад, які паўколам ахопліваў умацаваны дзядзінец. Як адзначае В. Паднякоў, па плошчы ўмацаванага пасада (8,6 га) Клецк пераўзыходзіў многія іншыя тагачаныя гарады. Пазней на яго месцы паўстаў Ніжні, або Нізкі, замак. Паводле пісьмовых крыніц, у 1507 г. у Клецку існаваў «горад» і «паркан». Горадам, найверагодней, называўся ўмацаваны сцяной з гародняў дзядзінец, а парканам – вакольны горад, які быў акружаны простым вастраколам[206]. У сярэдзіне XVI ст. функцыі рэзідэнцыі выконваў Верхні замак, на якім размяшчаўся адпаведны комплекс жыллёва-гаспадарчых будынкаў[207]. З пераходам Клецка ў сярэдзіне XVI ст. у рукі Радзівілаў сітуацыя карэнным чынам змянілася. Тэрыторыя Ніжняга замка была цалкам уключана ў рэзідэнцыянальны комплекс. Пры гэтым абсалютная большасць гаспадарчых і жылых будынкаў рэзідэнцыі была перанесена на тэрыторыю Ніжняга замка, дзе знаходзіліся два палацы з мураванымі паграбамі, дом урадніка, капліца, кухня, бровар, свірны, стайні і інш. На Верхнім замку застаўся толькі цэйхгаўз. Як можна меркаваць па інвентары 1626 г., на велізарным па плошчы Ніжнім замку былі таксама закладзены ажно тры сады. Яго ўмацаванні ўяўлялі сабою паркан з 10 «баштачкамі» і дзвюма брамамі. Верхні замак быў умацаваны драўлянай сцяной з гародняў, якая ў 1626 г. ужо знаходзілася ў дрэнным стане. Таксама мелася вежа-брама з гадзіннікам наверсе і турмой унізе[208]. Такім чынам, значэнне і абароназдольнасць Ніжняга замка пры Радзівілах узраслі, у той час як Верхні замак пачаў паступова прыходзіць у заняпад. Пасля спалення Клецка ў 1655 г., замкі як абарончыя аб'екты больш не аднаўляліся. У інвентары 1694 г. згадваецца аб павіннасці мяшчан абнесці замак і сады, а таксама горад парканам з чатырма брамамі[209]. В. Паднякоў мяркуе, што гэтыя планы былі часткова рэалізаваны[210]. Аднак гэта



Мал. 8. Замак у Давыд-Гарадку. Паводле П. А. Рапапорта

[206] *Паднякоў В. С.* Клецк X–XVIII стст. Матэрыяльная і духоўная культура беларускага феадальнага горада. С. 24–27.

[207] *Скеп'ян А. А.* Дзве ардынацыі – два цэнтры: Клецк і Нясвіж. С. 144–146.

[208] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 3135. Арк. 2–4 адв.; *Скеп'ян А. А.* Дзве ардынацыі – два цэнтры: Клецк і Нясвіж. С. 147–152.

[209] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 3136. Арк. 17 адв.

[210] *Паднякоў В. С.* Клецк X–XVIII стст. Матэрыяльная і духоўная культура беларускага феадальнага горада. С. 30.

было выклікана жаданнем уласніка добраўпарадкаваць сталіцу ардынацыі і надаць ёй належны выгляд, а не імкненнем аднавіць ваенны патэнцыял рэзідэнцыі.

Разам з Клецкам у валоданне да нясвіжскіх Радзівілаў у сярэдзіне XVI ст. перайшоў Давыд-Гарадок, які ў далейшым быў уключаны ў склад клецкай ардынацыі. У ім меўся старажытны замак, які паўстаў на месцы гарадзішча XII ст. (мал. 8). Яго дзядзінец дыяметрам 100–110 м мае набліжаную да круга форму. Па перыметры праходзіў вал, якія на цяперашні час захаваўся на вышыню 2 м[211]. Паводле інвентара 1605 г., рэзідэнцыя складалася з дзвюх частак: замка і двара, якія пазней называліся адпаведна Верхні і Ніжні замкі. На Верхнім замку, абарончы перыметр якога паводле пазнейшых апісанняў складаў 9 шнуроў 1 прут (каля 445 м), стаяла «вялікая» вежа-брама, яшчэ дзве вежы і сцяна з гародняў. Даўжыня сцяны-паркана Ніжняга замка складала 10 шнуроў 9 прутоў (каля 535 м). Тут мелася вежа-брама, дзве «башты з брамамі» і пяць «вежыц». У 1605 г. комплекс ужо знаходзіўся ў вельмі занядбаным стане, большасць будынкаў або пагнілі, або былі недабудаваны[212]. Як бачна, дрэва-земляныя ўмацаванні Давыд-Гарадоцкага замка мелі традыцыйны характар. У час войнаў сярэдзіны XVII ст. замак быў знішчаны, а пасля іх адбудаваны. Аднак яго ваенны патэнцыял істотна знізіўся. Хаця інвентар 1670 г. яшчэ згадвае пра абавязак падданых будаваць гародні і ставіць башты, яны аднак больш не будаваліся. І Верхні, і Ніжні замкі мелі брамы і былі абгароджаны дубовым парканам, у якім месцамі былі зроблены некалькі «вывадаў». Апошнія, верагодна, уяўлялі сабой выступаючыя частак, прызначаныя для фланкіравання сцен. Іх наяўнасць, як і згадка ў інвентары 1670 г. пра зброю, сведчыць аб тым, што Давыд-Гарадоцкі замак яшчэ некаторы час працягваў выконваць абарончае прызначэнне[213]. Гэта тлумачыцца спецыфікай ваеннай сітуацыі ў рэгіёне ўздоўж Прыпяці, дзе па-ранейшам адчувалася пагроза нападу казакаў з украінскіх зямель. Апроч таго, Радзівілы, напэўна, мелі недавер да мясцовых жыхароў, якія збунтаваліся і перайшлі на бок казакаў падчас войнаў сярэдзіны XVII ст. У час Вялікай Паўночнай вайны рэзідэнцыя ў Давыд-Гарадку была ў чарговы раз спалена[214].

Няшмат вядома пра замак у Свержані, які існаваў з XV ст., а ў другой палове XVI ст. перайшоў у валоданне да нясвіжскай галіны Радзівілаў. Па меркаванні В. Шаблюка, ён знаходзіўся ў цяжкадаступным месцы на правым беразе Нёмана. Акрамя ракі, яго прыкрывалі таксама залука Нёмана – Міранка і прылеглае балота. Паводле згадкі 1568 г., замак ужо быў напаўразбураны. У гэты час у ім меліся дзве вежы, адна з якіх выконвала функцыю брамы,

[211] *Ткачоў М. А.* Замкі і людзі. С. 42.

[212] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 9367. Арк. 51–52.

[213] Тамсама. Спр. 1913. Арк. 50–51, 194 адв., 255–256; Спр. 1914. Арк. 2–2 адв.; *Mikulski W., Zawadzki J.* Opisy zamków białoruskich z inwentarzy dóbr przechowywanych w Archiwum Radziwiłłów w Archiwum Głównym Akt Dawnych. S. 37–43.

[214] *Mikulski W., Zawadzki J.* Opisy zamków białoruskich z inwentarzy dóbr przechowywanych w Archiwum Radziwiłłów w Archiwum Głównym Akt Dawnych. S. 43–44.

і сцяна з гародняў. З пераходам да Радзівілаў Свержань быў уключаны ў склад Нясвіжскай ардынацыі, а мясцовы замак страціў функцыі рэзідэнцыі і абарончага цэнтра і неўзабаве прыйшоў у заняпад[215].

Адным са старэйшых і найбольш значных замкаў біржанскай лініі Радзівілаў быў комплекс Верхняга і Ніжняга замкаў у Слуцку (мал. 9–10). Верхні замак паўстаў на месцы дзядзінца XI–XIV стст. пры ўпадзенні невялікай рэчкі Бычок у Случ. Паводле абмераў 1815 г., яго плошча складала 1 морг 245 прутоў (1,3 га). Невялікая плошча ўмацавання, а таксама тое, што яно мела акруглую форму, з'яўляецца выразнай прыкметай яго старажытнасці. З паўночна-заходняга боку знаходзіўся Ніжні замак, плошча якога складала 2 моргі 189 прутоў (1,9 га)[216]. У крыніцах XVII–XVIII стст. Верхні і Ніжні замкі аб'ядноўваюцца пад назвай Стары замак.

Будаўніцтва ўмацаванняў Ніжняга замка адносіцца да пачатку XVI ст. Захаваўся цікавы летапісны ўрывак, які сведчыць аб узвядзенні Ніжняга замка і яго ролі для развіцця Слуцка: «*И зараз княгыня* [Анастасія Алелькавіч] *град около града заложыла и низина ровнятыся и подвыжшатыся почела. И в котором часе великое мноство людзи славных, годных, рожных, верных и жычливых миран намножылосе на мешкане и тыснутыся почали взглядом покою од непрыятеля наступившых. Тая ж княгиня церков соборную Пресвятое Богородыцы на высоком городе названым Дытынец зачавшы и скончыла року*



Мал. 9. Верхні і Ніжні замкі ў Слуцку. Я. Фюрстэнхоф.
Першая палова XVIII ст. SBB. Kart. XS49911/12.

[215] *Шаблюк В.* Замак у Свержні // З глыбі вякоў. Наш край. 2002. Вып. 2. С. 27–31.
[216] AGAD. AR. Dz. XXV. Sygn. 3857. S. 10–11.

1509»[217]. З гэтай крыніцы вынікае, што да пачатку XVI ст. абараніцца ад моцнага непрыяцеля можна было толькі ў Верхнім замку, ці Высокім горадзе, як ён названы ў крыніцы. Намаганнямі княгіні былі збудаваны магутныя абарончыя ўмацаванні вакол старажытнага гандлёва-рамеснага пасада, які ў далейшым сталі называць Ніжнім замкам. Павелічэнне плошчы слуцкай цытадэлі давала магчымасць большай колькасці мяшчан схавацца ў ёй у выпадку нападу ворага. Гэта стала істотным стымулам для павелічэння колькасці жыхароў горада, аб чым наўпрост пішацца ў крыніцы.

Не менш цікавай з'яўляецца нататка падарожніка Трыфана Карабейнікава, які пабачыў Слуцк у 1593 г. у той час, калі горад яшчэ належаў Алелькавічам. У прыватнасці, ён адзначае: *«Городок Слутъцкъ невеликъ, поменши Коломны, древяной, а около городка острогъ на городовое дело, а в остроге торги да двор панской, да жилецких дворов двести; а посадом болши Ростова, ...а у гра(да) в воротехъ и у острогу стоятъ воротники и стрельцы с ружьемъ, а в острогъ иноземца, не сказавъ, не пустятъ»*[218]. «Гарадком» падарожнік, верагодна, назваў Верхні замак, «панскім двaром» – Ніжні замак, «астрогам» – умацаваны пасад паміж рэчкамі Бычок і Случ. Такім чынам, мы бачым, што ўжо напрыканцы XVI ст. абодва замкі былі аб'яднаны ў адзін рэзідэнцыянальна-абарончы комплекс.



Мал. 10. Верхні і Ніжні замкі ў Слуцку. А. Гафо. 1731 г. HSD. P. 2. Sygn. 67/101.

[217] *Мицик Ю. А.* Два білоруських літописця XVI–XVII ст. // Загартована історією. Ювілейний збірник на пошану професора Надії Іванівни Миронець з нагоди 80-ліття від дня народження. Київ, 2013. С. 254. У копіі гэтага запісу, які захаваўся да нашага часу, дата ўказана памылкова – 1409 г.

[218] Второе хождение Трифона Коробейникова. С предисловием С. О. Долгова // Чтения в Императорском Обществе Истории и Древностей Российских при Московском Университете. 1887. Кн. 1. С. 7.

У рукі Радзівілаў Слуцк перайшоў у 1600 г. Стан умацаванняў яго замкаў у першай палове XVII ст. адлюстроўвае інструкцыя Крыштафа II Радзівіла 1620-х гг., інвентар 1642 г. і планы горада сярэдзіны XVII – першай паловы XVIII ст.[219] Па перыметры Верхняга замка ішла сцяна з гародняў. Яна была ўзведзена на глініста-пясчаным вале вышынёй 4 м[220]. З боку Ніжняга замка знаходзілася вежа-брама. Яна мела форму чацвярыка, які ўверсе пераходзіў у васьмярык. Унізе ў браме месціліся турмы. К. Радзівіл загадваў абмазваць ніжні чацвярык глінай, паставіць перад брамай «астрожак», а перад ім на мосце – узвод, ці пад'ёмны мост. Наверсе брамы меўся гадзіннік. У 1620-я гг. на дзядзінцы Верхняга замка знаходзіўся «стары» цэйхгаўз, які К. Радзівіл загадаў адрамантаваць і прыстасаваць для захавання зброі і гармат. Акрамя таго, магнат аддаў распараджэнне ўзвесці на дзядзінцы некалькі свірнаў для захавання харчовых прыпасаў, якіх «*пастаянна павінна было быць шмат у замку*». Гэтыя факты сведчаць аб тым, што Верхні замак па-ранейшаму ўспрымаўся тагачасным гаспадаром як галоўная цытадэль горада. Праўда, як сведчаць пазнейшыя апісанні, прапановы К. Радзівіла не былі рэалізаваны. Так, у інвентары 1642 г. цэйхгаўз у Верхнім замку не згадваецца, а ўся зброя была сабрана ў цэйхгаўзе ў Ніжнім замку. Гэтаксама не было там і свірнаў, якія знаходзіліся на тэрыторыі Ніжняга замка. Такім чынам, на гэтым прыкладзе бачна, што распараджэнні К. Радзівіла адносна Верхняга замка не былі рэалізаваны да канца, як, зрэшты, і некаторыя іншыя планы магната па разбудове і мадэрнізацыі ўмацаванняў Слуцка. Апроч таго, інвентар 1642 г. сведчыць аб тым, што на тэрыторыі Верхняга замка стаялі жылы дом і мураваная скарбніца. З інструкцыі К. Радзівіла вынікае, што Верхні замак як абарончы аб'ект меў істотны недахоп: на яго тэрыторыі не было студні, якую К. Радзівіл загадваў выкапаць.

У пачатку XVII ст. слуцкі Ніжні замак меў даволі моцныя фартыфікацыі. У інструкцыі К. Радзівіла згадваюцца некалькі веж, башта ў рове і сцяна з гародняў, наверсе якой мелася баявая галерэя, накрытая дахам. Самі гародні выкарыстоўваліся для захавання розных рэчаў. Перад брамай з боку горада мелася некалькі мастоў і ўзводаў. У 1620-я гг. у абарончым перыметры Ніжняга замка ўжо былі сур'ёзныя агрэхі. Напрыклад, з паўночна-заходняга боку за палацам зусім не было сцяны, а ў сам палац можна было ўлезці праз вокны. У інструкцыі К. Радзівіла згадваюцца таксама лазня, вялікая стайня і кухня. Ніжні замак, як і Верхні, меў праблемы з вадой, таму К. Радзівіл загадаў і тут выкапаць студню. Паводле інвентара 1642 г., Ніжні замак меў вежу-браму з узводам, палац, «башту» каля яго, скарбніцу, дом гараднічага, цэйхгаўз і тры свірны. Адсутнасць увагі гаспадара да неабходнасці падтрымання ўмацаван-

[219] БАН. ООРК. № 791; НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 55. Арк. 40; AGAD. AR. Dz. XXIII. T. 34. Pl. 2. S. 93–95; T. 130. Pl. 2. S. 259–263; HSD. P. 2. Sygn. 67/101; Sächsische Landesbibliothek. Handschriftensammlung. Mscr. Dresd. R. 30. M. II. Bl. 94; SSB. Kart. XS49911/10; XS49911/12.

[220] *Калядзінскі Л., Ткачоў М.* Слуцкія замкі // Вялікае княства Літоўскае: энцыкл. : у 2 т. Т. 2. Мінск, 2006. С. 595.

няў слуцкіх замкаў у належным стане сведчыць аб паступовай страце імі абарончага прызначэння.

Пры Багуславе Радзівіле рэзідэнцыя была рэканструявана. Магнат хаця і рэдка бываў у Слуцку, аднак надаваў яму вялікае значэнне. Будаўніцтва ў сярэдзіне XVII ст. у Новым месце магутнай бастыённай цытадэлі прывяло да пачатку дэмілітарызацыі Верхняга і Ніжняга замкаў. Знакавым стаў перанос у 1662 г. у новазбудаваную цытадэль рэзідэнцыі каменданта і харугвы слуцкага гарнізона[221]. Пазней, у другой палове XVII ст., адбылася змена назваў: комплекс Верхняга і Ніжняга замкаў пачалі называць Старым замкам, а цытадэль – Новым замкам. Пры гэтым Стары замак выконваў функцыі рэзідэнцыі, а Новы замак з'яўляўся абарончым цэнтрам горада.

У другой палове XVII ст. асноўныя высілкі былі накіраваны на рэканструкцыю рэзідэнцыянальнай часткі, хаця пры гэтым меркавалася захаваць пэўны абарончы патэнцыял усяго комплексу. Праекты будынкаў распрацоўваў архітэктар Тэафіл Спіноўскі. Непасрэдна кіравалі будаўніцтвам Казімір Клакоцкі і Крыштаф Вінклер. Працы пачаліся ў 1662 г., аднак некаторы час ішлі даволі марудна. У 1666 г. быў узведзены вялікі палац, а ў наступным годзе праводзіліся працы па яго аздабленні. Пасля смерці Багуслава Радзівіла ў 1669 г. будаўніцтва працягвалася, а закончаны выгляд рэзідэнцыя набыла ў апошняй чвэрці XVII ст.[222] На падставе апісання замка 1687 г., а таксама планаў першай паловы XVIII ст. можна ўявіць, як яна выглядала. Уваход у Стары замак ажыццяўляўся праз вежу-браму, да якой з Падзамча вёў драўляны мост. Насупраць брамы ў паўночнай частцы Ніжняга замка размяшчаўся комплекс рэпрэзентацыйных будынкаў: вялікі палац над Бычком і два меншыя палацы. Яны групаваліся такім чынам, што ў цэнтры ўтвараўся вялікі двор. Паўднёвая частка Ніжняга замка была занята будынкамі гаспадарчага прызначэння. Невялікі па плошчы Верхні замак па-ранейшаму быў акружаны земляным валам, а на яго тэрыторыю можна было патрапіць па драўляным мосце з тэрыторыі Ніжняга замка. Насупраць уваходa стаяў драўляны палац, злева ад яго – дом канцылярыі, справа – мураваны скарбец. На тэрыторыі Верхняга замка таксама знаходзіўся шэраг гаспадарчых будынкаў і цэйхгаўз, у якім захоўвалася ваенная амуніцыя[223].

Пэўныя складанасці падчас рэканструкцыі слуцкай рэзідэнцыі ўзніклі з-за наяўнасці на дзядзінцы Верхняга замка старажытнай Успенскай царквы, якая выконвала функцыі сабора і мела вялікае значэнне для жыхароў Слуцка. Аднак арганізацыя доступу вернікаў да царквы ўскладняла рэалізацыю архітэктурнай праграмы магнацкай рэзідэнцыі. Да пачатку XVIII ст. для праходу прыхаджан да царквы быў перакінуты мост цераз Бычок. Ад моста да храма

[221] *Волкаў М.* Слуцкая цытадэль XVII–XVIII ст. // БГА. 2012. Т. 19, сш. 1–2. С. 40.

[222] AGAD. AR. Dz. V. Sygn. 5569/I. S. 111–112, 179–182; Sygn. 6865/III. S. 21–23, 119–122; Sygn. 6865/IV. S. 17–23, 103–106, 142–144; Sygn. 17469/I. S. 146–147; Sygn. 17469/II. S. 36, 59, 61.

[223] *Mikulski W., Zawadzki J.* Opisy zamków białoruskich z inwentarzy dóbr przechowywanych w Archiwum Radziwiłłów w Archiwum Głównym Akt Dawnych. S. 57–75.

вяла сцежка па паўднёвым схіле замкавай гары. Гэты факт выразна сведчыць аб страце замкам у гэты час абарончага прызначэння.

Паколькі Слуцк з'яўляўся дастаткова вялікім горадам, ён меў развітую сістэму гарадскіх фартыфікацый. Яшчэ ў першай палове XVI ст. вакол гандлёва-рамеснага пасада ў міжрэччы Бычка і Случы быў насыпаны земляны вал з драўляным парканам наверсе. Апошні варта адносіць да новага тыпу ўмацаванняў, таму мы звернем на яго ўвагу пазней. Астатнія пасады Слуцка, як вынікае з інструкцыі К. Радзівіла, у 1620-я гг. мелі ўмацаванні ў выглядзе драўлянага штыкету з брамамі. Дзве драўляныя брамы ў ланцугу фартыфікацый Новага места можна пабачыць на плане Януша Радзівіла 1651–1652 гг.[224] У першай палове – сярэдзіне XVII ст. драўляныя гарадскія ўмацаванні былі заменены на бастыённыя.

Замак у Капылі, які знаходзіўся непадалёк ад Слуцка і быў з ім моцна звязаны, паўстаў на месцы дзядзінца летапіснага Капыля. Ён меў эліпсападобную форму памерамі 45 × 100 м са стромкімі схіламі. Да цяперашняга часу захаваліся валы вышынёй 2,5–3 м з пяску і гліны. У іх былі выяўлены рэшткі драўляных умацаванняў, што стаялі на вале. Уся забудова ў замку была драўляная. Звонку ён быў акружаны ровам шырынёй 6–8 м і глыбінёй 2–3 м. Ён мог напаўняцца вадой з рэчкі Каменка, каля якой быў узведзены замак. Умацаванні ў форме вала вышынёй 2,5 м зафіксаваны вакол так званага *вакольнага горада*[225]. Аднак невядома, ці быў ён у пазнейшы час уключаны ў рэзідэнцыянальны комплекс, як гэта было ў Клецку, Давыд-Гарадку і Слуцку. Яшчэ ў канцы XVI ст. у Капыльскім замку меліся амуніцыя і гарматы, аднак недзе паміж 1593–1600 гг. ён згарэў і, як мяркуе А. Скеп'ян, больш не аднаўляўся[226]. Такім чынам, пры біржанскіх Радзівілах, да якіх Капыль адышоў у 1600 г., у якасці рэзідэнцыі замак ужо не выкарыстоўваўся, хаця пэўны час ён яшчэ мог захоўваць функцыі лакальнага абарончага цэнтра. Але да сярэдзіны XVII ст. ён быў закінуты цалкам, а капыльскіх мяшчан абавязалі будаваць фартыфікацыі ў Слуцку. Гэтаксама на слуцкіх умацаваннях жыхары Капыля адпрацоўвалі пакаранні, якія на іх ускладваліся[227].

У першай палове XVII ст. у валоданне біржанскіх Радзівілаў перайшоў замак у Свіслачы ў Менскім павеце (мал. 11). Умацаванне размяшчалася пры ўпадзенні ракі Свіслач у Бярэзіну. Вада амывала дзядзінец з трох бакоў, што было вельмі выгадна для абароны. Умацаванне паўстала яшчэ ў XII ст. У гэты час па яго перыметры быў насыпаны земляны вал[228]. Паводле інвентара 1560 г.,

---

[224] НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 287. Арк. 40.

[225] *Калядзінскі Л.* Капыльскі замак // Вялікае княства Літоўскае: энцыкл. : у 2 т. Мінск, 2006. Т. 2. С. 43.

[226] *Скеп'ян А. А.* Дзве ардынацыі – два цэнтры: Клецк і Нясвіж. С. 50.

[227] *Пашкевіч У.* Горад Капыль паводле інвентара 1744 г. // Капыль : гісторыя горада і рэгіёна : да 360-годдзя надання Капылю прывілея на магдэбургскае права / уклад.: А. А. Скеп'ян, А. Б. Доўнар, І. В. Соркіна. Мінск, 2012. С. 215–216; *Скеп'ян А. А.* Дзве ардынацыі – два цэнтры : Клецк і Нясвіж. С. 55.

[228] Свіслацкі замак // Вялікае княства Літоўскае : энцыкл. : у 2 т. Мінск, 2006. Т. 2. С. 558.



Мал. 11. Замак у Свіслачы. Я. Радзівіл, 1651–1652 гг. НГАБ. Ф. 692. Воп. 1. Спр. 287

ён меў браму і чатыры вежы, на месцы адной з якіх на той час была ўзведзена царква[229]. Паводле планаў Януша Радзівіла 1651–1652 гг., дзядзінец быў набліжаны па форме да круга і меў памеры 93 × 112 локцяў (60,5 × 72,8 м)[230]. Да сярэдзіны XVII ст. комплекс быў ужо ў значнай ступені перабудаваны, але, як слушна мяркуе С. Сергачоў, маглі захавацца пэўныя элементы старой фартэцыі[231]. На старым месцы, верагодна, стаяла невысокая брама, ад якой да мястэчка вёў драўляны мост на ізбіцах. Замест сцен з гародняў, якія ішлі па перыметры замкавага дзядзінца, быў пастаўлены больш просты вастракол. Магчыма, захавалася адна з абарончых вежаў з боку Свіслачы, якая прыкрывала мост, перакінуты цераз раку побач з замкам. Яе наяўнасць сведчыць аб тым, што перабудаваная рэзідэнцыя працягвала выконваць абарончыя функцыі. Існаванне другой вежы з боку Свіслачы патрабуе верыфікацыі, паколькі загадныя планы даюць розную інфармацыю. Верагодна, у першай палове XVII ст. у паўднёва-ўсходняй частцы дзядзінца быў узведзены вялікі драўляны будынак жыллёва-гаспадарчага прызначэння. Ён складаўся з двух карпусоў. У паўднёвым корпусе памерам 12 × 55 локцяў (7,8 × 35,8 м) меліся печы, таму ён мог выкарыстоўвацца пад жыллё, а ва ўсходнім – памерам 12 × 60 локцяў (7,8 × 39 м) – печы не абазначаны, што ўказвае на размяшчэнне там складскіх памяшканняў. У месцы злучэння карпусоў знаходзілася сталовая ізба памерам 18 × 19,5 локцяў (11,7 × 12,7 м). Паводле інвентара 1560 г., на яе месцы знаходзілася царква. Такім чынам, храм у другой палове XVI – першай палове

[229] *Даўгяла Зьм. Ів.* Сьвіслацкі замак у 1560 г. // Наш край. 1927. № 6–7. С. 60–64.

[230] НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 287. Арк. 19 адв., 20, 23.

[231] *Сергачев С. А.* Деревянный замок середины XVII в. в Свислочи. С. 34.

XVII ст. быў вынесены з тэрыторыі замка. Гэта сведчыць аб ператварэнні колішняй абарончай цытадэлі Свіслачы ў цалкам прыватную рэзідэнцыю. За замкам, у міжрэччы Свіслачы і Бярэзіны размяшчаўся гандлёва-рамесны пасад, які з боку поля быў прыкрыты драўлянай сцяной з брамай. Свіслацкі драўляны замак быў знішчаны ў першыя гады вайны Расіі з Рэччу Паспалітай сярэдзіны XVII ст. 12 ліпеня 1655 г. казакі «*город Свислоч взяли, острог и город и посады выжгли, и которые были польские и литовские люди в городе Свислочь, и тех всех людей мечю предали*»[232]. Пазней як абарончае ўмацаванне не аднаўляўся.



Мал. 12. Замак у Копысі. 1665 г.
AGAD. AR. Dz. XXIII. T. 34. Pl. 2

Замак у Копысі, размешчаны на беразе Дняпра, адрозніваецца ад іншых замкаў гэтага тыпу. Вайна 1654–1667 гг. не прывяла да заняпаду яго як абарончага ўмацавання. Наадварот, тагачасны ўладальнік Копысі Багуслаў Радзівіл мадэрнізаваў умацаванні старажытнага замка, пераўтварыўшы яго ў невялікую бастыённую фартэцыю. Таму гарадзішча, што захавалася да нашага часу, мае выразныя сляды мадэрнізацыі. Тым не менш дзякуючы плану замка, выкананаму ў 1665 г., і, верагодна, якраз для распрацоўкі праекта перабудовы ўмацавання, мы можам уявіць як выглядалі ўмацаванні замка ў першай палове – сярэдзіне XVII ст. (мал. 12)[233]. Дапамагае ў гэтым таксама інвентар 1661 г., які паўстаў незадоўга да перабудовы замка[234]. Па форме гарадзішча мела выгляд конуса, выцягнутага ў паўночны бок, дзе дзве невялікія рэчкі Сморкаўка і Страшаўка ўпадалі ў Дняпро. Яшчэ ў XI–XII стст. па перыметры гарадзішча быў насыпаны магутны вал. У сярэдзіне XVII ст. на ім стаяў «звычайны паркан, збудаваны ў ізбіцы» і накрыты дахам. Мяркуючы па плане 1665 г., вонкавая сцяна ўяўляла сабой вастракол, а да яе былі прыстаўлены зрубы, па версе якіх праходзіла баявая галерэя, накрытая страхой. Па перыметры сцяны мелася 7 баштаў, а з паўночна-ўсходняга боку стаяла вежа-брама. Перад брамай была насыпана невялікая грэбля, што дазваляла падняць узровень вады ў рове вакол замка.

[232] Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией. СПб., 1889. Т. 14. Стб. 747–748.

[233] AGAD. AR. Dz. XXIII. T. 34. Pl. 2. S. 25. Аўтар выказвае падзяку А. Доўнару за ўказанне на гэтую каштоўную крыніцу.

[234] AGAD. AR. Dz. XXV. Sygn. 1768. S. 23.

Мала вядома пра ўмацаваную сядзібу біржанскіх Радзівілаў у Старым Сяле Менскага павета. На пачатку XVII ст. яна называецца «замкам»[235]. Гэта сведчыць аб наяўнасці ўмацаванняў і пэўным абарончым патэнцыяле гэтай рэзідэнцыі.

Акрамя замкаў, простыя драўляныя ўмацаванні мелі многія двары Радзівілаў, якія гаспадары маглі выкарыстоўваць у якасці рэзідэнцый. У біржанскіх Радзівілаў, па падліках польскай даследчыцы У. Аўгустыняк, у пачатку XVII ст. было каля 20 двароў, з якіх большая палова знаходзілася на тэрыторыі сучаснай Беларусі[236]. Адной з найбольш істотных рысаў двароў XVI – першай паловы XVII ст. быў абарончы характар. Часта яны ўзводзіліся ў найбольш прыдатных для абароны месцах, мелі рвы, сцены ў выглядзе вастракола, паркана ці тыну, а на ўваходзе брамы ў выглядзе вежаў ці нізкіх баштаў[237]. Паколькі пры будаўніцтве двароў выкарыстоўваліся мясцовыя рэсурсы, тэхналогія ўзвядзення іх умацаванняў, форма і канструкцыя адпавядалі традыцыям рэгіёна.

3.2. Мураваныя замкі

У канцы XV–XVI стст. у валоданне Радзівілаў пры розных абставінах перайшоў шэраг мураваных замкаў. Узведзеныя з больш трывалага матэрыялу яны былі надзейнейшымі за драўляныя замкі ўмацаваннямі традыцыйнага тыпу, але істотна ад іх не адрозніваліся па прынцыпах абароны. Тым не менш мураваныя замкі неабходна вылучыць у асобны тып абарончых рэзідэнцый. Галоўнай прычынай, якая падштурхоўвала магнатаў да будаўніцтва мураваных замкаў, было імкненне да стварэння рэзідэнцый больш высокага рангу, бо мураванае будаўніцтва мела статусны характар. Больш высокае значэнне цагляных будынкаў уплывала на змены ў суадносінах абароназдольнасці рэальнай і сімвалічнай. Само формаўтварэнне ў мураванай архітэктуры залежала ад іншых, чым у драўляным дойлідстве, фактараў. Таму разам з новымі тэхналогіямі цаглянага будаўніцтва на нашыя землі прыйшлі і іншыя формы будынкаў (данжоны, бергфрыды, кастэлі і інш.).

Працэс распаўсюджання прыватнаўласніцкага мураванага будаўніцтва ў Вялікім Княстве Літоўскім у XV–XVI стст. быў шчыльна звязаны з рэфармаваннем грамадска-палітычнай сістэмы і пашырэннем заходнееўрапейскіх уплываў. Магнаты імкнуліся ўсяляк падкрэсліць свой узрослы статус. У сувязі з гэтым пашырылася будаўніцтва прыватнаўласніцкіх мураваных рэзідэнцый, якія дасюль асацыяваліся з вялікакняжацкай уладай або з высокімі па сваім статусе феадаламі заходнееўрапейскіх краін. У канцы XV – пачатку

[235] *Augustyniak U.* Drewniane dwory Radziwiłłów birżańskich w pierwszej połowie XVII wieku – rezydencje czy siedziby? S. 106.

[236] Ibidem. S. 106–108.

[237] *Szabluk W.* Dwory i folwarki na Zachodniej Białorusi // AHP. 1996. T. 3. S. 290; *Augustyniak U.* Drewniane dwory Radziwiłłów birżańskich w pierwszej połowie XVII wieku – rezydencje czy siedziby? S. 107–108, 123.

XVII ст. у валоданне Радзівілаў перашоў цэлы шэраг мураваных замкаў (Койданава, Любча, Мір), а таксама замкаў, у якіх меліся асобныя мураваныя пабудовы (Клецк, Мядзел, Слуцк). Нам не ўдалося выявіць звестак аб тым, каб хто-небудзь з прадстаўнікоў роду да сярэдзіны XVI ст. фінансаваў мураванае будаўніцтва ў сваіх рэзідэнцыях на беларускіх землях. Тым не менш набытыя Радзівіламі мураваныя рэзідэнцыі мелі важнае значэння для роду.

Пры апісанні помнікаў дадзенай групы найперш трэба звярнуць увагу на Мядзельскі замак[238]. У 1490 г., пасля смерці Багдана Андрэевіча Саковіча, замак адышоў да яго зяця Мікалая Радзівіла. Хаця ў пісьмовых крыніцах няма інфармацыі аб тым, хто распачаў узвядзенне замка з мураванай вежай, пэўныя высновы можна зрабіць на падставе аналізу яго архітэктуры. Галоўным архітэктанічным элементам умацаванай рэзідэнцыі з'яўлялася мураваная вежа, знешні дыяметр якой дасягае 17,5 м. Падобныя збудаванні для першай чвэрці XVI ст. былі ўжо архаічнымі. У Вялікім Княстве Літоўскім масіўныя абарончыя вежы, якія маглі быць жылымі (данжоны) ці нежылымі (бергфрыды), былі распаўсюджаны ў XIII–XIV стст.[239] Такія вежы неслі значную сімвалічную нагрузку. Дамінуючы па вышыні над навакольнай забудовай яны сімвалізавалі ўладу вялікага князя альбо феадала над падданымі. Аднак у пачатку XVI ст. магнаты ўжо будавалі рэзідэнцыі іншага кшталту. Напрыклад, у Геранёнах, Іказні і Міры ў гэты час былі ўзведзены мураваныя замкі з унутраным дзядзінцам правільнай канфігурацыі, абкружаным мураванымі сценамі з палацам і нарожнымі вежамі. Але вежападобныя формы захоўвалі ў ВКЛ, як і ў суседняй Польшчы, моцнае сімвалічнае значэнне яшчэ на зломе XV–XVI стст.[240] Таму, найбольш верагодна, што будаўніцтва замка на востраве возера Мястра распачаў Б. Саковіч у канцы XV ст., а згаданая вежа стала адным з найбольш ранніх элементаў гэтай рэзідэнцыі.

Мікалай Радзівіл, для якога мядзельская латыфундыя мела істотнае значэнне, мог працягнуць разбудову замка ў Мядзеле. Аб гэтым сведчыць факт атрымання ім тытула князя на Мядзеле з рук імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі. Некаторыя даследчыкі лічылі, што перадумовай для гэтага была наяўнасць замка[241]. Але гэтае меркаванне застаецца гіпотэзай і не мае грунтоўных доказаў. Тым не менш само атрыманне тытула на пэўнай маёмасці сведчыць пра значэнне гэтай маёмасці для яе гаспадара ў доўгатэрміновай перспектыве. А гэта вымушала яго клапаціцца пра разбудову мясцовай рэзідэнцыі.

---

[238] Падрабязней гл.: *Волкаў М. А., Плавінскі М. А.* Мядзельскі замак у святле пісьмовых і археалагічных крыніц. С. 65–92.

[239] *Макараў М.* Да пытання пра выкарыстанне тэрміну «данжон» (donjon) у беларускай гістарычнай літаратуры // Гіст. альм. 2001. Т. 5. С. 55–66.

[240] *Lasek P.* Turris fortissima nomen Domini. Murowane wieże mieszkalne w Królestwie Polskim od 1300 r. do połowy XVI w. S. 174.

[241] *Спірыдонаў М. Ф.* Тры Мядзелы // Памяць: Мядзельскі раён / уклад. і навук. рэд. Я. Г. Звяруга. Мінск, 1998. С. 69–72.

З аналізу архітэктуры мураванай вежы Мядзельскага замка вынікае, што яе абарончы патэнцыял быў даволі абмежаваны. У прыватнасці, пра гэта сведчыць размяшчэнне ўваходу ў вежу на ўзроўні дзённай паверхні замкавага дзядзінца. З гэтага можна зрабіць высновы, што пры ўзвядзенні гэтай пабудовы першаснай была не абарончая, а сімвалічная функцыя. Вежа была выразным сімвалам, які добра «чытаўся» яшчэ напачатку XVII ст. Аб гэтым сведчыць выява на карце ВКЛ 1613 г. аўтарства Т. Макоўскага, на якой замак мае выразны і пазнавальны сілуэт з магутнай вежай у цэнтры (мал. 13). Аналіз выяў паселішчаў на гэтай карце сведчыць аб тым, што мясціны важныя для роду Радзівілаў, а дакладней нясвіжскай яго галіны, прамалёўваліся больш дакладна і рэалістычна, у той час, як іншыя падаваліся ўмоўна. Напэўна, менавіта таму Мядзельскі замак з яго вялізнай вежай, які асацыяваўся з атрыманнем Радзівіламі першага княжацкага тытула, быў вельмі выразна прамаляваны.

Мал. 13. Замак у Мядзеле. Т. Макоўскі. 1613 г.

Не менш цікавымі за вежу Мядзельскага замка з'яўляюцца мураваныя пабудовы на дзядзінцах верхніх замкаў у Клецку і Слуцку. У абодвух выпадках мы маем аднапавярховыя мураваныя будынкі з падваламі, якія на момант складання першых інвентароў у першай палове XVII ст. выкарыстоўваліся для захавання рэчаў рознага прызначэння. Аднак першапачатковая функцыя гэтых будынкаў, па ўсёй верагоднасці, была іншай. Аб гэтым можна меркаваць на падставе вывучэння так званага *мураванага скарбца* на Верхнім замку ў Слуцку[242].

Мураванае будаўніцтва ў старажытным Слуцку было рэдкай з'явай. Ажно да XIX ст. горад заставаўся амаль цалкам драўляным. Агульная неразвітасць цаглянага будаўніцтва, з іншага боку, можа сведчыць пра вялікае значэнне тых нешматлікіх мураваных пабудоў для фарміравання архітэктурнага ландшафту Слуцка. Найбольш цікавым у гэтым плане якраз быў мураваны скарбец на Верхнім замку. Па ўсёй верагоднасці, ён паўстаў яшчэ пры Алелькавічах у XV–XVI стст. як частка рэзідэнцыянальнага комплексу Верхняга замка. Упершыню будынак згадваецца ў інвентары 1642 г.[243] Комплекс пісьмовых і іканаграфічных крыніц XVII–XVIII стст. дае магчымасць даволі дакладна рэканструяваць выгляд скарбца[244]. Гэта быў аднапавярховы гмах з падвалам.

[242] Падрабязней гл.: *Волкаў М. А.* Мураваны скарбец у Верхнім замку ў Слуцку // Архіварыус. Мінск, 2018. Вып. 16. С. 190–198.

[243] AGAD. AR. Dz. XXIII. T. 130. Pl. 2. S. 93–95.

[244] Ibidem. Dz. XXV. Sygn. 1768; Dz. XXVI. Sygn. 166; *Mikulski W., Zawadzki J.* Opisy zamków białoruskich z inwentarzy dóbr przechowywanych w Archiwum Radziwiłłów w Archiwum Głównym Akt Dawnych. S. 57–88.

Яго вонкавы памер складаў 25 × 46 локцяў (16,25 × 29,9 м) пры таўшчыні сцен у 5 локцяў (3,25 м). Скарбец стаяў на паўночна-заходнім схіле замкавай гары і быў скіраваны па восі паўночны захад – паўднёвы ўсход, выходзячы тарцом на схіл замкавай гары. Ад яго паўночнага вугла па лініі тарцавой сцяны ўздоўж края дзядзінца ішла мураваная сцяна даўжынёй каля 30 м. Пра яе існаванне вядома дзякуючы планам першай паловы XVIII ст.[245] Прызначэнне гэтай сцяны невядомае. На працягу XVII–XVIII стст. скарбец выкарыстоўваўся для захавання архіва, а таксама рознага кшталту каштоўнасцей, ваеннай амуніцыі і пораху.

Аб тым, што слуцкі скарбец першапачаткова мог мець іншае прызначэнне, сведчаць надзвычай магутныя вонкавыя сцены будынка – 5 локцяў (3,25 м). Такую ж таўшчыню, напрыклад, маюць вонкавыя абарончыя сцены Мірскага замка. У той жа час парахавы пограб у слуцкай цытадэлі, а таксама ўзведзены ў 1760–1761 гг. новы скарбец у Верхнім замку мелі куды больш тонкія муры – 2 локці (1,3 м). Экстраардынарную таўшчыню муроў скарбца можна патлумачыць існаваннем яшчэ некалькіх мураваных паверхаў. Магчыма, у Верхнім замку ў Слуцку існаваў мураваны шмат'ярусны палац, які да пачатку XVII ст. быў часткова разабраны, або яго будаўніцтва па невядомай прычыне не было завершана. Сцяна побач са скарбцам магла першапачаткова мець абарончы характар, на што ўказвае яе размяшчэнне на самым схіле дзядзінца. Магчыма, абарончы патэнцыял мог мець і будынак, які быў пераабсталяваны пазней пад скарбец.

Мураваны будынак невядомага прызначэння меўся таксама ў Верхнім замку ў Клецку. Паводле інвентара 1626 г., ён меў падвал і адзін паверх над ім[246]. Як і ў Слуцку, першапачаткова гэта мог быць жылы вежападобны будынак з абарончымі функцыямі. Існаванне на тэрыторыі старых дрэва-земляных замкаў у Слуцку і Клецку такога кшталту будынкаў сведчыць пра развіццё канцэпцыі гэтых рэзідэнцый.

Цалкам іншы тып будынкаў уяўлялі сабой мураваныя замкі-кастэлі. Іх асноўнай прыкметай з'яўляецца план правільнай формы. Познія кастэлі, што належалі Радзівілам (Мірскі і Любчанскі замкі), мелі вуглавыя вежы, прыстасаваныя да ўжывання ручной агняпальнай зброі. Таму яны былі лепш прыстасаваны да абароны, чым драўляныя замкі. Аднак прыхільнасць да гэтага тыпу замкаў, па ўсёй верагоднасці, была выклікана не столькі імкненнем да павышэння абароназдольнасці рэзідэнцый, колькі большай прэстыжнасцю такога кшталту сядзіб. Гэты момант трэба ўлічваць пры аналізе абарончага патэнцыялу замкаў-кастэляў.

Пытанне аб часе ўзвядзення замка ў Міры дасюль застаецца адкрытым (мал. 1, 14–15). Першы этап будаўніцтва, калі быў закладзены познегатычны

[245] БАН. ООРК. № 791; HSD. P. 2. Sign. 67/101; Sächsische Landesbibliothek. Handschriftensammlung. Mscr. Dresd. R. 30. M. II. Bl. 94; SSB. Kart. XS49911/10; XS49911/12.

[246] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 3135. Арк. 4 адв.

замак, даследчыкі адносяць да першай чвэрці XVI ст.[247] У 1568 г. пасля смерці Юрыя Іллініча, Мір, паводле тастамента апошняга, перайшоў да Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі. Па яго ініцыятыве рэзідэнцыя была грунтоўна перабудавана ў стылі рэнесанс і акружана поясам земляных фартыфікацый.

Мал. 14. Мірскі замак



Мал. 15. План Мірскага замка. Паводле А. Я. Міцяніна

[247] *Калнін В.* Хто будаваў Мірскі замак? С. 38.

Паколькі Мірскі замак захаваўся да нашага часу ў добрым стане, яго архітэктуру можна дэталёва апісаць[248]. Ён паўстаў на невялікім узвышшы ля ўпадзення безназоўнай рэчкі (пазней Замкавай) у раку Міранку[249]. Праслы абарончых сцен даўжынёй 55–60 м утвараюць блізкі да квадрата ўнутраны двор-дзядзінец. Па вуглах пастаўлены чатыры фланкіравальныя вежы памерам 10 × 10 м, якія цалкам выступаюць за перыметр сцен. Пятая вежа-брама памерам 12 × 12 м была збудавана пасярэдзіне заходняй сцяны. Паўднёва-заходняя і паўднёва-ўсходняя вуглавыя вежы былі дабудаваны да ўзроўня шасці паверхаў. Шосты паверх утварала крыху высунутая вонкі баявая галерэя з машыкулямі (вертыкальнымі байніцамі). Абарончыя сцены ўнізе дасягаюць таўшчыні 3 м, а ўверсе звужаюцца да 2,2 м. Акрамя шэрагу байніц ніжняга бою, наверсе сцен мелася баявая галерэя, рэшткі якой захаваліся на заходнім і паўночным праслах. З вонкавага боку баявая галерэя была закрыта мураваным брустверам таўшчынёй 0,7–0,8 м і вышынёй 1,7 м, а наверсе мела дах. Разам з баявой галерэяй вышыня абарончых сцен складала 10 м[250].

Канцэпцыя абароны Мірскага замка выглядала наступным чынам. Для стрымлівання ворага на далёкай адлегласці прызначалася артылерыя, размешчаная ў вуглавых вежах. Размяшчэнне гармат на трэцім паверсе вежаў давала магчымасць павялічыць далёкасць стрэлу. Падыход да замкавых сцен, верагодна, закрывалі драўляныя палісады і сухі ці напоўнены вадою роў. Непасрэдна да саміх муроў роў, аднак, не падыходзіў[251]. Абарона подступаў да сцен і брамы вялася з вуглавых вежаў і з байніц ніжняга пояса ў праслах сцен. Значная вышыня вежаў была выклікана імкненнем да павелічэння колькасці абаронцаў і эфектыўнасці стральбы з розных відаў зброі. У выпадку прарыву ворага ў замак абаронцы мелі магчымасць нейкі час трымацца ў асобных вежах, а пазней пакінуць замак праз патаемны выхад. Падземны ход, паводле меркавання Ю. Ядкоўскага, існаваў у паўночна-заходняй вежы[252]. Для забеспячэння ўмацавання вадой на выпадак працяглай абароны на замкавым дзядзінцы была выкапана студня.

Адным з найбольш цікавых фартыфікацыйных элементаў Мірскага замка з'яўляецца яго брама[253]. Яе праезд знаходзіцца ў масіўнай вежы пасярэдзіне

---

[248] Падрабязней гл.: *Волкаў М.* Фартыфікацыя і ўзбраенне Мірскага замка. С. 11–24; *Ён жа.* Мірскі замак у XVI–XVIII стст.: гісторыя будаўніцтва і эвалюцыя функцыянальнага прызначэння // БГЧ. 2016. № 9. С. 29–45.

[249] *Здановіч Н. І., Краўцэвіч А. К., Трусаў А. А.* Матэрыяльная культура Міра і Мірскага замка. С. 20.

[250] *Калнін В. В., Трэпет Л. В.* Мірскі замак. С.29–30.

[251] *Здановіч Н. І., Краўцэвіч А. К., Трусаў А. А.* Матэрыяльная культура Міра і Мірскага замка. С. 20.

[252] *Иодковский И. И.* Замок в Мире. С. LXIX.

[253] Падрабязней гл.: *Волкаў М. А.* Брама Мірскага замка як абарончы вузел // Мірскі замак. Крыніцы стварэння музейных экспазіцый : гісторыка-дакументальныя матэрыялы і інфармацыйныя тэхналогіі. Мінск, 2013. С. 177–184; *Ён жа.* Да пытання аб існаванні герсы ў браме Мірскага замка // Рэстаўрацыя Мірскага замка. Праблема захавання прыроднага і культурнага ландшафтаў. Нясвіж, 2012. С. 48–54.

заходняй сцяны, подступы да якой фланкіруюцца з суседніх вуглавых вежаў. Для прыкрыцця гэтай зоны на самой вежы-браме на ўзроўні трэцяга паверха быў зроблены машыкуль. Унутры праезда за першай вузкай паўцыркулярнай аркай знаходзіцца выцягнутая адтуліна памерам 3,4 × 0,45 м. Мяркуючы па аналагах, гэтая адтуліна з'яўлялася разнавіднасцю надбрамнага машыкуля. У 2010 г. у выніку археалагічных даследаванняў адразу за машыкулем была выяўлена яма-пастка памерам 2,15 × 2,25 м. Яна мела глыбіню 2,5 м ад першапачатковага ўзроўню праезду і была размешчана паміж узводам, ці пад'ёмным мастом, які згадваецца ў інвентарах 1681 і 1688 гг., і варотамі[254]. Апошнім крокам па блакіраванню брамы было закрыццё масіўных дубовых варот, размешчаных адразу за стральчатай аркай і ямай-пасткай. Іх восі мацаваліся ў драўляных бэльках. Ад верхняй бэлькі засталіся толькі сляды ў мурах, у той час як ніжняя бэлька захавалася амаль цалкам.

Пасля пераходу Мірскага замка ва ўласнасць М. К. Радзівіла ў сярэдзіне XVI ст. да вежы-брамы было прыбудавана паўкруглае перадбрам'е. Яно павінна было ўмацаваць абарону праезду брамы. З заходняга вонкавага боку перадбрам'е закрывалася падвойнымі варотамі, у якіх мелася фортка. Наверсе мура знаходзілася крытая гонтамі баявая галерэя з байніцамі, на якую траплялі з другога паверху вежы.

У пачатку XVII ст. у валоданне біржанскай лініі Радзівілаў перайшоў Любчанскі замак, які меў форму кастэлі (мал. 16). Ініцыятарам будаўніцтва мураванай рэзідэнцыі ў Любчы быў Ян Станіслававіч Кішка, а адзіным сведчаннем, якое ўказвае на дату яго будаўніцтва, з'яўляецца лічба «1581», выбітая на флюгеры з наверша вежы, які быў знойдзены ў час археалагічных даследаванняў. Пры жыцці фундатара будаўніцтва рэзідэнцыі не было закончана, а ў канцы XVI – пачатку XVII ст. у ім яшчэ захоўвалася значная колькасць нарыхтаваных будаўнічых матэрыялаў[255]. Крыштаф Радзівіл актыўна карыстаўся любчанскай рэзідэнцыяй і працягнуў яе разбудову, хаця пры ім будаваліся пераважна драўляныя будынкі. Аб высокім статусе Любчы сведчыць захаванне ў мясцовым замку ў першай палове XVII ст. значнай мастацкай калекцыі[256]. Для біржанскіх Радзівілаў яна была важнейшай сядзібай у Наваградскім ваяводстве, адкуль было зручна кантраляваць палітычнае жыццё ў рэгіёне.

Замкавы дзядзінец уяўляе сабой прамавугольнік памерам 64 × 87 м і адным бокам прымыкае да Нёмана, а з трох іншых аддзелены ровам шырынёй да 30 м і глыбінёй 7–10 м[257]. З напольнага боку на вуглах дзядзінца былі ўзведзены дзве мураваныя вежы. Паўднёва-заходняя з'яўлялася брамай і мела форму

[254] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 4468. Арк. 44; *Mikulski W., Zawadzki J.* Opisy zamków białoruskich z inwentarzy dóbr przechowywanych w Archiwum Radziwiłłów w Archiwum Głównym Akt Dawnych. S. 46.

[255] *Zawadzki J.* Siedziby Kiszków i Radziwiłłów na Białorusi w XVI–XVIII wieku : opisy z zasobu Archiwum Głównego Akt Dawnych. S. 83.

[256] Ibidem. S. 73–76.

[257] *Ткачоў М.* Любчанскі замак // Вялікае княства Літоўскае : энцыкл. : у 2 т. Мінск, 2006. Т. 2. С. 230.

Мал. 16. Замак у Любчы

чацвярыка, на якім узвышаўся васьмярык. Значны памер вежы (10,15 × 9,8 м) і чатыры паверхі, на якіх мелася значная колькасць байніц, дазвалялі канцэнтраваць на ёй вялікую колькасць абаронцаў. Тым не менш магчымасці вядзення фланкіравальнага агню з яе ўздоўж сумежных праслаў сцен былі абмежаваныя. Гэты недахоп паўстаў, на нашу думку, у выніку сумяшчэння функцый вуглавой вежы і вежы-брамы, што з пункту гледжання абароны было не вельмі ўдалым варыянтам. Разам з тым пастаўленая такім чынам вежа мела лепшыя візуальныя сувязі з размешчаным з паўднёвага захаду мястэчкам. Менавіта таму на ёй быў змешчаны гадзіннік. У гэтым можна бачыць дамінаванне ў дадзенай рэзідэнцыі функцыі рэпрэзентацыі над ваенным прызначэннем. На паўднёва-ўсходнім рагу была ўзведзена другая вежа, якая мела памер 8,3 × 8,3 м і тры ярусы бою[258]. Яна ў большай ступені, чым вежа-брама, адпавядала патрэбам абароны. Яшчэ адну мураваную вежу пачалі ўзводзіць на адным з рагоў з боку Нёмана, аднак яе будаўніцтва не было скончана[259]. Такім чынам, прыклад Любчанскага замка адлюстроўвае актуальнасць у другой палове XVI ст. формы кастэлі. Прычым галоўнай функцыяй гэтага комплексу,

[258] *Ткачоў М.* Любчанскі замак. Т. 2. С. 230.

[259] *Zawadzki J.* Siedziby Kiszków i Radziwiłłów na Białorusi w XVI–XVIII wieku : opisy z zasobu Archiwum Głównego Akt Dawnych. S. 80.

Мал. 17. Замак у Койданаве. Н. Орда. 1876 г.

мяркуючы па яго архітэктуры, была рэпрэзентацыя, а ваенны складнік адыходзіў на другі план. Тым не менш, калі ўлічыць распаўсюджанасць рэнесансных ідэй і папулярнасць комплексаў рэгулярнай канфігурацыі, любчанская рэзідэнцыя не страціла сваёй актуальнасці пры Радзівілах у першай палове XVII ст. Пра мінімальны ваенны патэнцыял замка сведчыць той факт, што ў час вайны 1654–1667 гг. яго не спрабавалі ўмацаваць і забяспэчыць гарнізонам, у адрозненне ад таго ж Мірскага замка, які ў гэты час выкарыстоваўся ў якасці абарончага аб'екта.

У сярэдзіне XVI ст. ва ўласнасць Радзівілаў біржанскай галіны перайшло Койданава, у якім меўся мураваны замак (мал. 17). Ініцыятарам будаўніцтва апошняга, як лічыць Н. А. Скеп'ян, быў Альбрэхт Гаштольд. Паводле меркавання даследчыцы, будаўніцтва мураванага замка было выклікана найперш ваеннымі патрэбамі[260]. Магчыма, таму ў дадзеным выпадку мы бачым іншы, чым усе папярэднія, варыянт рэзідэнцыі. Мураваны замак заняў месца ранейшага драўлянага ўмацавання на авальным узгорку памерам 80 × 60 м. Па перыметры дзядзінец акружала мураваная сцяна з 9 вежамі дыяметрам каля 10 м, таўшчынёй сцен да 1,5 м і двума ярусамі бою. Да брамы, якая мела двое варот, вёў доўгі драўляны мост, перакінуты цераз роў[261]. Пры Радзівілах

[260] *Скеп'ян Н.* Пачаткі будаўніцтва прыватнаўласніцкіх мураваных замкаў у Вялікім княстве Літоўскім. С. 61.

[261] *Ткачоў М. А.* Замкі і людзі. С. 48–49; *Augustyniak U.* Drewniane dwory Radziwiłłów birżańskich… S. 106.

на тэрыторыі замка быў узведзены мураваны кальвінісцкі збор з высокай вежай, што змяніла ідэйную нагрузку комплексу. Тым не менш ён захоўваў свой абарончы патэнцыял да сярэдзіны XVII ст. У канцы 1650 – пачатку 1660-х гг. мяшчане Койданава прасілі Багуслава Радзівіла, каб «*даў для аховы мястэчка ад жаўнераў залогу ў некалькі жаўнераў*». Тады ж валашчане прасілі пра «*ахову якую ў Койданаўскім замку з убоствам сваім ад жаўнераў*»[262].

3.3. Мадэрнізаваныя дрэва-земляныя ўмацаванні

XVI стагоддзе стала пераломным у гісторыі фартыфікацыі ў Еўропе. Імклівае развіццё абарончай архітэктуры ў гэты час было звязана са значным прагрэсам ваеннай тэхнікі і найперш з развіццём артылерыі і тэхнікі аблогі. Гэта вымушала шукаць спосабы абароны ўмацаванняў ад новых больш магутных гармат, а таксама выпрацоўваць спосабы прыстасавання саміх умацаванняў да выкарыстання навейшай агняпальнай зброі. У выніку пошукаў і распрацовак шматлікіх эксперыментальных варыянтаў умацаванняў да канца XVI ст. былі вынайдзены прынцыпы бастыённай фартыфікацыі, якая ажно да XIX ст. дамінавала ў абарончым будаўніцтве. Прамежкавы, ці пераходны, перыяд ад познесярэднявечнай да бастыённай фартыфікацыі Новага часу з'яўляецца вельмі цікавым, і ў розных рэгіёнах Еўропы, у тым ліку на нашых землях, ён меў свае асаблівасці. Нягледзячы на гэта, да сённяшняга дня ён вывучаны недастаткова. Часта даследчыкі ўвогуле не адасабляюць яго ад сярэднявечнай ці бастыённай фартыфікацыі. На прыкладзе абарончых рэзідэнцый Радзівілаў добра бачныя ўнікальнасць і своеасаблівасць умацаванняў гэтага перыяду.

Прынцыпы фартыфікацыі, прыстасаванай для ўжывання агняпальнай зброі і артылерыі, пачынаюць выпрацоўвацца ў розных рэгіёнах Еўропы ўжо ў другой палове XV ст.[263] У Польшчы на прагрэс абарончай архітэктуры паўплывалі кантакты з чэшскімі гусітамі, а таксама войны з Тэўтонскім ордэнам і Вугоршчынай. На зломе XV–XVI стст. польскія майстры валодалі развітай тэхнікай насыпання земляных валоў, што пацвярджаецца тым фактам, што іх запрашалі для будаўніцтва такога кшталту ўмацаванняў у Германію (мал. 18). Створаная шмат у чым намаганнямі польскіх спецыялістаў традыцыя будаўніцтва земляных абарончых умацаванняў панавала на нямецкіх землях да канца XVI ст.[264] Таму на будаўніцтва дрэва-земляных умацаван-

---

[262] *Sahanowicz H.* Życie codzienne na Białorusi w warunkach wojny według skarg poddanych radziwiłłowskich z lat pięćdziesiątych i sześćdziesiątych XVII wieku // Biblioteka epoki nowożytnej 5 II/2016 : Hortus bellicus. Studia z dziejów wojskowości nowożytnej. Studia ofiarowane Profesorowi Mirosławowi Nagielskiemu / red. K. Bobiatyński i in. Warszawa, 2017. S. 318–319.

[263] *Viganò M.* Die Entwicklung historischer Zitadell-Bauten in Italien vom 16. bis zum 19. Jahrhundert // Erhalt und Nutzung historischer Zitadellen / H.-R. Neumann. Mainz am Rhein, 2002. S. 12–13.

[264] *Brohl E.* Polnische Einflüsse auf den frühen Festungsbau in Mitteldeutschland um 1500 // Von der Burg zum Schloss: landesherrlicher und adeliger Profanbau in Thüringen im 15. und 16. Jahrhundert / H. Laß. Bucha bei Jena, 2001. S. 120–130; *Lasek P.* Turris fortissima nomen Domini. Murowane wieże mieszkalne w Królestwie Polskim od 1300 r. do połowy XVI w. S. 160–163.

няў новага кшталту на землях ВКЛ у XVI ст., па ўсёй верагоднасці, значны ўплыў мелі спецыялісты з саюзнай Польшчы. А з сярэдзіны XVI ст. у ВКЛ працавала вялікая колькаць італьянскіх архітэктараў, якія былі задзейнічаны на будаўніцтве абарончых умацаванняў, асабліва ў час Інфлянцкай вайны (1558–1583).



Мал. 18. Дрэва-земляная бастэя. Першая палова XVI ст.

Прыход новых прынцыпаў фартыфікацыі ў ВКЛ адбыўся ўжо ў першай палове XVI ст. Пры гэтым можна вылучыць шэраг асноўных тэндэнцый, якія пачынаюць вызначаць накірунак развіцця абарончай архітэктуры. Папулярнасць набываюць земляныя ўмацаванні, якія маглі больш эфектыўна супрацьстаяць абложнай артылерыі, чым мураваныя і драўляныя. Разам з тым шэраг фактараў перашкаджалі шырокаму распаўсюджанню навейшых земляных умацаванняў. Так, на ўсходзе краіны з-за спецыфікі тэатру ваенных дзеянняў і характару праціўніка доўгі час актуальнасць захоўвалі дрэва-земляныя ўмацаванні традыцыйнага тыпу. Апроч таго, пашырэнню земляных умацаванняў перашкаджала тое, што яны былі малапрыдатнымі для будаўніцтва рэпрэзентацыйных комплексаў. Таму пры будаўніцтве многіх рэзідэнцый уласнікі кіраваліся распрацаванымі раней архітэктурнымі канцэпцыямі. Напрыклад, Любчанскі замак сведчыць аб папулярнасці формы кастэлі ў апошняй чвэрці XVI ст.

Для вядзення агню з розных відаў агняпальнай зброі былі неабходны спецыяльныя збудаванні. Першапачаткова замест высокіх і вузкіх познесярэднявечных вежаў у Еўропе ўзводзіліся магутныя артылерыйскія вежы з тоўстымі сценамі і шырокімі платформамі для ўстаноўкі гармат. Аднак у хуткім часе развіццё ваеннай тэхнікі і павелічэнне магутнасці артылерыі прымусіла да максімальнага паніжэння фланкіравальных элементаў, каб схаваць іх ад артылерыі. Так паўсталі бастэі, якія не пераўзыходзілі па сваёй вышыні абарончыя сцены ці валы, мелі магутныя муры і шырокія платформы на адным, двух ці трох узроўнях для размяшчэння на іх артылерыі і абаронцаў. Найбольш вядомай спробай тэарэтычнага абгрунтавання выкарыстання бастэй у ваеннай архітэктуры з'яўляецца праца А. Дзюрэра, выдадзеная ў 1527 г. У ВКЛ класічныя мураваныя бастэі А. Дзюрэра былі ўзведзены ў Коўне і ў ланцугу гарадскіх умацаванняў Вільні. Найбольш распаўсюджанай формай фланкіравальных збудаванняў, прыстасаваных да выкарыстання артылерыі, сталі земляныя бастэі, якія ў крыніцах фігуру-

юць пад тэрмінамі *больверкі* (ням. *Bollwerk*), ці *быкі*[265]. Па форме яны маглі быць круглым ці поліганальнымі[266]. Апошняе набліжае іх да бастыёнаў і ў пэўным сэнсе ўскладняе разуменне гэтай формы абарончых элементаў як асобнай.

Іншым папулярным варыянтам фланкіравальных збудаванняў сталі нізкія драўляныя башты. Яны давалі магчымасць узмацніць абарончы перыметр дрэва-земляных умацаванняў традыцыйнага тыпу і сталі надзвычай папулярнымі ва ўсходніх рэгіёнах ВКЛ. Нягледзячы на адносную таннасць земляных фартыфікацый, узводзіць іх маглі сабе дазволіць толькі найбольш заможныя гарады. У сваю чаргу, для многіх сярэдніх і дробных гарадоў у XVI–XVII стст. аптымальнай формай умацаванняў сталі невысокія драўляныя сцены ў выглядзе паркана з фланкіравальнымі баштамі. Аб даверы да такога кшталту ўмацаванняў сведчыць наступная цытата, у якой ідзе размова аб будаўніцтве ўмацаванняў у Сапежыне ў першай чвэрці XVII ст.: «*...iesliby sie miało co budowac tedy nie taki ostrog miałby byc, ktory prawie na smiechotowisko ludzkie postawiono, ale by go teraz prawie z fundamentu warowny parkan z gęstymi basztami do potężney obrony postawic*»[267]. Падобныя парканы з баштамі ў XVII ст. мелі радзівілаўскія замкі ў Клецку і Давыд-Гарадку, пра што згадвалася вышэй.

Абавязковым пры планаванні і ўзвядзенні фартыфікацый становіцца прынцып фланкіравання праслаў абарончых сцен і валоў[268]. Гэта вымушала да геаметрызацыі плана ўмацавання з мэтай ліквідацыі так званых *мёртвых зон* і максімальна эфектыўнага выкарыстання агняпальнай зброі. Разам з тым умелая рэарганізацыя перыметра абароны ўмацавання з шырокім выкарыстаннем фланкіравальнага агню дазваляла весці эфектыўную абарону пры адносна невялікім гарнізоне. Таму пераход да фартыфікацыі новага кшталту даваў магчымасці для пэўнай эканоміі сродкаў пры арганізацыі абароны[269]. Паралельна з гэтым у ВКЛ распаўсюджваліся рэнесансныя архітэктурныя канцэпцыі, паводле якіх рэгулярныя ў плане абарончыя збудаванні лічыліся найбольш эфектыўнымі. Апроч таго, рэгулярны план фартэцый сам па сабе лічыўся сімвалічным: канцэпцыя ідэальнага горада і ідэя антрапамарфізму ў архітэктуры. У гэтым можна бачыць таксама пэўны палітычны маніфест, звязаны з эвалюцыяй канцэпцыі ўлады ў розных краінах Еўропы[270]. У ВКЛ гэтую сімволіку паспяхова выкарыстоўвалі магнаты, у тым ліку Радзівілы.

---

[265] *Ласковский Ф. Ф.* Материалы для истории инженернаго искусства в России. Ч. 1. С. 74.

[266] *Bogdanowski J.* Fortyfikacje łańcuckie na tle małopolskiej sztuki obronnej. S. 102–104.

[267] LMAVB. F. 139. B. 2148. L. 13.

[268] *Bogdanowski J.* Fortyfikacje łańcuckie na tle małopolskiej sztuki obronnej. S. 168–169.

[269] *Gebuhr R., Theissen A., Winter M.* Von Vestungen // Von Vestungen – Die brandenburgisch-preußischen Festungen Spandau, Peitz und Küstrin. Berlin, 2001. S. 18.

[270] *Schütte U.* Das Schloß als Wehranlage: befestigte Schloßbauten der frühen Neuzeit im alten Reich. S. 144–145; Viganò M. Die Entwicklung historischer Zitadell-Bauten in Italien vom 16. bis zum 19. Jahrhundert. S. 12.

Новыя фартыфікацыйныя ўплывы бачны ў замку ў Пячкоўскім Гарадку, які ў крыніцах фігуруе таксама пад назвай Ярад Гарадок[271]. Важна адзначыць, што гэта была адна з першых рэзідэнцый на беларускіх землях, якую збудавалі самі Радзівілы. Вядома, што ў 1495 г. Аляксандр Ягелончык надаў Мікалаю II Радзівілу маёнтак Хоўхла, да якога належаў Пячкоўскі «дварэц». Апошняе адназначна ўказвае на ўзвядзенне ўмацаванай рэзідэнцыі ўжо пры новых уласніках. Гэта магло адбыцца пры Яне II Радзівілу, які валодаў згаданым маёнткам у 1521–1545 гг. Пра ўвагу гэтага магната да Пячкоўскага гарадка сведчыць заснаванне тут у 1530 г. мястэчка[272].

Паводле археалагічных даследаванняў, першапачаткова ў Гарадку існавала гарадзішча ранняга жалезнага веку, якое ў далейшым было закінута. У пачатку XVI ст. фіксуюцца значныя працы па мадэрнізацыі ўмацаванняў, якія трэба звязваць з дзейнасцю Радзівілаў. Паводле матэрыялаў археалогіі, замак функцыянаваў да сярэдзіны – другой паловы XVII ст. Умацаванне складаецца з двух галоўных элементаў: авальнай пляцоўкі памерам 44 × 72 м і вышынёй 5 м, на якой знаходзіліся жылыя пабудовы, і вала вышынёй да 10 м. Яны падзелены вадзяным ровам шырынёй 25 м (мал. 19)[273]. Падобную структуру з невялікай унутранай пляцоўкай, акружанай магутным земляным валам, меў Геранёнскі замак Гаштольдаў першай чвэрці XVI ст., які лічыцца адным з першых умацаванняў новага кшталту ў ВКЛ. Важна адзначыць, што ў выпадку Пячкоўскага Гарадка і Геранёнаў пояс земляных фартыфікацый амаль пазбаўлены фланкіравальных элементаў, што дапамагае ў датаванні. Прынцып фланкіравання сумежных абарончых элементаў становіцца абавязковым на нашых землях з сярэдзіны XVI ст.



Мал. 19. Замак у Пячкоўскім Гарадку. Паводле Я. Г. Звяругі

На прыкладзе Пячкоўскага Гарадка праявілася характэрная асаблівасць умацаваных рэзідэнцый новага тыпу, што праявілася ў Еўропе ў канцы XV – пачатку XVI ст., – аддзяленне абарончых умацаванняў ад жылых будынкаў. Гэта было звязана з эвалюцыяй абарончай архітэктуры, якую прыстасоўвалі да агняпальнай зброі,

[271] *Zawadzki J.* Siedziby Kiszków i Radziwiłłów na Białorusi w XVI–XVIII wieku : opisy z zasobu Archiwum Głównego Akt Dawnych. S. 26.

[272] *Malczewska M.* Latyfundium Radziwiłłów w XV do połowy XVI wieku. S. 72.

[273] *Zawadzki J.* Siedziby Kiszków i Radziwiłłów na Białorusi w XVI–XVIII wieku : opisy z zasobu Archiwum Głównego Akt Dawnych. S. 26; *Ганецкая І.* Гісторыя фартыфікацыі гарадзішча ў в. Гарадок Маладзечанскага раёна // ГАЗ. 2002. № 17. С. 175–180; *Бохан Ю. М.* Мястэчкі і працэсы ўрбанізацыі на землях Беларусі ў XV–XVIII стст. / уклад. М. А. Волкаў. Мінск, 2018. С. 72.

і з развіццём архітэктурнай праграмы рэзідэнцыянальнай часткі. Падзел на жылую і абарончую часткі стаў надзвычай актуальны з пашырэннем земляных умацаванняў[274].

Змены ў архітэктурным вобліку магнацкіх рэзідэнцый у XVI ст. добра ілюструе прыклад Мірскага замка. Пасля атрымання Міра ў 1568 г. Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка зрабіў замак сваёй галоўнай рэзідэнцыяй[275]. Ужо пасля ўзвядзення магутнага бастыённага замка ў Нясвіжы ў канцы XVI – пачатку XVII ст. рэзідэнцыя была перанесена туды, а Мірскі замак адступіў на другі план. На нашу думку, асноўныя працы па перабудове Мірскага замка маглі прыпасці якраз на 70-я гг. XVI ст. Працэс перабудовы рэзідэнцыі, верагодна, супаў з лакацыяй і наданнем магдэбурскага права мястэчку Мір, што адбылося ў 1579 г. Асноўныя працы па перабудове замка былі скончаны да 1594 г.[276] Унутры старой кастэлі Іллінічаў былі ўзведзены два трохпавярховыя жылыя карпусы, а звонку былі насыпаны земляныя ўмацаванні, якія ўяўлялі сабой няправільны па форме чатырохвугольнік з невялікімі паліганальнымі бастэямі па вуглах (мал. 20–21). Да нашага часу захаваліся паўночна-ўсходняя бастыя, паўночная і часткова заходняя і ўсходняя курціны. Вал захаваўся на вышыню 4 м. Раней перад ім меўся роў, які напаўняўся вадою пры дапамозе сістэмы ставаў. Ролю бруствера мог выконваць драўляны паркан ці шэрагі кашоў-габіёнаў з байніцамі для стралкоў і амбразурамі для гармат. Падобныя ўмацаванні набыло і мястэчка Мір. Па перыметры прамавугольнага ў плане паселішча быў насыпаны вал, на якім стаяў драўляны паркан[277]. У вале меліся чатыры мураваныя брамы, а па рагах умацавання, па ўсёй верагоднасці, былі насыпаны земляныя бастэі, аналагічныя замкавым.

Адным з асноўных недахопаў земляных умацаванняў Мірскага замка, на думку Ю. Заяца, была невялікая вышыня вала, які не закрываў палац ад варожага абстрэлу[278]. Аднак варта ўлічваць, што для апошняй чвэрці XVI ст. актуальнай была небяспека так званай *казацкай сваволі* ці супрацьстаяння з іншымі магнатамі. Менавіта супраць такой пагрозы мусілі абараняць свайго ўладальніка і яго маёмасць мадэрнізаваныя фартыфікацыі Мірскага замка. Падобныя задачы выконвалі і многія іншыя *palazzo in forteca* (фартыфікаваныя палацы), узведзеныя ў гэты час.

Аднак ужо напрыканцы XVI ст. земляныя ўмацаванні замка ў Міры, верагодна, страцілі сваю актуальнасць. Мірская рэзідэнцыя была безабароннай перад казакамі Севярына Налівайкі, якія ў 1595 г. занялі і разрабавалі Слуцк і пагражалі землям Наваградскага ваяводства. У пачатку 1596 г. С. Налівайка

---

[274] *Schütte U.* Das Schloß als Wehranlage: befestigte Schloßbauten der frühen Neuzeit im alten Reich. S. 210.

[275] *Калнін В. В.* Мірскі замак. С. 62–74.

[276] *Калнін В.* Хто будаваў Мірскі замак? С. 40.

[277] AGAD. AR. Dz. V. Sygn. 17 664. S. 169; Dz. XXV. Sygn. 2455/1. S. 24.

[278] *Заяц Ю. А.* О некоторых особенностях принципов организации обороны Мирского замка (мифы и реальность) // МАБ. Мінск, 2006. Вып. 12. С. 194.

Мал. 20–21. Земляныя ўмацаванні вакол Мірскага замка

з артылерыяй прайшоў праз Лахву, якая належала Сіротку, пераправіўся праз Прыпяць і пайшоў на Валынь. Але баяліся, што ён вернецца, аб чым пісаў сам князь[279]. Сіротка адмовіўся ад грунтоўнай мадэрнізацыі Мірскага замка на карысць Нясвіжа. Што мела вырашальны ўплыў на гэта, вызначыць дакладна цяжка. Цалкам магчыма, што магнат вырашыў узвесці больш сучасную ў плане фартыфікацый і архітэктурнай праграмы рэзідэнцыю менавіта ў сталіцы ардынацыі. Акрамя таго, у Нясвіжы мелася выдатная магчымасць для стварэння разгалінаванай сістэмы водных перашкод, што было важна для бастыённай фартыфікацыі.

У жніўні-верасні 1655 г. мястэчка Мір было захоплена і абрабавана казакамі і маскоўскімі войскамі, аднак замак узяты не быў[280]. Далейшыя падзеі засведчылі, што Мірскі замак на лакальным узроўні захоўваў абарончае значэнне і дазваляў кантраляваць рэгіён і шляхі, якія праз яго праходзілі. У канцы 1655 г. Багуслаў Радзівіл праз слуцкага каменданта Волакса хітрасцю падпарадкаваў сабе Нясвіж і Мір, адабраўшы іх ва ўнука Сіроткі – Міхала Казіміра Радзівіла. Слуцкія жаўнеры занялі Мірскі замак 12 снежня. Яго камендантам быў прызначаны нейкі Ліхтэмберк[281]. Тады ж з Нясвіжскага замка ў Мірскі было адпраўлена 4 гарматы і 24 гакаўніцы[282]. Аднак у хуткім часе Нясвіжскі і Мірскі замкі былі заняты атрадамі Самуэля Аскеркі і вернуты ў падпарадкаванне нясвіжскаму ардынату. У Слуцк навіна аб страце Мірскага замка прыйшла напачатку красавіка 1656 г., у ёй адзначалася, што замак быў узяты праз здраду групы жаўнераў[283]. Вясною 1659 – у першую палову 1660 г. у час паходу маскоўскіх войскаў на чале з ваяводам Іванам Хаванскім у Наваградчыну, Берасцейшчыну і Падляшша Мірскі замак ізноў быў разрабаваны. Пасля разгрому арміі Хаванскага пад Палонкай 28 чэрвеня 1660 г. ужо на наступны дзень, 29 чэрвеня, пад Мірскі замак падышла група войскаў ВКЛ на чале Самуэлем Кміцічам, Станіславам Ліпніцкім і Крыштафам Францішкам Сапегам, якія рушылі з-пад Ляхавічаў хуткім маршам, спадзяючыся ўзяць у палон самога ваяводу. У замку стаяла маскоўская залога ў 120 чалавек, якія «пасля некалькіх эксперыментаў» у той жа дзень здалі замак. Вырашальнае значэнне, напэўна, мела вестка аб поўным разгроме маскоўскіх войскаў пад Палонкай[284].

У выніку вайны 1654–1667 гг. стала зразумела, што замак у Міры больш не здольны выконваць функцыі абарончага ўмацавання, таму яго пачалі перарабліваць пад адкрытую рэзідэнцыю. Уздоўж паўднёвай і заходняй сцен былі

---

[279] *Грицкевич А. П.* Социальная борьба горожан Белоруссии (XVI–XVIII вв.). С. 58.

[280] *Naronowicz-Narański J.* Budownictwo wojenne / oprac. J. Nowakowa, red. T. Nowak. Warszawa, 1957. S. 51.

[281] *Kossarzecki K.* Próby tworzenia udzielnego władztwa księcia Bogusława Radziwiłła w oparciu o dobra podlaskie i słuckie w okresie zalewu szwedzkiego i moskiewskiego przełomu 1655 i 1656 r. S. 33.

[282] AGAD. AR. Dz. XXVI. Sygn. 80. S. 2.

[283] LMAVB. F. 9. B. 1873. P. 101.

[284] *Касажэцкі К.* Кампанія 1660 году ў Літве. С. 289.

ўзведзены гаспадарчыя збудаванні рознага прызначэння, для якіх у абарончых мурах прабіваліся праходы. Ужо ў 1661 г. згадваецца аб заканчэнні даху на бровары, які быў прыбудаваны да сцяны між паўднёва-заходняй і брамнай вежамі[285]. У крыніцах 1680-х гг. згадваюцца спецыяльныя матыкі і колы, якія выкарыстоўваліся для разбівання муроў[286]. Як вынікае з інвентароў 1681 і 1688 гг., узвод у браме ўжо не працаваў: ланцугі былі абарваныя і ён наўпрост ляжаў на зямлі. У канцы XVII ст. з паўночнага палаца праз вал быў збудаваны мост у італьянскі сад, што сведчыла аб страце Мірскім замкам абарончага характару.

У час Вялікай Паўночай вайны шведы не бачылі ў Мірскім замку колькінебудзь сур'ёзнага фартыфікацыйнага аб'екта, не было там і гарнізона. Фатальным для замка стаў паход шведскіх войскаў праз тэрыторыю Беларусі на чале з Карлам XII у 1706 г. У сярэдзіне сакавіка шведскі корпус на шляху ў Нясвіж разграміў тысячны атрад казакаў, які стаяў у Міры[287]. Пры гэтым казакі, захопленыя знянацку, відаць, не паспелі скарыстацца абарончымі ўмацаваннямі замка. 27 красавіка шведы ізноў увайшлі ў Мір і занялі рэзідэнцыю, якую на наступны дзень спалілі[288]. Пры гэтым варта адзначыць, што шведы не палічылі неабходным руйнаваць састарэлыя фартыфікацыі замка, у той час як больш сучасныя бастыённыя фартыфікацыі Карл XII загадваў разбураць. Такім чынам, абароназдольнасць Мірскага замка Радзівілы падтрымлівалі да сярэдзіны XVII ст., а пасля вайны 1654–1667 гг. яго ваенная гісторыя закончылася.

Вельмі рана – яшчэ ў першай палове XVI ст. – земляны вал з драўляным парканам наверсе быў узведзены ў Слуцку. Актыўная будаўнічая дзейнасць у горадзе была магчымай дзякуючы значнаму дэмаграфічнаму і эканамічнаму росту паселішча. Новая лінія ўмацаванняў закрыла найбольш густанаселены гандлёва-рамесны пасад у міжрэччы Бычка і Случы і праіснавала да пачатку XVII ст., калі пачалося будаўніцтва новага больш маштабнага фартыфікацыйнага пояса[289]. Дакладная дата пачатку ўзвядзення новага земляного вала, які акружыў усё Старое места Слуцка, невядомая, аднак з упэўненасцю можна казаць, што працы ініцыяваў Януш Радзівіл, у валоданне якога горад перайшоў у 1600 г. Так, у рахунках магната за 1619 г. згадваецца «ляхавіцкі валмайстар», які працаваў на ўзвядзенні валоў у Слуцку[290]. Верагодна, першапачаткова для вядзення фланкіравальнага агню насыпаліся невялікія земляныя бастэі, ці быкі[291].

Аб далейшай мадэрнізацыі ўмацаванняў Слуцка, ці дакладней аб планаваных захадах у гэтым накірунку, сведчыць інструкцыя Крыштафа Радзівіла 1620-х гг. Важнейшым мерапрыемствам былі працы па насыпанні земляного

[285] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 4466. Арк. 285 адв.
[286] Тамсама. Спр. 4468. Арк. 131 адв.
[287] *Nordberg J. A.* Histoire De Charles XII Roi De Suede. La Haie. 1744. T. 2. P. 81.
[288] AGAD. AR. Dz. V. Sygn. 12044. S. 15.
[289] *Волкаў М.* Слуцк на старых планах. С. 11–12.
[290] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 10 729. Арк. 10 адв.
[291] AGAD. AR. Dz. VII. Sygn. 678. S. 5–8.

вала Старога места. У якасці дадатковага ўмацавання прапановаўвалася шырока выкарыстоўваць драўляны штыкет. У прыватнасці, яго неабходна было паставіць з вонкавага боку старамескага вала. Закрыць штыкетам таксама планавалася неўмацаваныя валам часткі горада: Старое места з боку ракі, Новае места і замкі. Пры гэтым згадваецца, што ў Ніжнім замку трэба было паставіць штыкет «*для бакавой стральбы і фланкіравання сцен*». Для ўмацавання Старога места з боку ракі К. Радзівіл прапаноўваў пасярэдзіне дзядзінца Верхняга замка з боку Новага места ўзвесці «вялікі больверк», з якога б можна было прастрэльваць рэчышча ракі. Узвесці больверк можна было з зямлі і дзірвану ці з дрэва ў дзве сцяны, якія затым для абароны ад агня трэба было абляпіць глінай. Сам К. Радзівіл лічыў больш надзейным больверк з зямлі. Наверсе па перыметры ўмацавання неабходна было расставіць кашы, насыпаныя зямлёй, якія б выконвалі функцыю бруствера. Аднак гэты праект не быў рэалізаваны. Досыць простыя ўмацаванні Новага места па праекце К. Радзівіла павінны былі выглядаць наступным чынам: перад штыкетам трэба было ўзвесці плот з галля ў пояс чалавека, які трэба было ўнутры набіць зямлёй з рову перад штыкетам. Такім досыць простым спосабам меркавалася абараніць штыкет ад артылерыйскага агню. Урэшце, завяршаючы апісанне планаў па разбудове ўмацаванняў Слуцка, варта прыгадаць пра драўляныя кабыліны, якія трэба было расставіць за ровам вакол усяго горада. Апошнія павінны былі забяспечыць горада на выпадак раптоўнай атакі[292]. Дакладна невядома, што з інструкцыі К. Радзівіла было рэалізавана, але на падставе яе добра бачны асаблівасці абарончай архітэктуры першай чвэрці XVII ст. Узвядзенне земляных умацаванняў вакол Слуцка ішло паступова, а ў сярэдзіне – другой палове XVII ст. яны былі мадэрнізаваны па правілах старагаландскай фартыфікацыі.

Стварэнне ўрбаністычнага арганізма новага ўзроўню ў Нясвіжы было звязана з дзейнасцю Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі (мал. 22–23). Будаўніцтва новага бастыённага замка распачалося ў 1582 ці 1583 г.[293] Паралельна з узвядзеннем замка была праведзена лакацыя, ці закладка новага горада. Пачатак гэтага працэсу выразна маркіруе наданне Нясвіжу магдэбурскім правам, якое адбылося ў 1586 г. У прывілеі на магдэбурскае права рэгламентаваліся абавязкі мяшчан па будаўніцтве фартыфікацый[294]. У 1592 г. працы па насыпанні гарадскіх умацаванняў ужо вяліся[295]. Прынята лічыць, што на час, калі была напісана гравюра Т. Макоўскага (каля 1600 г.), асноўныя працы па ўзвядзенні замка і горада былі скончаны. Але працы працягваліся і пазней. Вядома, напрыклад, што ў 1615 г. нейкімі будаўнічымі працамі ў Нясвіжы кіраваў майстар Ганус[296].

---

[292] AGAD. AR. Dz. XXIII. T. 130. Pl. 2. S. 259–263.

[293] *Metel'skij A. A.* Fortyfikacje zamku w Nieświeżu z końca XVI – początku XVIII wieku. S. 161–162.

[294] Падрабязней гл.: *Волкаў М.* Абарончы комплекс Нясвіжа ў XVI–XVIII стст. С. 175–187.

[295] *Kempa T.* Mikołaj Krzysztof Radziwiłł Sierotka (1549–1616) – wojewoda wileński. S. 188.

[296] LMAVB. F. 139. B. 3818. L. 3–3v.



Мал. 22. Нясвіж. Т. Макоўскі. Пачатак XVII ст.

Мал. 23. Нясвіж. Пачатак XIX ст.

Т. Бернатовіч выказаў слушнае меркаванне наконт таго, што паводле першага праектнага плана горада, і яго фартыфікацыі павінны былі мець рэгулярны, магчыма, прамавугольны абрыс[297]. Аднак у хуткім часе магнат быў вымушаны мадыфікаваць план паселішча, якое было выцягнута ў паўднёвым накірунку і набыло выгляд няправільнага шматвугольніка. Гэта адбылося пасля 1590 г., калі на паўднёвым вугле горада было вырашана закласці кляштар бенедыктынак[298].

Параўноўваючы планы Нясвіжа канца XVIII – пачатку XIX ст. з гравюрай Т. Макоўскага, можна больш дакладна вызначыць характар першых гарадскіх умацаванняў. Яны ўяўлялі сабой земляны вал з драўляным штыкетам і вадзяным ровам. На трох вуглах, а таксама пасярдзіне паўднёва-заходняй курціны былі размешчаны паліганальныя земляныя бастэі. Адна з іх захавалася да канца XVIII ст. ля бернардзінскага кляштара. Пасля вайны 1654–1667 гг. нясвіжскія фартыфікацыі былі грунтоўна перабудаваны паводле старагаландскай манеры, у тым ліку вакол згаданай бастэі быў насыпаны большы па плошчы бастыён. На падставе выявы на плане канца XVIII ст. добра бачна, што нясвіжскія бастэі былі аналагічнымі да бастэй Мірскага замка. Умацаванні ва ўсходнім вугле горада былі слабейшымі, паколькі з гэтага боку над паселішчам дамінаваў замак. Для фланкіравання Замкавай і Слуцкай брам абарончая сцяна ў гэтым месцы крыху выступала за перыметр валоў, утвараючы фланкі, што выразна бачна на гравюры Т. Макоўскага. З-за нізіннага забалочанага характару мясцовасці сцяна ў гэтым месцы была разабрана ў XVII–XVIII стст. У другой палове XVII ст. гарадскія ўмацаванні Нясвіжа былі мадэрнізаваны паводле прынцыпаў старагаландскай школы.

Земляныя ўмацаванні, што акружалі Нясвіж, не давалі магчымасці для рэпрэзентацыі, таму ўся знакавая нагрузка была ўскладзена на вежы пры брамах. Тут варта казаць аб рэалізацыі яшчэ сярэднявечнай ідэі акцэнтавання брамаў з дапамогай вышынных дамінантаў. Іх вертыкальны сілуэт паказваў месца брамы ва ўмацаваннях і абазначаў галоўныя восі гарадской прасторы. Пры гэтым для Усходняй Еўропы характэрным было ўладкаванне праездаў у вежах, у той час як у Нясвіжы мы бачым адасабленне брам ад вежаў (мал. 22, 24). Такі варыянт можна сустрэць у асобных рэгіёнах Германіі, у прыватнасці Саксоніі-Ангальт[299]. На прыкладзе збудаванай побач з Замкавай брамай вежы, якая захавалася да нашага часу, можна сцвярджаць, што абарончыя функцыі гэтых вежаў былі мінімальныя.

Адной з цікавых асаблівасцей лакацыйнага Нясвіжа з'яўляецца будаўніцтва на вуглах горада кляштараў. Вышэй згадвалася, што выбар месца іх

---

[297] *Bernatowicz T.* «Nesvisium metropolis ducatus». Nieznany przykład urbanistyki manierystycznej. S.165.

[298] *Bernatowicz T.* Kościół i klasztor benedyktynek w Nieświeżu // Sztuka kresów wschodnich. 1996. T. 2. S. 128–137.

[299] *Biller T.* Die mittelalterliche Stadtbefestigung im deutschsprachigen Raum: Zu Stand und Perspektive der Forschung // Stadt, Burg, Festung. Stadtbefestigung von der Antike bis ins 19. Jahrhundert. Innsbruck, 1994. S. 109, 112.

Мал. 24. Вежа ля Замкавай брамы ў Нясвіжы. Пачатак XX ст. IS PAN. TOZP. Nr 2998

будаўніцтва, верагодна, вынікаў з ідэйных перакананняў Сіроткі. Разам з тым кляштарныя комплексы маглі выконваць і абарончую функцыю[300]. У прыватнасці, вядома, што ў езуіцкім кляштары ў 1706 г. паспяхова абараняліся казакі пасля захопу шведамі астатняга горада[301].

Такім чынам, умацаванні Нясвіжа шмат у чым адрозніваліся ад слуцкіх. Пояс нясвіжскіх фартыфікацый будаваўся паводле аднаго праекта, які хаця і быў падкарэктаваны ў працэсе рэалізацыі, аднак захаваў пэўную стройнасць і прадуманасць. У сваю чаргу, развіццё Слуцка і будаўніцтва яго ўмацаванняў шмат у чым мела стыхійны характар. У нясвіжскіх умацаваннях была больш значная семантычная нагрузка, што вынікала са статусу Нясвіжа, які быў

[300] *Hryckiewicz A.* Warowne miasta magnackie na Białorusi i Litwie. S. 431, 437; *Дзянісаў У. М., Пазняк З. С.* Мінскі кляштар дамініканцаў // Помнікі мастацкай культуры Беларусі : новыя даследаванні. Мінск, 1989. С. 125.

[301] *Волкаў М.* Нясвіжскі замак у Вялікай Паўночнай вайне // Вялікае Княства Літоўскае і суседзі : Права. Вайна. Дыпламатыя / рэд. С. Ф. Сокал, А. М. Янушкевіч. Мінск, 2012. С. 225–226.

галоўнай родавай рэзідэнцыяй нясвіжскай галіны Радзівілаў. У сваю чаргу, біржанскія Радзівілы мелі больш прагматычныя адносіны да пытання разбудовы ўмацаванняў Слуцка. Урэшце, як паказалі будучыя падзеі, куды большае значэнне для арганізацыі абароны паселішча мела не якасць фартыфікацый, а дэмаграфічны і эканамічны патэнцыял населеных пунктаў. Таму заможны Слуцк у сярэдзіне XVII ст. быў пераўтвораны ў магутную фартэцыю, здольную вытрымаць аблогу вялікага вайсковага злучэння, а рэалізаваць падобны праект на падставе меншага па памерах Нясвіжа не ўдалося.

На прыкладзе земляных умацаванняў Мірскага замка і Нясвіжа бачна, што адной з важнейшых асаблівасцей умацаванняў XVI ст. была планіроўка правільнай формы. На гэта ўплывала не толькі развіццё ваеннай тэхнікі, але і новыя архітэктурныя канцэпцыі, якія прыйшлі ў ВКЛ разам з культурай Рэнесансу. У сваіх землях Радзівілы мелі шэраг рэзідэнцый, якія паводле гэтага крытэрыю можна аднесці да тыпу навейшых умацаванняў. Напрыклад, яшчэ да перабудовы Нясвіжа і ўзвядзення новага бастыённага замка там мелася ўмацаваная рэзідэнцыя, якая ў плане мела правільную канфігурацыю. Як бачна на гравюры Т. Макоўскага, гэта быў драўляны замак з невысокімі сценамі і вуглавымі вежамі, а таксама з комплексам жылых і гаспадарчых будынкаў унутры. Пра час будаўніцтва гэтага комплексу нічога невядома, аднак па асаблівасцях архітэктуры можна меркаваць, што ён паўстаў недзе ў першай палове – сярэдзіне XVI ст. пры Радзівілах ці папярэдніх уласніках Нясвіжа – Кішках[302].

У XVI–XVII стст. дрэва-земляны замак існаваў у мястэчку Магільна Менскага павета. Дзядзінец умацавання памерам 110 × 65 м меў правільную канфігурацыю, што з'яўляецца выразнай праявай новых тэндэнцый у фартыфікацыі. Па перыметры быў насыпаны земляны вал, а перад ім меўся роў глыбінёй да 8 м[303]. Захаваўся інвентар Магільнянскага замка 1536 г. У ім згадваецца, што замак быў узведзены пры Станіславе Пацу. У 1599 г. Магільна разам з замкам было прададзена М. К. Радзівілу Сіротку[304]. У хуткім часе за непатрэбнасцю ўмацаванне прыйшло ў заняпад.

Рэалізацыю прынцыпаў навейшай фартыфікацыі можна бачыць у гарадскіх умацаваннях Копысі, якая ў канцы XVI ст. перайшла ў валоданне біржанскіх Радзівілаў. У крыніцах гэтага часу згадваецца пра ўмацаванні замка і горада. Апошнія называюцца і парканам, і астрогам[305]. На плане 1665 г. бачна, што паселішча было акружана працяглай лініяй драўляных умацаванняў, якія мелі правільны абрыс (мал. 25)[306]. Выгляд сцяны адпавядае інфармацыі з інвентарных апісанняў, у якіх яна названа парканам «з ізбіцамі»[307]. Як бачна

[302] *Metel'skij A. A.* Fortyfikacje zamku w Nieświeżu z końca XVI – początku XVIII wieku. S. 162.

[303] *Ткачоў М. А.* Замкі і людзі. С. 129.

[304] *Mikulski W., Zawadzki J.* Opisy zamków białoruskich z inwentarzy dóbr przechowywanych w Archiwum Radziwiłłów w Archiwum Głównym Akt Dawnych. S. 53–54.

[305] *Ткачоў М.* Замкі і людзі. С. 59.

[306] AGAD. AR. Dz. XXIII. T. 34. Pl. 2. S. 25.

[307] *Ткачоў М.* Замкі і людзі. С. 62.



Мал. 25. Копысь. 1665 г. AGAD. AR. Dz. XXIII. T. 34. Pl. 2



Мал. 26. Копысь. 1707 г. БАН. Ф. 266. Т. 3. Арк. 36

на плане, па перыметры стаяла 21 башта, з якіх 3 выконвалі функцыі брам, а перад сцяной праходзіў вадзяны роў. Агульная даўжыня гарадскіх умацаванняў складала 3370 локцяў (2190 м). Што цікава, гэтыя фартыфікацыі не былі знішчаны ў час вайны 1654–1667 г., нягледзячы на некалькі аблог і штурмаў Копысі, і прастаялі да Вялікай Паўночнай вайны[308]. Гэта добра бачна пры параўнанні плана 1665 г. з расійскім планам 1707 г. (мал. 26)[309]. Апошні быў створаны ў час узвядзення вялікага абарончага лагера вакол горада. Аднак у тым жа годзе расіяне прынялі рашэнне адступіць і спалілі паселішча з умацаваннямі[310].

3.4. Бастыённыя ўмацаванні новаітальянскай сістэмы

У другой палове XVI ст. у ВКЛ прыйшлі перадавыя на той час бастыённыя ўмацаванні. Дамінаванне італьянскіх уплываў у культуры ВКЛ у сярэдзіне – другой палове XVI ст. прывяло да распаўсюджання ў краіне так званай *новаітальянскай фартыфікацыйнай сістэмы*, якая на той час была найбольш развітай і дасканалай у Еўропе. Яе асаблівасцю было шырокае выкарыстанне мураваных збудаванняў і канструкцый, што рабіла ўмацаванні такога кшталту больш даўгавечнымі, а разам з тым надзвычай дарагімі. Таму ўзвядзенне фартэцый па новаітальянскай сістэме было даступна толькі найбольш заможным магнатам. У выніку ў ВКЛ іх было збудавана няшмат, а асноўнай формай умацаванняў, узведзеных паводле правілаў новаітальянскай сістэмы, былі бастыённыя замкі, якія, як пісалася вышэй, сталі новай формай самарэпрэзентацыі магнацкай эліты. Ва ўладаннях Радзівілаў на тэрыторыі Беларусі гэтая сістэма была рэалізавана толькі ў Нясвіжскім замку.

Падрыхтоўка да будаўніцтва новага замка пачалася пасля 1577 г., калі Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка стаў паўнапраўным гаспадаром Нясвіжа. Будаўнічыя працы пачаліся з 1582–1583 гг.[311], а на момант стварэння гравюры Т. Макоўскага, каля 1600 г., былі скончаны ці набліжаліся да завяршэння (мал. 27). Існуе меркаванне, што гравёр адлюстраваў Нясвіж не ў актуальным стане, а ў праектным, які мог быць не рэалізаваны да канца. Таму многія дэталі на гравюры выклікаюць у даследчыкаў сумненні[312].

Асноўным фартыфікацыйным элементам Нясвіжскага замка з'яўляўся высокі земляны вал. Унізе ён быў дадаткова ўмацаваны ніжнім валам з мураваным эскарпам. Высокі вал, на нашу думку, быў неабходны для прыкрыцця пабудоў унутры замка ад артылерыйскага абстрэлу ў выпадку аблогі. Яго знешні і ўнутраны схілы не мелі мураванай абкладкі. Як можна меркаваць

[308] *Ткачоў М.* Замкі і людзі. С. 61–62.

[309] БАН. Ф. 266. Т. 3. Л. 36.

[310] *Ткачоў М.* Замкі і людзі. С. 63.

[311] *Metel'skij A. A.* Fortyfikacje zamku w Nieświeżu z końca XVI – początku XVIII wieku. S. 161–162.

[312] *Gruszecki A.* Fortyfikacja zamku w Nieświeżu. S. 143; *Пярвышын У.* Фартыфікацыі Нясвіжскага замка ў канцы XVI – XVIII ст. С. 115.

Мал. 27. Нясвіжскі замак. Т. Макоўскі. Пачатак XVII ст.

па гравюры Т. Макоўскага, вал першапачаткова не меў бруствера. На пачатку вайны 1654–1667 гг., калі замак пачалі рыхтаваць да абароны і ўдасканальваць яго фартыфікацыі, на валах і бастыёнах быў насыпаны земляны бруствер. Зверху на ім былі пастаўлены малыя габіёны, ці плеценыя кашы, насыпаныя зямлёй.

Ніжні вал з'яўляўся другім узроўнем абароны фартэцыі (мал. 28–29). Ён быў цалкам абкладзены цэглай і завяршаўся мураваным брустверам з амбразурамі. З іншага боку даволі глыбокага рова знаходзіўся цагляны контрэскарп. Мураваная абкладка эскарпа і контрэскарпа надзвычай ускладнялі перадоленне рова для непрыяцеля. Пры гэтым муры былі схаваны ад вачэй непрыяцеля, і іх нельга было разбурыць з дапамогай артылерыі. Магутнасць мураванага эскарпа ніжняга вала і контрэскарпа рова ацанілі і шведы, якія ўвайшлі ў замак у 1706 г.[313] Амбразуры ў брустверы ніжняга вала прызначаліся для стральбы з гармат. На самым пачатку Вялікай Паўночнай вайны месцы, у якіх мураваны бруствер абваліўся, заклалі драўлянымі брусамі, а ў іх зрабілі мушкетныя байніцы. Тады ж у каменданта замка Любарта Полемана ўзнікла ідэя павесіць на эскарп вала бярвенні для скідвання іх на праціўніка ў выпадку штурму[314].

Паміж знешнім схілам галоўнага вала і мураваным брустверам ішла валавая дарога ніжняга вала, якую выкарыстоўвалі для перамяшчэння жывой сілы, а таксама ўстаноўкі артылерыі. Выхад на гэтую дарогу ажыццяўляўся праз двое варот у мураванай браме. Праз іх на ніжні вал выцягваліся лёгкія гарматы. Выхад жаўнераў на ніжні вал быў магчымы таксама праз мураваныя галерэі ў фланках бастыёнаў.

---

[313] *Adlerfeld G.* The military history of Charles XII. King of Sweden. London, 1740. Vol. II. P. 230.
[314] AGAD. AR. Dz. V. Sygn. 12 044. S. 5–8; Sygn. 16 645. S. 22.





Мал. 28–29. Рэканструяваны заходні бастыён Нясвіжскага замка

На шпіцах усіх чатырох бастыёнаў Нясвіжскага замка меліся мураваныя вартавыя вежачкі, якія навісалі над эскарпамі, што дазваляла жаўнерам, якія стаялі на варце, аглядаць роў і ўсе падыходы да бастыёнаў і курцін. Шпіцы бастыёнаў з'яўляліся, такім чынам, месцам размяшчэння г. зв. шыльдваха, ці варты, якая ў ваенны час павінна была пільнаваць падыходы да замка і не дапусціць варожай дыверсіі ці нечаканага штурму.

Фланкі бастыёнаў на ўзроўні ніжняга вала прыкрываліся паўкруглымі арылонамі. У саміх фланках размяшчаліся батарэі альбо выхады да рова. Гарматы ў фланках ставіліся для абстрэлу ворага, які спрабаваў перайсці роў і падысці да эскарпа ніжняга вала. На заходнім бастыёне фланкавая батарэя размяшчалася ніжэй за ўзровень валавай дарогі і прыкрывала падыходы да замкавай брамы, якая была слабейшым месцам у ланцугу ўмацаванняў.

У 1706 г. брама часоў Сіроткі была ўзарвана шведамі. Разбурэнні былі настолькі значныя, што для ўзвядзення новай брамы давялося разбіраць падмуркі старой. Брама, якая захавалася да нашага часу і з'яўляецца помнікам першай чвэрці – сярэдзіны XVIII ст., толькі ўскосна можа сведчыць пра выгляд брамы канца XVI – пачатку XVII ст.[315] Праезд першай замкавай брамы меў даўжыню 28 м, што адпавядала шырыні галоўнага і ніжняга валоў замка. Са знешняга боку брама зачынялася акаванымі жалезам масіўнымі падвойнымі дубовымі варотамі. Перад імі меўся акаваны жалезам узвод, які падымаўся з дапамогай калаўротаў унутры брамы. У глыбіні брамы меліся яшчэ адны вароты для выхаду на замкавы дзядзінец. У іх мелася фортка для праходу пешых. Перад брамай праз роў быў перакінуты драўляны мост з парэнчамі. Са знешняга боку ён меў драўляныя вароты.

Галоўны роў Нясвіжскага замка напаўняўся вадой з суседняга ставa. Вядома, што на працягу другой паловы XVII – пачатку XVIII ст. роў Нясвіжскага замка заставаўся сухім. Адной з прычын асушэння рова магло быць імкненне захаваць мураваны эскарп і контрэскарп, якія ўтваралі сценкі рова і пры ўзаемадзеянні з вадою хутчэй разбураліся. Пасля гэтага ўнізе рова ў сярэдзіне XVII ст. была выкапана так званая *фасета*, ці невялікі равок, які запаўняўся вадою. У 1702 г., калі замак інтэнсіўна рыхтавалі да абароны ад шведаў, у рове перад эскарпам быў пастаўлены палісад[316].

За ровам ішла прыкрытая дарога з гласісам, якая дазваляла весці актыўную абарону з дапамогай вылазак жаўнераў з фартэцыі. Упершыню гласіс быў апісаны ў 1554 г., а рэалізаваны ў Італіі ў 1567 г., што ўсяго на 20 гадоў раней за пачатак будаўніцтва Нясвіжскага замка. Выхад з прыкрытай дарогі на перадполле, ці эспланаду, ажыццяўляўся з паўночна-заходняга і паўночна-ўсходняга бакоў па дарогах, якія прастрэльваліся з прыкрытага ходу, а з напольнага боку былі закрыты брустверам. На гэтай дарозе меліся спецыяльныя плацдармы для канцэнтрацыі жаўнераў перад вылазкамі. Звонку за гласісам меўся дадатковы вадзяны роў, праз які ў месцах падыходу дарог былі

[315] *Волкаў М.* Нясвіжскі замак у Вялікай Паўночнай вайне. С. 229–237.

[316] AGAD. AR. Dz. V. Sygn. 12044. S. 5–8; Sygn. 16 645. S. 22.

перакінуты драўляныя масткі. Прыкрытая дарога з гласісам, такім чынам, з'яўляліся трэцяй лініяй абароны замка разам з галоўным і ніжнім валамі. На яе жаўнеры выходзілі альбо праз галоўны мост перад брамай, альбо праз таемныя выцечкі ў бастыёнах і валах замка.

Вызначэнне абарончай сістэма, паводле якой быў збудаваны Нясвіжскі замак, з'яўляецца няпростай справай. Паводле Ф. Маркоўскага, у Нясвіжскім замку была рэалізавана старaітальянская бастыённая сістэма, А. Грушэцкі бачыў тут французскі ўплыў, а М. А. Ткачоў адносіў яго да новаітальянскай бастыённай сістэмы[317]. Сама форма бастыёнаў, мураваныя эскарп вала і контрэскарп рова, а таксама гласіс з прыкрытай дарогай сведчаць пра рэалізацыю прынцыпаў новаітальянскай бастыённай сістэмы. Высокія земляныя насыпы на бастыёнах, што ў крыніцах называліся «рандэлямі», таксама знаходзяць месца ў рамках тэорыі і практыкі тагачаснай фартыфікацыі і адпавядаюць так званым *кавальерам*, якія прызначаліся для ўстаноўкі гармат. Такія кавальеры былі рэалізаваны, напрыклад, у бастыённым замку ў Ляхавічах. Аднак земляныя валы між гэтымі «рандэлямі» – гэта элемент, аналагаў якому знайсці цяжка. Фактычна ў дадзеным выпадку мы маем справу з двайной структурай вала, што было характэрна для старагаландскай сістэмы, якая распаўсюдзілася пазней. Таму ў выпадку Нясвіжскага замка, на нашу думку, варта казаць аб эксперыментальнай форме ўмацаванняў, калі навінкі італьянскай абарончай архітэктуры былі адаптаваны да патрэб канкрэтнага збудавання. Пры гэтым можна ўпэўнена казаць пра ўплыў мясцовай традыцыі, бо «рандэлі» Нясвіжскага замка па сваіх параметрах адпавядаюць бастэям Мірскага замка.

Бастыённы замак у Нясвіжы быў збудаваны паводле правілаў новаітальянскай фартыфікацыйнай сістэмы і з'яўляўся першакласным фартыфікацыйным умацаваннем. Таму ён захоўваў абарончы патэнцыял да пачатку XVIII ст. Разам з тым адной з важнейшых прычын узвядзення Нясвіжскага замка было імкненне ўласніка стварыць рэзідэнцыю, якая б сведчыла аб яго высокіх пазіцыях на палітычнай арэне дзяржавы. Справа ў тым, што ў Італіі, адкуль паходзіць бастыённая фартыфікацыя, ці ў Нямеччыне будаўніцтва бастыённых замкаў не заўжды было выклікана ваеннымі патрэбамі, а часта дыктавалася меркаваннямі прэстыжу для іх уладароў[318]. Гэтаксама няма падстаў сцвярджаць, што будаўніцтва новага замка ў Нясвіжы было абгрунтавана выключна ваеннымі патрэбамі. Справа ў тым, што казакі, якія на зломе XVI–XVII стст. уяўлялі адзіную рэальную пагрозу для гэтага рэгіёна, не мелі добрай артылерыі і вопыту вядзення аблог. Такім чынам, бастыённыя замкі былі важным элементам архітэктурнай рэпрэзентацыі палітычнай эліты грамадства, сімвалам самасцвярджэння і дамінавання магнатэрыі, а Нясвіжскі замак Сіроткі стаў адной з першых рэзідэнцый такога кшталту на тэрыторыі ВКЛ.

---

[317] *Markowski F.* Zamek Mikołaja Krzysztofa Radziwiłła Sierotki w Nieświeżu. S. 159; *Gruszecki A.* Fortyfikacja zamku w Nieświeżu. S. 144; *Ткачоў М. А.* Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII–XVIII стст. С. 82.

[318] *Burger D.* Die Festungen der Hohenzollern in Brandenburg und Franken. S. 43–44.

3.5. Бастыённыя ўмацаванні старагаландскай сістэмы

У 1620–1630-я гг. у Вялікае Княства Літоўскае пранікла моцная хваля ўплыву галандскага ваеннага мастацтва. Значным стымулам для гэтага сталі зацяжныя войны са шведамі ў Інфлянтах, праціўнікам, які хутка авалодаў дасягненнямі галандцаў, творча адаптаваў і актыўна іх выкарыстоўваў[319]. Падобным стымулам для нямецкіх земляў стала Трыццацігадовая вайна (1618–1648 гг.), адным з галоўных удзельнікаў якой былі тыя ж шведы. Апроч таго, многія магнаты ВКЛ, у тым ліку Радзівілы, у час замежных вандровак мэтанакіравана ездзілі для адукацыі ў Нідэрланды. Галандскі ўплыў увасобіўся ў значных зменах у арганізацыі арміі, тактыцы вядзення бою, а таксама артылерыі і фартыфікацыі. Менавіта як частку шырокага працэсу мадэрнізацыі вайсковай справы ў ВКЛ у другой чвэрці XVII ст. трэба разглядаць прыход на нашыя землі так званай *старагаландскай фартыфікацыйнай манеры*.

Выпрацоўка прынцыпаў старагаландскай фартыфікацыйнай школы пачалася ў Нідэрландах у другой палове XVI ст., а ў 1620–1630-я гг. яна пашырылася ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе. Асаблівую ролю ў гэтым адыграла кніга немца з Торуня А. Фрэйтага «Architectura militaris nova et aucta», што пабачыла свет у 1631 г. у Лейдэне, а пасля шмат разоў перавыдавалася[320]. Сістэматызаваныя А. Фрэйтагам правілы ўзвядзення ўмацаванняў аказвалі моцны ўплыў на фартыфікацыйную практыку цягам усяго XVII ст. Польскія даследчыкі падкрэсліваюць выключную ролю ў пашырэнні старагаландскай манеры ў Рэчы Паспалітай караля Уладзіслава IV, якому, урэшце, і была прысвечана кніга А. Фрэйтага. Ён жа ініцыяваў рэфармаванне польскай артылерыі[321]. Аднак Вялікае Княства Літоўскае караля цікавілі менш, а сапраўднымі праваднікамі ўплыву галандскага ваеннага мастацтва на нашых землях сталі Радзівілы біржанскай лініі, якія фактычна лічылі занятак ваеннай справай сваёй дынастычнай традыцыяй. Асабліва шмат для распаўсюджання новых уплываў, у тым ліку старагаландскай фартыфікацыйнай манеры, зрабілі Крыштаф II Радзівіл, яго сын Януш і пляменнік Багуслаў. Той жа А. Фрэйтаг быў завербаваны Янушам Радзівілам і, вярнуўшыся ў Рэч Паспалітую, доўгі час працаваў на Радзівілаў біржанскай лініі. Вядома, што ён прымаў удзел у праектаванні новых земляных бастыённых фартыфікацый вакол Біржанскага замка[322].

Дзякуючы дзейнасці біржанскіх Радзівілаў, а найперш Януша і Багуслава, на беларускіх землях ВКЛ паўстаў шэраг умацаванняў старагаландскага кшталту. Найбольш значным дасягненнем стала мадэрнізацыя фартыфікацый Слуцка. Акрамя таго, быў перабудаваны замак у Копысі, а таксама пачалося

---

[319] *Dybaś B.* Znaczenie wojen polsko-szwedzkich dla rozwoju fortyfikacji stałych w Rzeczypospolitej w XVII wieku (na przykładzie wielkich miast Prus Królewskich). S. 205, 207.

[320] *Freitag A.* Architectura militaris nova et aucta oder Newe vermehrte Fortification von regular Vestugen, von irregular Vestugen und Aussen Wercken, von Praxi Offensiva und Defensiva. Leyden, 1631. 160 s.

[321] *Bogdanowski J.* Fortyfikacje łańcuckie na tle małopolskiej sztuki obronnej. S. 76.

[322] *Wasilewski T.* Budowa zamku i rezydencji Radziwiłłów w Birżach w latach 1586–1654. S. 266.

ўзвядзенне земляных бастыённых фартыфікацый у Свіслачы. Пад уплывам старагаландскай фартыфікацыі быў мадэрнізаваны замак і гарадскія ўмацаванні Нясвіжа. А ў апошняй чвэрці XVII ст. у рукі Радзівілаў перайшоў магутны бастыённы замак у Глуску, узведзены паводле правілаў старагаландскай фартыфікацыйнай школы.

Моцны ўплыў на станаўленне фартыфікацыйнага будаўніцтва ў Нідэрландах аказаў эканамічны фактар: галандцы не мелі грошай на абмуроўку знешніх плоскасцяў курцін і бастыёнаў, як гэта рабілася ў стара- і новаітальянскай школах (мал. 30). Да таго ж узводзіць умацаванні часта даводзілася ў вельмі кароткі тэрмін, што было магчыма толькі з выкарыстаннем зямлі. Ва ўмовах працяглых войнаў гэты метад станавіўся надзвычай эфектыўным. З мэтай павелічэння абароназдольнасці фартэцый галандцы паглыблялі лінію абароны. Перад валамі насыпалі ніжні вал, ці фосэбрэю, на якой рабіліся пазіцыі для стралкоў з агняпальнай зброяй (мушкецёраў). Лічылася, што агонь з мушкетаў нашмат больш эфектыўна паражаў жывую сілу, чым агонь з гармат. Вынайдзеныя ў новаітальянскай школе равеліны былі яшчэ больш павялічаны. Старагаландскія бастыёны былі полымі (гэта значыць не мелі ўнутранай засыпкі) і больш шырокімі за папярэднія. Модулем фартыфікацыі ў старагаландскай сістэме была адлегласць стрэлу мушкета, якая паводле А. Фрэйтага



Мал. 30. Бастыённыя ўмацаванні. Паводле А. Фрэйтага

складала 60 прутоў (220 м). Свой уплыў на яе аказала спрактыкаванасць галандцаў у справе рэгулявання абваднення тэрыторыі і стварэння шматлікіх водных перашкод для ворага, ажно да затаплення вялікіх тэрыторый. Выкарыстанне таннага матэрыялу для фартыфікацыйнага будаўніцтва дазваляла абносіць умацаваннямі вялікія плошчы і ствараць абшырныя фартыфікацыйныя комплексы[323].

Рэарганізацыя і пераход да пастаяннага войска прывялі да значных зменаў у практыцы аблогі абарончых умацаванняў. Паспяхова абараняцца ў новых умовах маглі толькі вялікія фартэцыі, забяспечаныя моцнымі гарнізонамі. Для ўтрымання значнай колькасці жаўнераў, у сваю чаргу, было патрэбна моцнае эканамічнае заплечча, якое даваў вялікі горад. Таму асноўным тыпам эфектыўнага ўмацавання ў XVII ст. стаў горад-фартэцыя. На гэтым фоне малыя па плошчы ўмацаванні захавалі сваё значэнне толькі на лакальным узроўні[324]. У сярэдзіне XVII ст. гэтая тэндэнцыя праявілася ў ВКЛ. Стала відавочным, што невялікія па плошчы бастыённыя замкі, якія былі найбольш распаўсюджаным тыпам навейшых умацаванняў на нашых земляў, не могуць эфектыўна супрацьстаяць добра падрыхтаванаму і ўзброенаму войску. Па меркаванні сучаснікаў, Нясвіжскі замак у час вайны 1654–1667 гг. наўрад ці змог бы вытрымаць доўгую рэгулярную аблогу[325]. Разам з тым сапраўдным дзівам стала шматмесячная ўпартая абарона Ляхавіцкага замка ў 1660 г. Найбольш эфектыўнымі ўмацаваннямі ў час згаданай вайны на нашых землях былі такія магутныя гарады-фартэцыі, як сапегаўскі Быхаў ці радзівілаўскі Слуцк. Яны давалі месца для ўтрымання і забеспячэння вялікай залогі і з'яўляліся асновай для маштабных ваенных аперацый[326].

Яшчэ адным ударам па бастыённых замках стала «дэмакратычнасць» старагаландскай манеры. Справа ў тым, што земляныя валы былі малапрыдатныя для дэманстрацыі статусу іх уладальніка. Самі ўмовы ўзнікнення гэтай фартыфікацыйнай сістэмы ў ахопленых паўстаннем Нідэрландах прадвызначылі нізкую ўвагу яе стваральнікаў да патрэбаў рэпрэзентацыі. Пры будаўніцтве ўмацаванняў на першае месца выразна выступалі ваенныя патрэбы, а магчымасці ўвядзення сродкаў для візуальнай рэпрэзентацыі рэзка звужаліся. Гэта, між іншым, істотна стрымлівала распаўсюджанне самой сістэмы за межамі Нідэрландаў, дзе неабходнасць узвядзення шыкоўных рэзідэнцый захоўвала сваю актуальнасць. Пераломным момантам у распаўсюджанні сістэмы стала Трыццацігадовая вайна, у час якой была даказана эфектыўнасць фартыфікацый старагаландскай манеры. Пры гэтым асноўная знакавая нагрузка была сканцэнтравана ў планіроўцы і ўнутранай структуры ўмацаванняў. Ідэаліза-

[323] *Dybaś B.* Fortece Rzeczypospolitej: studium z dziejów budowy fortyfikacji stałych w państwie polsko-litewskim w XVII wieku. S. 21.

[324] *Burger D.* Die Festungen der Hohenzollern in Brandenburg und Franken. S. 47.

[325] AGAD. AR. Dz. V. Sygn. 5569/I. S. 99–100.

[326] *Dybaś B.* Fortece Rzeczypospolitej: studium z dziejów budowy fortyfikacji stałych w państwie polsko-litewskim w XVII wieku. S. 79, 83.

цыя планаў фартэцый, з аднаго боку, абгрунтоўвалася патрэбамі дасягнення максімальнай эфектыўнасці абароны, з іншага, было выразным сведчаннем развіцця абсалютысцкіх тэндэнцый у краінах Еўропы.

На землях ВКЛ бастыённыя замкі, фартыфікацыі якіх былі мадэрнізаваны па правілах старагаландскай школы, захавалі сваё значэнне як абарончыя аб'екты да пачатку XVIII ст. На гэта паўплывалі ўмовы мясцовага ваеннага тэатра, а дакладней нязначная колькасць вялікіх гарадоў[327]. Разам з тым памеры бастыённых замкаў імкнуліся павялічыць.

Працяглыя войны сярэдзіны XVII ст. ва Усходняй Еўропе сталі, падобна вайне за незалежнасць у Нідэрландах і Трыццацігадовай вайне ў Нямеччыне, моцным імпульсам для шырокага фартыфікацыйнага будаўніцтва на беларускіх землях. Да найбольш значных фартэцый, збудаваных у гэты час, належаў горад Слуцк. Значны комплекс пісьмовых і іканаграфічных крыніц дае магчымасць уявіць, як будаваліся і як выглядалі слуцкія ўмацаванні.

Да сярэдзіны XVII ст. Старое места ў Слуцку ўжо было абведзена земляным валам з бастыёнамі і трыма мураванымі брамамі, аб чым сведчыць накід плана Слуцка таго часу (мал. 31)[328]. Выбух казацкага паўстання на Украіне ў 1648 г., а таксама пачатак вайны з Маскоўскай дзяржавай у 1654 г. зрабілі надзвычай актуальнай патрэбу далейшай разбудовы слуцкіх фартыфікацый. У 1654–1655 гг. горад сканцэнтраваў усе сілы на мадэрнізацыі валоў вакол Старога места і ўзвядзенні грэблі на Случы. На левым беразе ракі на сродкі



Мал. 31. Слуцк. Я. Радзівіл. 1651–1652 гг. НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 287

[327] *Dybaś B.* Fortece Rzeczypospolitej: studium z dziejów budowy fortyfikacji stałych w państwie polsko-litewskim w XVII wieku. S. 78.

[328] НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 287. Арк. 40.

Багуслава Радзівіла з вясны 1655 г. вялося будаўніцтва бастыённай цытадэлі для ўмацавання абароны Новага места, якое не мела моцных фартыфікацый. Пасля двух спробаў маскоўскага войска авалодаць Слуцкам у верасні 1655 г. было вырашана тэрмінова распачаць узвядзенне фартыфікацый і вакол Новага места. У чарговы раз пагроза нападу маскоўскіх войскаў і казакаў на Слуцк стала актуальнай у 1659–1660 гг. У гэты час было скончана ўзвядзенне ўмацаванняў вакол Новага места, і Слуцк, такім чынам, быў цалкам замкнёны ў коле бастыённых умацаванняў. На працягу наступнага дзесяцігоддзя працы па ўдасканаленні фартыфікацый працягваліся, але з-за зніжэння ўзроўню небяспекі і змяншэння рэсурсаў горада яны ішлі больш павольнымі тэмпамі.

Галоўным ініцыятарам фартыфікацыйнага будаўніцтва ў Слуцку быў яго ўладальнік Багуслаў Радзівіл, для якога было надзвычай важна захаваць горад ад захопу і разбурэння (мал. 32)[329]. Паводле слоў самога князя, Слуцк быў для яго важны «як вока ў ілбе»[330]. Таму Б. Радзівіл у лістах да сваіх мясцовых ураднікаў і гарадскіх уладаў пастаянна пакрэсліваў неабходнасць далейшага ўдасканалення гарадскіх фартыфікацый[331]. Паколькі сам магнат валодаў вайсковым досведам і ведамі ў галіне фартыфікацыйнага мастацтва[332], вырашэнне найбольш істотных пытанняў адносна будаўніцтва ўмацаванняў у Слуцку знаходзілася ў яго кампетэнцыі. У маі-ліпені 1655 г. пасля няўдалай зімовай кампаніі войска ВКЛ князь сам знаходзіўся ў Слуцку, «*дзе спыніўся для рэстаўрацыі гарадскіх валоў, якія былі <…> паводле новай манеры тых вякоў напраўлены і пекнымі баштамі прыаздоблены*»[333]. У гэты час прыдворны архітэктар магната Тэафіл Спіноўскі прадставіў яму праект мадэрнізацыі слуцкіх фартыфікацый. Пры гэтым наконт свайго праекта перабудовы цытадэлі Т. Спіноўскі наўпрост пісаў, што ў ім «*усё па-нідэрландску зроблена*»[334]. Пазней Б. Радзівіл, які знаходзіўся пераважна ў Караляўцы, ажыццяўляў кантроль за будаўніцтвам умацаванняў у Слуцку дыстанцыйна, толькі час ад часу наведваючы горад. Аб'ектыўна ацэньваць сітуацыю з будаўніцтвам фартыфікацый князю дапамагаў той факт, што акрамя вайсковага інжынера, які меўся пры слуцкім гарнізоне, многія яго вайсковыя і цывільныя службоўцы мелі добрыя веды ў галіне фартыфікацыі. Гэта стварала пэўную канкурэнцыю між імі і ў сваю чаргу давала магчымасць магнату трымаць сітуацыю пад кантролем.

---

[329] Падрабязней гл.: *Волкаў М. А.* Арганізацыя і забеспячэнне будаўніцтва фартыфікацый у Слуцку пры Багуславе Радзівіле (1654–1669 гг.) // Studia Historica Europae Orientalis = Исследования по истории Восточной Европы. Мінск, 2012. Вып 5. С. 188–204.

[330] *Kossarzecki K.* Słuck wobec zagrożenia moskwieskiego i kozackiego podczas wojny z Moskwą w latach 1654–1667. S. 101.

[331] AGAD. AR. Dz. IV. K. 47. S. 73; K. 48. S. 3; Dz. VII. Sygn. 678. S. 16.

[332] *Карлюк К.* Пад штандарам дома Аранскіх. Першае «кавалерыйскае падарожжа» Багуслава Радзівіла (1637–1640 гг.) і яго ўдзел у галандскай аблозе Хюлста 1640 г. С. 403–439.

[333] *Popliński A.* Żywot Jaśnie Oświeconego Księcia Bogusława Radziwiłła, Świętego Pánstwa Rzymskiego książęcia... : z rękopismów Hr. T. Działyńskiego. S. 119.

[334] AGAD. AR. Dz. V. Sygn. 14 914. S. 2.



Мал. 32. Слуцк. Я. Фюрстэнхоф.
Першая палова XVIII ст. SBB. Kart. XS49911/12

Значную ролю ў падрыхтоўцы Слуцка да абароны адыгрываў оберстэр-лейтэнант палка нямецкай пяхоты Б. Радзівіла Уільям Патэрсан, які ў 1654–1655 гг. выконваў абавязкі каменданта і губернатара Слуцка[335]. Менавіта ён восенню 1655 г., у найбольш крытычны для горада момант, прымаў тэрміновыя рашэнні адносна будаўніцтва ўмацаванняў. У гэты час па загадзе У. Патэрсана вакол фартэцыі былі насыпаны некалькі часовых земляных умацаванняў. У пачатку верасня 1655 г., пасля першай маскоўскай аблогі, ён настаяў, каб тэрмінова распачаліся працы па ўзвядзенні ўмацаванняў вакол Новага места[336]. Падобную ролю, што і У. Патэрсан, пачынаючы з восені 1658 г. выконваў Казімір Клакоцкі, які меў добрыя веды ў галіне фартыфікацыі. Напрыклад, улетку 1663 г. Б. Радзівіл даручыў яму падрыхтаваць да абароны фальваркі Слуцкага княства, а ў пачатку 1664 г. яго запрашаў у Нясвіж Міхал Казімір Радзівіл для кансультацый наконт мадэрнізацыі фартыфікацый замка і горада[337]. Але галоўнай функцыяй К. Клакоцкага была арганізацыя будаўнічых прац[338].

Праект мадэрнізацыі слуцкіх фартыфікацый быў выкананы Т. Спіноўскім да лета 1655 г. Напэўна, па гэтым праекце ўвосень 1655 г. пачалося насыпанне валоў вакол Новага места. Той жа Т. Спіноўскі падрыхтаваў для Б. Радзівіла праект перабудовы слуцкай цытадэлі, які пачалі рэалізоўваць з канца 1650-х гг.[339]. Удзел Т. Спіноўскага ў будаўніцтве слуцкіх фартыфікацый быў, аднак, даволі абмежаваны. Фактычна ён на аснове вывучэння тапаграфічных асаблівасцей горада і ваколіц падрыхтаваў план Слуцка і на падставе яго склаў праект мадэрнізацыі слуцкіх фартыфікацый. У працэс праектавання і будаўніцтва фартыфікацый у Слуцку быў уключаны таксама Крыштаф Вінклер, які адначасова выконваў абавязкі, звязаныя з кіраваннем горадам, у тым ліку пэўны час быў войтам Слуцка[340].

У часы Багуслава Радзівіла пры слуцкім гарнізоне з'явілася асобная пасада вайсковага інжынера, які павінен быў непасрэдна адказваць за праектаванне, разметку і ўзвядзенне фартыфікацый. З 1665 г. да першай паловы 1670-х гг. гэтую пасаду займаў Густаў Адольф дэ ля Вале дэ Гоб[341]. Апроч таго, у 1666–1667 гг. дэ ля Вале падрыхтаваў праект перабудовы старога драўлянага замка ў Копысі ў бастыённую цытадэль і сачыў за яго рэалізацыяй[342]. Дзесьці ў дру-

---

[335] *Kossarzecki K.* Słuck wobec zagrożenia moskwieskiego i kozackiego podczas wojny z Moskwą w latach 1654–1667. S. 95.

[336] BCzart. Rkps. 389. S. 62.

[337] AGAD. AR. Dz. IV. K. 50. S. 210; Dz. V. Sygn. 6865/III. S. 47.

[338] AGAD. AR. Dz. V. Sygn. 5569/I. S. 210; *Kossarzecki K.* Słuck wobec zagrożenia moskwieskiego i kozackiego podczas wojny z Moskwą w latach 1654–1667. S. 98.

[339] AGAD. AR. Dz. V. Sygn. 14 914. S. 1–3.

[340] BCzart. Rkps. 389. S. 114, 120.

[341] *Dybaś B.* Fortece Rzeczypospolitej: studium z dziejów budowy fortyfikacji stałych w państwie polsko-litewskim w XVII wieku. S. 264; *Пярвышын У.* Фартыфікацыі Нясвіжскага замка ў канцы XVI–XVIII стст. С. 121.

[342] AGAD. AR. Dz. V. Sygn. 16 828. S. 1–2.

гой палове 1670-х гг. дэ ля Вале, як мяркуе беларускі даследчык У. Пярвышын, перабраўся служыць у Нясвіж[343]. З лістоў за 1669 г. вядома, што ў інжынерных справах яму дапамагаў харужы Фёлькерзамб[344]. У 1669 г. у Слуцк па загадзе Б. Радзівіла прыехаў інжынер Пальмструх з мэтай выканання карты Капыльскага княства і плана Слуцка[345].

Верагодна, яшчэ ў першай палове XVII ст. у Слуцку ўсталявалася практыка вербаваць штогод на грошы з гарадскога бюджэту работнікаў-капачоў для працы на вале. Эфектыўнасць працы найманых рабочых была высокай. Паводле меркавання магістрата, сотня найманых капачоў за дзень магла зрабіць болей, чым дзве сотні мяшчан[346]. Што да аб'ёмаў працы, якія мог выконваць капач за дзень, дык, паводле К. Клакоцкага, добрым вынікам было 100 тачак зямлі[347]. Між сабою найманыя работнікі выбіралі дзясятнікаў, якія падпарадкоўваліся непасрэдна валмайстру[348]. Колькасць найманых капачоў, якую мог выставіць горад, залежала ад яго фінансавых магчымасцяў. Максімальнай нагрузкай для Слуцка было ўтрыманне і забеспячэнне 50 капачоў, аднак у найбольш цяжкія часы за кошт пазык і ўвядзення дадатковых збораў іх колькасць павялічвалася да 100 чалавек.

За ўзвядзенне ўмацаванняў і арганізацыю працы капачоў на ўмацаваннях адказвалі валмайстры, якія былі высокакваліфікаванымі спецыялістамі і валодалі тэхналогіяй насыпання вала. З крыніц вядомыя імёны двух валмайстраў, якія працавалі ў Слуцку пры Б. Радзівіле. Адзін з іх – «стары рускі валмайстр» Іван Прэсны – у пратаколе сэсіі слуцкага магістрата за 7 мая 1658 г. называўся «здаўна заслужаным слугой у горадзе»[349]. Гэта значыць, што ён ужо на працягу многіх гадоў працаваў на слуцкіх умацаваннях. Валмайстар нямецкага паходжання Ганс Бэк быў, верагодна, прысланы Б. Радзівілам у Слуцк у дапамогу І. Прэснаму, калі працы на слуцкіх фартыфікацыях дасягнулі вялікага размаху. Пры гэтым І. Прэсны працаваў выключна на гарадскіх фартыфікацыях, у той час як галоўнай задачай Г. Бэка, які быў уключаны ў склад слуцкага гарнізона і атрымліваў заробак ад князя, было ўзвядзенне цытадэлі[350].

У лісце да Б. Радзівіла Т. Спіноўскі пісаў: «*...тую ж мадэль можна выдатна прыстасаваць для слуцкай Новай фартэцыі* [цытадэлі. – *М. В.*], *і ці ні хутчэй у нас* [у Слуцку. – *М. В.*] *стане, чым у Нясвіжы, бо там няма ані работнікаў такога мноства і такіх здольных, ані валмайстра, ані цесля такога здольнага, каб такую пекную работу, якая ў мадэлі паказана, змог выканаць*»[351].

---

[343] *Пярвышын У.* Фартыфікацыі Нясвіжскага замка ў канцы XVI–XVIII ст. С. 121.

[344] AGAD. AR. Dz. V. Sygn. 16 828. S. 13; Sygn. 17 469/III. S. 54.

[345] Ibidem. Sygn. 17 469/III. S. 69.

[346] BCzart. Rkps. 389. S. 69.

[347] AGAD. AR. Dz. V. Sygn. 6865/III. S. 15.

[348] Ibidem. Dz. XXIII. T. 134. Pl. 2. S. 332; BCzart. Rkps. 389. S. 28, 68–69, 103.

[349] BCzart. Rkps. 389. S. 175.

[350] Ibidem. S. 112, 175.

[351] AGAD. AR. Dz. V. Sygn. 14 914. S. 1.



Мал. 33. Профіль умацаванняў Слуцка.
Другая палова XVII ст. AGAD. AR. Dz. XXIII. T. 133. Pl. 1

Такім чынам, у Слуцку было больш рамеснікаў, якіх можна было прыцягнуць да будаўніцтва ўмацаванняў, чым у Нясвіжы, што ўказвае на прамую залежнасць інтэнсіўнасці фартыфікацыйнага будаўніцтва ад дэмаграфічнага і эканамічнага патэнцыялу паселішча.

Комплекс бастыённых умацаванняў старагаландскага тыпу ў Слуцку ўключаў два асноўныя элементы: уласна вал з бастыёнамі вакол горада і чатырохбастыённую цытадэль у Новым месце (мал. 33–34). Наяўныя пісьмовыя і іканаграфічныя крыніцы дазваляюць даволі дакладна апісаць выгляд умацаванняў цытадэлі, якая не захавалася да сённяшняга часу[352]. Падобны выгляд мелі і гарадскія ўмацаванні. Асноўны абарончы перыметр цытадэлі ўтваралі чатыры звязаныя паміж сабою курцінамі востравугольныя бастыёны. Перад курцінамі і фланкамі бастыёнаў быў насыпаны ніжні вал. Браму цытадэлі, якая знаходзілася ў сярэдзіне заходняй курціны, абараняў невялікі трохвугольны равелін. З усходняга напольнага боку цытадэль прыкрываў горнверк. Цытадэль, равелін і горнверк акружалі вадзяныя рвы. Памер вонкавага палігона цытадэлі (адлегласць паміж шпіцамі бастыёнаў) складаў 51,5 прута (194 м). Як патрабавала тэорыя старагаландскай фартыфікацыі, бастыёны мелі вугал 60°. Даўжыня іх фасаў складала 14,92 прута (56,2 м), фланкаў – 4,85 прута (18,3 м). Бастыёны злучаліся курцінамі працягласцю 222 пруты (83,6 м)[353]. За рвамі цытадэлі, равеліна і горнверка мелася тыповая для старагаландскай фартыфікацыі прыкрытая дарога, а за ёй – гласіс. Вакол цытадэлі была створана так званая *эспланада*, ці тэрыторыя, ачышчаная ад забудовы, якая магла б перашкаджаць абароне. Вакол гарадскіх фартыфікацый шырыня эспланады павінна была дасягаць, паводле інструкцый Б. Радзівіла, двух стрэлаў

[352] Падрабязней гл.: *Волкаў М.* Слуцкая цытадэль XVII–XVIII ст. С. 31–66.
[353] AGAD. AR. Dz. XXIII. T. 133. Pl. 1. S. 295.



Мал. 34. Слуцкая цытадэль. Я. Фойгт. 1704 г. БАН. ООРК. № 791

з мушкета ці гарматы (каля 450 м)[354]. Паводле планаў першай паловы XVIII ст., найбліжэйшая забудова ад цытадэлі размяшчалася ў 180 м.

Такім чынам, у сярэдзіне XVII ст. абарончыя ўмацаванні Слуцка былі мадэрнізаваны паводле правілаў старагаландскай фартыфікацыйнай школы, у выніку чаго горад пераўтварыўся ў адну з самых магутных фартэцый на землях ВКЛ. Гэта стала магчымым дзякуючы значнаму дэмаграфічнаму і эканамічнаму патэнцыялу паселішча, а таксама мэтанакіранай палітыцы ўласніка. Свой абарончы патэнцыял слуцкая фартэцыя захоўвала да пачатку XVIII ст., пакуль у час Паўночнай вайны не быў цалкам знішчаны яе арсенал. Пры гэтым фартыфікацыі не былі закрануты. Але, пазбаўленая сродкаў для абароны, фартэцыя страціла сваю баяздольнасць.

Фартыфікацыі старагаландскага кшталту ў другой палове 1660-х гг. па загадзе Б. Радзівіла пачалі ўзводзіць у Копысі. Паколькі дэмаграфічны патэнцыял Копысі і капыскіх уладанняў Радзівілаў быў даволі вялікі, праект перабудовы Капыскага замка ў бастыённую цытадэль быў у значнай ступені рэалізаваны. Акрамя таго, біржанскія Радзівілы ініцыявалі ўзвядзенне земляных бастыённых умацаванняў яшчэ ў шэрагу сваіх паселішчаў. Вядома, што Януш Радзівіл пачаў насыпаць земляныя ўмацаванні вакол Свіслачы. Верагодна, з мэтай праектавання гэтых умацаванняў магнат і зрабіў некаль-

[354] AGAD. AR. Dz. IV. K. 50. S. 46, 58–64.

кі накідаў плана гэтага паселішча[355]. Рэшткі гэтых умацаванняў былі бачны яшчэ ў пачатку XVIII ст.[356]

Умацаванні Нясвіжа ў сярэдзіне XVII ст. ужо не маглі вытрымаць рэгулярнай аблогі. Таму горад быў спалены яшчэ ў час першага паходу маскоўскіх і казацкіх войскаў у 1655 г. У сваю чаргу моцны бастыённы замак быў занадта малы для размяшчэння вялікай залогі і забеспячэння яе ўсім неабходным, а таксама быў дрэнна ўкамплектаваны прафесійнымі жаўнерамі і кваліфікаванымі афіцэрамі[357]. Тое, што Нясвіж не быў узяты ў 1660 г., стала вынікам паспяховай абароны суседняга Ляхавіцкага бастыённага замка.

З пачаткам вайны 1654–1667 гг. былі зроблены спробы ўзмацніць абарончую сістэму Нясвіжскага замка. Перад брамай быў насыпаны равелін, а з паўночнага боку замка – палявыя шанцы. Пасля адыходу маскоўскіх войскаў у пачатку 1660 г. увага была скіравана на ўмацаванне абарончага патэнцыялу горада. Яго паўднёвы вугал, які быў самым слабым месцам у ланцугу гарадскіх умацаванняў, цалкам перарабілі. Плошча ўмацавання была пашырана, насыпаны два новыя бастыёны і паўбастыён у старагаландскай манеры. Вядома, што якраз па прычыне інтэнсіўных прац па ўзвядзенні фартыфікацый нясвіжскія мяшчане ў 1670 г. былі вызвалены ад выплаты падаткаў і мыт на тэрыторыі ўсёй Рэчы Паспалітай на дваццаць год. У 1676 г. гэты прывілей быў паўторна зацверджаны[358]. Апроч таго, захаваўся рэестр выдаткаў на будаўніцтва ўмацаванняў у Нясвіжы за 1686–1687 гг.[359]

Працы па мадэрнізацыі ўмацаванняў Нясвіжа, якія вяліся ў апошняй трэці XVII ст., трэба расцэньваць як спробу стварэння на базе горада моцнай фартэцыі на ўзор суседняга Слуцка. Аднак ужо напярэдадні Вялікай Паўночнай вайны было зразумела, што Нясвіж не зможа вытрымаць аблогі шведскай арміі[360]. Эканамічныя магчымасці ўладальніка, горада і ўсёй ардынацыі не дазвалялі далей удасканальваць умацаванні і забяспечыць увесь комплекс пастаянным гарнізонам, які быў бы здольны супрацьстаяць узрастаючым арміям новага тыпу. У выніку шведскі корпус у 1706 г. заняў горад, а пасля прымусіў да капітуляцыі і замак, фартыфікацыі якога былі знішчаны.

Глускі замак быў рэканструяваны і ператвораны ў вялікую пяцібастыённую фартэцыю намаганнямі Аляксандра Гілярыя Палубінскага ў 1670-я гг.[361]. У 1679 г. ён перайшоў да Радзівілаў. Пяцігранная форма была больш прыдатным варыянтам для фартэцыі ў другой палове XVII ст., паколькі давала магчымасць павялічыць плошчу ўмацавання[362]. Агромністы практычны вопыт,

---

[355] НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 287. Арк. 19 адв., 20, 21, 23.

[356] *Niezabitowski S.* Dzienniki 1695–1700 / oprac. A. Sajkowski. Poznań, 1998. S. 88.

[357] AGAD. AR. Dz. V. Sygn. 6865/I. S. 99–100.

[358] Volumina legum. Petersburg, 1860. T. 5. S. 54, 213.

[359] AGAD. AR. Dz. XV. T. 19. Pl. 1.

[360] Ibidem. Dz. V. Sygn. 10 430. S. 3.

[361] Падрабязней гл.: *Ганецкая І., Волкаў М.* Глуская фартэцыя. С. 209–226.

[362] *Gruszecki A.* Bastionowe zamki w Małopolsce. S. 264.

які прынеслі войны сярэдзіны XVII ст., прымусіў адмовіцца ад імкнення да абсалютнай сіметрыі і больш уважліва лічыцца з асаблівасцямі мясцовага рэльефу. Пяціграннік новазбудаванай глускай фартэцыі быў абведзены шырокім вадзяным ровам з усіх бакоў, не меў цалкам правільнай формы, што дыктавалася патрэбай упісаць абарончы комплекс у мясцовы ландшафт. Працягласць знешніх бакоў фартэцыі вагаецца ад 170 да 200 м. Глускі замак меў дзве мураваныя брамы: галоўную з боку мястэчка і Водную з боку ракі Пціч. Як і слуцкая фартэцыя, Глускі замак не зазнаў моцных разбурэнняў у час Вялікай Паўночнай вайны, аднак расійская армія цалкам вывезла ўвесь яго арсенал.

Глава 4

Узбраенне

† Артылерыя

† Ручная агняпальная зброя

† Боепрыпасы

Узбраенне, як і абарончая архітэктура, адносіцца да крытэрыяў, якія сведчаць пра падрыхтоўку фартэцый да абароны на доўгатэрміновую перспектыву. Часта практыкавалася, што разам з будаўніцтвам абарончых умацаванняў набывалася ці выраблялася ўзбраенне, якое напрамую адпавядала характару фартыфікацый. Магчымасці ўдасканалення фартыфікацый, як і папаўнення арсенала фартэцый новым узбраеннем непасрэдна ў ходзе баявых дзеянняў былі даволі абмежаваныя.

Асноўным узбраеннем, якое прызначалася для абароны ўмацаванняў, была зброя далёкага бою і найперш артылерыя. З пачатку XVI ст. кідальную зброю амаль цалкам выцесніла агняпальная. У гэты час зраспаўсюджваецца артылерыя новага кшталту, а таксама з'яўляецца ручная агняпальная зброя больш дасканалай канструкцыі, якая выцесніла лукі і арбалеты. Такім чынам, у разгляданы намі перыяд, г. зн. у XVI – пачатку XVIII ст., агняпальная зброя дамінавала цалкам. Інвентары арсеналаў рэзідэнцый Радзівілаў даюць магчымасць вызначыць узровень забяспечанасці іх узбраеннем і боепрыпасамі. Пры гэтым звесткі пра колькасць зброі дазваляюць параўнаць баяздольнасць розных фартэцый, а таксама вызначыць іх абарончы патэнцыял у розныя перыяды.

Апісанняў арсеналаў радзівілаўскіх рэзідэнцый у XVI ст. захавалася вельмі мала, а асноўны масіў крыніц такога кшталту паходзіць з XVII ст. Трэба адзначыць, што на старонкі інвентароў арсеналаў часта не траплялі лёгкія віды агняпальнай зброі (ручніцы, мушкеты і інш.), а таксама засцерагальнае ўзбраенне, ці даспехі, паколькі яны адносіліся да асабістага рыштунку жаўнераў. Гэтыя віды зброі мелі значэнне ў час прамога штурму і таму ўплывалі на ступень абароназдольнасці ўмацавання. Аднак ацаніць узровень забяспечанасці гарнізонаў такога кшталту ўзбраеннем цяжка, бо ён напрамую залежаў ад характару ваенных падраздзяленняў, якія прыцягваліся для абароны фартэцый.

4.1. Артылерыя

У разгляданы перыяд важнейшым відам узбраення, што дазваляла абараняць умацаванні, была артылерыя. Першыя згадкі пра выкарыстанне гармат у Еўропе адносяцца да першай паловы XIV ст. Даволі хутка новы від зброі

прыйшоў на землі ВКЛ. Артылерыю эпохі позняга Сярэднявечча, гэта значыць XIV–XV стст., можна падзяліць на дзве групы: камнекідальныя бамбарды і гарматы, якія стралялі металічнымі (свінцовымі ці жалезнымі) ядрамі. У старажытнарускіх летапісах першыя называліся «пушкамі», а другія — «пішчалямі»[363].

Бамбарды прынята падзяляць на лёгкія (калібрам 12–20 см), цяжкія (калібрам 25–45 см) і звышцяжкія (калібрам 50–80 см)[364]. Цяжкія і звышцяжкія бамбарды прызначаліся для разбурэння абарончых умацаванняў. Лёгкія бамбарды ў крыніцах называліся «гуфніцамі» і выкарыстоўваліся ў палявых бітвах і пры абароне ўмацаванняў. Прыкладна ў сярэдзіне XV ст. з гуфніц развіліся марціры, якія стралялі па навеснай траекторыі каменнымі ядрамі вялікага дыяметру. Апошнія набылі папулярнасць з XVI ст. Таксама з гуфніц развіліся гаўбіцы, распаўсюджаныя ў XVII–XVIII стст. Фізічная характарыстыка каменнага ядра абумоўлівала спецыфіку канструкцыі бамбардаў, а таксама вытворных ад іх гуфніц, гаўбіц і марцір. Парахавая камера гарматы была ў некалькі разоў вузейшая за канал, у які ўкладвалася ядро. Яе звужэнне дазваляла скіроўваць ціск газаў у сярэдзіну каменнага ядра, таму выбуховая сіла пораху выкарыстоўвалася з максімальнай эфектыўнасцю[365].

Сярод гармат, якія стралялі металічнымі ядрамі, найбольш распаўсюджанымі былі тарасніцы і фоглеры. Гэта былі гарматы калібрам ад 40 да 100 мм, якія мелі роўны па шырыні канал ствала, чым выразна адрозніваліся ад бамбардаў. Апошняе тлумачылася спецыфікай металічных ядраў, якія з-за большай шчыльнасці матэрыялу пры аднолькавым дыяметры з каменнымі ядрамі былі значна больш цяжкія. Тарасніцы былі тыповай зброяй для абароны ўмацаванняў. Яны ўсталёўваліся на сценах і вежах у спецыяльных драўляных ложах, якія маглі мець механізм змянення вугла стрэлу. Эфектыўная далёкасць стральбы тарасніц складала 250–300 м[366]. Фоглеры, у адрозненне ад гармат усіх іншых тыпаў, зараджаліся не з пераду, а з казённай, ці задняй, часткі. Яны мелі некалькі спецыяльных зменных камор-парахаўніц, якія мацаваліся ззаду з дапамогай кліна і мяняліся пры перазарадцы. Гэта дазваляла павялічыць хуткастрэльнасць, аднак зніжала магутнасць стрэлу.

Гарматы познесярэднявечнага тыпу (тарасніцы, гуфніцы і фоглеры) актыўна выкарыстоўваліся на землях ВКЛ да сярэдзіны XVI ст., пакуль у Вільні не была заснавана людвісарня, у якой пачаўся масавы выпуск артылерыі новага тыпу. Таму ў першай палове XVI ст. познесярэднявечныя гарматы яшчэ выкарыстоўваліся пры абароне ўмацаванняў, у прыватнасці ў замках з традыцыйнымі для рэгіёна драўлянымі фартыфікацыямі або ў мураваных замках-кастэлях. Напрыклад, для ўстаноўкі такіх гармат былі прыстасаваны вежы

[363] *Бохан Ю. М.* Узбраенне войска ВКЛ другой паловы XIV – канца XVI ст. С. 180.
[364] *Schmidtchen V.* Bombarden, Befestigungen, Büchsenmeister. S. 12.
[365] *Egg E.* Der Tiroler Geschützguss 1400–1600. S. 22.
[366] *Szymczak J.* Początki broni palnej w Polsce: (1383–1533). S. 54.

Мірскага замка, збудаванага ў першай чвэрці XVI ст.[367] Вядома, што ў 1536 г. адна жалезная гармата познесярэднявечнага тыпу мелася ў Магільнянскім замку[368]. Па адной жалезнай гармаце згадваецца ў арсеналах Свіслачы і Глуска адпаведна ў 1560 і 1571 гг.[369] Аднак невялікая колькасць інвентароў рэзідэнцый Радзівілаў першай паловы XVI ст. не дазваляе грунтоўна вывучыць пытанне забеспячэння іх артылерыяй познесярэднявечнага тыпу ў гэты час.

Некаторыя гарматы познесярэднявечнага тыпу захоўваліся ў арсеналах радзівілаўскіх фартэцый яшчэ ў першай палове XVII ст. Так, у інвентары Нясвіжскага замка 1626 г. згадваюцца дзве «старасвецкія» жалезныя гарматы, адну з якіх да 1636 г. ужо пусцілі на жалеза для направы гарматных колаў[370]. Па ўсёй верагоднасці, гэта былі гуфніцы. Тое, што гармата «была разабрана на шыны», сведчыць пра архаічную тэхналогію яе вырабу. Першыя камнекідальныя гарматы вырабляліся шляхам скоўвання жалезных штабаў, ці брускоў, на якія нацягваліся гарачыя абручы. Яны пры астыванні моцна сціскалі штабы. Меншыя гарматы маглі выкоўвацца з аднаго жалезнага кавалка. Вялікія бамбарды пры тагачасных тэхналогіях ліцця было немагчыма адліваць з жалеза[371]. З цягам часу для вытворчасці вялікіх гармат пачалі выкарыстоўваць бронзу, тэхналогія апрацоўкі якой скарыстоўвалася ўжо пры ліцці званоў. У пісьмовых крыніцах няма згадак аб ліцці такіх гармат на тэрыторыі ВКЛ да другой чвэрці XVI ст. Гэта азначае, што большая частка гармат на нашых землях у XV – пачатку XVI ст. вырабляласа з каванага жалеза[372]. Прыклад каваных гармат Нясвіжскага замка, а таксама больш раннія згадкі аб жалезных гарматах у Глуску, Магільне і Свіслачы пацвярджаюць гэтую думку. Акрамя таго вядома, што невялікая бронзавая гармата знаходзілася ў 1636 г. на паўднёва-ўсходняй вежы Мірскага замка. Да яе мелася 30 ядраў[373]. Магчыма, гэта таксама была гармата познесярэднявечнага тыпу, бо пазнейшая даўгаствольная артылерыя была менш прыдатная для ўстаноўкі на вежах.

З часу свайго з'яўлення артылерыя прайшла шэраг этапаў у сваім развіцці. Пераломным момантам стала, напрыклад, пашырэнне наразной артылерыі у трэцяй чвэрці XIX ст. Менш вядомая «рэвалюцыя» ў артылерыі адбылася ў канцы XV – першай чвэрці XVI ст. Павышэнне эфектыўнасці гармат у гэты час было выклікана шэрагам інавацый. Пераход да ўжывання літога жалезнага, а пазней чыгуннага ядра, якое пры аднолькавай вазе было меншае за

[367] *Волкаў М. А.* Фартыфікацыя і ўзбраенне Мірскага замка. С. 14–15.

[368] *Mikulski W., Zawadzki J.* Opisy zamków białoruskich z inwentarzy dóbr przechowywanych w Archiwum Radziwiłłów w Archiwum Głównym Akt Dawnych. S. 54; *Бохан Ю. М.* Вайсковая справа ў Вялікім княстве Літоўскім у другой палове XIV – канцы XVI ст. С. 242.

[369] НГАБ. Ф. 694. Воп. 7. Спр. 936. Арк. 3; Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. Вильна, 1867. Т. 3. С. 39.

[370] AGAD. AR. Dz. XXVI. Sygn. 51. S. 1–2; Sygn. 52. S. 12; *Bernatowicz T.* Monumenta variis Radivillorum: wyposażenie zamku nieświeckiego w świetle źródeł archiwalnych. S. 37.

[371] *Schmidtchen V.* Bombarden, Befestigungen, Büchsenmeister. S. 13.

[372] *Brensztejn M.* Zarys dziejów ludwisarstwa na ziemiach b. Wielkiego Księstwa Litewskiego. S. 17.

[373] AGAD. AR. Dz. XXVI. Sygn. 51. S. 1–2.

каменнае і адначасова больш трывалае, прывёў да памяншэння ствалоў пры адначасовым павелічэнні разбуральнай сілы. Тады ж з'явіліся лёгкія і трывалыя двухсценныя колавыя лафеты, якія зрабілі артылерыю манеўранай і прыдатнай да выкарыстання ў палявых умовах. Ствол мацаваўся да лафета пры дапамозе чопаў, што спрасціла працэс навядзенне гарматы на цэль і зрабіла больш трапным артылерыйскі агонь[374]. Лейтматывам развіцця артылерыі яшчэ ў XV ст. стала выцягванне ствалоў гармат у даўжыню пры адначасовым змяншэнні калібру. Гэта было выклікана імкненнем павысіць магутнасць, трапнасць і далёкасць стрэлу. Значныя магчымасці для развіцця ў гэтым накірунку мелі гарматы, што стралялі свінцовымі і жалезнымі ядрамі, найперш тарасніцы, даўжыня ствала якіх дасягала 21–29 калібраў[375]. Менавіта яны сталі асновай даўгаствольнай артылерыі XVI ст. Усе гэтыя інавацыі мелі значныя наступствы: развіццё артылерыі фактычна абрынула асновы сярэднявечнай абарончай архітэктуры і прымусілі да выпрацоўкі новых прынцыпаў фартыфікацыі.

Адным з творцаў новай артылерыі лічыцца кароль Францыі Карл VIII, які ў італьянскую кампанію 1494 г. выправіўся са 140 гарматамі новага ўзору[376]. Неўзабаве з ініцыятывы імператара Максіміліяна I Габсбурга была рэфармавана і артылерыя Свяшчэннай Рымскай імперыі. Мадэрнізаваная яшчэ раз у сярэдзіне XVI ст., артылерыя Габсбургаў стала найлепшай у Еўропе і захавала сваё першынство ажно да Трыццацігадовай вайны (1618–1648 гг.). Для Польскага каралеўства і Вялікага Княства Літоўскага новая эпоха ў развіцці артылерыі пачалася падчас праўлення Жыгімонта I Старога, які прыклаў шмат намаганняў для яе ўдасканалення. Для забеспячэння сваёй арміі і замкаў сучаснымі гарматамі кароль заснаваў людвісарні ў Кракаве і Львове. У апошнія гады яго кіравання, верагодна, пачалася вытворчасць гармат і ў сталіцы ВКЛ Вільні. Аднак яна не дасягнула значных памераў[377].

У эпоху княжання Жыгімонта I магнаты ВКЛ пачалі замаўляць для сябе першыя гарматы новага тыпу. Гэта было звязана з узвышэннем магнатэрыі на палітычнай арэне і павелічэннем яе фінансавых рэсурсаў. Першыя вядомыя гарматы Радзівілаў, звесткі пра якія ўдалося выявіць у крыніцах, былі адліты ў 1531–1532 гг. Яны мелі радзівілаўскі герб «Трубы» на ствалах і, па ўсёй верагоднасці, былі выраблены для Юрыя Радзівіла[378]. Падставай для вырабу гармат магла стаць намінацыя Ю. Радзівіла ў 1531 г. на пасаду вялікага гетмана. Гэта, відавочна, паўплывала на жаданне магната засведчыць свой статус у бронзе. У гэтым ён выразна прыпадабняўся да манарха, якому дасюль нале-

---

[374] *Górski K.* Historia artylerii polskiej. S. 33.

[375] *Бохан Ю. М.* Узбраенне войска ВКЛ другой паловы XIV – канца XVI ст. С. 184.

[376] *Szymczak J.* Początki broni palnej w Polsce (1383–1533). S. 214.

[377] *Brensztejn M.* Zarys dziejów ludwisarstwa na ziemiach b. Wielkiego Księstwa Litewskiego. S. 17.

[378] Armémuseum Stockholm. № 5378. A. 89, 96. *Волкаў М. А.* Артылерыя Нясвіжскага замка. С. 26–27.

жала ініцыятыва ў ліцці гармат. Да пачатку XVIII ст. дзве згаданыя гарматы захоўваліся ў Біржанскім замку.

Пры Жыгімонце II Аўгусце распачалася эпоха росквіту артылерыі ў ВКЛ. Гэта было звязана з заснаваннем людвісарні ў Вільні. Уздым яе дзейнасці прыпадае на 50-я – першую палову 60-х гадоў XVI ст. З мноства гармат, адлітых у Вільні пры Жыгімонце II Аўгусце, у Нясвіжскі замак у сярэдзіне XVII ст. трапіла марціра. Інвентары замка дазваляюць досыць дакладна яе апісаць. Гэта была сярэдняя паводле класіфікацыі XVI ст. марціра. Яна важыла 9 ¾ літоўскага цэнтнера (439 кг) і мела калібр каля 270 мм[379]. Дзейнасць людвісарні ў Вільні і прыцягненне ў сталіцу дзяржавы значнай колькасці майстроў-ліцейшчыкаў стала значным стымулам для развіцця прыватнаўласніцкай артылерыі. З сярэдзіны XVI ст. магнаты пачалі ствараць вялікія артылерыйскія паркі ў сваіх рэзідэнцыях, што было выклікана не толькі клопатам аб абароне сваіх фартэцый, але і імкненнем прадэманстраваць сваю магутнасць і сілу на палітычнай арэне.

Значная колькасць гармат новага кшталту мелася ў сярэдзіне XVI ст. у Клецку (табл. 1). У прыватнасці, у інвентары 1558 г. згадваюцца 9 фальканетаў, якія адносяцца да гармат новага тыпу[380]. Гэтай артылерыяй Клецк быў забяспечаны яшчэ да перадачы яго Радзівілам. У 1626 г. у Клецку мелася 12 гармат, з іх толькі адна няспраўная[381]. Да сярэдзіны XVII ст. мясцовы арсенал перастаў існаваць, а яго рэшткі былі вывезены ў Нясвіж.

Табліца 1. **Забеспячэнне артылерыяй і ручной агняпальнай зброяй Клецкага замка**

Від	1558	1626	1640 (?)	1655
Артылерыя				
Гарматы	**14**	**11 (10)**	**9 (6)**	**–3**
Ручная агняпальная зброя				
Гакаўніцы	25	70 (68)	70 (68)	–50
Рушніцы	31	22	20	–
Аркебузы	24	–	–	–
Іншыя	–	–	2	–
АГУЛАМ	**80**	**92 (90)**	**92 (90)**	**–50**

НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 3135. Арк. 4 адв.; Спр. 1913. Арк. 94 адв.–95; AGAD. AR. Dz. XI. Sygn. 48; Скеп'ян А. А. Дзве ардынацыі – два цэнтры: Клецк і Нясвіж. С. 146.

Умоўныя абазначэнні для гэтай і наступных табліц: «+» – прывезена, «–» – вывезена, «>» – больш, «≥» – больш ці роўна, «( )» – спраўныя, «[ ]» – колькасць ствалоў у арганах, «/» – розныя даныя)

Пра тое, як выглядала артылерыя гэтага часу, сведчыць прыклад двух гармат Мікалая Радзівіла Чорнага, адлітых у 1550 г. (мал. 35). Іх ствалы маюць двухчасткавую структуру і амаль цалкам пазбаўлены дэкору. У кароткім

[379] BCzart. Rkps. 1814. S. 18; *Волкаў М. А.* Артылерыя Нясвіжскага замка. С. 28, 31.

[380] *Скеп'ян А. А.* Дзве ардынацыі – два цэнтры: Клецк і Нясвіж. С. 146.

[381] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 3135. Арк. 4 адв.–5.

полі змешчаны герб і інскрыпцыі, якія маюць істотную сімвалічную нагрузку. Гэта звязана з тым, што ў 1547 г. М. Радзівіл атрымаў з рук імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі тытул князя на Алыцы і Нясвіжы, а разам з ім герб у выглядзе арла з чатырохпалёвай тарчай на грудзях. Менавіта гэты герб быў змешчаны на гармаце разам з надпісам «NICOLAVS RADSIWIL DEI GRASIA DVX ETC 1550».

Працэс фарміравання прыватнаўласніцкай артылерыі Радзівілаў ішоў поруч з разбудовай іх рэзідэнцый, абарончы патэнцыял якіх пастаянна ўзрастаў. Пры гэтым вельмі часта будаўніцтва абарончых умацаванняў рэзідэнцый суправаджалася стварэннем ці значнай мадэрнізацыяй іх артылерыйскіх паркаў. На прыкладзе забеспячэння рэзідэнцый Радзівілаў гэтае правіла знаходзіць цэлы шэраг пацвярджэнняў.

У XVII ст. у арсенале Нясвіжскага замка мелася серыя фальканетаў, адлітых Стэфанам Борнікелем (Бурнікелем) у 1576–1577 гг. па замове М. К. Радзівіла Сіроткі[382]. Майстэрня С. Борнікеля знаходзілася ў Вільні, таму да яго паслуг часта звярталіся магнаты ВКЛ, у тым ліку Мікалай Радзівіл Чорны[383].

У сярэдзіне XVII ст. у нясвіжскім арсенале мелася восем борнікелеўскіх гармат. Яны мелі вагамер 1–4 фунты[384] і, паводле класіфікацыі XVI–XVII ст., адносіліся да серпантын і фальканетаў. Гэтыя гарматы былі адлітыя, відавочна, для адной з рэзідэнцый Сіроткі. У тастаменце князя ад 5 сакавіка 1595 г. пералічваюцца наступныя маёмасці: Нясвіж, Мір, Свержань, Лахва[385]. Пры гэтым у 1570-я гг. земляныя ўмацаванні прыдатныя для ўстаноўкі артылерыі такога кшталту меў толькі Мірскі замак. У Нясвіжы, які з 1568 г. стаў цэнтрам ардынацыі, у гэты час па-ранейшаму стаяў драўляны замак. Не было ўмацаванняў у Свержані і Лахве. Таму слушным будзе дапусціць, што адлітыя С. Борнікелем у 1576–1577 гг. гарматы прызначаліся для Мірскага замка, а іх выраб быў звязаны з будаўніцтвам земляных умацаванняў вакол



Мал. 35. Гармата М. Радзівіла. Ф. Я. Тэлот. XVIII ст. АМ. № 5378

[382] *Волкаў М. А.* Артылерыя Нясвіжскага замка ў канцы XVI – пачатку XVIII ст. С. 46–48.

[383] AGAD. AR. Dz. VII. Sygn. 641. S. 7.

[384] Вагамер – спосаб вызначэння калібра гарматы праз вагу ядра да яе. У Рэчы Паспалітай і Вялікім Княстве Літоўскім у XVI–XVII стст. для вымярэння вагі карысталіся нюрнбергскім фунтам, які складаў 509,9 г.

[385] LMAVB. F. 18. B. 145. P. 638 v.

яго. Неабходнасць узвядзення больш магутнай рэзідэнцыі напрыканцы XVI ст. прымусіла Сіротку закласці Нясвіжскі замак, куды ён перавёз усю артылерыю Мірскага замка. Пазней, у час вайны 1654–1667 гг., артылерыйскі парк Мірскага замка, які меркавалася абараняць, быў на кароткі час папоўнены за кошт гармат з Нясвіжа. У другой палове XVII ст. рэзідэнцыя ў Міры цалкам згубіла абарончы патэнцыял, аб чым сведчыць адсутнасць там спраўных гармат.

Адным з найбольш адметных прыкладаў забеспячэння артылерыяй прыватнаўласніцкай рэзідэнцыі на беларускіх землях з'яўляецца Нясвіжскі замак, збудаваны па загадзе М. К. Радзівіла Сіроткі ў канцы XVI ст.[386] Рэканструяваць артылерыйскі парк фартэцыі канца XVI – пачатку XVII ст. магчыма па інвентарах Нясвіжскага замка XVII ст. (табл. 2)[387]. Фарміраванне арсенала Нясвіжскага замка пачалося з закупкі і збору гармат з іншых фартэцый. У першым вядомым інвентары замка за 1626 г. згаданы шэраг гармат старых тыпаў, альбо «старасвецкіх», як іх называлі ў інвентарах. Гэта была адна бронзавая гармата пад назвай «Месяц» і дзве жалезныя, пра якія згадвалася вышэй. Вагамер «Месяца» складаў 4 фунты. Такога кшталту артылерыю, відавочна, не выраблялі для новай фартэцыі, а перавезлі з нейкага старога замка. З іншых фартэцый у Нясвіжскі замак трапілі таксама чатыры серпантыны і шротаўніца «Цмок». Нясвіжскія серпантыны, верагодна, трэба атаясамліваць з чатырма палкавымі «кругераўскімі» гарматамі вагамерам 1½ фунта, якія, паводле інвентароў 1657 г., належалі да артылерыі Нясвіжскага замка. Шротаўніцамі называлі гарматы для стральбы шротам (невялікімі свінцовымі кулямі ці кавалкамі сечанага жалеза) з блізкай адлегласці для знішчэння жывой сілы непрыяцеля. Дакладна вядома, што «Цмок» быў у даўжыню 2 локці (1,3 м) і меў вагамер 14 фунтаў і выяву цмока на ствале[388]. Аднак найбольш істотна арсенал Нясвіжскага замка папоўніўся за кошт серыі з васьмі фальканетаў С. Борнікеля, пра якія згадвалася вышэй.

Табліца 2. **Забеспячэнне артылерыяй і ручной агняпальнай зброяй Нясвіжскага замка**

Від	1626	1636	1656	1657	1658	1681	1693	1695	1706
Артылерыя									
Цяжкія	4	4	4	4	4	4	4	4	–
Лёгкія	20	20	38 / 29	24	24	17	17	17	–
Шротаўніцы	4	4	9 / 5	4	4	8	8	8	–
Марціры	1	1	3	2	2	2	2	1	–
Арганы	1 [4]	[15]	–	5	5	4 [36]	2 [11]	–	–
АГУЛАМ	**30**	**29**	**54 / 42**	**39**	**39**	**35**	**33**	**30**	**– 22 / 0**

[386] Падрабязней гл.: *Волкаў М.* Артылерыя Нясвіжскага замка ў канцы XVI – пачатку XVIII ст. С. 41–91; *Ён жа.* Артылерыя Нясвіжскага замка.

[387] НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 55. Арк. 373; AGAD. AR. Dz. XI. Sygn. 48. S. 72–75; Dz. XXVI. Sygn. 52, 80; 81, 103, 112, 113, 169, 768; *Bernatowicz T.* Monumenta variis Radivillorum: wyposażenie zamku nieświeckiego w świetle źródeł archiwalnych. S. 37, 44–46.

[388] Собрание государственных и частных актов, касающихся истории Литвы и соединённых с ней владений (от 1387 до 1710 г.). Ч. 1. С. 117.

Від	1626	1636	1656	1657	1658	1681	1693	1695	1706
Ручная агняпальная зброя									
Самапалы	–	–	–	95 (80)	53 (50)	–	–	–	–
Гакаўніцы	108 (105)	89 (86)	242 (217)	215 (185)	199 (184)	183	180 (124)	–	–
Пулгакі	26	29 (27)	60	54	42	14	14	–	–
Ручніцы	21	21	–	–	–	–	–	–	–
Мушкеты	31	33	182 (33)	–	–	138	96 (60)	–	–
Штурмакі	23	23	24	24	23	26	26	–	–
Іншыя	1	1	4	3	3	–	–	–	–
АГУЛАМ	**210 (207)**	**196 (191)**	**512 (338)**	**391 (346)**	**320 (302)**	**361**	**316 (224)**	–	–

НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 55. Арк. 373; AGAD. AR. Dz. XI. Sygn. 48. S. 72–75; Dz. XXVI. Sygn. 52, 80, 81, 103, 112, 113, 169, 768; Adlerfeld G. The military history of Charles XII. King of Sweden. S. 230; Bernatowicz T. Monumenta variis Radivillorum: wyposażenie zamku nieświeckiego w świetle źródeł archiwalnych. S. 37, 44–46.

Збіранне гармат з іншых месцаў дазволіла ў хуткім часе пасля ўзвядзення замка прыстасаваць яго да абароны. Аднак асновай артылерыйскага парка новай фартэцыі павінна была стаць новая артылерыя, адлітая непасрэдна для яе. Надзвычай каштоўным дакументам, які сведчыць пра пачатак вытворчасці гармат для Нясвіжскага замка, з'яўляецца недатаваны рахунак коштаў на выраб дзесяці бронзавых гармат[389]. Першымі ў рахунку згадваюцца 2 «вялікія» гарматы з выявамі св. Мікалая і св. Крыштафа, за імі – 4 гарматы «для каменных ядраў» з выявамі чатырох «элементаў» і 4 «малыя гарматкі» таксама «для каменных ядраў» з выявамі чатырох евангелістаў. Ва ўсіх інвентарах серыя гармат з выявамі чатырох «элементаў», ці першапачаткаў прыроды, згадваецца як «Элементы» альбо па назвах кожнай асобнай гарматы: «Агонь», «Зямля», «Вада», «Паветра». Яны былі выраблены ў 1596 г. і прызначаліся для стральбы каменнымі ядрамі ці шротам. Яны важылі па 895 гданьскіх фунтаў (388 кг)[390] і мелі калібр, які адпавядаў дыяметру 8-фунтовага каменнага ядра (каля 145–155 мм). На ствалах гармат меліся надпісы з імем Сіроткі і выява радзівілаўскага арла з гербам «Трубы» на грудзях[391]. Гарматы з выявамі чатырох евангелістаў: «Св. Мацвей», «Св. Марк», «Св. Лука» і «Св. Ян», былі аднолькавыя па масе і важылі па 775 гданьскіх фунтаў (336 кг). Пры меншай вазе «Евангелісты» адпаведна мелі і меншы вагамер, які складаў 14 фунтаў жа-

[389] AGAD. AR. Dz. XXVI. Sygn. 126.

[390] Гданьскі фунт складаў 0,434 г. Арыентацыя на гэту сістэму вымярэнняў тлумачыцца дзвюма прычынамі: па-першае, пры вызначэнні вагі, акрамя фунтаў, у самім дакуменце выкарыстоўваўся цэнтнер, які складаў 120 фунтаў, што адпавядае гданьскай сістэме вымярэнняў, і па-другое – значная частка матэрыі для вырабу гармат была закуплена, менавіта, у Гданьску.

[391] AGAD. AR. Dz. XXVI. Sygn. 166.

лезнай вагі (125–130 мм). Яны былі адліты ў 1597 г. Нязначная вага «Элементаў» і «Евангелістаў», як і заўвага, што яны стралялі каменнымі ядрамі, сведчаць пра ідэнтычную познесярэднявечным бамбардам канструкцыю ствала, які пры невялікай даўжыні і шырокім канале для ядра меў вузкую камору для пораху. Пра істотны запас каменных ядраў для гэтых гармат згадваюць інвентары 1657, 1658 і 1681 гг. Значны запас каменных ядраў меўся і ў Клецкім замку, што сведчыць пра шырокае выкарыстанне «каменных» гармат да канца XVI ст. Як сведчаць інвентарныя апісанні, з сярэдзіны XVII ст. нясвіжскія «Элементы» і «Евангелісты» выкарыстоўвалі для стральбы шротам.

Ведаючы час вырабу «Элементаў» і «Евангелістаў», цяжкія гарматы «Св. Мікалай» і «Св. Крыштаф» можна датаваць 1596–1597 гг. На тое, што гарматы былі замоўлены менавіта Сіроткам, прама ўказвае іх прысвячэнне святым заступнікам князя. Паводле рахунку, ствалы гармат важылі амаль аднолькава: «Св. Мікалай» – 6948 гданьскіх фунтаў (3015 кг), «Св. Крыштаф» – 6960 гданьскіх фунтаў (3021 кг). На жаль, з-за недахопу інфармацыі немагчыма больш дакладна акрэсліць іх параметры. Відавочна, аднак, што гэта былі самыя вялікія гарматы, замоўленыя Сіроткам, а ўлічваючы прысвячэнне святым патронам князя, можна меркаваць, што яны мелі для магната істотнае значэнне.

У 1598–1599 гг. на замову Сіроткі былі адліты яшчэ чатыры цяжкія гарматы: «Кракадзіл», «Саламандра» (ці «Саламандра ў агні»), «Аляксандр» і «Георгій» (ці «Юрый»). Амаль ва ўсіх інвентарах указвалася, што «Саламандра» і «Кракадзіл» былі паўкартаўнамі, у той час як «Аляксандр» і «Георгій» выдзяляліся ў асобны тып, які не акрэсліваўся. Гэтыя гарматы мелі вагамер 18–24 фунты. У выніку захопу Нясвіжскага замка шведамі ў 1706 г. яны былі знішчаны[392].

У варшаўскім архіве Радзівілаў захаваўся непадпісаны малюнак, на якім, верагодна, адлюстравана нясвіжская «Саламандра»[393] (мал. 36). Мяркуючы



Мал. 36. Гармата «Саламандра». AGAD. AR. Dz. VII. Sygn. 715

[392] *Волкаў М. А.* Артылерыя Нясвіжскага замка ў канцы XVI – пачатку XVIII ст. С. 51–52.

[393] AGAD. AR. Dz. VII. Sygn. 715. S. 1. Падрабязней гл.: *Волкаў М.* Нясвіжская «Саламандра» // БГЧ. 2013. № 9. С. 15–21.

па параметрах гарматы, яна адносілася да тыпу так званых *спявачак* (ням. *Singerin*), альбо спецыфічнага тыпу доўгіх паўкартаўнаў, папулярных у XVI – пачатку XVII ст. Верагодна, такімі ж былі і іншыя цяжкія гарматы Нясвіжскага замка.

Шырока вядомай з'яўляецца дзейнасць у Нясвіжы нямецкага людвісара Германа Мольцфельта, майстэрня для якога была збудавана на тэрыторыі самога замка. З яго імем дакладна можна звязваць восем лёгкіх гармат, выробленых у 1599–1603 гг. Усе яны зберагліся да нашага часу. Гарматы «Гідра» і «Цэрбер» былі адліты ў 1599 г., а гарматы «Вінаград», «Цырцэя», «Папугай» і «Сава» – у 1600 г. Вагамер пяці з гэтых гармат складае ¾ фунта (калібр ад 47 да 51 мм), адной – 1 фунт (калібр 56 мм). Апошнімі па замове Сіроткі ў 1602 і 1603 гг. былі адліты адпаведна «Мелюзіна» і «Хімера» (мал. 37). Менавіта на іх з'явіўся надпіс з імем людвісара і месцам вытворчасці гармат: «HERMAN MOLTZFELT ZV NIESWISCH» на «Мелюзіне» і «MOLTZFELD ZV NESWISCH» на «Хімеры». «Мелюзіна» мае вагамер 6 фунтаў (калібр 93 мм), «Хімера» – 3 фунты (калібр 78 мм).

Гарматы ліцця Г. Мольцфельта маюць выбітнае мастацкае афармленне, што можна патлумачыць імкненнем іх заказчыка, М. К. Радзівіла Сіроткі, да сцвярджэння высокага статусу і прэстыжу сваёй асобы і роду. Вядома, што арсенал Нясвіжскага замка забяспечваў артылерыяй вайсковыя аддзелы магната. Артылерыя разам з уласным войскам прадстаўляла М. К. Радзівіла ў ваенных выправах і рознага кшталту сходах, куды магнат выпраўляў сваё войска для забеспячэння падтрымкі ўласных інтарэсаў. У якасці прыкладу можна згадаць з'езд пад Стэнжыцамі ў 1575 г., дзе пасля ўцёкаў Генрыха Валуа ў Францыю абмяркоўваліся кандыдатуры на трон Рэчы Паспалітай. Сюды магнаты і шляхта з ВКЛ, сярод якіх быў і Сіротка, прыйшлі з вялікім войскам і гарматамі, і, як згадвалі відавочцы, «*літвіны былі больш гатовыя да бою, чым да пасяджэнняў*»[394].



Мал. 37. Гармата «Мелюзіна». Ф. Я. Тэлот. XVIII ст. AM. Nr 5379

Такім чынам, каля паловы гармат, сканцэнтраваных М. К. Радзівілам у новазбудаваным Нясвіжскім замку, паходзіла з іншых фартэцый. Тым не менш, нягледзячы на вялікую колькасць прывазнога ўзбраення, асновай нясвіжскай

[394] *Кетра Т.* Mikołaj Krzysztof Radziwiłł Sierotka (1549–1616) – wojewoda wileński. S. 97.

артылерыі сталі гарматы, створаныя непасрэдна для новай фартэцыі. Пры гэтым значная іх частка была выраблена ў самім Нясвіжы.

Артылерыйскі парк Нясвіжскага замка, сфарміраваны на мяжы XVI–XVII стст., не зазнаў істотных змен ажно да пачатку XVIII ст., калі фартэцыя была захоплена і разрабавана шведамі. У першым вядомым інвентары Нясвіжскага замка за 1626 г. згадваюцца 27 баявых гармат. Паводле інвентара, складзенага ў 1636 г., у нясвіжскім арсенале ў параўнанні з 1626 г. паболела на адзін борнікелеўскі фальканет, а адна са старых жалезных гармат пайшла на матэрыял для рамонту лафетаў. У наступным інвентары, які быў складзены, хутчэй за ўсё, у 1650 г., згадваюцца 28 баявых гармат. Такім чынам, да сярэдзіны XVII ст. артылерыйскі парк Нясвіжскага замка моцна не змяніўся.

Істотна паўплывала на артылерыю Нясвіжскай фартэцыі вайна паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй 1654–1667 гг. Артылерыйскі парк, з аднаго боку, папоўніўся новымі гарматамі, звезенымі з іншых, больш слабых умацаванняў ці перададзеных войскам, а з іншага боку, пацярпеў пэўныя страты. Вядома, што ў ліпені 1655 г. пасля адступлення з-пад Магілёва войска ВКЛ пакінула ў Нясвіжы частку сваёй артылерыі[395]. У інвентары 1656 г. падаецца дакладны пералік гэтых гармат: чатыры 6-фунтовыя, адна 5-фунтовая, тры 1-фунтовыя, адна ½-фунтовая гармата і тры марціры. Апрача гармат, якія належалі да дзяржаўнай артылерыі, у Нясвіжскі замак у 1655 г. былі перавезены яшчэ тры 1-фунтовыя гарматы з Клецка. У 1655 г. маскоўскае войска разрабавала горад, але не стала штурмаваць моцны бастыённы замак. Тым не менш ён стаў ахвярай амбіцый Багуслава Радзівіла. У канцы 1655 г. пад лозунгам абароны ад маскоўскага войска жаўнеры са слуцкага гарнізона Б. Радзівіла без згоды тагачаснага ўладальніка Нясвіжа занялі замак. На гэты час у фартэцыі была сканцэнтравана найбольшая за ўсё XVII ст. колькасць гармат – ажно 47 (толькі адна з іх была няспраўнай) і 3 марціры. Такі артылерыйскі парк быў завялікі для гэтага тыпу фартэцыі, а збіранне значнай колькасці гармат у Нясвіжы тлумачыцца імкненнем зберагчы іх ад захопу маскоўскімі войскамі ці казакамі. Частка з гармат падчас валодання замкам Б. Радзівілам была перавезена ў Мір і Слуцк. Пасля вяртання Нясвіжскага замка пад уладу Міхала Казіміра Радзівіла ў 1656 г. частка «трафейных» гармат была вернута войску ВКЛ. У 1657–1658 гг. у арсенале Нясвіжскага замка мелася 32 гарматы і 2 вялікія марціры. Найбольш сур'ёзная небяспека над Нясвіжскім замкам навісла ў 1660 г., калі ён быў узяты ў аблогу маскоўскім войскам на чале з Сямёнам Змеевым. Аднак паспяховая абарона суседняй Ляхавіцкай фартэцыі, якая затрымала асноўныя маскоўскія сілы на чале з Іванам Хаванскім, а неўзабаве і разгром непрыяцельскіх войскаў пад Палонкай 28 чэрвеня 1660 г. выратавалі замак у Нясвіжы.

З інвентароў нясвіжскага арсенала 1657–1658 гг., калі пад пагрозай варожага нападу ўсе гарматы былі расстаўлены на валах, вядомы прынцып іх размяшчэння на ўмацаваннях Нясвіжскага замка. Месцамі канцэнтрацыі артылерыі з'яўляліся бастыёны, на якіх знаходзілася значная частка гармат,

[395] *Wisner H.* Janusz Radziwiłł 1612–1655: wojewoda wileński, hetman wielki litewski. S. 190.

у тым ліку ўсе цяжкія. На заходнім бастыёне стаялі дзве паўкартаўны «Саламандра» і «Кракадзіл», а таксама два фальканеты. У 1658 г. туды ж была пастаўлена вялікая марціра. На паўночным бастыёне знаходзілася цяжкая гармата «Георгій» і тры фальканеты, на паўднёвым – цяжкая гармата «Аляксандр» і адзін фальканет. Замест усходняга бастыёна, які, верагодна, быў моцна «падрэзаны» ў выніку будаўніцтва стайні ў першай палове XVII ст., была ўзведзена новая батарэя. На ёй паставілі тры фальканеты. На курцінах паміж бастыёнамі былі расстаўлены фальканеты: 1 – на паўднёва-ўсходняй, 3 – на паўднёва-заходняй, 2 – на паўночна-заходняй. Другая гармата стаялі на паўночна-ўсходняй курціне. Такім чынам, на бастыёнах Нясвіжскага замка было расстаўлена па 2–4 гарматы, а на курцінах паміж імі стаяла ад 1 да 3 гармат. Пры гэтым 4 цяжкія гарматы вагамерам 18–24 фунты былі ўсталяваны толькі на бастыёнах, дзе мелася дастаткова месца для іх абслугоўвання. Галоўнай задачай гэтых гармат было вядзенне артылерыйскай дуэлі на далёкай адлегласці, разбурэнне батарэй і ўмацаванняў ворага. У дапамогу ім на бастыёнах і курцінах для знішчэння жывой сілы непрыяцеля былі пастаўлены лёгкія гарматы вагамерам 1–4 фунты: 15 фальканетаў ліцця С. Борнікеля і Г. Мольцфельта і 2 прывазныя лёгкія гарматы.

Пасля заканчэння вайны 1654–1667 гг. большасць прывазных гармат былі вернуты іх уласнікам. У апошняй чвэрці XVII ст. у фартэцыі знаходзілася 29 гармат ці прыкладна столькі ж, колькі да вайны. Пэўныя змены ў артылерыі Нясвіжскага замка адбыліся напярэдадні Вялікай Паўночнай вайны. Тады з замка былі вывезены больш за дзесяць бронзавых гармат, а замест іх з'явіліся 4 жалезныя. Усяго ў рукі шведаў, якія захапілі фартэцыю у 1706 г., трапіла 17 бронзавых і 5 жалезных гармат[396]. Выкарыстанне жалеза для вырабу гармат дазваляла рабіць іх больш таннымі. Але разам з тым пагаршалася іх якасць, яны станавіліся больш цяжкімі. Таму жалезныя гарматы, як правіла, адліваліся для фартэцый і не выкарыстоўваліся ў палявых бітвах. Верагодна, адна з жалезных гармат, выробленых для Нясвіжскага замка ў гэты час, была знойдзена ў 2010 г. у замкавым рове (мал. 38)[397]. Яна мае калібр 100 мм, што адпавядае вагамеру 6 фунтаў. Такім чынам, напярэдадні Вялікай Паўночнай вайны артылерыйскі парк Нясвіжскага замка быў зменшаны, што прывяло да зніжэння абароназдольнасці фартэцыі. Прычынай гэтага з'яўлялася недастатковая ўвага да гэтай рэзідэнцыі з боку тагачаснага нясвіжскага ардыната Караля Станіслава Радзівіла. У прыватнасці, з дзённіка магната вынікае, што ён рэдка наведваў родавую сталіцу, праводзячы шмат часу ў Белай на Падляшшы, якая знаходзілася бліжэй да тагачаснага палітычнага цэнтра Рэчы Паспалітай – Варшавы. Паказальным у стаўленні магната да сваёй нясвіжскай рэзідэнцыі з'яўляецца той факт, што падчас прыездаў у ВКЛ К. С. Радзівіл часцей спыняўся ў Мірскім замку, чым у Нясвіжскім, хаця апошні фармальна захоўваў статус галоўнай рэзідэнцыі роду[398].

[396] *Adlerfeld G.* The military history of Charles XII. King of Sweden. P. 230.

[397] *Мяцельскі А. А.* Знаходкі агнястрэльнай зброі ў Нясвіжскім замку. С. 43–44.

[398] AGAD. AR. Dz. VI. Sygn. II-79.



Мал. 38. Гармата, знойдзеная ў рове Нясвіжскага замка

Месцам, куды была вывезена значная колькасць нясвіжскіх гармат незадоўга да шведскага нашэсця, быў, па ўсёй верагоднасці, Глускі замак, ператвораны Аляксандрам Гілярыем Палубінскім у другой палове XVII ст. у магутную бастыённую фартэцыю. Аб гэтым сведчыць рэестр гармат, вывезеных з Глуска расійскімі войскамі ў 1707 г.[399] Тады з фартэцыі было забрана 35 гармат: 3 цяжкія (адна 24-фунтовая паўкартаўна і дзве 12–фунтовыя чвэрцькартаўны), 30 лёгкіх і 2 марціры. З апісання вынікае, што значная іх частка для была закуплена ці прывезена з іншых фартэцый. Акрамя гармат з радзівілаўскімі гербамі меліся таксама 2 з гербамі Збаражскіх і яшчэ 2 з гербам «Пагоня», якія, хутчэй за ўсё, належалі да артылерыі ВКЛ. Разам з тым найбольшая гармата, якая мелася ў Глускім замку, 24-фунтовая паўкартаўна, была адлітая па замове А. Г. Палубінскага, па ўсёй верагоднасці, спецыяльна для новай фартэцыі ў Глуску.

Такім чынам, у фарміраванні артылерыйскага парка Глускага бастыённага замка можна выдзеліць два асноўныя этапы. Першым аб артылерыі для новазбудаванага замка ў 1670-х гг. паклапаціўся А. Г. Палубінскі, а паміж 1695 і 1706 гг. каля дзясятка гармат было перададзена новым уладальнікам Глуска Дамініку Мікалаю Радзівілу ці яго сыну Мікалаю Фаўстыну з Нясвіжа. Пры дапамозе гэтай артылерыі, напэўна, меркавалася ўмацаваць Глускую фартэцыю, якая ў канцы XVII ст. перайшла да Радзівілаў клецкай лініі. Пры гэтым

[399] AGAD. AR. Dz. VII. Sygn. 645. S. 1; Dz. XXVI. Sygn. 155.

параўнанне глускага арсенала з нясвіжскім дазваляе сцвярджаць, што Глускі замак быў у дастатковай ступені забяспечаны артылерыяй. Усе гарматы мелі добрыя акаваныя лафеты, што сведчыць аб падрыхтаванасці фартэцыі да абароны. Вываз гармат з Глускага замка ў 1707 г. прывёў да істотнага падзення яго абароназдольнасці. Фактычна фартэцыя была пазбаўлена сродкаў для вядзення доўгачасовай паспяховай абароны і згубіла сваё ваеннае значэнне.

Наймацнейшай фартэцыяй Радзівілаў у XVII ст. быў Слуцк (табл. 3). Важнае значэнне гэтай рэзідэнцыі стала прычынай клопату ўласнікаў пра яе артылерыйскі парк. У 1595 г., яшчэ да пераходу Слуцка ва ўласнасць Радзівілаў, арсенал фартэцыі быў у значнай ступені спустошаны. У гэтым годзе горад занялі казакі на чале з Севярынам Налівайкам, якія ў час адыходу забралі з сабою 12 «лепшых» гармат[400]. На працягу першай паловы – сярэдзіны XVII ст. артылерыйскі парк Слуцка быў адноўлены: у 1620 г. у фартэцыі было 35 гармат, у 1662 г. – 53, а ў 1669 г. – 62[401]. Пры гэтым у слуцкім арсенале меліся гарматы ўсіх тыпаў: у 1669 г. было 14 цяжкіх гармат, 40 лёгкіх, 5 шротаўніц і 3 марціры. Колькасць няспраўных гармат была нязначнай.

Табліца 3. **Забеспячэнне артылерыяй і ручной агняпальнай зброяй Слуцка**

Від	1595	1620	1662	1666	1669	1686	1701	1703	1706
Артылерыя									
Цяжкія	–	6	6	≥ 3	8 / 9	14	13	+ 15	16 / 0
Лёгкія	–	25 (20)	31 (28)	≥ 5	45	40 (34)	41 (30)	+ 4	36 / 5
Шротаўніцы	–	–	5	≥ 1	5	1	1	–	1 / 0
Марціры	–	4	2	≥ 2	3	2	3	–	3
АГУЛАМ	**– 12**	**35 (30)**	**44 (41)**	**≥ 11**	**61 / 62**	**57 (51)**	**58 (47)**	**+ 19**	**56 / 8**
Ручная агняпальная зброя									
Шмыгаўніцы	–	9	9	–	9	9	9	–	–
Гакаўніцы	– 80	133 (130)	147 (137)	–	133	126	131	–	–
Мушкеты	–	229 (227) / 233 (231)	394 / 418	–	684	531	703	–	–
Карабіны	–	–	28	–	26	93	79	–	–
Іншыя	–	–	34	–	9	2	14	–	–
АГУЛАМ	**– 80**	**372 (367) / 377 (372)**	**612 (602) / 636 (626)**	–	**861**	**626**	**936**	–	–

НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 55. Арк. 143–144 адв.; AGAD. AR. Dz. II. Supl. Sygn. 716; Dz. V. Sygn. 63; Sygn. 6865/I. S. 133–134; Dz. VII. Sygn. 641. S. 1–2, 5–11; Sygn. 646. S. 1–2; Sygn. 678. S. 192–216; Dz. XXVI. Sygn. 759; Adlerfeld G. The military history of Charles XII. King of Sweden. S. 230; Kronika polska Marcina Bielskiego. S. 1743.

Аналіз даты вырабу, гербаў і інскрыпцый, якія меліся на гарматах і былі зафіксаваны ў інвентарах, дазваляе зрабіць высновы аб асноўных этапах фарміравання артылерыйскага парка слуцкай фартэцыі. У 1669 г. тут мелася

[400] Kronika polska Marcina Bielskiego. Sanok, 1856. T. 3, ks. 6. S. 1743.

[401] НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 55. Арк. 143–144 адв.; AGAD. AR. Dz. V. Sygn. 63. S. 210–213; Sygn. 6865/I. S. 133–134; Dz. VII. Sygn. 641. S. 1–2, 5–11; Dz. XXVI. Sygn. 759.

9 лёгкіх гармат, якія маглі належаць да спадчыны першых уласнікаў Слуцка, князёў Алелькавічаў. У прыватнасці, 4 гарматы мелі гербы Юрыя Юр'евіча Алелькавіча. Каля 2/3 усіх гармат трапілі ў Слуцк пры Багуславе Радзівіле ў сярэдзіне XVII ст.: на 7 меліся гербы магната, а яшчэ на 9 – прускія і галандскія гербы. Гэтыя гарматы былі, найверагодней, прывезены з Прусіі, дзе Б. Радзівіл выконваў ролю губернатара. Усе іншыя гарматы былі адліты пры жыцці магната. Такім чынам, значнае ўзбуйненне артылерыйскага парка Слуцка супала з інтэнсіфікацыяй будаўнічых прац на ўмацаваннях горада ў сярэдзіне XVII ст. Пры гэтым некаторыя гарматы адліваліся ў самім Слуцку. У прыватнасці, вядома, што ў 1664 г. у горадзе меўся людвісар[402].

Створаны намаганнямі Б. Радзівіла ў Слуцку артылерыйскі парк застаўся амаль нязменным да пачатку Вялікай Паўночнай вайны. У інвентары 1686 г. згадваецца пра 57 гармат, сярод якіх было 6 няспраўных[403]. Гэтая крыніца таксама дазваляе ўявіць, як былі расстаўлены гарматы ў мірны час. З 57 гармат 30 былі ў арсенале ў цытадэлі, астатнія стаялі на валах: 4 – у цытадэлі, 13 – на гарадскіх валах. На пачатку вайны, у 1703 г., у Слуцк былі прывезены 19 гармат з Ляхавіцкага замка, але неўзабаве яны сталі здабычай расійскага войска[404]. А ў 1706–1707 гг. арсенал фартэцыі быў цалкам спустошаны. На загад Карла XII былі знішчаны 27 лёгкіх гармат, а расійскія войскі вывезлі 16 цяжкіх, 4 лёгкія гарматы і 1 шротаўніцу. У выніку з 56 гармат, якія меліся ў слуцкім арсенале, засталося 5 лёгкіх гармат і 3 марціры[405]. Такім чынам, у першай палове – сярэдзіне XVII ст. намаганнямі Радзівілаў Слуцк быў забяспечаны значным артылерыйскім паркам, дзякуючы чаму яго абароназдольнасць істотна вырасла. Свой абарончы патэнцыял горад захоўваў да пачатку XVIII ст., пакуль яго артылерыя не была поўнасцю знішчана.

Акрамя галоўных рэзідэнцый Радзівілаў, у XVII ст. артылерыя мелася таксама ў замках у Давыд-Гарадку, Міры і Копысі. У 1605 г. у Давыд-Гарадоцкім замку налічвалася 11 гармат, з іх – 4 спіжовыя, 5 жалезныя, 2 марціры[406]. У час вайны 1654–1667 г. у Мірскі замак з Нясвіжа разам з іншым узбраеннем былі высланы 6 гармат (табл. 4)[407]. У інвентары замка 1688 г. згадваюцца 3 жалезныя гарматы, якія ляжалі ў браме без лафетаў[408]. Гэты факт выразна сведчыць аб тым, што рэзідэнцыя ў азначаны час згубіла ваеннае прызначэнне. У арсенале Капыскага замка ў 1670 г. было 4 гарматы, а ў 1690 г. – 3[409]. Як бачна, па забеспячэнні ўзбраеннем другасныя рэзідэнцыі выразна адрозніваліся ад цэнтральных фартэцый.

---

[402] AGAD. AR. Dz. VII. Sygn. 678. S. 105–107.

[403] Ibidem. S. 192–203.

[404] Ibidem. Sygn. 646. S. 1–2.

[405] Ibidem. Dz. XXIII. T. 133. Pl. 1. S. 331–332; Dz. XXVI. Sygn. 153, 774.

[406] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 9367. Арк. 51 адв. – 52.

[407] AGAD. AR. Dz. XI. Sygn. 48. S. 72–75.

[408] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 4468. Арк. 14.

[409] *Ткачоў М. А.* Замкі і людзі. С. 62–63.

Табліца 4. **Забеспячэнне артылерыяй і ручной агняпальнай зброяй Мірскага замка**

Від	1636	1656	1657	1660	1662	1681	1688
Артылерыя							
Лёгкія	1	+ 6	3	–	–	–	–
АГУЛАМ гармат	**1**	**+ 6**	**3**	**–**	**–**	**–**	**3 (0)**
Ручная агняпальная зброя							
Самапалы	–	–	–	4 (0)	8 (4) / 4 (0)	–	–
Гакаўніцы	64 (56)	+ 10	≥ 24	13/1	22 / 12	–3 (0)	–
Пулгакі	35 (20)	–	–	–	–	–	–
Кабылы	15	–	–	–	–	–	–
Мушкеты	–	–	–	68/35	91 (57) / 47 (35)	–16	–
АГУЛАМ	**114 (91)**	**+ 10**	**≥ 24**	**85 (81) / 36**	**121 (83) / 63 (51)**	**–19 (16)**	**–**

НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 4466. Арк. 29–31; 183–183 адв.; Спр. 4468. Арк. 13–19 адв.; AGAD. AR. Dz. XI. Sygn. 48. S. 72–75; Dz. XXVI. Sygn. 51. S. 1–2; Sygn. 768.

Спецыфічным відам артылерыі з'яўляюцца так званыя *арганы*. Гэта была шматствольная зброя, залп з якой мог нанесці вялікія страты і пасеяць паніку ў шэрагах нападнікаў. Арганы, якія выкарыстоўваліся ў радзівілаўскіх фартэцыях (Нясвіж, Слуцк) у XVII ст., уяўлялі сабою двухколыя вазкі, на якіх мацавалася 3–5 гакаўнічных, а пазней 5–9 мушкетных ствалоў. У Нясвіжскім замку ў XVII ст. было ад 1 да 5 арганаў. Іх было зручна выкарыстоўваць у вузкіх, а таксама найбольш небяспечных месцах, напрыклад, у браме ці на бастыёнах. Вядома, што ў Алыцкім замку на бастыёнах стаялі ўсе наяўныя 6 арганаў[410].

Для ацэнкі ўзроўню забяспечанасці беларускіх рэзідэнцый Радзівілаў артылерыяй мэтазгодна параўнаць іх з арсеналамі іншых умацаванняў. Найперш звернем увагу на радзівілаўскія замкі ў Алыцы на Валыні і Біржах у Завілейскай Літве. Падобны да Нясвіжскага артылерыйскі парк меў Алыцкі замак (табл. 5). Пасля пачатку паўстання на чале з Б. Хмяльніцкім у 1648 г. фартэцыя была добра падрыхтавана да абароны. У 1653 г. тут мелася 31 гармата: 6 цяжкіх, 24 лёгкіх (з іх 2 няспраўныя), 1 марціра, а таксама 6 арганаў. У 1681 г. у алыцкім арсенале было 25 гармат: 6 цяжкіх, 18 лёгкіх (з іх 1 няспраўная), 1 марціра і 6 арганаў. Як бачна, артылерыйскі парк Алыцкага замка быў даволі стабільным, і, відаць, не зазнаў значных страт у войнах сярэдзіны XVII ст. Падобна, як і ў Нясвіжы, артылерыя валынскай рэзідэнцыі істотна зменшылася пры Каралі Станіславе Радзівіле. Так, у 1698 г. у Алыцы засталося 19 гармат: 1 цяжкая, 17 лёгкіх (з іх 1 няспраўная), 1 марціра і 6 арганаў[411]. Большая частка цяжкіх гармат была вывезена для ўмацавання нейкай іншай рэзідэнцыі, верагодна, замка ў Белай.

[410] AGAD. AR. Dz. XXVI. Sygn. 773.

[411] Ibidem. Sygn. 773; Інвентарі Олицького замку XVII–XVIII століть : зб. док. / зібр. і підг. В. Александрович. Луцьк, 2007. С. 49–51, 62–65, 75–82.

Табліца 5. **Забеспячэнне артылерыяй і ручной агняпальнай зброяй Алыцкага замка**

Від	1653	1681	1686	1692	1698
Артылерыя					
Цяжкія	6	6	6	2	1
Лёгкія	24 (22)	18 (17)	18 (17)	16 (15)	17 (16)
Марціры	1	1	1	1	1
Арганы	6	6 [27]	6 [27]	6 [26]	6 [26]
АГУЛАМ	**37 (35)**	**31 (30)**	**31 (30)**	**25 (24)**	**25 (24)**
Ручная агняпальная зброя					
Гакаўніцы	6	10	10	9	9
Мушкеты	41	45	45	36	35
Штурмакі	6	–	–	–	–
АГУЛАМ	**53**	**55**	**55**	**45**	**44**

AGAD. AR. Dz. XXVI. Sygn. 773; Інвентарі Олицького замку XVII–XVIII століть. С. 49–51, 62–65, 75–82.

Адным з самых магутных бастыённых замкаў у ВКЛ і Рэчы Паспалітай быў радзівілаўскі замак у Біржах (табл. 6). Артылерыйскі парк гэтай фартэцыі па колькасным і якасным складзе быў роўны артылерыйскаму парку горада-фартэцыі Слуцка, а ў асобныя перыяды пераўзыходзіў яго. У 1619 г. у Біржах мелася 82 гарматы, а да 1623 г. іх колькасць павялічылася да 125, з якіх 105 былі прыдатныя да выкарыстання[412]. У 1625 г. замак быў захоплены шведамі, якія вывезлі з яго значную частку артылерыі. У рэестры 1627 г. занатавана, што пасля іх зыходу ў фартэцыі засталося 72 гарматы, з якіх 58 былі спраўнымі[413]. У далейшым намаганнямі К. Радзівіла артылерыйскі парк Біржанскага замка быў значна мадэрнізаваны: шмат старых гармат было адпраўлена на пераплаўку, а замест іх была выраблена новая артылерыя па галандскім узоры. У 1638 г. налічвалася 37 гармат[414]. Да сярэдзіны XVII ст. іх колькасць яшчэ ўзрасла: у 1655 г. у Біржах мелася 57 гармат (з іх 54 спраўныя), у 1659 г. – 67 (з іх 46 спраўных), у 1663 г. – 52 (з іх 49 спраўных)[415]. У другой палове XVII ст. памер артылерыйскага парка фартэцыі заставаўся стабільным: 1696 г. мелася 53 гарматы[416]. Да характарыстыкі біржанскага арсенала трэба

[412] AGAD. AR. Dz. XI. Sygn. 48. S. 5–15; Dz. XXVI. Sygn. 125; *Karvelis D.* Radvilų Biržų pilis ir jos arsenalas XVI–XVII a. // Karo archyvas. 2008. № 13. P. 63–68.

[413] AGAD. AR. Dz. XI. Sygn. 48. S. 5–15; А. Цеханавецкі піша пра 60 вывезеных шведамі гармат: *Ciechanowiecki A.* Z dziejów budowy zamku w Birżach // Kwartalnik architektury i urbanistyki. 1959. T. 4, z. 1/2. S. 44.

[414] *Karvelis D.* Radvilų Biržų pilis ir jos arsenalas XVI–XVII a. P. 70–71.

[415] НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 287; Спр. 301; AGAD. AR. Dz. VI. P. 36 i 37 / II–82. S. 372–377; Dz. XXVI. Sygn. 72, 75, 87, 88, 131; *Karvelis D.* Radvilų Biržų pilis ir jos arsenalas XVI–XVII a. P. 50. Я. Тышкевіч у сваёй працы пра Біржы прывёў звесткі аб тым, што ў 1665 г. у замку мелася 85 гармат, аднак, верагодна, у дадзеным выпадку мела месца памылка, і даследчыкам былі прыведзены даныя за больш ранні час. *Tyszkiewicz E.* Birże: rzut oka na przeszłość miasta, zamku i ordynacyi. St.-Petersburg, 1869. S. 55–56.

[416] AGAD. AR. Dz. XXVI. Sygn. 116.

Табліца 6. **Забеспячэнне артылерыяй і ручной агняпальнай зброяй Біржанскага замка**

Від	1619	1620	1623	1626	1627	1637	1638	1655	1659	1660	1663	1686	1696
Артылерыя													
Цяжкія	10	–	17	–	5	–	–	13	13 (10)	–	8	–	9
Лёгкія	53	–	95 (75)	–	59 (45)	–	–	38 (35)	42 (27)	–	32 (31)	–	30
Шротаўніцы	–	–	–	–	–	–	–	2	3 (2)	–	6	–	5
Марціры	–	–	1	–	–	–	–	–	6 (4)	–	3 (1)	4	4
Арганы	1 [6]	–	–	–	–	–	–	–	–	–		–	–
Іншыя	18	–	12	–	8	–	–	4	3	–	3	47	5
АГУЛАМ	**82**	**–**	**125 (105)**	**–**	**72 (58)**	**–**	**37**	**57 (54)**	**67 (46)**	**47**	**52 (49)**	**51**	**53**
Ручная агняпальная зброя													
Шмыгаўніцы	4	–	–	–	–	–	–	6 (4)	–	–	–	–	–
Гакаўніцы	275	–	275 (273)	–	274 (272)	> 1	217	154 (135)	155 (133)	–	161 (135)	–	169 (166)
Ручніцы	155 (147)	142 (120)	142 (120)	–	–	–	–	–	–	–	–	–	543 (535)
Мушкеты	224	669	720	120	120	473	649	552 (522)	135 (100)	–	249 (164) / 448 (363)	–	543 (535)
Штурмакі	6	–	–	–	–	–	–	–	–	–	–	–	–
Іншыя	9	–	–	–	–	–	–	–	–	–	–	–	7
АГУЛАМ	**673 (665)**	**≥ 824 (801)**	**1158 (1125)**	**> 120**	**394 (392)**	**> 474**	**866**	**712 (661)**	**290 (233)**	**–**	**410 (299) / 609 (498)**	**–**	**719 (707)**

НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 287; Спр. 301; AGAD. AR. Dz. VI. P. 36 і 37 / II–82. S. 372–377; Dz. XI. Sygn. 48. S. 5–15; Dz. XXVI. Sygn. 72, 75, 87, 88, 116, 131, 125; Karvelis D. Radvilų Biržų pilis ir jos arsenalas XVI–XVII a. P. 50, 63–68, 70–71.

дадаць тое, што ў ім мелася значная колькасць цяжкіх гармат, шротаўніц і марцір. Высілкі Радзівілаў па ўмацаванні ваеннага патэнцыялу Біржанскага замка тлумачыліся шэрагам фактараў. Па-першае, гэта была адна з галоўных рэзідэнцый гэтай галіны роду. Па-другое, яна размяшчалася на памежжы з Інфлянтамі, якія з другой паловы XVI ст. сталі арэнай шматлікіх войнаў. Па-трэцяе, многія прадстаўнікі біржанскай галіны Радзівілаў былі гетманамі і выкарыстоўвалі свой уласны замак у Біржах для падрыхтоўкі і забеспячэння ваенных кампаній у Інфлянтах.

Аб высокім ваенным патэнцыяле ўмацаваных рэзідэнцый Радзівілаў сведчыць параўнанне іх артылерыйскіх паркаў з іншымі прыватнаўласніцкімі і дзяржаўнымі фартэцыямі. Найбольш магутнымі ўмацаванымі рэзідэнцыямі роду Сапегаў на землях ВКЛ у XVII – пачатку XVIII ст. з'яўляліся бастыённы замак у Ляхавічах і горад-фартэцыя Быхаў. У 1658 г. артылерыйскі парк Ляхавіцкага замка складаўся з 31 гарматы, з якіх было ажно 18 цяжкіх[417]. У Быхаве ў 1655 г. мелася 30 гармат, у канцы XVII – пачатку XVIII ст. – 34–35 гармат, а ў 1707 г., калі фартэцыя была захоплена расійскімі войскамі, – 41 гармата[418]. Аднымі з найбольш магутных прыватных фартэцый на землях Польскага каралеўства былі замак у Дубне і горад Замосце. Як і галоўныя ўмацаваныя рэзідэнцыі Радзівілаў, гэтыя фартэцыі былі цэнтрамі асобных ардынацый. Вядома, што ў Дубне ў 1616 г. была 41 гармата, а ў 1674 г. – 42. У сваю чаргу, у Замосці ў 1607 г. было 20 гармат, а ў 1691 г. – 56. Красамоўнымі з'яўляюцца таксама прыклады арсеналаў дзвюх дзяржаўных фартэцый. У Камянцы-Падольскім, які фактычна з'яўляўся галоўнай фартэцыяй Рэчы Паспалітай на мяжы з Асманскай імперыяй, у 1703 г. было 76 гармат, у 1710 г. – 88, а ў 1713 г. – 121[419]. У Пскове, які ў 1581 г. паспяхова адбіў штурмы вялікага войска Рэчы Паспалітай на чале са Стэфанам Баторыем, у 1633 г. было 85 гармат, а ў 1683 г. – 157 гармат[420]. У Смаленску, які на працягу 1609–1611 гг. стрымліваў пад сваімі мурамі армію Рэчы Паспалітай, было, паводле звестак ваяводы Міхаіла Шэіна, каля 100 гармат і 170 гакаўніц[421]. А ў Салавецкім манастыры напачатку паўстання 1668 г., калі манахі паднялі ўзброе-

[417] Собрание государственных и частных актов, касающихся истории Литвы и соединенных с ней владений (от 1387 до 1710 г.). Ч. 1. С. 116–118; *Sawicki M.* Artyleria i cekhauz twierdzy Lachowicze w 1658 roku. C. 191–201.

[418] Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией. Стб. 715–716; *Бутурлин Д. П.* Военная история походов россиян в XVIII столетии. СПб., 1820. С. 127; *Савіцкі М.* Артылерыя, замак і цэйхгаўз у крэпасці Стары Быхаў у 1692–1707 г. Ч. 1, т. 2. С. 45–74.

[419] *Szlezynger P. S.* Inwentarze cekhauzów i armaty zamkowej z XVII i XVIII wieku w magnackich fortecach w Wiśniczu, Połonnem, Dubnem i Żółkwi. S. 296–297, 306.

[420] *Михайлов А. А.* Артиллерия Псковской крепости в XVII в. Состав и размещение орудийного парка // Новые материалы по истории фортификации / сост. и ред.: И. М. Гостев. Архангельск, 2012. С. 133–134, 139.

[421] *Молочников А. М.* Смоленская артиллерия в 1609 г. // Война и оружие. Новые материалы и исследования. СПб., 2017. Ч. 3. С. 308.

нае паўстанне супраць царкоўнай рэформы патрыярха Нікана, налічвалася 90 гармат і 1000 стрэльбаў[422].

Прыведзеныя вышэй лічбы дазваляюць сцвярджаць, што ў XVII – пачатку XVIII ст. галоўныя рэзідэнцыі Радзівілаў на беларускіх землях былі вельмі добра забяспечаны артылерыяй. У бастыённым замку ў Нясвіжы было ад 30 да 50 гармат, а ў горадзе-фартэцыі Слуцку – ад 40 да 60. Такая колькасць артылерыі адпавядала ідэям тэарэтыкаў артылерыі і фартыфікацыі таго часу. Паводле вядомага тэарэтыка артылерыі другой паловы XVI – пачатку XVII ст. Дыега Уфана, для абароны горада было патрэбна 60 гармат. Вядомы тэарэтык фартыфікацыі першай паловы XVII ст. Адам Фрэйтаг лічыў, што на кожным бастыёне ўмацавання павінна было быць не менш за 3–4 гарматы. А картограф і тэарэтык фартыфікацыі Юзэф Нарановіч-Наронскі сцвярджаў, што для абароны чатырохбастыённага ўмацавання было неабходна 16 гармат[423].

Бастыённыя замкі ў Нясвіжы і Алыцы мелі падобныя па колькасным і якасным складзе артылерыйскія паркі. У сваю чаргу, Біржанскі замак быў значна лепш забяспечаны артылерыяй. Па яе патэнцыяле ён адпавядаў арсеналу горада-фартэцыі Слуцка. Пры гэтым варта адзначыць, што фартэцыі ў Біржах і Слуцку належалі біржанскай галіне Радзівілаў, а замкі ў Алыцы і Нясвіжы – нясвіжскай галіне. Таму значныя артылерыйскія паркі ў Біржах і Слуцку таксама сведчаць пра вялікую ўвагу біржанскіх Радзівілаў да праблемы забеспячэння баяздольнасці сваіх фартэцый, а больш сціплыя арсеналы замкаў у Нясвіжы і Алыцы – пра меншую зацікаўленасць нясвіжскіх Радзівілаў у гэтым пытанні. Гэта тлумачыць той факт, што для біржанскіх Радзівілаў пасада гетмана была фактычна спадчыннай. З 1531 да 1655 г. з 9 гетманаў вялікіх 5 былі Радзівіламі біржанскай галіны[424]. Праз будаўніцтва і ўтрыманне магутных фартэцый яны, з аднаго боку, у вачах шляхецкага грамадства пацвярджалі сваё права на вышэйшы вайсковы ўрад у дзяржаве, а з іншага – мелі ўласныя рэсурсы для забеспячэння і вядзення ваенных кампаній, што ва ўмовах Рэчы Паспалітай было важна.

4.2. Ручная агняпальная зброя

З XV ст. тыповай зброяй для абароны ўмацаванняў сталі гакаўніцы, ці цяжкія стрэльбы з круком (гакам) у пачатку ствала. Яны маюць прамежкавы статус, знаходзячыся паміж артылерыяй і ручной агняпальнай зброяй.

[422] *Иванюк С. А.* «Всякия крепости ведает»: майор Степан Келен во время осады Соловецкого монастыря (1672–1676) // Новые материалы по истории фортификации // сост. и ред. И. М. Гостев. Архангельск, 2016. Вып. 2. С. 219.

[423] *Nowak T. M.* Przegląd polskiego piśmiennictwa z dziedziny artylerii do połowy XVII w. // SMHW. 1958. T. 4. S. 268–269; *Szlezynger P. S.* Inwentarze cekhauzów i armaty zamkowej z XVII i XVIII wieku w magnackich fortecach w Wiśniczu, Połonnem, Dubnem i Żółkwi. S. 305.

[424] *Rachuba A.* Czy każdy Radziwiłł musiał być hetmanem? // Biblioteka epoki nowożytnej 5 II/2016: Hortus bellicus. Studia z dziejów wojskowości nowożytnej. Studia ofiarowane Profesorowi Mirosławowi Nagielskiemu / red. K. Bobiatyński. Warszawa, 2017. S. 136–137.

З-за істотнай вагі ствалоў і моцнай аддачы пры выстрале з іх было магчыма страляць толькі маючы трывалую апору (край бруствера, драўляную трыногу). Гэта дазваляла павялічыць зарад пораху, а значыцца, сілу і эфектыўную далёкасць стрэлу, якая складала каля 100 м[425]. Таму нават пры нізкай хуткастрэльнасці такая зброя лічылася вельмі эфектыўнай пры абароне. Удасканаленне тэхналогіі вытворчасці ствала, а таксама вынаходніцтва кнотавага замка ў другой палове XV ст. далі штуршок для шырокага распаўсюджання гакаўніц. У XV–XVI стст. яны фактычна меліся ў кожным замку і да першай чвэрці XVII ст. заставаліся адным з асноўных відаў агняпальнай зброі, які выкарыстоўвалі для абароны ўмацаванняў. Вядома, што ў 1551–1566 гг. з Вільні ў памежныя замкі было разаслана 3087 гакаўніц[426]. Нягледзячы на значную эвалюцыю ручной агняпальнай зброі, вялікая колькасць гакаўніц захоўвалася ў беларускіх замках і фартэцыях да пачатку XVIII ст., пакуль у час Вялікай Паўночнай вайны яны не былі знішчаны.

Гакаўніцы прайшлі даволі доўгі шлях эвалюцыі, у выніку чаго быў створаны шэраг варыянтаў гэтых стрэльбаў. Адным з самых ранніх відаў ручной агняпальнай зброі быў так званы *кій*. Ён меў кароткі ствол з шыпам для мацавання да простага ложа ў выглядзе кія[427]. Такія ложы мелі і найбольш ранніх гакаўніцы. Напрыклад, у Магільнянскім замку ў 1536 г. было 4 гакаўніцы ў ложах і 5 гакаўніц на кіях[428]. Ажно 114 гакаўніц трох відаў меліся ў Мірскім замку ў 1636 г.: 56 гакаўніц і 8 гакаўнічных ствалоў; 20 меншых гакаўніц, ці пулгакаў, і 15 паўгакаўнічных ствалоў; 15 так званых *кабыл,* альбо *старасвецкіх пулгакаў*[429]. Пулгакі былі больш лёгкай мадыфікацыяй гакаўніц. Блізкія па калібры, яны мелі значна меншую даўжыню ствала. У 1626 і 1636 гг. у Нясвіжскім замку захоўвалася 11 пулгакаў з так званымі *губчастымі* (мадыфікацыя кнотавага замка) і 15 з колавымі замкамі[430]. Колавыя замкі сведчылі аб «элітарнасці» зброі. Стрэльбы простых жаўнераў у XVII ст., як правіла, мелі простыя і танныя кнотавыя замкі, у той час як стрэльбы з колавымі замкамі прызначаліся для афіцэраў. Паводле інвентара Нясвіжскага замка 1656 г., гакаўніцы гэтай фартэцыі былі аднесены да так званых *падвойных гакаўніц* (ням. *Dopelhaken*), а паўгакаўніцы – да малых гакаўніц (ням. *kleine Haken*)[431]. Кабылы, якія згадваліся ў Мірскім замку ў 1636 г., верагодна, адрозніваліся ад гакаўніц адсутнасцю кнотавага замка і больш простым ложам, якое мацавалася ў задняй частцы ствала. Да звышцяжкіх гакаўніц залічваліся так званыя *шмыгаўніцы*, якія ў нямецкамоўных крыніцах таксама называліся «доўгімі

[425] *Szymczak J.* Początki broni palnej w Polsce: (1383–1533). S. 303.

[426] BCzart. Rkps. 1814.

[427] *Бохан Ю. М.* Узбраенне войска ВКЛ другой паловы XIV – канца XVI ст. С. 197–198.

[428] *Mikulski W., Zawadzki J.* Opisy zamków białoruskich z inwentarzy dóbr przechowywanych w Archiwum Radziwiłłów w Archiwum Głównym Akt Dawnych. S. 54.

[429] AGAD. AR. Dz. XXVI. Sygn. 51. S. 1–2.

[430] Ibidem. Sygn. 52; *Bernatowicz T.* Monumenta variis Radivillorum: wyposażenie zamku nieświeckiego w świetle źródeł archiwalnych. S. 37.

[431] AGAD. AR. Dz. XI. Sygn. 48. S. 72–75.

сценавымі гакаўніцамі» (ням. *lange Wandehacken*)[432]. У Слуцку ў XVII ст. было 9 такіх стрэльбаў. Аб разнастайнасці гакаўніц у радзівілаўскіх фартэцыях сведчаць і археалагічныя знаходкі. У Нясвіжы было знойдзена больш за дзесяць ствалоў ад гакаўніц і фрагментаў ад іх (мал. 39)[433]. Таксама два васьмігранныя гакаўнічныя ствалы захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь: адзін паходзіць з Нясвіжа, а другі са збораў баранавіцкага краязнаўчага музея, а, найверагодней, таксама з Нясвіжа. Калібр усіх гакаўніц складае 20 мм, аднак яны маюць розныя габарыты і падзяляюцца па форме ствала на васьмігранныя і круглыя[434].

Адным з найбольш архаічных відаў ручной агняпальнай зброі былі ручніцы. Асноўным адрозненнем гэтых стрэльбаў ад гакаўніц былі меншыя калібр і вага, што рабіла магчымым стральбу з рукі. Аднак пры тагачаснай тэхніцы вытворчасці гэта прыводзіла да змяншэння сілы стрэлу, таму з ручніцы нельга было прабіць моцны даспех. Па гэтай прычыне яны не маглі замяніць цяжкія гакаўніцамі пры абароне ўмацаванняў. Спецыфічнай мадыфікацыяй ручніц былі аркебузы, якія мелі калібр каля 10 мм[435]. Яны з'явіліся ў Германіі ў пачатку XVI ст., былі лягчэйшыя за гакаўніцы і больш трывалыя і моцныя за ручніцы.



Мал. 39. Ствалы гакаўніц, знойдзеныя ў рове Нясвіжскага замка

[432] AGAD. AR. Dz. VII. Sygn. 641. S. 8.
[433] *Мяцельскі А. А.* Знаходкі агнястрэльнай зброі ў Нясвіжскім замку. С. 43–44.
[434] *Волкаў М.* Артылерыя Нясвіжскага замка. С. 64–67.
[435] *Бохан Ю. М.* Узбраенне войска ВКЛ другой паловы XIV – канца XVI ст. С. 203.

Гэта давала магчымасць павялічыць зарад, сілу і далёкасць стрэлу, якая складала каля 120–130 м. У першай палове таго ж стагоддзя яны трапілі ў Польшчу і ў ВКЛ, аднак доўгі час заставаліся дарагой і маладаступнай зброяй[436]. Аб элітарнасці гэтых стрэльбаў сведчыць наступны прыклад. Паводле інвентароў 1657–1658 гг., у Нясвіжскім замку меліся 3 аркебузы, ложы якіх былі ўпрыгожаны косцю. Верагодна, да аркебузы адносіцца стрэльба з колавым замком, знакам Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі і датай «1615» на ствале, якая захоўваецца ў музеі Каралеўскага замка на Вавелі ў Кракаве[437].

З пачатку XVII ст. у ВКЛ з'явіліся мушкеты, які неўзабаве выцеснілі ўсе іншыя віды ручной агняпальнай зброі. Мушкет, як цяжкая стрэльба калібрам каля 20 мм, быў сканструяваны каля 1560 г.[438] За кошт удасканалення вытворчасці ствала і выкарыстання пры стральбе спецыяльнай падпоркі-фаркету ўдалося вынайсці зброю, якая пераўзыходзіла па магутнасці і зручнасці ранейшыя стрэльбы. Далёкасць стрэлу іспанскага мушкета складала каля 150–180 м. У XVII ст., паводле тэарэтыкаў старагаландскай фартыфікацыйнай школы, далёкасць стрэлу з мушкета, якая з'яўлялася модулем для праектавання фартыфікацый, складала 60 рэйнскіх прутоў (220 м).

Аналіз забяспечанасці рэзідэнцый Радзівілаў ручной агняпальнай зброяй дазваляе зрабіць пэўныя высновы аб іх баяздольнасці. У замку ў Пячкоўскім Гарадку ў канцы XVI ст. налічвалася 39 гакаўніц і 10 губчастых ручніц[439]. Гэтым узбраеннем рэзідэнцыю маглі прынамсі часткова забяспечыць Радзівілы яшчэ ў першай чвэрці XVI ст., калі яна паўстала. Пра колькасны склад узбраення ў гэты час можна меркаваць на падставе арсеналаў замкаў, якія перайшлі ў валоданне Радзівілаў пазней. У 1536 г. у Магільнянскім замку налічвалася 14 стрэльбаў: 4 гакаўніцы ў ложах, 5 гакаўніц на кіях і 5 ручніц[440]. Вельмі сціплы запас ручной агняпальнай зброі ў сярэдзіне XVI ст. захоўваўся ў замку ў Глуску, дзе мелася ўсяго 5 стрэльбаў[441]. Вялікі арсенал у сярэдзіне XVI ст. быў у Свіслацкім замку. У 1560 г. у ім было 22 гакаўніцы, 3 ручніцы і 7 аркебузаў[442]. Але ў хуткім часе ў сувязі з разгортваннем Інфлянцкай вайны ён быў папоўнены: у 1562 г. з віленскага арсенала ў Свіслачы былі высланы 10 гакаўніц і 30 ручніц[443]. Такім чынам, на ўзбраенні Свіслацкага замка ў сярэдзіне XVI ст. меліся 72 стрэльбы.

---

[436] *Nowak T. M.* Polska technika wojskowa w latach 1500–1655. S. 126, 137.

[437] *Petrus J. T.* Strzelba z roku 1615 w zbiorach wawelskich // Studia do Dziejów Wawelu. 1991. T. 5. S. 450–468.

[438] *Gradowski M., Żygulski Z.* Słownik uzbrojenia historycznego. Warszawa, 2000. S. 96.

[439] *Zawadzki J.* Siedziby Kiszków i Radziwiłłów na Białorusi w XVI–XVIII wieku: opisy z zasobu Archiwum Głównego Akt Dawnych. S. 26.

[440] *Mikulski W., Zawadzki J.* Opisy zamków białoruskich z inwentarzy dóbr przechowywanych w Archiwum Radziwiłłów w Archiwum Głównym Akt Dawnych. S. 54.

[441] Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. С. 39.

[442] *Даўгяла Зьм. Ів.* Сьвіслацкі замак у 1560 г. С. 60–64.

[443] BCzart. Rkps. 1814. S. 51.

Добра быў забяспечаны ручной агняпальнай зброяй Клецкі замак (гл. табл. 1). У 1558 г. у ім было 25 гакаўніц, 31 ручніца і 24 аркебузы, а ў 1626 г. – 72 гакаўніцы і 22 ручніцы. Значны запас агняпальнай зброі ў Клецку захоўваўся да пачатку вайны 1654–1667 гг., калі ўмацаванне было цалкам знішчана. Аднак пры гэтым яго асартымент не абнаўляўся, у прыватнасці, не з'явіліся мушкеты. У Давыд-Гарадку ў 1605 г. мелася 20 гакаўніц і 7 губчастых і 8 кнотавых ручніц. Пасля заканчэння войнаў сярэдзіны XVII ст. Давыд-Гарадоцкі замак быў яшчэ на некаторы час прыстасаваны да абароны, а яго арсенал папоўніўся 20 гакаўніцамі[444]. У другой палове XVII ст. значны запас гакаўніц захоўваўся ў Капыскім замку. У 1670 г. там было 22 гакаўніцы, 4 мушкеты, а ў 1690 – 22 гакаўніцы[445]. Адсутнасць ці малая колькасць мушкетаў у Клецку, Давыд-Гарадку і Копысі сведчыць аб меншай увазе іх уладальнікаў да гэтых фартэцый і зніжэнні іх абароназдольнасці.

З другарадных рэзідэнцый найбольшая колькасць гакаўніц была ў Мірскім замку (гл. табл. 4). Як згадвалася вышэй, у 1636 г. у ім было ажно 114 гакаўніц розных тыпаў. Вядома, што ў другой палове 1655 г. з Нясвіжа ў Мір было выслана 10 гакаўніц і 400 гакаўнічных куль. У Нясвіжскім замку на той час засталося больш за 200 гакаўніц і толькі 600 куль[446]. З гэтага можна зрабіць высновы, што Мірскі замак лічыўся больш прыдатным для выкарыстання гакаўніц, чым нясвіжская фартэцыя. Разам з тым у час вайны 1654–1660 гг. у Мір была прывезена значная колькасць мушкетаў, што палепшыла абароназдольнасць замка.

Найбольшыя запасы стрэльбаў меліся ў Нясвіжы і Слуцку. Узведзены на мяжы XVI–XVII стст. Нясвіжскі бастыённы замак быў забяспечаны значным арсеналам гакаўніц (гл. табл. 2). Паводле першага вядомага інвентара замка, датаванага 1626 г., у яго арсенале было 105 спраўных гакаўніц. Вельмі істотна колькасць гакаўніц узрасла ў час вайны 1654–1667 гг. за кошт стрэльбаў, прывезеных з іншых замкаў. Напрыклад, з Клецку ў 1655 г. было прывезена 50 гакаўніц[447]. Аднак трэба ўлічваць, што перадача гакаўніц у Нясвіжскі замак была выклікана не столькі імкненнем да яго ўмацавання, колькі жаданнем захаваць гэтую зброю ад рабавання ў выпадку захопу слабых замкаў. На той час асноўнай зброяй абаронцаў Нясвіжскага замка ўжо былі мушкеты, на што ўказвае некалькі фактаў. Так, у час казацкага нападу на замак у 1657 г., як сведчаць інвентары, жаўнерам была раздадзена 1 барыла пораху і 420 мушкетных куль[448]. Хаця гакаўніцы і саступалі па зручнасці мушкетам, іх не спяшаліся спісваць з рахункаў да канца XVII ст. Вядома, што паміж 1681 і 1693 г. 124 нясвіжскія гакаўніцы атрымалі новыя ложы. А ў 1706 г. шведы палічылі патрэбным гэтую зброю паламаць і патапіць у рове, каб пазней яе нельга бы-

[444] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 1913. Арк. 194 адв. М. Ткачоў піша пра 80 гакаўніц, што, верагодна, з'яўляецца вынікам памылковага прачытання крыніцы: *Ткачоў М. А.* Замкі і людзі. С. 43–46.

[445] *Ткачоў М. А.* Замкі і людзі. С. 62.

[446] AGAD. AR. Dz. XI. Sygn. 48. S. 72–75.

[447] Ibidem.

[448] Ibidem. Dz. XXVI. Sygn. 81, 768.

ло выкарыстоўваць. Фактычна тады быў знішчаны ўвесь арсенал гакаўніц Нясвіжскага замка.

Найбольш арахічным відам агняпальнай зброі, які згадваецца ў Нясвіжскім арсенале ў XVII ст., былі г. зв. *старыя самапалы*. Яны трапілі ў Нясвіжскі замак у час вайны 1654–1667 гг. з іншых замкаў і былі на той час ужо не столькі ўзбраеннем, колькі сыравінай, якую пры неабходнасці пускалі на рамонт іншай зброі.

У першай палове XVII ст. у нясвіжскім арсенале меліся ўсяго 33 мушкеты. І хаця ў параўнанні з гакаўніцамі іх колькасць была нязначнай, на той час мушкетамі ўжо была ўзброена большасць прыватных вайсковых аддзелаў Радзівілаў. Іх колькасць у арсенале ўзрасла пасля вайны 1654–1667 гг.: у 1681 г. мушкетаў было 138, а ў 1693 г. – 96.

Спецыфічнай зброяй, якая ў XVII ст. захоўвалася ў нясвіжскім арсенале, былі штурмакі. Яны мелі адносна кароткія пашыраныя наперадзе ствалы. Гэта дазваляла зараджаць іх кулямі або шротам і выкарыстоўваць для стральбы на блізкую адлегласць, напрыклад у час штурму. На працягу 1626–1636 гг. у Нясвіжскім замку меліся 23 штурмакі. Паводле інвентароў 1681 і 1693 гг., да іх дадаліся яшчэ 3 кароткіх штурмакі. Па 6 штурмакоў мелася ў першай палове – сярэдзіне XVII ст. у Біржах і Алыцы. Пры гэтым у інвентары Алыцкага замка 1653 г. яны названы шротаўніцамі, што сведчыць аб спецыфіцы іх выкарыстання[449].

Запас ручной агняпальнай зброі ў Слуцку быў нашмат большы, чым у Нясвіжы (гл. табл. 3). Слуцк быў адметны тым, што ў ім вельмі рана з'явілася значная колькасць мушкетаў. Ужо ў 1620 г. на 133 гакаўніцы ў Слуцку было 233 мушкеты. А ў час вайны 1654–1667 гг. іх колькасць узрасла да 684. Тады ж у Слуцку ўжо ў сярэдзіне XVII ст. з'явіліся карабіны, якія былі больш дасканалымі за мушкеты. У 1662 г. карабінаў было 28, а ў 1686 г. – 93. Ступень забяспечанасці слуцкага арсенала новымі відамі стрэльбаў сведчыць аб імкненні яго ўласнікаў – Радзівілаў біржанскай лініі – да мадэрнізацыі ўзбраення сваёй фартэцыі і павелічэння яе абароназдольнасці. Агулам у Слуцку ў сярэдзіне XVII – пачатку XVIII ст. захоўвалася каля 600–900 стрэльбаў.

Падобныя да Слуцка запасы ручной агняпальнай зброі меліся ў гэты час у магутным Біржанскім замку (гл. табл. 6). Ужо ў 1619 г. у яго арсенале налічвалася 673 стрэльбы, з іх 275 гакаўніц і 224 мушкеты, а ў 1623 г. іх агульная колькасць узрасла да 1158, з якіх мушкетаў было ажно 720. Апошняе тлумачыцца вялікай небяспекай для замка з боку шведаў, якія дзейнічалі ў Інфлянтах, а таксама актыўным выкарыстаннем біржанскага арсенала для забеспячэння войска ВКЛ. У 1625 г. фартэцыю здабылі шведы, у выніку чаго яе арсенал быў значна спустошаны. Аднак у хуткім часе запасы ручной агняпальнай зброі былі адноўлены і ў сярэдзіне – другой палове XVII ст. дасягалі 800 адзінак. Ступень забяспечанасці слуцкага і біржанскага арсеналаў стрэльбамі, у тым ліку новымі тыпамі (мушкетамі і карабінамі), сведчыць аб

[449] Інвентарі Олицького замку XVII–XVIII століть : зб. док. С. 49–51.

імкненні іх уласнікаў, Радзівілаў біржанскай лініі, да мадэрнізацыі ўзбраення сваіх фартэцыі і павелічэння іх абароназдольнасці.

Даволі сціплыя запасы меліся ў Алыцкім замку, дзе ў сярэдзіне – другой палове XVII ст. мелася 40–50 стрэльбаў (гл. табл. 5). Паводле гэтага крытэрыя, ён быў нашмат слабейшы за замак у Нясвіжы, дзе было больш за 300 баяздольных стрэльбаў. Пры гэтым у Ляхавіцкім замку, які ў 1660 г. вытрымаў жорсткую аблогу маскоўскага войска, у 1658 г. было ўсяго 88 стрэльбаў[450]. Гэты прыклад сведчыць, што колькасць ручной агняпальнай зброі не можа сведчыць напрамую аб абароназдольнасці фартэцыі, бо ваенныя падраздзяленні, якія наймаліся для абароны фартэцый, мелі сваю зброю. Значная колькасць ручной агняпальнай зброі, назапашанай у фартэцыях, прызначалася для забеспячэння жаўнераў, якія набіраліся ў гэтым рэгіёне. Напрыклад, у 1620 г. у Слуцку 83 мушкеты былі ў выбранцаў, а ў 1686 г. 300 мушкетаў былі раздадзены выбранцам і мяшчанам. Падобна, як Слуцк, базай для забеспячэння прыватнаўласніцкіх аддзелаў быў замак у Дубне, дзе ў 1616 г. мелася 721 стрэльба[451].

4.3. Боепрыпасы

Акрамя ўласна ўзбраення аб ступені падрыхтоўкі ўмацаванняў да абароны сведчаць запасы боепрыпасаў. Пры гэтым ключавым рэсурсам з'яўляўся парах (табл. 7). Калі пораху было мала, у выніку недагляду ён псаваўся, альбо ворагу ўдавалася з дапамогай дыверсіі ці бамбардавання знішчыць усе запасы, абаронцам не заставалася нічога іншага, як капітуляваць. Спадзявацца на вядзенне паспяховай абароны без пораху не выпадала. Таму ў важнейшых фартэцыях Радзівілаў – у Нясвіжы і Слуцку – для яго захоўвання былі ўзведзены спецыяльныя мураваныя парахоўні. У Нясвіжскім замку сховішча для гэтага выбуханебяспечнага рэчыва адмыслова пабудавалі каля брамы, гэта значыць далей ад жылых будынкаў. Пры гэтым значная частка парахоўні была схавана ў земляным вале, што абараняла яе на выпадак артылерыйскага абстрэлу. З боку дзядзінца меліся жалезныя дзверы і трое вокнаў для вентыляцыі паветра. У 1657 г. ва ўмовах ваеннай небяспекі парахоўня Нясвіжскага замка была цалкам замуравана[452]. У Слуцку порах першапачаткова захоўвалі ў мураваным скарбцы на Верхнім замку. У сярэдзіне XVII ст. пасля ўзвядзення новай бастыённай цытадэлі ўвесь ваенны рыштунак, у тым ліку порах, перанеслі туды. Для яго захавання ў адным з бастыёнаў цытадэлі збудавалі адмысловую парахоўню. Гэта быў будынак памерам 16,5 × 12,25 локцяў (10,7 × 8 м) і вышынёй 3 локці (1,9 м). У розны час ён быў накрыты драніцамі ці гонтай. Неабходнасць захавання пораху нават ва ўмовах варожага абстрэлу ці бамбар-

[450] Собрание государственных и частных актов, касающихся истории Литвы и соединенных с ней владений (от 1387 до 1710 г.). Ч. 1. С. 116–118.

[451] *Szlezynger P. S.* Inwentarze cekhauzów i armaty zamkowej z XVII i XVIII wieku w magnackich fortecach w Wiśniczu, Połonnem, Dubnem i Żółkwi. S. 296.

[452] AGAD. AR. Dz. XXVI. Sygn. 81.

давання абумовіла наяўнасць скляпенняў і муроў таўшчынёй 2 локці (1,3 м). На ўваходзе ў будынак былі павешаны акаваныя дзверы, за якімі знаходзіліся яшчэ адны – дубовыя. У сценах меліся тры большыя і адно меншае вакенцы, закрытыя кратамі і прызначаныя для вентыляцыі памяшкання[453].

Порах, як правіла, захоўвалі ў барылах – спецыяльных бочках невялікіх памераў. Яны былі розных памераў, аднак на падставе інвентароў арсенала Нясвіжскага замка можна вызначыць іх сярэдні памер. Так, паводле інвентара 1656 г., у 31 барыле змяшчалася 3336 нюрнберскіх фунтаў пораху (1700 кг), ці каля 108 нюрнберскіх фунтаў (55 кг) у кожнай, а паводле інвентара 1681 г., у 12 бочках змяшчалася 1563 літоўскіх фунтаў[454] пораху, ці каля 130 літоўскіх фунтаў (49 кг) у кожнай. Паводле інвентара 1693 г., у 26 барылах, з якіх адна была няпоўнай, змяшчалася 3836 літоўскіх фунтаў (1438 кг) пораху, ці каля 150 літоўскіх фунтаў у кожнай (56 кг). Такім чынам, у XVII ст. у сярэднім у адну барылу змяшчалася 130–150 літоўскіх фунтаў (49–56 кг) пораху. Адносна невялікая вага барылаў рабіла зручным іх перамяшчэнне. Для параўнання, салетру, якая ішла на выраб пораху, захоўвалі ў значна большых бочках, куды змяшчалася па 640–770 літоўскіх фунтаў (240–289 кг). У інвентарах асобных фартэцый згадваюцца таксама невялікія бочкі. Але, як можна меркаваць па інвентары Біржанскага замка 1663 г., па вазе яны адпавядалі барылам. Асобна варта згадаць Алыцкі замак, у якім порах у сярэдзіне – другой палове XVII ст. захоўвалі ў вялікіх бочках па 130–160 кг.

Для забеспячэння доступу да пораху ў выпадку пільнай неабходнасці некалькі бочак знаходзіліся па-за парахоўняй, у розных месцах фартэцыі. Напрыклад, у 1657 г. у парахоўні Нясвіжскага замка захоўвалася 31 барыла пораху, у той час як у лёхах пад палацам меліся па 2 няпоўныя бочкі і барылы, а ў галерэі ля цэйхгаўза – яшчэ 2 поўныя барылы і 2 няпоўныя бочкі. Такім чынам, нават падчас вайны па-за межамі парахоўні знаходзілася не больш за 1/5 частку ўсяго пораху, які меўся ў фартэцыі.

Звесткі з інвентароў дазваляюць вызначыць аб'ёмы пораху, які захоўваўся ў Нясвіжы і Слуцку ў XVII ст. Для забеспячэння абароназдольнасці Нясвіжскага замка дастатковым лічылася мець 20–30 барылаў (каля 1000–1500 кг). Найбольшая колькасць пораху была назапашана ў час вайны 1654–1667 гг., у прыватнасці, на пачатку 1656 г. у парахоўні захоўвалася 31 барыла вагою 1700 кг. Акрамя таго, у замку быў пакінуты порах, які належаў артылерыі ВКЛ, а менавіта 60 барылаў (каля 3150 кг). У фартэцыі іх пакінула войска, якое адступала на захад пасля няўдалай аблогі Магілёва. Прыблізна такая ж колькасць пораху мелася ў Алыцкім замку. У 1653 г. у ім было каля 1500 кг пораху. У другой палове XVII ст. колькасць яго зменшылася, аднак напярэдадні Вялікай Паўночнай вайны, у 1698 г., яго запасы былі павялічаны і склалі 1200 кг. Значна больш пораху захоўвалася ў Слуцку: у 1620 г. там было яго каля 1900 кг, у 1666 г. – каля 3700 кг, а на пачатку Вялікай Паўночнай вайны

[453] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 7527. Арк. 1145 адв.

[454] Літоўскі фунт складаў 0,3748 кг.

Табліца 7. **Забеспячэнне рэзідэнцый Радзівілаў порахам**

Рэзідэнцыя	1619	1620	1623	1626	1627	1636	1650	1653	1655	1656	1657	1663	1666	1681	1686	1692	1693	1696	1698	1701
Алыка	–	–	–	–	–	–	–	1,5 т		–	–	–	–	0,8 т	0,4 т	0,1 т	–	–	1,2 т	–
Біржы	> 2,1 т	–	3,1 т		1,8 т	–	–	–	3,7 / 4,3 т	–	–	2,1 т	–	–	–	–	–	3,7 т	–	–
Нясвіж	–	–	–	1,4 т	–	> 1,3 т	> 0,6 т	–	–	1,6 т, + 3,1 т [арт. ВКЛ]	> 1,6 т	–	–	0,7 т	–	–	1,4 т	–	–	–
Слуцк	–	1,9 т	–	–	–	–	–	–	–	–	–	–	3,7 т	–	–	–	–	–	–	9 т

AGAD. AR. Dz. II. Supl. Sygn. 716; Dz. V. № 6865/I. S. 133–134; Dz. VII. Sygn. 641. S. 1–2; Dz. XI. Sygn. 48. S. 5–15, 72–75; Dz. XXVI. Sygn. 52, 72, 75, 80, 81, 88, 103, 112, 116, 759, 768, 773; Bernatowicz T. Monumenta variis Radivillorum: wyposażenie zamku nieświeckiego w świetle źródeł archiwalnych. S. 37, 43; Karvelis D. Radvilų Biržų pilis ir jos arsenalas XVI–XVII a. P. 63–68; Інвентарі Олицького замку XVII–XVIII століть. С. 49–51, 62–65, 75–82.

яго запасы дасягнулі 9000 кг. Вялікія запасы меліся ў магутным Біржанскім замку, у якім у XVII ст. было засяроджана ад 1700 да 4300 кг пораху. Для параўнання, у Ляхавіцкім замку ў 1658 г. знаходзілася 5915 літоўскіх фунтаў (2217 кг) пораху. Пры гэтым у згаданай фартэцыі ў 1660 г. вытрымала цяжкую аблогу з некалькімі штурмамі, гэта значыць такой колькасці пораху хапіла для паспяховай абароны. Разам з тым трэба адзначыць, што па колькасці выбухоўкі радзівілаўскія фартэцыі саступалі галоўным дзяржаўным фартэцыям. Так, у Смаленску ў 1649 г. было 480–580 літоўскіх цэнтнераў пораху (21 600–26 100 кг)[455]. Для параўнання, у магутным Салавецкім манастыры ў 1668 г. захоўвалася 900 пудоў пораху (каля 14 700 кг)[456]. Вельмі мала пораху мелася ў другарадных рэзідэнцыях Радзівілаў, якія не былі разлічаны на доўгатрывалую абарону. Напрыклад, у Міры ў 1636 г. – усяго паўтары бочкі.

Порах для забеспячэння фартэцый закуплялі ў гатовым выглядзе альбо выраблялі на месцы з неабходных кампанентаў. Але апошнія збольшага даводзілася таксама завозіць. Для вырабу пораху закупляліся неабходныя кампаненты (салетра, сера і вугаль), якія затым перадаваліся салетарніку ці парахоўніку, як называлі рамеснікаў, што выраблялі порах. Так, у 1658 г. з нясвіжскага арсенала 86 фунтаў серы былі перададзены ляснічаму Габрыэлю для вырабу пораху[457]. Верагодна, ён таксама атрымаў адпаведную колькасць салетры, а вугаль ён павінен быў вырабіць сам. Часта вытворчасць пораху даручалася пушкарам, якія служылі ў замку. Для гэтага ў цэйхгаўзе захоўваліся спецыяльныя прылады: бронзавыя і жалезныя ступы для перацірання рэчываў, латунныя шалі для ўзважвання і дакладнай вытрымкі прапорцый. Вытворчасць пораху ў вялікіх аб'ёмах адбывалася на так званых *парахавых млынах*. Салетру, якая была асноўным складнікам пораху, як правіла, прывозілі з Украіны. Так, у 1681 г. у Нясвіжскім замку, апрача 1962 фунтаў пораху, знаходзілася 1600 фунтаў салетры, прывезенай з Алыкі. З такой колькасці можна было вырабіць больш за 2100 фунтаў пораху.

Асноўным відам боепрыпасаў для артылерыі ў разгляданы перыяд былі гарматныя ядры (табл. 8). Большасць гармат страляла літымі жалезнымі альбо чыгуннымі ядрамі, якія спецыяльна закупляліся для арсеналаў фартэцый. Радзей выкарыстоўваліся свінцовыя ядры ці жалезныя аблітыя свінцом, з-за дарагавізны гэтага металу. Свінец мае ніжэйшую тэмпературу плаўлення, чым жалеза, што робіць працэс адлівання ядраў з яго прасцейшым. Аднак свінец мае і шэраг істотных мінусаў: па-першае, ён больш мяккі за жалеза, а па-другое – нашмат даражэйшы. У інвентарах Нясвіжскага замка 1626 і 1636 гг. згадваецца аб васьмі бронзавых формах, а ў інвентарах 1657, 1658 і 1681 гг. фігуруюць шэсць бронзавых форм з жалезнымі рукаяцямі для ліц-

[455] 1 літоўскі цэнтнер складаў 120 літоўскіх фунтаў, ці 44,98 кг. AGAD. AR. Dz. VI. P. 36 і 37/1. S. 153.

[456] 1 пуд складаў 16,38 кг. *Иванюк С. А.* «Всякия крепости ведает» : майор Степан Келен во время осады Соловецкого монастыря (1672–1676). С. 219.

[457] AGAD. AR. Dz. XXVI. Sygn. 769.

ця «вялікіх і малых» ядраў. Таксама ў нясвіжскіх інвентарах 1657–1658 гг. згадваецца пра дзве жалезныя лыжкі для адлівання ядраў для лёгкіх гармат. Трэба, аднак, адзначыць, што свінец у асноўным прызначаўся для вырабу куль для стрэльбаў. Акрамя таго, у XVI – пачатку XVII ст. выкарыстоўваліся каменныя ядры. Іх істотнай перавагай была даступнасць матэрыялу для ядраў, якія можна было вырабляць нават з камянёў, сабраных у бліжэйшым наваколлі. Шмат каменных ядраў мелася ў Клецкім замку. Вядома таксама, што аднымі з першых пры Мікалаі Крыштафе Радзівіле Сіротку для Нясвіжскага замка былі адліты восем гармат, якія стралялі каменнымі ядрамі. Запас каменных ядраў фігуруе ў інвентарах нясвіжскага арсенала цягам усяго XVII ст. Толькі напрыканцы гэтага стагоддзя ад іх цалкам адмовіліся, і яны зніклі са старонак інвентароў.

Табліца 8. **Забеспячэнне рэзідэнцый Радзівілаў гарматнымі ядрамі**

Рэзідэнцыя	1605	1619	1620	1626	1627	1636	1638	1640 (?)	1653	1655	1656	1659
Алыка	–	–	–	–	–	–	–	–	3780	–	–	–
Біржы	–	7366	–	–	4536	–	4553	–	–	8126	–	5171
Давыд-Гарадок	728	–	–	–	–	–	–	–	–	–	–	–
Клецк	–	–	–	3900	–	–	–	3568	–	–	–	–
Мір	–	–	–	–	–	30	–	–	–	–	≥ 300	–
Нясвіж	–	–	–	–	–	–	–	–	–	–	6525, + 1012 (арт. ВКЛ)	–
Слуцк	–	–	2040	–	–	–	–	–	–	–	–	–

Рэзідэнцыя	1661	1662	1666	1669	1681	1686	1692	1693	1696	1698	1701	1703
Алыка	–	–	–	–	3454	3454	3271	–	–	3458	–	–
Біржы	–	–	–	–	–	–	–	–	5099	–	–	–
Давыд-Гарадок	–	–	–	–	–	–	–	–	–	–	–	–
Клецк	–	–	–	–	–	–	–	–	–	–	–	–
Мір	–	–	–	–	–	–	–	–	–	–	–	–
Нясвіж	–	–	–	–	4832			4534	–	–	–	–
Слуцк	4528	4523	≥ 2213 + 133 (арт. ВКЛ)	3913	–	5380	–	–	–	–	6231	+ 1058

НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 55. Арк. 143–144 адв.; Спр. 301. Арк. 3–3 адв.; Воп. 2. Спр. 3135. Арк. 4 адв.; Спр. 1913. Арк. 94 адв. – 95; Спр. 9367. Арк. 51–52; AGAD. AR. Dz. II. Supl. Sygn. 716; Dz. V. Sygn. 6865/I. S. 133–134; Dz. VII. Sygn. 641. S. 1–2, 5–11; Sygn. 678. S. 192–216; Dz. XI. Sygn. 48. S. 5–15, 72–75; Dz. XXVI. Sygn. 51, 72, 75, 87, 88, 103, 112, 116, 759, 773; Karvelis D. Radvilų Biržų pilis ir jos arsenalas XVI–XVII a. P. 63–68; Інвентарі Олицького замку XVII–XVIII століть. С. 49–51, 62–65, 70–71, 75–82.

На прыкладзе арсенала Нясвіжскага замка магчыма разгледзець пытанне забеспячэння ўмацавання ядрамі рознай вагі (табл. 9). У большасці апісанняў нясвіжскага арсенала можна знайсці спробы класіфікацыі гарматных ядраў. Напрыклад, у 1626 і 1636 гг. згадваюцца «вялікія і малыя» ядры. Такі, на першы погляд, невыразны падзел меў пад сабой пэўны грунт. Паводле інвентароў 1657–1658 гг., усе ядры былі падзелены на тры групы: ядры для цяжкіх гармат, ядры для лёгкіх гармат і гакаўніц, а таксама каменныя ядры. Атрымліваецца, што цягам першай паловы XVII ст. ядры для лёгкіх гармат і кулі для гакаўніц вагою ад 0,1 да 6 фунтаў (дыяметрам ад 2 да 9 см), а таксама ядры для цяжкіх гармат вагою ад 18 да 24 фунтаў (дыяметрам ад 131 да 145 мм) захоўваліся разам. Падчас ваеннай небяспекі, калі гарматы расстаўляліся на бастыёнах і валах, да іх пры дапамозе спецыяльных прылад падбіраліся адпаведныя ядры, якія разам з іншым рыштункам складваліся непасрэдна ля гармат. У інвентары 1636 г. згадваецца 25 цыркуляў, з дапамогай якіх вызначалі дакладны памер ядраў. Аб трываласці такога падзелу ў першай палове – сярэдзіне XVII ст. сведчыць аналагічны падзел форм для ліцця ядраў, шуфляў і шпунтоў для гармат, а таксама банак для шроту на «вялікія і малыя», альбо «большыя і меншыя».

Табліца 9. **Забеспячэнне Нясвіжскага замка гарматнымі ядрамі**

Вагамер ядра	1656	1656 (арт. ВКЛ)	1681	1693
24 ф.	325	–	–	325
20 ф.	–	–	314	385
18 ф.	393	–	–	–
Менш за 20 ф., «рознага гатунку»	–	–	595	–
Менш за 20 ф., жалезныя	–	–	300	–
12 ф.	248	–	–	200
6 ф.	–	+ 206	–	327
4 ф.	–	+ 806	171	–
3 ф.	–	–	1020	350
2 ½ ф.	488	–		–
2 ф.	–	–		672
1 ½ ф.	1246	–	1564	–
1 ¼ ф.	1715	–		–
1 ф.	1350	–		610
½ ф.	157	–		1665
Гакаўнічныя	600	–	–	–
Каменныя	–	–	868	–
Агулам	**6522**	**+ 1012**	**4832**	**4534**

AGAD. AR. Dz. XI. Sygn. 48. S. 72–75; Dz. XXVI. Sygn. 103, 112.

Дакладны падзел жалезных ядраў па вазе быў уведзены ў Нясвіжскім замку з сярэдзіны XVII ст. і адлюстраваны ў інвентарах 1656, 1681 і 1693 гг. У апісаннях 1656 і 1693 гг. была зроблена спроба дакладна падзяліць ядры па вазе, прычым у 1693 г. для гэтага выкарыстоўваліся восем спецыяльных тонкіх жалезных форм-узораў. Градацыя ядраў, зробленая ў 1693 г., была выклікана, віда-

вочна, імкненнем адсартаваць усе ядры па пэўным аднастайным прынцыпе. Аднак ён не паказваў фактычную вагу ядраў: напрыклад, 4-фунтовыя ядры, якія згадваюцца ў інвентары 1681 г., у 1693 г. былі занесены ў 6-фунтовыя і г. д. Найбольш дакладна, на нашу думку, фактычную вагу ядраў дэманструе інвентар 1656 г., дзе ўказана дакладная градацыя ядраў малой вагі. Падзел 1693 г. выглядае нацягнутым і прыстасаваным для патрэб тагачаснай артылерыі. З'яўленне падзелу ядраў на 1, 3, 6, 12 і 24 фунты звязана з імкненнем мадэрнізаваць і адаптаваць артылерыю адпаведна з тагачаснымі тэндэнцыямі ў ваеннай справе. Так, у Прусіі пераход на падобную сістэму адбыўся ў 1680-я гг.[458]

Колькасць ядраў для 24-фунтовых гармат у Нясвіжскім замку ў 1656 і 1693 гг. была 325 (па 162–163 на гармату). Для дзвюх іншых цяжкіх гармат у 1656 г. мелася па 393 ядры, у 1681 г. – 314, а ў 1693 г. – 385 (157–197 на гармату). Дакладна можна сцвярджаць, што 868 каменных ядраў, пра якія згадваецца ў інвентары 1681 г., прызначаліся для васьмі «каменных» гармат (108–109 на гармату). Агульная колькасць ядраў для гармат калібрам ад ½ да 6 фунтаў у 1656 г. складала 5968 адзінак (з улікам ядраў, якія належалі артылерыі ВКЛ і былі на часовым захаванні ў Нясвіжскім замку), у 1681 г. – 2755, а ў 1693 г. – 3624. Такім чынам, забяспечанасць лёгкіх гармат ядрамі выглядае наступным чынам: у другой палове 1655 – пачатку 1656 г. на кожную спраўную лёгкую гармату мелася па 138–139 ядраў (усяго 43 гарматы), у 1681 г. – па 110–111 ядраў (усяго 25 гармат), а ў 1693 г. – па 144–145 ядраў (усяго 25 гармат). Прыведзеныя лічбы дазваляюць сцвярджаць, што з цяжкіх гармат стралялі менш, чым з лёгкіх.

Нясвіжскі замак па колькасці гарматных ядраў амаль не саступаў Слуцку, дзе ў сярэдзіне – другой палове XVII ст. было каля 4–5 тыс. ядраў. Каля 4 тыс. ядраў было ў Алыцкім замку. Большы запас снарадаў быў у Біржах, дзе колькасць ядраў у 1655 г. перавысіла 8 тыс., а ў далейшым складала каля 5 тыс. Пры гэтым у Слуцку і Біржах было больш гармат і пораху. Па ўсёй верагоднасці, значная частка ядраў, сабраных у арсеналах фартэцый, прызначалася не толькі для ўласнай артылерыі, але выкарыстоўвалася таксама для падтрымкі ваенных кампаній, якія вялі войскі Вялікага Княства. Напрыклад, у лістападзе 1659 г. для аблогі Боўскай фартэцыі з Біржанскага замка былі выдадзены тры 6-фунтовыя гарматы і 150 ядраў да іх, а ў студзені 1661 г. адтуль жа для аблогі Віленскага замка былі накіраваны дзве паўкартаўны са 100 ядрамі[459]. Акрамя таго, арсеналы вялікіх фартэцый выкарыстоўваліся для забеспячэння другасных умацаванняў. Так, у Мірскі замак, паводле інвентара Нясвіжскага замка 1656 г., было перададзена 5 палявых гармат вагамерам 1–1½ фунты і 300 ядраў для іх.

Акрамя звычайных ядраў, у арсеналах фартэцый Радзівілаў меліся снарады іншага кшталту. Так, у інвентары Нясвіжскага замка 1636 г. згадваецца пра два жалезныя «агністыя» ядры, ці бомбы, для стральбы якімі ў Нясвіжы

[458] *Müller H.* Die Bewaffnung: Das Heerwesen in Brandenburg und Preussen von 1640 bis 1806. S. 190.

[459] НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 300. Арк. 1–5 адв.

ў першай палове XVII ст. мелася спецыяльная марціра (табл. 10). У мірны час гэтыя снарады, як бомбы і гранаты іншых відаў, захоўваліся незапраўленымі. Непасрэдна перад стральбой пушкар насыпаў унутр порах і ўстаўляў кнот. На іх корпусе мелася спецыяльнае вуха, за якое чаплялі вяроўку ці крук для ўкладання бомбы ў марціру. Акрамя дзвюх вялікіх бомб, у нясвіжскі арсенал разам з боезапасам артылерыі ВКЛ у 1655 г. прывезлі 7 бомб, якія прызначаліся для марцір, пакінутых войскам ВКЛ у замку. Значны запас бомб меўся ў час вайны 1654–1667 гг. у Слуцку: у 1662 г. іх было 36, а ў 1666 г. – 127. Але, напрыклад, у Біржанскім замку на працягу XVII ст. іх колькасць не перавышала двух дзясяткаў. Як можна меркаваць па апісаннях арсенала Быхава, у канцы XVII – пачатку XVIII ст. ужыванне бомб для марцір і гармат значна пашырылася.

Табліца 10. **Забеспячэнне рэзідэнцый Радзівілаў бомбамі для марцір**

Рэзідэнцыя	1623	1655	1656	1657	1658	1662	1663	1666	1681	1686	1693	1696	1701
Біржы	16	6	–	–	–	–	11	–	–	–	–	5	–
Нясвіж	–	–	8	9	9	–	–	–	4	–	5	–	–
Слуцк	–	–	–	–	–	36	–	≥ 127	–	1	–	–	33

НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 55. Арк. 143–144 адв.; AGAD. AR. Dz. II. Supl. Sygn. 716; Dz. V. Sygn. 6865/I. S. 133–134; Dz. VII. Sygn. 678. S. 192–216; Dz. XI. Sygn. 48. S. 5–15, 72–75; Dz. XXVI. Sygn. 72, 75, 80, 81, 88, 103, 112, 116, 768; Bernatowicz T. Monumenta variis Radivillorum: wyposażenie zamku nieświeckiego w świetle źródeł archiwalnych. S. 44–48.

Іншы тып снарадаў прадстаўляюць смаляныя «агністыя» ядры, якія выкарыстоўваліся для запальвання абарончых умацаванняў ці лагера праціўніка. Гэтыя былі ядры, абвітыя вяроўкай і аблітыя смалой. Такога кшталту снарады актыўна выкарыстоўваліся ў часы Стэфана Баторыя і былі своеасаблівымі папярэднікамі бомбаў. На працягу ўсяго XVII ст. у нясвіжскім цэйхгаўзе захоўвалася адно вялікае смаляное ядро, якім, як і дзвюма вялікімі бомбамі, так ніколі і не скарысталіся. У 1657 г. згадваюцца таксама сем меншых смаляных «агністых» ядраў, шэсць з якіх захаваліся да 1693 г. Цяжка сказаць дакладна, стралялі гэтымі снарадамі з цяжкіх гармат ці марцір.

Эфектыўным сродкам знішчэння жывой сілы праціўніка падчас штурму фартэцыі былі карцечныя, ці шротавыя снарады. Першапачаткова ўжываліся драўляныя карцечы. Асновай такога снарада была драўляная банка (карцеч), выраблена на такарскім станку. Яна напаўнялася кавалкамі сечанага жалеза ці свінцовымі кулямі і накрывалася спецыяльнай накрыўкай. Пасля вылету з гарматы карцечная банка разрывалася, наносячы пашкоджанні непрыяцелю. Карцечныя снарады пачалі выкарыстоўвацца з сярэдзіны XVII ст. У 1655 г. больш за сотню карцечаў было прывезена ў Мірскі замак, што сведчыць аб падрыхтоўцы гэтай рэзідэнцыі да абароны ў час вайны 1654–1667 гг. (табл. 11). У Слуцку паводле інвентароў 1669 і 1686 гг. было адпаведна 283 і 280 карцечаў, а ў 1701 г. іх колькасць вырасла 3610, з іх, праўда, 2900 былі ненапоўненыя. У інвентары Нясвіжскага замка 1681 г. згадваецца пра 170 карцечаў роз-

нага калібру, а ў інвентары 1693 г. фігуруюць 94 карцечы, запраўленыя шротам. Для параўнання, у бастыёнам замку ў Біржах у другой палове XVII ст. было 205–234 карцечаў.

Табліца 11. **Забеспячэнне рэзідэнцый Радзівілаў карцечамі для гармат**

Рэзідэнцыя	1655	1656	1669	1681	1686	1693	1696	1698	1701
Алыка	–	–	–	57	57	–	–	36	–
Біржы	205 / 225	–	–	–	–	–	234	–	–
Мір	116	≥ 12	–	–	–	–	–	–	–
Нясвіж	–	–	–	170	–	≥ 94	–	–	–
Слуцк	–	–	283	–	280	–	–	–	3610

AGAD. AR. Dz. II. Supl. Sygn. 716; Dz. VII. Sygn. 641. S. 5–11; Dz. VII. Sygn. 678. S. 192–216; Dz. XI. Sygn. 48. S. 72–75; Dz. XXVI. Sygn. 72, 75, 103, 112, 116, 773; Інвентарі Олицького замку XVII–XVIII століть. С. 62–65, 75–78.

Аб абмежаваным выкарыстанні гакаўніц у сярэдзіне – другой палове XVII ст. сведчыць незначная колькасць куль для іх. У першай палове XVII ст., як вынікае з апісанняў арсеналаў, кулі для гакаўніц захоўваліся разам з ядрамі для лёгкіх гармат, і аб іх дакладнай колькасці нам невядома. Толькі ў інвентары Мірскага замка 1636 г. згадваецца пра 120 куль для гакаўніц. Такая колькасць падаецца надзвычай малой, улічваючы, што ў замку на той час было больш за 100 гакаўніц. Але падобнае становішча было і ў Нясвіжскім замку, дзе ў другой палове XVII ст. колькасць куль раўнялася колькасці гакаўніц. На нашу думку, гэта выразна сведчыць аб незапатрабаванасці гэтага віду зброі.

Значны запас куль для мушкетаў, які фіксуецца ў арсеналах радзівілаўскіх фартэцый у сярэдзіне – другой палове XVII ст., сведчыць, з аднаго боку, аб актыўным выкарыстанні гэтай зброі ў згаданы час, а з іншага – аб узроўні баяздольнасці фартэцый (табл. 12). Так, у Слуцку ў 1660-я гг. колькасць мушкетных куль вагалася ў межах 12–18 тыс. Такі ж запас меўся ў Біржанскім замку. Нясвіжскі замак значна саступаў згаданым фартэцыям. Вядома, што ў 1657 г. у яго арсенале мелася 4 тыс. куль. Што цікава, значны запас мушкетных куль (3 тыс.) у 1656 г. былі перададзены ў Мірскі замак. Гэта з'яўляецца выразным сведчаннем падрыхтоўкі гэтай рэзідэнцыі да абароны.

Табліца 12. **Забеспячэнне рэзідэнцый Радзівілаў мушкетнымі кулямі**

Рэзідэнцыя	1655	1656	1657	1661	1662	1663	1669	1681	1686	1692	1696
Алыка	–	–	–	–	–	–	–	747	650	600	–
Біржы	4470	–	–	–	–	15950	–	–	–	–	12991
Мір	–	≥ 3000	–	–	–	–	–	–	–	–	–
Нясвіж	–	–	4000	–	–	–	–	–	–	–	–
Слуцк	–	–	–	18285	16542	–	12100	–	1602	–	–

НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 55. Арк. 143–144 адв.; AGAD. AR. Dz. VII. Sygn. 641. S. 5–11; Sygn. 678. S. 192–216; Dz. XI. Sygn. 48. S. 72–75; Dz. XXVI. Sygn. 72, 75, 80, 81, 88, 116, 768; Інвентарі Олицького замку XVII–XVIII століть. С. 62–65, 75–82.

З сярэдзіны XVII ст. у арсеналах радзівілаўскіх фартэцый з'явіліся ручныя гранаты (табл. 13). Асабліва выгадным было іх выкарыстанне ў актыўнай фазе штурму, калі непрыяцель спрабаваў узабрацца на вал. Упершыню ручныя гранаты ў колькасці 170 штук трапілі ў Нясвіжскі замак у 1655 г. Крыху пазней 30 гранат перадалі ў Мірскі замак, а астатнія так і засталіся ў Нясвіжы. Змяншэнне колькасці да 110 штук у 1657 г. сведчыць аб іх выкарыстанні, у прыватнасці, падчас нападу казакоў у той год. Паводле спісу выдаткаў на абарону Нясвіжскага замка ў 1655–1660 гг. на закупку гранат, а таксама іншага ваеннага рыштунку было выдаткавана 700 злотых[460]. Да 1681 г. запас гэтага віду зброі быў істотна папоўнены: да 85 запраўленых порахам гранат дадаліся яшчэ 167 незапраўленых. Істотнае павелічэнне запасаў сведчыць аб узрастанні ролі гранат пры абароне ўмацаванняў у другой палове XVII ст. Нашмат большы, чым у Нясвіжы, запас ручных гранат меўся ў Слуцку: у 1686 г. там іх было 1396, а ў 1701 г. – 2140. Крыху менш гранат было ў Біржанскім замку. Гэта сведчыць пра аднолькавы ваенны патэнцыял гэтых дзвюх фартэцый. У сваю чаргу, у Алыцкім замку ў 1681 г. было 280 гранат, што адпавядае запасам Нясвіжскага замка.

Табліца 13. **Забеспячэнне рэзідэнцый Радзівілаў ручнымі гранатамі**

Рэзідэнцыя	1655	1656	1657	1658	1659	1662	1664	1666	1669	1681	1686	1693	1696	1701
Алыка	–	–	–	–	–	–	–	–	–	280	280	–	–	–
Біржы	–	–	–	–	937	–	+107	–	–	–	–	–	≥ 1232	–
Мір	–	≥ 30	–	–	–	–	–	–	–	–	–	–	–	–
Нясвіж	170 [арт. ВКЛ]	140 [арт. ВКЛ]	110	108	–	–	–	–	–	252	–	251	–	–
Слуцк	–	–	–	–	–	1293	–	≥ 133	1261	–	1396	–	–	2140

НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 55. Арк. 143–144 адв.; Dz. V. № 6865/I. S. 133–134; Dz. VII. № 641. S. 5–11; № 678. S. 192–216; Dz. XI. № 48. S. 72–75; Dz. XXVI. № 80; № 81; № 87; № 103; № 112; № 116; № 768; Bernatowicz T. Monumenta variis Radivillorum: wyposażenie zamku nieświeckiego w świetle źródeł archiwalnych. S. 44–48; Інвентарі Олицького замку XVII–XVIII століть. С. 62–65, 75–78.

Узрастанне значэння артылерыі і агняпальнай зброі для абароны ўмацаванняў у XVI–XVII стст. выклікала неабходнасць будаўніцтва на тэрыторыі фартэцый спецыяльных будынкаў – цэйхгаўзаў, ці арсеналаў, якія прызначаліся для захавання гармат, ручной агняпальнай зброі, боепрыпасаў і амуніцыі. Вакол іх засяроджвалася ўся дзейнасць, звязаная з наглядам і направай зброі.

Мураваны цэйхгаўз быў узведзены ўжо на першым этапе будаўніцтва Нясвіжскага замка ў канцы XVI – пачатку XVII ст. Ён добра бачны на гравюры Т. Макоўскага. Гэта быў выцягнуты ўздоўж паўночна-ўсходняй курціны аднапавярховы будынак. Паводле інвентароў 1658 і 1673 гг.[461], у ім было пяць

[460] AGAD. AR. Dz. II. Sygn. 1433.

[461] *Bernatowicz T.* Monumenta variis Radivillorum: wyposażenie zamku nieświeckiego w świetle źródeł archiwalnych. S. 44, 61.

вокнаў, закрытых кратамі, і двое варот з боку дзядзінца. Унутраная прастора цэйхгаўза, верагодна, не была падзелена і ўтварала адно вялікае памяшканне, у якім захоўвалася артылерыя, рыштунак для яе і рознага кшталту зброя. Падлога была выкладзена дылямі, сцяна з боку вала была зашыта дошкамі, а столь перакрыта бэлькамі. На паддашша, якое выкарыстоўвалася для захавання рэчаў неваеннага характару, вяла лесвіца ўнутры арсенала, а таксама спецыяльны пераход з боку вала. Двухсхільны дах цэйхгаўза быў накрыты гонтамі.

У Слуцку цэйхгаўз першапачаткова знаходзіўся на Верхнім замку. У другой чвэрці XVII ст. узбраенне і амуніцыя ўжо захоўваліся ў будынку на Ніжнім замку, дзе было больш месца для такога кшталту збудаванняў. З узвядзеннем у сярэдзіне XVII ст. у Новым месце цытадэлі ўсе будынкі ваеннага прызначэння былі перанесены туды. Аднымі з першых на тэрыторыі цытадэлі з'явіўся комплекс будынкаў цэйхгаўза і правіянтхаўза. Як можна бачыць на плане цытадэлі таго часу, яны месціліся ў драўляным будынку, узведзеным ўздоўж паўночнай курціны на адлегласці 16 дзесяцічных рэйнскіх стоп[462] (6 м) ад яе (мал. 40). Выцягнуты будынак памерам 30 (11,3 м) на 78 стоп (29,3 м) быў падзелены на тры памяшканні. Адзіны ўваход вёў у сярэдняе памяшканне шырынёй у 21 стапу (7,9 м), адкуль можна было трапіць у два бакавыя – шырынёй 28,5 стапы (10,4 м), дзе ўласна і месціліся правіянтхаўз і цэйхгаўз. У прахадным памяшканні мелася лесвіца на другі паверх. Да 1662 г. у гэтым невялікім будынку заховаўся і правіянт, і ўзбраенне, таму Багуслаў Радзівіл запатрабаваў збудаваць другі правіянтхаўз такога ж памеру, як і ўвесь гэты будынак. Праект падрыхтаваў у 1662 г. Казімір Клакоцкі[463]. Ён прапанаваў паставіць будынак новага правіянтхаўза па лініі ранейшага ўздоўж паўночнай курціны, пакінуўшы паміж імі праезд шырынёй у 22 стапы (8,3 м). Акрамя таго, ураднік лічыў неабходным да абодвух правіянтхаўзаў з захаду і ўсходу дабудаваць дзве шопы, кожная шырынёй па 22 стапы (8,3 м), для захавання гармат, вазоў, тачак і іншага рыштунку. Увесь комплекс будынкаў агульнай даўжынёй 222 стапы (83,6 м) К. Клакоцкі прапаноўваў накрыць адным дахам уключна з праездам між правіянтхаўзамі, а вялікае паддашша выкарыстоўваць для захавання рознага рыштунку. У 1666 г. гэты праект быў рэалізаваны, аднак пры гэтым змянілася функцыянальнае прызначэнне будынкаў: новы вялікі гмах быў цалкам аддадзены пад цэйхгаўз, а стары – пад правіянтхаўз. Усе будынкі былі зроблены з цясанага дрэва і накрыты гонтавым дахам. Цэйхгаўз меў восем вокнаў і два ўваходы: з боку дзядзінца і з тарца.

---

[462] Звычайная рэйнская стапа раўнялася 0,3138 м. 12 стоп складалі 1 рэйнскі прут (3,7668 м). Так званая *дзесятковая рэйнская стапа* была вынайдзена для зручнасці вылічэння памераў фартыфікацыйных умацаванняў. У адным пруце было 10 дзесятковых стоп. 1 дзесятковая стапа складала, такім чынам, 0,37668 м. *Freitag A.* Architectura militaris nova et aucta oder Newe vermehrte Fortification von regular Vestugen, von irregular Vestugen und Aussen Wercken, von Praxi Offensiva und Defensiva. S. 31.

[463] AGAD. AR. Dz. V. Sygn. 6865/II. S. 53–54.



Мал. 40. Цэйхгаўз і правіянтхаўз у слуцкай цытадэлі. AGAD. AR. Dz. VII. Sygn. 678

У мірны час, як можна меркаваць па інвентарах, большасць гармат у Нясвіжы і Слуцку захоўвалася ў цэйхгаўзе. Яны ставіліся пасярэдзіне памяшкання, у той час як уздоўж сцен складваліся снарады, рыштунак і агняпальная зброя. Гарматныя ядры большага памеру звычайна складваліся ў піраміды, ці грамады, меншыя ядры маглі змяшчацца ў скрыні і бочкі. Пад столь падвешваліся канаты, кноты, а таксама спецыяльныя вагі для ўзважвання гарматных ствалоў. Акрамя таго, у цэйхгаўзе знаходзілася шмат іншага рыштунку і інструментаў, неабходных для абслугоўвання і направы гармат.

Глава 5

Гарнізоны

† Ваеннаабавязанае насельніцтва

† Найманыя жаўнеры

Выключна важнай умовай для паспяховай абароны ўмацавання быў моцны гарнізон. Наяўнасць дасведчаных жаўнераў з высокім баявым духам давала магчымасць выкарыстаць патэнцыяльныя магчымасці для абароны, якія давалі высокаякасныя фартыфікацыі і ўзбраенне. Калі ў час ваеннай небяспекі ў фартэцыі не было гарнізона адпаведнага памеру, то яе наўпрост не было каму абараняць, і страчвала значэнне ўся папярэдняя падрыхтоўка ўмацавання да абароны ў выглядзе будаўніцтва фартыфікацый і назапашвання ўзбраення і боепрыпасаў.

У XVI–XVII стст. у абсалютнай большасці магнацкіх і дзяржаўных фартэцый у Вялікім Княстве Літоўскім адсутнічалі пастаянныя гарнізоны. Выключэннем былі толькі найбольш важныя для абароны краіны гарады, у якіх стаялі адносна невялікія гарнізоны (Смаленск, Полацк, Вільня). Сістэма абароны ўмацаванняў была заснавана на практыцы прыцягнення розных груп ваенна-абавязанага насельніцтва (зямян, путных баяр, мяшчан, выбранцаў, стральцоў і інш.). Таксама шырока практыкавалася размяшчэнне ў замках і фартэцыях найманых падраздзяленняў. Пры гэтым памеры і баяздольнасць гарнізонаў залежалі ад ваеннай сітуацыі, фінансавых магчымасцей і канкрэтных дзеянняў уласнікаў умацаванняў. Таму нават у тым выпадку, калі з крыніц вядомы памеры гарнізонаў фартэцый, гэтыя звесткі можна выкарыстоўваць толькі для ацэнкі іх баяздольнасці ў канкрэтнай сітуацыі. Такім чынам, у адрозненне ад фартыфікацый і ўзбраення, наяўны ў пэўны момант у фартэцыях гарнізон сведчыць пра ступень яго падрыхтоўкі да абароны на кораткатэрміновую перспектыву. Разам з тым разгляд практыкі забеспячэння ўмацаванняў гарнізонамі дазваляе ўявіць наколькі абарончы патэнцыял замкаў і фартэцый мог быць рэалізаваны ў выпадку ваенных канфліктаў.

Абарона прыватных умацаванняў была справай іх уласнікаў, якія самі клапаціліся аб забеспячэнні іх гарнізонамі. Фактычна ў азначаны перыяд дакладна вызначанага паняцця «гарнізон» не было, а яго фарміраванне насіла аказіянальны характар. Таму для абароны ўмацаванай рэзідэнцыі маглі ўключацца любыя вайсковыя аддзелы, якія былі ў распараджэнні магнатаў. Улічваючы спецыфіку вядзення абароны ўмацаванняў, для гэтага былі найбольш прыдатны пяхотныя падраздзяленні. У склад гарнізонаў маглі ўключацца кавалерыйскія аддзелы, якія выкарыстоўваліся для вылазак з фартэцый, вядзен-

ня баявых дзеянняў на вялікай адлегласці і арганізацыі сувязі. Такім чынам, характар гарнізонаў прыватнаўласніцкіх умацаванняў залежаў ад спецыфікі прыватных войск іх уласнікаў.

У ВКЛ і Рэчы Паспалітай у XVI – пачатку XVIII ст. практыка ўтрымання прыватных вайсковых аддзелаў была шырока распаўсюджана. Яны выраслі з так званых *панскіх харугваў*, якія займалі месца ў сістэме паспалітага рушання шляхты. Напрыклад, у 1567 г. аддзелы магнатаў складалі каля 26 % ад агульнай колькасці паспалітага рушання[464]. У далейшым магнаты пачалі шырока карыстацца найманымі вайсковымі падраздзяленнямі, якія складаліся з дасведчаных жаўнераў і вызначаліся высокай баяздольнасцю. Абарона рэзідэнцый і зямель уласніка была адной з важнейшых задач прыватнаўласніцкіх вайсковых аддзелаў. Акрамя таго, у час вайны іх маглі скіроўваць у паспалітае рушанне ў якасці прыватных почтаў ці непасрэдна пад уладу гетманаў, а ў мірны час яны падтрымлівалі парадак на землях магнатаў і служылі для рэпрэзентатыўных мэтаў пры рознага кшталту дзяржаўных ці сямейных урачыстасцях[465].

Не ўсе наяўныя ў таго ці іншага магната ваенныя аддзелы былі засяроджаны ў яго фартэцыях і бралі ўдзел у іх абароне. Гэта ўскладняе магчымасць вызначэння памераў гарнізонаў умацаваных рэзідэнцый Радзівілаў. Напрыклад, у 1661 г. Міхал Казімір Радзівіл звярнуўся да сойма Рэчы Паспалітай з просьбай аб аплаце ўтрымліванага ім «нясвіжскага гарнізона». Пры гэтым ён сцвярджаў, што восенню 1655 г. у Нясвіжы было сканцэнтравана 1800 жаўнераў, вясной 1657 г. – 1000, у маі – жніўні 1657 г. – 1200 і столькі ж у першай палове 1660 г.[466] Аднак магнат, відавочна, прыпісаў да нясвіжскага гарнізона ўсе найманыя падраздзяленні, якія знаходзіліся ў яго на службе, у тым ліку тыя, што забяспечвалі яго асабістую бяспеку, каб атрымаць кампенсацыю за іх утрыманне. Таму гэтая крыніца не дазваляе вызначыць дакладны памер гарнізона, які абараняў Нясвіж у 1655–1660 гг.

5.1. Ваеннаабавязанае насельніцтва

Найбольш архаічная форма камплектавання прыватнаўласніцкага войска грунтавалася на так званай *земскай павіннасці*, паводле якой уся шляхта ці ваеннаабавязанае саслоўе Вялікага Княства Літоўскага, у час вайны павінна была ўдзельнічаць у абароне дзяржавы. У першай палове XVI ст. для абазначэння ваеннаабавязанага саслоўя ўжываўся тэрмін «баяры», пазней ён выцясняецца азначэннем «зямяне». Гэтымі тэрмінамі называлі як паўнапраўную шляхту, так і залежную ад магнатаў шляхту. З апошняй фарміраваліся почты, якія заможныя землеўласнікі выстаўлялі для выканання земскай павіннасці[467].

---

[464] *Kotarski H.* Wojsko polsko-litewskie podczas wojny inflanckiej 1576–1582. Cz. 4. S. 87.

[465] *Ракуціс В.* Міліцыя Радзівілаў у XVIII ст. // Arche. 2012. № 6. С. 95–96.

[466] *Бабятынскі К.* Выдаткі М. К. Радзівіла на абарону Нясвіжа ў 1655–1660 г. С. 43–60.

[467] *Sienkiewicz W.* Ziemianie zależni w Wielkim Księstwie Litewskim od połowy XVI do połowy XVIII w. Studium z dziejów feudalizmu litewskiego (Maszynopis pracy doktorskiej). Warszawa, 1982. S. 12–18.

Узнікненне залежнай шляхты ў ВКЛ ішло двума асноўнымі шляхамі: праз асаджэнне князямі і магнатамі баяр на сваіх землях для ўмацавання свайго ваеннага патэнцыялу і засялення пустых зямель і праз наданне вялікім князем маёнткаў разам са шляхтай, што жыла ў іх[468]. У другім выпадку маглі паўставаць вострыя канфлікты. Так, у першай чвэрці XVI ст. Мікалай II Радзівіл атрымаў значныя землі ў Падляшшы і прыклаў значныя намаганні, каб прымусіць мясцовую шляхту служыць у ягонай прыватнай харугве, а не ў павятовай[469]. У XVI–XVII стст. пераважная большасць зямян, якія жылі з маёнтках Радзівілаў, не мелі ўласнай зямлі і трымалі яе пры ўмове нясення ваеннай службы (узброены вершнік выстаўляўся з 5 валок), што прыводзіла да высокай ступені залежнасці іх ад магнатаў. У час ваеннай выправы зямян узначальваў прызначаны ўласнікам ротмістр. Ад яго зямяне атрымлівалі харугву і барабан. Найбольш папулярным тыпам фармаванняў зямян была казацкая кавалерыя, радзей яны служылі ў гусарскіх харугвах. Вядома таксама пра драгунскія і пешыя харугвы, якія складаліся з зямян[470].

Крыніцы дазваляюць ацаніць прыблізную колькасць зямян у землях Радзівілаў. Вядома, што ў 1567 г. Мірскае графства павінна было выстаўляць 47 зямян-вершнікаў. Пры гэтым Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка, якому ў гэты час адышла мірская латыфундыя, сваім загадам напрамую абавязаў зямянаў сваіх уладанняў удзельнічаць у абароне Мірскага і Нясвіжскага замкаў. Акрамя таго, у 1567 г. з сялян і мяшчан мірскага маёнтка было набрана 33 пешых жаўнеры[471]. У 1569 г. з Міра было выстаўлена 48 вершнікаў і 24 драбы[472]. Такім чынам, у другой палове XVI ст. у выпадку неабходнасці на абарону Мірскага замка маглі быць скіраваны 70–80 жаўнераў. У блізкім Свержані, дзе ў XVI ст. існаваў драўляны замак, у 1569 г. зямяне выстаўлялі 16 коней, а ў 1628 г. – 45. У Клецкім княстве ў XVI ст. было каля 130 зямян і татараў, якія разам фарміравалі харугву. У Давыд-Гарадку ў канцы гэтага стагоддзя Радзівілы мелі 26 зямян і 12 панцырных баяр[473]. Летам 1617 г.

---

[468] *Sienkiewicz W.* Ziemianie zależni w Wielkim Księstwie Litewskim od połowy XVI do połowy XVIII w. S. 24–35, 220.

[469] *Baranowski I.* T. Z dziejów feudalizmu na Podlasiu: Rajgrodzko-Goniądzkie «państwo» Radziwiłłów w pierwszej połowie XVI wieku // Przegląd Historyczny. 1907. № 4. S. 66; *Kloza J.*, *Maroszek J.* Dzieje Goniądza w 450 rocznicę praw miejskich. S. 18–20; *Maroszek J.* Pogranicze Litwy i Korony w planach króla Zygmunta Augusta: z historii dziejów realizacji myśli monarszej między Niemnem a Narwią. S. 73.

[470] *Sienkiewicz W.* Ziemianie zależni w Wielkim Księstwie Litewskim od połowy XVI do połowy XVIII w. S. 80, 137, 144; *Rachuba A.* Siły zbrojne Wielkiego Księstwa Litewskiego w XVII wieku. S. 395–396.

[471] *Аляхновіч Р. А., Рыбчонак С. А., Шаланда А. І.* Род Іллінічаў у Вялікім Княстве Літоўскім у XV–XVI стст. : радавод, гербы, уладанні. С. 263–285.

[472] *Радаман А., Янушкевіч А.* Шляхта Новагародскага павета ў паспалітым рушэнні ВКЛ 1567 года // Studia z dziejów Wielkiego Księstwa Litewskiego (XVI–XVIII wieku) / red. S. Górzyński, M. Nagielski. Warszawa, 2014. S. 346.

[473] *Sienkiewicz W.* Ziemianie zależni w Wielkim Księstwie Litewskim od połowy XVI do połowy XVIII w. S. 62–63; 138; *Rachuba A.* Siły zbrojne Wielkiego Księstwa Litewskiego w XVII wieku. S. 396.

у Нясвіжы Радзівілы сустракалі каралевіча Уладзіслава ў суправаджэнні 300 «прыяцеляў і слуг»[474]. Па ўсёй верагоднасці, у іх склад уваходзілі зямяне з Нясвіжскай ардынацыі, у якую ўваходзілі Мір і Свержань, а таксама зямяне і татараў з суседняга Клецкага княства. Колькасць зямян Нясвіжскай ардынацыі дапамагае вызначыць рэестр гарнізона Нясвіжскага замка ў 1656 г. На той час у замку знаходзілася 28 рот агульным складам у 163 жаўнеры, якія, па ўсёй верагоднасці, выконвалі зямянскую службу. На гэта ўказвае тэрытарыяльны прынцып фарміравання рот. Напрыклад, былі роты з Крошына, Лахвы, Дзярэўнай і інш.[475]

У канцы XVI ст. з маёнткаў Койданава, Смалявічы і Станькава служыла 100 вершнікаў, а Слуцкае княства, якое неўзабаве перайшло ў валоданне біржанскай галіны Радзівілаў, выстаўляла 108 конных зямян. На пахаванні Крыштафа II Радзівіла ў 1640 г. са Слуцка прыйшла харугва ў 100 вершнікаў. Для параўнання, тады ж з Біржанскага княства і іншых маёнткаў Радзівілаў у Завілейскай Літве была сабрана харугва ў 140 зямян. Паводле ацэнкі Багуслава Радзівіла, на тэрыторыі Слуцкага і Капыльскага княства, а таксама блізкага Койданава пражывала каля 1500 зямян, аднак толькі невялікая частка з іх мела сродкі для нясення вайсковай службы. Так, у час падрыхтоўкі да сойма ў Варшаве ў 1668 г. Б. Радзівіл правёў попіс, на які са Слуцкага княства з'явіліся 190 узброеных вершнікаў, з Капыльскага – 30, з Койданава – 37. Яшчэ 60 коней ставілі татары. Пры гэты не ўсе вершнікі мелі адпаведную экіпіроўку, таму для суправаджэння магната былі абраны толькі 150 з іх. У другой палове XVII ст. Слуцкае і Капыльскае княствы выстаўлялі каля 200 баяздольных вершнікаў, якія ўтваралі дзве харугвы[476].

У 1662 г. Б. Радзівіл выдаў адмысловую ўставу для зямян, з дапамогай якой магнат імкнуўся больш дакладна рэгламентаваць умовы нясення службы залежнай шляхтай і павысіць баяздольнасць зямянскіх харугваў. Паводле яе, забаранялася пераводзіць зямян на грашовы падатак. Гэты пункт, аднак, пазней не выконваўся. Кожны зямянін, паводле ўставы, павінен быў несці службу сам або з асаблівага дазволу выстаўляць сабе замену. Служба за свой кошт працягвалася чвэрць году, а за астатні час зямянін атрымліваў па 12 злотых у месяц. Кожныя тры месяцы зямяне былі абавязаныя станавіцца на агульны попіс, а штомесяц – на попіс у асобных уладаннях. У гэты час яны праходзілі навучанне, у іх правяралі экіпіроўку і ўзбраенне. Зямянін павінен быў мець «добрага» каня коштам у 120 злотых, сядло, пару пісталетаў, карабін з порахам, шаблю і вопратку. Асобна падкрэсліваўся абавязак абароны слуцкай фартэцыі, прычым падчас аблогі зямянін павінен быў забяспечыць

[474] *Maskiewicz S.* Pamiętniki Samuela Maskiewicza początek swój biorą od roku 1594 w lata po sobie idące. Wilno, 1838. S. 102–103.

[475] AGAD. AR. Dz. VII. Sygn. 675.

[476] Ibidem. Dz. II. Supl. Sygn. 716; *Sienkiewicz W.* Ziemianie zależni w Wielkim Księstwie Litewskim od połowy XVI do połowy XVIII w. S. 70–71, 74, 138, 141.

сябе правіянтам і заставацца ў Слуцку, пакуль будзе захоўвацца ваенная небяспека[477].

Дасягненне высокай баяздольнасці зямянскіх аддзелаў было няпростай справай і шмат у чым залежала ад арганізацыйных здольнасцей і вайсковай спрактыкаванасці ўраднікаў. Аб гэтым сведчыць згадка пра абарону Койданаўскага замка ад татар у першай палове XVI ст. Ва ўмацаванні, якое знаходзілася тыдзень у аблозе, сабраліся толькі «некаторыя» баяры, у той час як значная частка залежнай шляхты не з'явілася з-за таго, што ўраднікі «мала дбалі» пра падрыхтоўку замка да абароны[478]. Баяздольнасць зямянскіх харугваў павышалася, калі ў іх склад пры розных абставінах уваходзілі спрактыкаваныя жаўнеры. Аднак у агульным такія ваенныя фармацыі характарызаваліся дрэннай ваеннай прыдатнасцю, а іх існаванне да XVIII ст. тлумачыцца шэрагам дадатковых функцый, якія яны выконвалі. Зямяне былі эфектыўным інструментам ва ўнутрыпалітычных канфліктах, суправаджалі магнатаў на рознага кшталту ўрачыстасцях, чым дэманстравалі магутнасць сваіх гаспадароў, вазілі пошту, выконвалі паліцэйскія функцыі ў маёнтках і інш.[479] Асноўнай перавагай зямянскіх аддзелаў была таннасць іх утрымання.

Асобную этнічную, а разам з тым і ваеннаабавязаную групу насельніцтва ў ВКЛ складалі татары. Яны пражывалі ў многіх маёнтках Радзівілаў і былі абавязаны выконваць вайсковую службу нароўні з зямянамі. Найбольш рана татары з'явіліся пад Клецкам. У 1558 г. яны выстаўлялі 20 вершнікаў, а ў 1575 г. – 32. У другой палове XVII ст., паводле падлікаў П. Бароўскага, з усіх маёнткаў Радзівілаў нясвіжскай і біржанскай ліній татары павінны былі выстаўляць 114 вершнікаў (з Клецкага княства – 32, Нясвіжскага – 24, Слуцкага – 17, Капыльскага – 18, Біржанскага – 6, Койданава – 17). Татарскія харугвы лічыліся больш баяздольнымі за зямянскія, таму Радзівілы былі зацікаўлены ў іх утрыманні. Так, у першай палове XVII ст. прадстаўнікі біржанскай галіны роду маглі выставіць асобную татарскую харугву ў 100 вершнікаў, а ў пахаванні Крыштафа II у 1641 г. удзельнічалі дзве татарскія харугвы[480].

Ва ўмовах адсутнасці грошай у скарбе цэнтральная ўлада ВКЛ карысталася сістэмай забеспячэння абароназдольнасці стратэгічна важных рэгіёнаў праз надзяленне пэўных груп насельніцтва зямлёй з умовай нясення ваеннай службы. Людзей, якія на ўмовах валодання зямлёй, былі абавязаны выконваць вайсковую службу, або «конную павіннасць», называлі па-рознаму: зямяне, панцырныя баяры, путныя слугі, казакі і інш. Сістэма раздачы службаў, за якія іх уладальнікі павінны былі несці ваенную павіннасць, шырока выкарыстоўвалася ва ўладаннях Радзівілаў ва ўсходніх землях Беларусі. Пры гэтым

[477] *Sienkiewicz W.* Ziemianie zależni w Wielkim Księstwie Litewskim od połowy XVI do połowy XVIII w. S. 139, 341–345, 353.

[478] Санкт-Петербургский институт истории РАН. Ф. 124. Оп. 1. Карт. 1. Д. 107.

[479] *Sienkiewicz W.* Ziemianie zależni w Wielkim Księstwie Litewskim od połowy XVI do połowy XVIII w. S. 142–144, 181–190.

[480] *Borawski P.* Ziemska służba wojskowa Tatarów Wielkiego Księstwa Litewskiego w XV–XVII wieku. Zabrze ; Tarnowskie Góry: 2015. S. 244–246, 257, 275, 287, 292.

у большасці маёнткаў, якія перайшлі ў валоданне Радзівілаў, гэтая сістэма ўжо існавала раней[481]. Так, у невельскай і себежскай маёмасцях, якія перайшлі ў валоданне біржанскіх Радзівілаў у сярэдзіне XVII ст., у 1690 г. было 176 казацкіх дымоў, ці 9,5 % ад агульнай колькасці[482].

Сістэма ваеннай службы на аснове трымання зямлі ў ВКЛ у дзяржаўных і прыватнаўласніцкіх землях была шырока развіта. Апроч рознага кшталту баяраў і зямян, якія служылі конна, такую зямлю маглі трымаць жаўнеры, што служылі ў пяхоце, пушкары, рамеснікі, што даглядалі ўмацаванні. Гэтая сістэма гарантавала наяўнасць пастаяннага персаналу для абслугоўвання ўзбраення і фартыфікацый. Гэта тычалася і мірнага часу, калі служылае насельніцтва павінна было несці варту ў замках.

Спробай павялічыць колькасць пешых аддзелаў у дзяржаўным і прыватных войсках стала фарміраванне на ўзор вугорскай пяхоты так званай *выбранецкай пяхоты*, якая стваралася праз усталяванне спецыяльнай вайсковай павіннасці для сялян. Паводле соймавай ухвалы 1595 г., 1 селянін з 20 з дзяржаўных уладанняў узамен на звальненне ад выплаты падаткаў мусіў ісці на службу ў войска. Выбранецкія харугвы мусілі быць апрануты ў аднолькавую вопратку і ўзброены ручніцамі (пазней мушкетамі), шаблямі і сякерамі. На практыцы праект умацавання войска ВКЛ за кошт пяхоты з выбранцаў не быў паспяхова рэалізаваны, і іх колькасць не перавышала 500 чалавек пры адносна нізкай баяздольнасці. Дзяржаўцы дзяржаўных маёнткаў не хацелі выдаваць сялян, а тыя з-за цяжкіх умоваў службы і высокай смяротнасці не хацелі ваяваць. Тыя ж сяляне, што траплялі ў войска, не мелі добрага ўзбраення і вывучкі, у той час як служба ў пяхоце патрабавала доўгатрывалай муштры. Да гэтага дадаваліся і праблемы з забеспячэннем узбраеннем. Як паказала практыка, найбольш прыдатнымі выбранцы былі для службы ў гарнізонах замкаў, а таксама пры ўзвядзенні ўмацаванняў, дарог і мастоў. Нягледзячы на нізкую баяздольнасць выбранцаў, іх працягвалі выкарыстоўваць у ВКЛ на працягу ўсяго XVII ст. па прычыне нізкага кошту[483].

Практыкай набору выбранцаў з сялян шырока карысталіся Радзівілы. У першай чвэрці XVII ст. пры Янушы Радзівіле ў Слуцкім замку служыла каля 100 выбранцаў. У выдатках за 1619 г. згадваецца аб 97 выбранцах[484], а паводле апісання слуцкага арсенала 1620 г. выбранцам было раздадзена 87 мушкетаў[485]. Паводле інструкцыі, дадзенай каменданту Слуцка ў 1621 г., у 15-ы дзень кожнага месяца ўсе выбранцы павінны былі з'яўляцца ў замак на попіс, на якім правяралася ўзбраенне, амуніцыя і боепрыпасы (мушкет, шабля, сякерка, парахаўніца, кулі, порах і кнот). Пасля гэтага палова выбранцаў

[481] *Rychlikowa I.* Bojarzy pancerni na pograniczu moskiewskim w XVI–XIX wieku // Przegląd wschodni. 1994. T. 3, z. 3 (11). S. 412–413.

[482] VUB. F. 4. B. 39 747.

[483] *Грыцкевіч А.* Беларускія выбранцы. С. 249–253; *Wisner H.* Wojsko litewskie I połowy XVII wieku. Cz. 1. S. 82–89; *Rachuba A.* Siły zbrojne Wielkiego Księstwa Litewskiego w XVII wieku. S. 387–389.

[484] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 10 729. Арк. 10 адв.

[485] AGAD. AR. Dz. VII. Sygn. 641. S. 1–2; Dz. XXVI. Sygn. 759.

разыходзілася па дамах, а палова заставалася служыць у замку на працягу месяца, за што атрымлівала грошы. Удзень на варце ў замку заставалася дзесяць выбранцаў, а ўначы ў замку павінны былі начаваць усе. Увосень пасля свята св. Міхаіла, якое адзначалася 29 верасня, усе выбранцы павінны былі збірацца ў замку і служыць у ім да вясны[486].

У 1637 г. Багуслаў Радзівіл правёў рэарганізацыю выбранецкай пяхоты і загадаў выбіраць з 10 валок зямлі аднаго нежанатага выбранца, «*такога, каб быў прыгожы, зграбны, рослы і каб меў да службы ахвоту*». Ім давалі паўвалокі зямлі, за якія не трэба было плаціць падаткі, але са сваіх прыбыткаў выбранец павінен быў набываць узбраенне. Акрамя таго, за службу яму плацілася яшчэ 4 злотыя ў месяц. Набор адбываўся наступным чынам. На сходзе сялян з вёскі на 30 валок прадстаўнікі магната выбіралі трох «*самых прыгожых і самых здольных*». Выбранцаў павінны былі перапісваць, а рэестры з іх імёнамі перадаваліся капітану, які камандаваў выбранецкай пяхотай. Б. Радзівіл планаваў павялічыць колькасць выбранцаў з Капыльскага і Слуцкага княстваў да 150 чалавек, аднак войны сярэдзіны XVII ст. не далі рэалізаваць гэтыя планы. У 1660-я гг. у Слуцку налічвалася 130 выбранцаў, апранутых «па-нямецку»[487]. Пры гэтым некаторая частка выбранцаў набіралася з зямян, дробнай шляхты і жаўнераў слуцкага гарнізона. Сам Б. Радзівіл заахвочваў сваіх слуцкіх ураднікаў надзяляць зямлёй побач з горадам з «усялякімі льготамі» найбольш здольных жаўнераў[488]. У канцы 1660-х гг. побач са Слуцкам, у вёсках Серагі, Варкавічы, Лучнікі, Агароднікі, Бранавічы і Паздзер, якія былі спустошаны ў час вайны, арганізавалі «калоніі», дзе выбранцаў пасялілі кампактна. У 1668 г. у выбранецкіх вёсках налічвалася 34 дымы, а ў 1693 г. – ужо 157[489]. У 1701 г. з гэтых вёсак планавалася набраць 140 выбранцаў[490].

На прыкладзе радзівілаўскага Слуцка добра бачна, што ў першай палове XVII ст. выбранцы былі найбольш прыдатныя якраз пры абароне ўмацаванняў. Яны з'яўляліся асновай гарнізонаў умацаваных рэзідэнцый, паколькі іх можна было хутка мабілізаваць. Для параўнання, паводле згаданай інструкцыі 1621 г., зямян меркавалася выкарыстоўваць для рознага кшталту даручэнняў. Клопат Б. Радзівіла аб выбранецкай пяхоце ў сярэдзіне XVII ст. сведчыць аб тым, што яна і надалей не страціла сваёй актуальнасці.

Шырокае выкарыстанне выбранцаў, верагодна, у найбольшай ступені практыкавалася Радзівіламі біржанскай галіны. У першай палове XVII ст. выбранецкая пяхота, па ўсёй верагоднасці, існавала пры большасці самых важных абарончых рэзідэнцыях магнатаў. Пры гэтым найбольшыя фарміраванні выбранцаў былі звязаны з галоўнымі рэзідэнцыямі роду. Вышэй згадвалася пра слуцкіх выбранцаў, колькасць якіх у XVII ст. складала 100–150 чалавек. Крыху менш іх было ў Біржанскім княстве. Так, у склад залогі Біржанскага

[486] AGAD. AR. Dz. VII. Sygn. 678. S. 5–8.

[487] *Rachuba A.* Siły zbrojne Wielkiego Księstwa Litewskiego w XVII wieku. S. 396–397.

[488] AGAD. AR. Dz. VII. Sygn. 678. S. 15–18.

[489] *Грыцкевіч А.* Беларускія выбранцы. С. 250–251.

[490] AGAD. AR. Dz. II. Supl. Sygn. 716.

замка ў 1625 г. уваходзіла 80 выбранцаў і ўсяго 30 зямян[491]. Меліся выбранцы таксама ў Койданаве, Копысі і Любчы[492]. Паводле падлікаў Г. Віснера, у 1630-я гг. біржанскія Радзівілы маглі выстаўляць каля 350 выбранцаў, з іх 100 – са Слуцка, 50 – з іншых маёнткаў на тэрыторыі Беларусі, астатнія 200 – з маёнткаў у Падляшшы, Жамойці і іншых зямель[493]. А паводле А. Рахубы, Крыштаф II Радзівіл мог мабілізаваць да 450 выбранцаў[494].

Менш увагі выбранцам надавалі прадстаўнікі нясвіжскай галіны роду. Вядома, што з восені 1655 да вясны 1656 г. на фартыфікацыйных працах у Нясвіжскім замку працавала «замкавая пяхота», якая складалася з 36 калдычаўскіх выбранцаў[495]. 30 чалавек пяхоты згадваецца ў рэестры нясвіжскага гарнізона за 1656 г. Пры гэтым у той жа час у замку служыла 163 зямяніна, пра якіх згадвалася вышэй[496]. Праўда, у гэтым рэестры пазначана, што пяхота была з Міра, а не з Калдычэва. Магчыма, гэтыя жаўнеры першапачаткова павінны былі забяспечваць абарону замка ў Міры, гэтаксама, як і зямяне з Жухавіч, пра якіх згадвае рэестр. Але ход вайны прымусіў Міхала Казіміра Радзівіла сканцэнтраваць усе свае баяздольныя падраздзяленні ў Нясвіжскім замку. На падставе гэтых звестак, можна зрабіць высновы, што нясвіжскія Радзівілы па практыцы ранейшых часоў для абароны ўмацаванняў прыцягвалі пераважна зямян, у той час як прадстаўнікі біржанскай галіны роду рабілі стаўку на выбранцаў. Гэта тлумачыцца тым, што біржанскія Радзівілы былі дасведчаныя ў ваеннай справе і разумелі вялікае значэнне пяхотных фармацый.

У сярэдзіне XVI – першай палове XVII ст. вялікакняская ўлада актыўна прыцягвала да нясення вайсковай службы стральцоў, які ахоўвалі лясы і пушчы і мелі вялікі вопыт валодання агнепальнай зброі. Паводле загаду Жыгімонта II Аўгуста, іх колькасць павінна была дасягнуць 300 чалавек. Пры Жыгімонце III у дзяржаўных валоданнях служыў 421 стралец. Але ў 1639 г. Уладзіслаў IV адмяніў для гэтай катэгорыі насельніцтва абавязак нясення ваеннай службы[497]. Пра выкарыстанне Радзівіламі стральцоў для абароны ўмацаванняў вядома з сярэдзіны XVII ст.[498] У 1701 г. для абароны Слуцка меркавалася прыцягнуць 100 стральцоў, а ў 1717 г. – 117[499]. Вядома таксама, што стральцы з Налібок і іншых уладанняў у 1706 г. былі сабраныя для абароны Нясвіжскага замка[500]. Нягледзячы на тыя перавагі, якія даваў лясным страль-

[491] *Wisner H.* Wojsko litewskie I połowy XVII wieku. Cz. 1. S. 119.

[492] *Rachuba A.* Siły zbrojne Wielkiego Księstwa Litewskiego w XVII wieku. S. 397.

[493] *Wisner H.* Wojsko litewskie I połowy XVII wieku. Cz. 1. S. 121.

[494] *Rachuba A.* Siły zbrojne Wielkiego Księstwa Litewskiego w XVII wieku. S. 396.

[495] *Metel'skij A. A.* Fortyfikacje zamku w Nieświeżu z końca XVI – początku XVIII wieku. S. 172.

[496] AGAD. AR. Dz. VII. Sygn. 675.

[497] *Lulewicz H.* Strzelcy z puszcz litewskich // Studia z dziejów Wielkiego Księstwa Litewskiego (XVI–XVIII wieku) / red. S. Górzyński, M. Nagielski. Warszawa, 2014. S. 273–286.

[498] Przyczynki do historyi domowej w Polsce: (Samuel Korecki, Adam Tarło, Bogusław Radziwiłł). S. 53.

[499] AGAD. AR. Dz. II. Supl. Sygn. 716; *Крывашэеў Д.* Налібоцкая пушча князёў Радзівілаў у XVI–XVIII стст.: фарміраванне тэрыторыі, адміністрацыя і службоўцы // Верхняе Панямонне : альм. лакальнай гісторыі. 2012. Вып. 1. С. 44.

[500] AGAD. AR. Dz. II. Sygn. 2098.

цам вопыт валодання агняпальнай зброяй, яны саступалі прафесійным жаўнерам па прычыне адсутнасці адпаведнай ваеннай падрыхтоўкі, слабой дысцыплінаванасці і нізкага баявога духу.

Да ваеннаабавязаных груп насельніцтва адносіліся таксама мяшчане, якія павінны былі клапаціцца аб забеспячэнні абароназдольнасці сваіх гарадоў, у тым ліку самі выходзіць на іх абарону. Кожны мешчанін быў абавязаны мець зброю і ўдзельнічаць у ваенных попісах і практыкаваннях. Асноўнай адзінкай гарадской міліцыі была сотня на чале з сотнікамі. Яны падзяляліся на дзясяткі на чале з дзясятнікамі і мелі вызначаныя адцінкі валу ці сцяны, якія павінны былі абараняць у выпадку нападу непрыяцеля. У вялікіх гарадах сотні аб'ядноўваліся ў палкі. Міліцыяй кіравалі войты і члены магістрату, якія ў сваю чаргу падпарадкоўваліся камендантам фартэцый.

Колькасны склад гарадской міліцыі напрамую залежаў ад колькасці гараджан. Набольш шматлікай была міліцыя Слуцка. У 1655 г. яна складалася з 4 палкоў, што ў сваю чаргу падзяляліся на 18 сотняў. Найбольшы полк узначальваў войт. У ім было 6 сотняў, з якіх 2 былі сфарміраваны з «гасцей», якія прыбылі ў горад у час вайны. У 1661 г. з прычыны ваенных разбурэнняў колькасны склад слуцкай міліцыі зменшыўся да 10 сотняў, якія аб'ядноўваліся ў 3 палкі і налічвалі 1019 чалавек. Пры гэтым у склад міліцыі ўваходзілі 259 «гасцей». Да канца XVII ст. абавязак па абароне горада быў ускладзены таксама на яўрэяў. У 1681 г. у слуцкім гарадскім апалчэнні налічвалася 1095 чалавек[501]. А ў 1701 г. камендант Слуцка разлічваў, што для абароны фартэцыі ён зможа выкарыстаць 1000 мяшчан і гарадскіх выбранцаў[502]. Апошніх пачалі набіраць у другой палове XVII ст. са слуцкіх мяшчан, якім выдавалася ўзбраенне з арсенала фартэцыі. Гэты крок тлумачыцца імкненнем павысіць баяздольнасць часткі гарадской міліцыі. Паводле інвентара 1669 г., выбранцам з воласці і горада было раздадзена 300 мушкетаў[503]. Паводле падлікаў А. Грыцкевіча, колькасць гарадскіх выбранцаў складала ад 100 да 130 чалавек[504]. Міліцыя іншых гарадоў Радзівілаў значна саступала па памерах слуцкай. Гарадское апалчэнне Копысі ў 1635 г. складалася з 5 сотняў. У 1706 г. у Нясвіжскім замку па загадзе Караля Станіслава Радзівіла было сабрана 300 нясвіжскіх мяшчан[505]. Верагодна, гэта і была ўся гарадская міліцыя Нясвіжа. Для параўнання, у Біржах у 1673 г. у міліцыі налічвалася 139 чалавек[506]. У час вайны 1654–1667 гг. мірскія мяшчане напалі і зрабавалі мястэчка Пясэчна, што, на нашу думку, сведчыць аб наяўнасці вайсковай арганізацыі жыхароў Міра[507].

---

[501] *Hryckiewicz A.* Milicje miast magnackich na Białorusi i Litwie w XVI–XVIII w. S. 48–50.

[502] AGAD. AR. Dz. II. Supl. Sygn. 716.

[503] Ibidem. Dz. VII. Sygn. 641. S. 5–11.

[504] *Hryckiewicz A.* Milicje miast magnackich na Białorusi i Litwie w XVI–XVIII w. S. 60–61.

[505] AGAD. AR. Dz. II. Sygn. 2098.

[506] *Hryckiewicz A.* Milicje miast magnackich na Białorusi i Litwie w XVI–XVIII w. S. 48–49.

[507] *Sahanowicz H.* Życie codzienne na Białorusi w warunkach wojny według skarg poddanych radziwiłłowskich z lat pięćdziesiątych i sześćdziesiątych XVII wieku. S. 320.

У XVI–XVII стст. шырока практыкавалася выкарыстанне розных груп ваеннаабавязанага насельніцтва ў ваенных мэтах, у тым ліку для абароны ўмацавання, аднак іх значэнне няўхільна зніжалася. Урэшце ваенныя фарміраванні такога роду сталі выкарыстоўвацца ў рэпрэзентацыйных мэтах і для вырашэння рознага кшталту ўнутрыпалітычных канфліктаў. Напрыклад, у 1695 г. Караль Станіслаў Радзівіл зрабіў спробу захапіць «нойбургскія» маёнткі, у тым ліку Слуцкае княства, сабраўшы са сваіх маёнткаў ажно некалькі тысяч рознага кшталту «*слуг, пяхоты, драгунаў, зямян, баяр і падданых*»[508]. Нягледзячы на шматлікасць сабранага магнатам войска, гэтая акцыя не мела поспеху, што сведчыць аб невялікай эфектыўнасці фармаванняў, сабраных на хуткую руку з ваенаабавязанага насельніцтва. Гэта выразна праявілася і ў час няўдалай абароны Нясвіжскага замка ў 1706 г. Калі да фартэцыі падышло загартаванае ў баях шведскае войска з самім каралём Карлам XII на чале, з яе ўжо ўцякла частка гарнізона: стральцы з Налібок і іншых мясцовасцей, а таксама выбранцы. Тым не менш камендант з «*жаўнерамі і з той невялікай горсткай людзей*» вырашыў бараніцца. Аднак 300 мяшчан, сабраныя для абароны замка, пастанавілі, што не падымуць зброю, паколькі не бралі на сябе абавязак абараняць замак, а калі камендант вырашыць бараніцца, то будуць наўпрост уцякаць праз вал. Як адзначалася ў лісце да ўласніка, складзеным пасля капітуляцыі, панічныя настроі сярод мяшчан раслі яшчэ задоўга да прыходу непрыяцеля. У прыватнасці, іх справакавалі ад'езд з замку нясвіжскага губернатара Станіслава Міхала Маляўскага і прымусовая прысяга на вернасць князю. Таму яшчэ да прыходу шведаў мяшчане прасілі, каб ім дазволілі выйсці з умацавання, і нават спрабавалі сілай прымусіць каменданта выпусціць іх. Не вызначаліся высокім маральным духам стральцы і выбранцы, якія складалі большасць гарнізона. Яшчэ ў 1702 г. адміністратар княства Самуэль Тышэвіч пісаў, што стральцы ва ўмовах надзвычайнай небяспекі адкрыта адмаўляліся выконваць свае абавязкі па падрыхтоўцы фартэцыі да абароны. Катэгарычная пазіцыя мяшчан, змяншэнне колькаснага складу гарнізона ў выніку ўцёкаў і нізкі маральны дух абаронцаў не пакінулі каменданту іншага выбару, як здаць фартэцыю[509]. Тым не менш ваеннаабавязанымі падданымі Радзівілы карысталіся і надалей, што тлумачылася імкненнем ашчадзіць грошы. Напрыклад, у 1764 г., калі расійскія войскі падышлі да Нясвіжа, тагачасны нясвіжскі ардынат Караль Станіслаў Радзівіла загадаў сабраць зямян і мяшчан для абароны замка[510].

5.2. Найманыя жаўнеры

З пачатку XVI ст. для вядзення войнаў у ВКЛ пачалі выкарыстоўваць найманых жаўнераў, якія ўмацоўвалі паспалітае рушанне і служылі ў гарнізонах замкаў. У другой палове XVI – XVII ст. колькасны склад найманых аддзелаў не быў вялікі, але за кошт добрай падрыхтоўкі і высокай баяздольнасці

[508] *Rachuba A.* Siły zbrojne Wielkiego Księstwa Litewskiego w XVII wieku. S. 397.
[509] *Волкаў М.* Нясвіжскі замак у Вялікай Паўночнай вайне. С. 229.
[510] *Taurogiński B.* Z dziejów Nieświeża. S. 108–111.

яны дзейнічалі больш эфектыўны, чым сабраная ў паспалітае рушанне шляхта. Таму ў разгляданы перыяд шляхецкае апалчэнне паступова страціла сваё значэнне, а найманыя атрады сталі асновай дзяржаўнага войска. У 1578 г., падчас планавання пахода на Полацк, кароль Стэфан Баторый адмыслова адмовіўся ад яго ўжывання на карысць найманага войска. А дасведчаны ў ваеннай справе Крыштаф II Радзівіл у 1621 г. выступіў за поўную ліквідацыю паспалітага рушання[511]. Разлажэнне шляхецкага апалчэння стала відавочным у час вайны 1654–1667 гг., напачатку якой шляхта проста разбягалася, уражаная поспехамі і памерамі войскаў цара, а абарона краіны была ўскладзена на невялікую найманую армію.

Па прыкладзе манарха магнаты пачалі наймаць на службу надворныя харугвы, якія сталі найбольш баяздольнай часткай прыватнаўласніцкіх войск. Напрыканцы панавання Жыгімонта III надворныя аддзелы магнатаў, у тым ліку Радзівілаў, не былі вялікія і складаліся з некалькіх дзясяткаў ці сотняў жаўнераў. Крыштаф II Радзівіл утрымліваў толькі адну пешую харугву, у якой у 1621 г. налічвалася 78 чалавек, у 1631 г. – 59, а ў 1634 г. – 31[512]. Да таго ж прыватныя аддзелы былі пераважна пешымі, утрыманне якіх было таннейшым. У 1628 г. згаданы К. Радзівіл выправіўся на сойм у суправаджэнні 100-асабовай надворнай пяхоты[513]. Верагодна, пехуроў у першай чвэрці XVII ст. у Слуцку ўтрымліваў таксама Януш Радзівіл. Так, у інвентары 1620 г. згадваецца, што апроч 87 мушкетаў, раздадзеных выбранцам, яшчэ 62 стрэльбы былі перададзены «*пану Корсаку на пяхоту*»[514]. Сітуацыя змянілася ў час панавання Уладзіслава IV, што, паводле Г. Віснера, было звязана з пэўнай зменай шляхецкай ментальнасці, пашырэннем ганарлівасці, а таксама з павышэннем вонкавай і ўнутранай напружанасці ў дзяржаве[515]. У гэты час памеры надворных аддзелаў магнатаў, у тым ліку Радзівілаў, істотна ўзраслі. У 1640 г. К. Радзівіл меў дзве харугвы: татарскую ў 100 коней і драгунскую ў 60 коней, а яго сын Януш у 1648 г. заязджаў у Вільню на чале 200 драгунаў і 100 гайдукоў[516]. У выключных выпадках «асістэнцыя» магнатаў магла значна павялічвацца. Так, на пахаванні К. Радзівіла было выстаўлена 13 харугваў, якія складаліся з ваеннаабавязанага насельніцтва і найманых жаўнераў[517].

У мірны час найманыя надворныя харугвы выкарыстоўваліся для рэпрэзентацыйных мэт і для асабістай аховы ўласнікаў, але ў выпадку патрэбы іх маглі накіроўваць для выканання ваенных задач, у тым ліку для абароны рэ-

---

[511] *Wisner H.* Wojsko litewskie I połowy XVII wieku. Cz. 1. S. 94–100; *Rachuba A.* Siły zbrojne Wielkiego Księstwa Litewskiego w XVII wieku. S. 382–386; *Сагановіч Г. М.* Войска Вялікага княства Літоўскага ў XVI–XVII стст. С. 6–17.

[512] *Rachuba A.* Siły zbrojne Wielkiego Księstwa Litewskiego w XVII wieku. S. 394.

[513] *Augustyniak U.* Dwór i klientela Krzysztofa Radziwiłła: (1585–1640): mechanizmy patronatu. S. 95.

[514] AGAD. AR. Dz. VII. Sygn. 641. S. 1–2; Dz. XXVI. Sygn. 759.

[515] *Wisner H.* Wojsko litewskie I połowy XVII wieku. Cz. 1. S. 115–118.

[516] *Rachuba A.* Siły zbrojne Wielkiego Księstwa Litewskiego w XVII wieku. S. 394.

[517] *Augustyniak U.* Dwór i klientela Krzysztofa Radziwiłła: (1585–1640) : mechanizmy patronatu. S. 138, 359.

зідэнцый. У першай палове XVII ст. аснову гарнізонаў прыватнаўласніцкіх рэзідэнцый складалі выбранцы і зямяне. Сітуацыя змянілася з пачаткам зацяжных войн, калі магнаты былі вымушаны для абароны сваіх фартэцый засяроджваць значныя ваенныя сілы. Аднак утрымліваць шмат наймітаў маглі толькі найбагацейшыя магнаты і тое не доўгі час. Таму яны імкнуліся перавесці свае ваенныя аддзелы на ўтрыманне дзяржаўнага скарбу. Абгрунтаваннем было выкарыстанне гэтых аддзелаў для абароны фартэцый, што служыла інтарэсам дзяржавы. Вышэй згадваўся прыклад Міхала Казіміра Радзівіла, які імкнуўся атрымаць ад дзяржавы кампенсацыю за ўтрыманне «нясвіжскага гарнізона». Падобным чынам дзейнічаў і Багуслаў Радзівіл, хаця ў адрозненне ад свайго родзіча з нясвіжскай галіны ён хацеў атрымаць грошы на жаўнераў, якія сапраўды служылі ў яго фартэцыі. Паводле попісу 10 студзеня 1662 г., у Слуцку мелася 1000 жаўнераў: 115 драгунаў, 765 нямецкай і 100 польскай пяхоты і 20 пушкароў. За 3,5 гады слуцкаму гарнізону трэба было выплаціць 538 985 злотых 12 грошаў 9 дынарыяў. Пры гэтым са Слуцкага і Капыльскага княстваў за згаданы перыяд удалося сабраць усяго 73 971 злоты 7 грошаў. Такім чынам, выдаткі на ўтрыманне такога вялікага гарнізона перавышалі эканамічныя магчымасці слуцкай латыфундыі, самай значнай у ВКЛ[518].

Паколькі ўтрыманне значнага кантынгенту найманых ваенных падраздзяленняў перавышала эканамічныя магчымасці нават самых багатых землеўласнікаў, яны шукалі магчымасці да іх скарачэння і эканоміі сродкаў. Пасля заканчэння вайны 1654–1667 гг. надворныя войскі магнатаў былі зменшаны. Напрыклад, нясвіжскі ардынат Міхал Казімір Радзівіл, які з'яўляўся польным гетманам і падканцлерам, меў харугву вугорскай пяхоты ў 47 чалавек. Далейшы рост колькасці наёмных атрадаў прыпадае на канец XVII – пачатак XVIII ст., што было звязана з абвастрэннем унутры- і знешнепалітычнай сітуацыі. Так, у 1700 г. нясвіжскі ардынат Караль Станіслаў Радзівіл ахвяраваў на службу Аўгусту II гвардыю ў 60 рэйтараў і 100 драгунаў[519].

У час войнаў сярэдзіны – другой паловы XVII ст. найманыя падраздзяленні даказалі высокую эфектыўнасць пры абароне ўмацаванняў. Напрыклад, у 1655 г. у найбольш крытычны для Слуцка момант, калі да горада падышло вялікае злучэнне маскоўскіх і казацкіх войск, ключавую ролю ў абароне горада адыгралі найманыя падраздзяленні, колькасны склад якіх не перавышаў 1000 чалавек. Пры гэтым гарадская міліцыя, колькасць якой складала каля 1800 чалавек, выконвала дапаможную ролю і займалася будаўніцтвам фартыфікацый. Вялікае значэнне найманых падраздзяленняў палягала не толькі ў высокіх баявых якасцях, але і ў вернасці гаспадару. Тыя ж слуцкія мяшчане ў XVI–XVII стст. мелі вялікія сімпатыі да казакаў, таму ўраднікі Багуслава

[518] AGAD. AR. Dz. VII. Sygn. 678. S. 65–79.

[519] *Rachuba A.* Siły zbrojne Wielkiego Księstwa Litewskiego w XVII wieku. S. 395; *Sawicki M.* Działania wojenne w Rzeczypospolitej w latach 1700–1713 w świetle pamiętnika Karola Stanisława Radziwiłła // Вялікае Княства Літоўскае і суседзі: Права. Вайна. Дыпламатыя / рэд. С. Ф. Сокал, А. М. Янушкевіч. Мінск, 2012. С. 240.

Радзівіла небеспадстаўна баяліся здрады[520]. Таму ў другой палове XVII ст. у найбольшых значных рэзідэнцыях Радзівілы пачалі ўтрымліваць сталыя гарнізоны, якія складаліся з прафесійных жаўнераў.

У другой палове XVII – пачатку XVIII ст. найбольшы гарнізон утрымліваўся ў Слуцку (табл. 14). У час вайны 1654–1667 гг. ён дасягаў 1000 чалавек[521]. Напрыканцы вайны Б. Радзівіл стаў рабіць крокі да скарачэння гарнізона. Ужо ў 1664 г. ён быў зменшаны да 393 чалавек. Паводле меркаванняў магната, у Слуцку можна было ўтрымліваць залогу ў 500 чалавек, ядро якой фарміравалі 200 чалавек служылай пяхоты і 40 драгунаў. Да гарнізона ён таксама прылічваў мескіх выбранцаў і 200 «казакаў», ці зямян[522]. У другой палове XVII ст. памер слуцкага гарнізона вагаўся ў межах 200–400 чалавек[523]. Пры гэтым са Слуцка забяспечваліся жаўнерамі меншыя рэзідэнцыі. Так, у 1668 г. 20 слуцкіх жаўнераў служылі ў Копысі, а 3 – у Койданаве[524]. У 1701–1704 гг., гэта значыць напачатку Вялікай Паўночнай вайны, у Слуцку служыла 179–187 прафесійных жаўнераў[525]. Для абароны фартэцыі ў выпадку ваеннай небяспекі камендант разлічваў прыцягнуць 200 зямян (2 харугвы), 140 сельскіх выбранцаў, 1000 мяшчан з мескімі выбранцамі 100 стральцоў, сабраўшы агулам 1622 чалавек[526]. Паводле звестак шведаў, якія ўвайшлі ў Слуцк у 1706 г., мясцовы гарнізон налічваў 500 чалавек[527], аднак у яго, па ўсёй верагоднасці, апроч прафесійных жаўнераў, уваходзілі таксама зямяне і выбранцы. Такой залогі было, відавочна, мала, каб абараніць фартэцыю, працягласць абарончага перыметра якога складала каля 3,5 км.

Табліца 14. **Гарнізоны ў рэзідэнцыях Радзівілаў**

Гарнізон	1620	1662	1664	1668 (праект)	1668	1673	1675	1685	1692	1700	1701	1703	1704	1706
Глуск	–	–	–	–		–	–	–	21	–	–	–	–	–
Койданава	–	–	–	–	3	–	–	–	–	–	–	–	–	–
Копысь	–	–	–	–	20	–	–	–	–	–	–	–	–	–
Афіцэры	–	–	–	–	1	–	–	–	–	–	–	–	–	–
Пяхота	–	–	–	–	19	–	–	–	–	–	–	–	–	–
Нясвіж	–	194	–	–	–	–	62	–	–	104	–	–	–	≈ 90
Афіцэры і падафіцэры	–	–	–	–	–	–	6	–	–	5	–	–	–	–
Пяхота	–	–	–	–	–	–	55	–	–	95	–	–	–	–
Іншыя	–	–	–	–	–	–	1	–	–	4	–	–	–	–

[520] AGAD. AR. Dz. V. Sygn. 5569/I. S. 79–82; Sygn. 6865/I. S. 189–192; Sygn. 6865/III. S. 134.

[521] Ibidem. Dz. VII. Sygn. 678. S. 65–79.

[522] Przyczynki do historyi domowej w Polsce: (Samuel Korecki, Adam Tarło, Bogusław Radziwiłł). S. 52–53.

[523] AGAD. AR. Dz. VII. Sygn. 678. S. 105–107, 109–115, 121, 188, 191.

[524] *Kossarzecki K.* Fortece i zamki radziwiłłowskie w XVII–XVIII w. na podstawie zachowanych archiwaliów w Archiwum Warszawskim Radziwiłłów. S. 54, 61.

[525] AGAD. AR. Dz. VII. Sygn. 678. S. 121, 188.

[526] Ibidem. Dz. II. Supl. Sygn. 716.

[527] *Nordberg J. A.* Histoire De Charles XII Roi De Suede. P. 90.

Гарнізон	1620	1662	1664	1668 (праект)	1668	1673	1675	1685	1692	1700	1701	1703	1704	1706
Слуцк	≥ 149	1000	338	267	265	433		> 10			182	187	179	≈ 500
Афіцэры і падафіцэры	–	–	≥ 9	26	≥ 9	–	–	–	–	–	–	26	20	–
Драгуны (з іх пешыя)	–	115	86	50	96	–	–	–	–	–	77	72 (42)	72	–
Пяхота нямецкая	–	765	238	164	164	–	–	–	–	–	93	78	78	–
Пяхота польская, вугорская, гайдукі	≥ 62	100		20		–	–	–	–	–	–	–	–	–
Пушкары (з іх памочнікі)	–	20	11	5	–	–	–	10 (3)	–	–	11 (4)	7	7	–
Іншыя	–	–	3	2	5	–	–	–	–	–	1	4	2	–

НГАБ. Ф. 694. Воп. 7. Спр. 846. Арк. 2 адв. – 14 адв.; AGAD. AR. Dz. II. Supl. Sygn. 716; Dz.V. Sygn. 16645. S. 7; Dz. VII. Sygn. 641. S. 1–2; Sygn. 675; Sygn. 678. S. 65–79, 105–107, 109–115, 121, 188, 191; Dz. XXVI. Sygn. 759; Adlerfeld G. The military history of Charles XII. King of Sweden. P. 224; Nordberg J. A. Histoire De Charles XII Roi De Suede. P. 88; Kossarzecki K. Fortece i zamki radziwiłłowskie w XVII–XVIII w. na podstawie zachowanych archiwaliów w Archiwum Warszawskim Radziwiłłów. S. 54, 61.

Сталы гарнізон з прафесійных жаўнераў меўся ў другой палове XVII ст. у Нясвіжскім замку. У 1675 г. у ім служылі 62 жаўнеры[528]. Па колькасным складзе ён быў роўны гарнізону Біржанскага замка, у якім у 1674 г. служылі 48 пешых жаўнераў, 12 драгунаў і 10 выбранцаў[529]. Нясвіжскі гарнізон быў у некалькі разоў меншы за слуцкі, аднак і яго ўтрыманне патрабавала значных выдаткаў. Таму Караль Станіслаў Радзівіл пасля таго, як у 1680 г. яму перайшла нясвіжская ардынацыя, распусціў залогу. У выніку напярэдадні Вялікай Паўночнай вайны ў Нясвіжскім замку не было ніводнага жаўнера. Толькі напачатку ваенных дзеянняў магнат прызначыў каменданта і наняў каля 100 жаўнераў для абароны фартэцыі. Аднак, як паказалі далейшыя падзеі, такі гарнізон быў занадта малы для абароны ад рэгулярнай шведскай арміі. Для параўнання, супрацьстаяць шведам у гэты час наважыліся фартэцыя ў Жаберы з гарнізонам у 800 чалавек і Ляхавіцкі замак, у гарнізоне якога знаходзілася 300 прафесійных жаўнераў і каля 1000 казакаў[530]. Невялікі гарнізон з 21 жаўнера ў 1692 г. быў таксама ў Глускім замку[531]. Такім чынам, нават самыя магутныя фартэцыі

[528] AGAD. AR. Dz. VII. Sygn. 678. S. 9–10.

[529] *Augusiewicz S.* Garnizon Birż w latach 1659–1687 i jego komendant Karol Karlick von Nezetitz. S. 289–291.

[530] *Adlerfeld G.* The military history of Charles XII. King of Sweden. P. 224; *Nordberg J. A.* Histoire De Charles XII Roi De Suede. P. 88; *Волкаў М. А., Ліневіч С. Б.* Гісторыя і ваенны патэнцыял Жаберскага замка паводле пісьмовых і археалагічных крыніц // Архіварыус. Мінск, 2017. Вып. 15. С. 133.

[531] НГАБ. Ф. 694. Воп. 7. Спр. 846. Арк. 2 адв. – 14 адв.

Радзівілаў, як Нясвіж і Слуцк, не былі забяспечаны напачатку Вялікай Паўночнай вайны моцнымі залогамі. Галоўнай прычынай такога становішча была адсутнасць сродкаў у іх уласнікаў для ўтрымання вялікай колькасці жаўнераў.

У XVI – пачатку XVII ст. абарону замка ўзначальваў стараста ці галоўны адміністратар, прызначаны ўласнікам. У першай палове XVII ст. Радзівілы пачалі ставіць на чале сваіх гарнізонаў прафесійных афіцэраў. Вышэй згадвалася пра інструкцыю капітану, які ў 1621 г. быў накіраваны ў Слуцк у якасці каменданта, якому падпарадкоўвалася як замкавая залога, так і гарадская міліцыя. Практычна ўсе каменданты фартэцый Багуслава Радзівіла рэкрутаваліся з падуладных яму войскаў у Прусіі. Пры гэтым магнат адмыслова прызначаў камендантамі замежнікаў, якія, на яго думку, былі больш вернымі. Каменданту належала ўся вайсковая ўлада ў горадзе, тым не менш ён мусіў падпарадкоўвацца губернатару, якога Б. Радзівіл прызначыў для кіравання княствам. У час вайны 1654–1667 гг. магнат таксама прысылаў у Слуцк камісараў, якія маглі здымаць з пасады каменданта[532]. У падпарадкаванні апошняга меўся афіцэрскі штаб, які складаўся з паручнікаў, вахмістраў, харужых, капітанаў, правіянтмайстра і цэйгварта. Агулам афіцэраў і падафіцэраў у Слуцку ў другой палове XVII ст. было каля 20–30 чалавек[533]. У Нясвіжы, які меў больш сціплы гарнізон, колькасць афіцэраў і падафіцэраў не перавышала 6 чалавек.

Аснову гарнізона Слуцка ў сярэдзіне – другой палове XVII ст. складалі пяхота і драгуны. У гэтым бачна тэндэнцыя развіцця тагачаснай ваеннай справы, для якой было характэрна павышэнне ролі пяхоты. Да таго ж пешыя жаўнеры былі найбольш прыдатныя для абароны ўмацаванняў. Аддзелы, якія фарміраваліся з мясцовых жаўнераў, называліся пяхотай польскага, літоўскага ці вугорскага тыпаў. Пяхота такога кшталту, як правіла, была арганізавана ў харугвы па 100 чалавек на чале з ротмістрамі, якія былі шляхцічамі па паходжанні. Харугва фарміравалася наступным чынам: таварышы, якія, як правіла, былі шляхцічамі, дамаўляліся аб службе з ротмістрам і набіралі почат з 2–3 жаўнераў-пахолкаў, з якім уваходзілі ў склад харугвы. Пахолкамі часта былі нешляхцічы. Ротмістр меў у памочніках аднаго ці двух паручнікаў. Харугва дзялілася на дзясяткі на чале з дзясятнікамі. Акрамя грашовых выплат, уласнік забяспечваў шараговых жаўнераў сукном, з якога шылі аднолькавае абмундзіраванне. Адным з недахопаў мясцовай пяхоты была неабходнасць яе доўгай падрыхтоўкі, бо пешыя фарміраванні для дасягнення высокай баяздольнасці павінны былі мець добрую падрыхтоўку і дысцыпліну. Таму на працягу XVII ст. яе выцесніла іншаземная пяхота. Да пяхоты мясцовага набору, верагодна, адносіўся аддзел Корсака, які згадваецца ў слуцкім гарнізоне ў 1621 г. Харугва польскай пяхоты са 100 чалавек была ў Слуцку ў 1662 г. Але ў далейшым яе больш не вербавалі, аддаючы перавагу пяхоце іншаземнага тыпу. У другой палове XVII ст. нават выбранцаў апраналі і муштравалі на ўзор апошняй.

---

[532] *Miłuński M.* Zarząd dóbr Bogusława Radziwiłła w latach 1636–1669. S. 215, 233, 240.

[533] AGAD. AR. Dz. VII. Sygn. 678. S. 19–21, 105–107, 109–115.

Без увагі на паходжанне жаўнераў іншаземную пяхоту, як правіла, называлі нямецкай. Да Смаленскай вайны 1632–1634 гг. аддзелы нямецкай пяхоты у ВКЛ і Рэчы Паспалітай былі не большыя за 300 чалавек. З 1632 г. пачалі з'яўляцца палкі, у складзе якіх налічвалася да 1000 жаўнераў, што было больш эфектыўна пры вядзенні боя пяхотай. Яна была арганізавана па нямецка-галандскім узоры. На чале палка нямецкай пяхоты стаяў оберстэр, ці оберст. Калі апошні выконваў намінальныя функцыі, кіраваў палком оберст-, ці оберстэр-лейтэнант. Полк меў развіты штаб і падзяляўся на 8–12 кампаній па 100–300 чалавек. Кампаніямі кіравалі афіцэры, а на чале лейбкампаніі стаяў кіраўнік палка. Кампаніі дзяліліся на роты па 5 чалавек, якімі кіравалі капралы. Пераважную большасць складалі ўзброеныя мушкетамі жаўнеры. Апроч таго, да 1/3 атрадаў складалі пікенёры. Заробак жаўнераў раўняўся заробку гусараў, якія лічыліся элітнай часткай кавалерыі, таму нямецкая пяхота была вельмі дорагой. У 1630-я гг. палкі нямецкай пяхоты ў ВКЛ пачалі фарміраваць з мясцовых людзей, што было нашмат танней, чым наймаць іншаземцаў. Пры гэтым кіравалі такой пяхотай выключна іншаземныя афіцэры. Першапачаткова вынікі выкарыстання пяхоты такога кшталту былі невысокія, аднак пазней яна пачала цаніцца[534].

У Слуцк на пачатку вайны 1654–1667 гг. Багуслаў Радзівіл увёў значны вайсковы кантынгент з прафесійных жаўнераў. Аснову гарнізона складала нямецкая пяхота, якой налічвалася 765 чалавек. Яе ўзначальваў сам камендант. Першым яе главой быў оберсштэр Уільям Патэрсан, які арганізаваў паспяховую абарону горада ў 1655 г. У далейшым разам са скарачэннем гарнізона была зменшана і колькасць нямецкай пяхоты, аднак яна засталася яго галоўным складнікам. Так, у 1668 г. нямецкая пяхота складала 3/5 гарнізона, а астатнія былі драгунамі. На пачатку XVIII ст. колькасць пешых жаўнераў і драгунаў зраўнялася. Як можна меркаваць па спісе жаўнераў Нясвіжскага замка 1675 г., мясцовы гарнізон складаўся выключна з пяхоты іншаземнага строю. Яна падзялялася на 10 рот, у якіх было па 6 чалавек[535].

У першай чвэрці XVII ст. з'яўляецца новая вайсковая фармацыя – драгуны, які ваявалі пешшу, але перамяшчаліся на конях. Першая драгунская кампанія з'явілася ў 1618 г. у войску Крыштафа Радзівіла, а ў сярэдзіне XVII ст. яны складалі ажно 22,5 % войска. Пры Уладзіславе IV пяхота і драгуны складалі да 64 % войска. Падобную сітуацыю назіраем і ў арміі Януша Радзівіла, у час войнаў з казакамі ў 1649–1653 гг., дзе колькасць пешых і драгунаў складала 52,5–63,6 %. Найбольшага росквіту драгуны як род войска дасягнулі ў час вайны 1654–1667 гг. Яны былі аднолькава прыдатныя для войнаў з Расіяй і Швецыяй, каштавалі даволі танна і спалучалі такія якасці, як моцны агонь пяхоты і хуткасць конніцы. У час гэтай вайны колькасць драгунаў і пяхоты складала 54 %, і гэтая прапорцыя захавалася і цягам другой паловы XVII ст. Драгунаў доўгі час залічвалі да пяхоты, бо яны былі арганізаваны на ўзор нямецкай пяхоты. Часам драгунскія аддзелы фарміравалі наўпрост з пешых аддзелаў. У драгуны ішла служыць як мясцовая шляхта, так і людзі

[534] *Wisner H.* Wojsko litewskie I połowy XVII wieku. Cz. 3. S. 107–113.

[535] AGAD. AR. Dz. VII. Sygn. 678. S. 9–10.

нешляхецкага паходжання. Таксама ў драгуны імкнуліся трапіць выбранцы[536]. У Слуцку ў сярэдзіне – другой палове XVII ст. служыла харугва драгунаў, колькасць жаўнераў у якой вагалася ад 50 да 114. Неабходнасць утрымання драгунаў тлумачылася вялікай плошчай княства, у межах якога слуцкі гарнізон павінен быў падтрымліваць парадак. Акрамя ваенных выпраў, драгунаў таксама пасылалі для выканання рознага кшталту даручэнняў.

Важнай часткай гарнізонаў у XVI–XVII ст. былі пушкары, якія абслугоўвалі артылерыю. У XVI ст. распаўсюджанай была практыка надзялення пушкароў зямлёй побач з замкамі, за што яны павінны былі абслугоўваць узбраенне і вырабляць порах. У XVII ст. пашырылася практыка найму прафесійных пушкароў. У першай чвэрці XVII ст. на сталым утрыманні ў Нясвіжскім замку знаходзіўся толькі адзін замкавы пушкар Давід Бухольц, які выконваў функцыі цэйгварта, ці загадчыка цэйхгаўза. Паводле інструкцыі 1621 г., меліся пушкары і ў Слуцку. У ваенны час колькасць пушкароў узрастала. Падчас вайны 1654–1667 гг. у Нясвіжскім замку служыла 4–5 пушкароў, для якіх на дзядзінцы паблізу заходняга бастыёна быў спецыяльна пастаўлены драўляны будынак. У канцы 1655 г. разам з больш чым 250 жаўнерамі слуцкага гарнізона Багуслава Радзівіла ў замак увайшлі пяць пушкароў: Рудольф Вебер, Андрэс Хал, Генрых Фельш, Генрых фон Фер і Міхель Гірш[537]. Па прозвішчах пушкароў можна зрабіць выснову, што яны былі завербаваны ў нямецкамоўных землях. У Слуцку ў гэты час колькасць пушкароў дасягнула 20 чалавек. Пасля завяршэння вайны іх колькасць была зменшана. У другой палове XVII – пачатку XVIII ст. у Слуцку ўтрымлівалася ад 5 да 10 пушкароў. У сваю чаргу ў Нясвіжы ў канцы XVII ст. служыла ад 1 да 3 пушкароў. Мяркуючы па іх нізкіх заробках, а таксама па мясцовым паходжанні (Мікалай, Васіль і Іван Раманішка), гэта былі спецыялісты нізкай кваліфікацыі, на ўтрыманні якіх уласнік усяляк ашчаджаў[538]. У далейшым нясвіжскі ардынат К. С. Радзівіл увогуле адмовіўся ад утрымання пушкароў. Таму ў 1700 г., напярэдадні Вялікай Паўночнай вайны, у замку не было ніводнага пушкара. Гэта негатыўна адбівалася на абароназдольнасці фартэцыі.

У XVII ст. пры нясвіжскім і слуцкім гарнізонах існавала пасада цэйгварта. Яго асноўнай задачай было захаванне артылерыі, ручной агняпальнай зброі, амуніцыі і пораху. Пры неабходнасці цэйгварт павінен быў рамантаваць зброю і гарматы альбо даручаць гэтую справу рамеснікам. Як дасведчаны пушкар ён мусіў вырабляць і запраўляць рознага кшталту «агністыя» снарады і бомбы для гармат. У выпадку недахопу рыштунку ці матэрыялаў для вырабу боепрыпасаў і направы зброі ў абавязкі цэйгварта ўваходзіла своечасовае інфармаванне аб гэтым каменданта альбо ўладальніка замка. Падчас ваеннай небяспекі цэйгварт павінен быў пастаянна знаходзіцца ў замку і пры патрэбе выдаваць абаронцам неабходную амуніцыю[539].

---

[536] *Wisner H.* Wojsko litewskie I połowy XVII wieku. Cz. 3. S. 113–116.

[537] AGAD. AR. Dz. XI. Sygn. 48. S. 76–83.

[538] НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 56.

[539] AGAD. AR. Dz. XXVI. Sygn. 53.

ЗАКЛЮЧЭННЕ

Замкі і фартэцыі Радзівілаў у XVI – пачатку XVIII ст. з'яўляліся абарончымі, адміністрацыйнымі, эканамічнымі, культурнымі і рэлігійнымі цэнтрамі зямельных латыфундый роду. Важнейшай іх задач была абарона ўласнікаў, іх маёмасці, а таксама дэмаграфічнага і эканамічнага патэнцыялу ўладанняў магнатаў, таму забеспячэнню іх абароназдольнасці надавалася значная ўвага.

Узвядзенне і забеспячэнне замкаў і фартэцый ва ўладаннях Радзівілаў залежала ад фактараў ваеннага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага характару. Да чыннікаў ваеннага характару адносяцца эвалюцыя ваеннай тэхнікі і ўзбраення, а таксама ваенна-стратэгічная і ваенна-палітычная сітуацыя ў рэгіёнах, дзе знаходзіліся рэзідэнцыі. Гэтыя фактары аказвалі ўплыў на актыўнасць абарончага будаўніцтва, тып фартыфікацыйных умацаванняў і характар забеспячэння рэзідэнцый зброяй і гарнізонамі. У XVI–XVII стст. прадстаўнікі роду мэтанакіравана набывалі землі пераважна ў цэнтральных рэгіёнах ВКЛ. Аднак паколькі сістэма абароны граніц дзяржавы была недасканалай, большасць замкаў і фартэцый Радзівілаў, што знаходзіліся на беларускіх землях, так ці інакш былі ўключаны ў сістэму абароны ўсходняга і паўднёва-ўсходняга тэатраў ваенных дзеянняў (Глуск, Давыд-Гарадок, Клецк, Копысь, Мір, Нясвіж, Свіслач, Слуцк).

Ад сацыяльна-эканамічнага патэнцыялу зямельных комплексаў, у цэнтры якіх знаходзіліся рэзідэнцыі, залежаў маштаб абарончага будаўніцтва. Утварэнне вялікіх зямельных латыфундый прадстаўнікамі роду дало моцны стымул для разбудовы і ўмацавання абарончага патэнцыялу рэзідэнцый. З аднаго боку, будаўніцтва ўмацаванняў было неад'емнай часткай працэсу гаспадарчага асваення зямель латыфундый, паколькі сядзібы стваралі ўмовы для развіцця і жыццядзейнасці гандлёва-рамесных паселішчаў і сельскіх ваколіц. З іншага боку, дзейнасць магнатаў, скіраваная на павелічэнне прыбытковасці сваіх зямельных латыфундый праз іх узбуйненне, рэарганізацыю старой структуры, развіццё інфраструктуры і ўдасканаленне адміністрацыі, стварала перадумовы для ўзвядзення і функцыянавання магутных абарончых комплексаў у іх цэнтрах. Пры гэтым мадэрнізацыя эканамічнай сістэмы вялікіх зямельных комплексаў суправаджалася змяненнем канцэпцыі іх абароны, у выніку чаго ўсе сродкі скіроўваліся на забеспячэнне цэнтральных рэзідэнцый, а другарадныя сядзібы прыходзілі ў заняпад.

З пачатку XVI ст. у значнай ступені ў выніку культурных уплываў краін Цэнтральнай і Заходняй Еўропы абарончыя рэзідэнцыі сталі адным з важнейшых элементаў дынастычна-станавага самаўсведамлення магнатаў ВКЛ. Пры гэтым абарончая архітэктура мела высокае сімвалічнае значэнне, бо ўвасабляла магутнасць і становішча ў грамадстве ўласнікаў умацаваных рэзідэнцый. Знакавае напаўненне меў як увесь архітэктурны комплекс, так і асобныя яго дэталі. Таму выгляд рэзідэнцый быў вельмі важны для рэпрэзентацыі статусу ўласнікаў.

У XVI – пачатку XVIII ст. Радзівілам на землях Беларусі належалі 16 замкаў і фартэцый, пры чым многія з іх перайшлі ў валоданне роду як сфарміраваныя комплексы, якія новыя ўласнікі так ці інакш мадэрнізавалі. Іх ваенны патэнцыял залежаў ад якасці абарончых умацаванняў, узбраення і гарнізонаў. Аналіз гэтых крытэрыяў дае магчымасць ацаніць абароназдольнасць умацаваных рэзідэнцый Радзівілаў у розны перыяд іх існавання.

Будаўніцтва фартыфікацый вымагала вялікіх арганізацыйных высілкаў і часу, таму іх якасць сведчыць аб падрыхтоўцы замкаў і фартэцый да абароны на доўгатэрміновую перспектыву. Паводле характару ўмацаванняў, іх можна ўмоўна падзяліць на наступныя тыпы: традыцыйныя драўляныя, мадэрнізаваныя дрэва-земляныя, бастыённыя новаітальянскай сістэмы, бастыённыя старагаландскай сістэмы і мураваныя замкі. Гэтыя тыпы ўзніклі ў выніку эвалюцыі абарончай архітэктуры, на развіццё якой уплываў прагрэс ваеннай тэхнікі і ўзбраення.

Большасць рэзідэнцый Радзівілаў мела традыцыйныя для беларускіх зямель драўляныя абарончыя ўмацаванні (Давыд-Гарадок, Капыль, Копысь, Клецк, Свержань, Свіслач, Слуцк, Старое Сяло). У пераважнай большасці гэта былі замкі, якія паўсталі на месцы гарадоў старажытнарускага часу і перанялі іх абарончую сістэму. Усе рэзідэнцыі такога кшталту перайшлі ў валоданне Радзівілаў у XVI ст. Некаторыя з іх не выкарыстоўваліся новымі гаспадарамі і хутка прыйшлі ў заняпад (Капыль, Свержань, Старое Сяло), іншыя існавалі і выконвалі абарончыя функцыі да сярэдзіны XVII ст. (Давыд-Гарадок, Копысь, Клецк, Свіслач, Слуцк). Абарончая сістэма такіх замкаў мела познесярэднявечны характар: галоўная стаўка рабілася на франтальную абарону перыметра ўмацавання, а высокая абароназдольнасць дасягалася за кошт павелічэння вышыні ўмацаванняў. Папулярнасць драўляных фартыфікацый традыцыйнага тыпу тлумачылася спецыфікай ваеннага тэатра ВКЛ, а таксама таннасцю і моцнай традыцый драўлянага будаўніцтва на беларускіх землях. У сярэдзіне XVII ст. умацаванні такога кшталту цалкам страцілі актуальнасць.

У XVI–XVII стст. Радзівілы валодалі трыма мураванымі замкамі (Койданава, Любча, Мір), а таксама трыма замкамі, у якіх меліся асобныя мураваныя будынкі (Клецк, Мядзел, Слуцк). Адной з важнейшых задач мураваных рэзідэнцый была дэманстрацыя магутнасці і сацыяльнага становішча іх уласнікаў. Гэта накладвала моцны адбітак на іх форму і выгляд. Разам з тым па прычыне большай трываласці будаўнічых матэрыялаў іх абарончы патэнцыял

быў больш значны за драўляныя ўмацаванні. Таму асобныя мураваныя замкі выкарыстоўваліся для абароны да сярэдзіны XVII ст.

У XVI ст. шэраг рэзідэнцый Радзівілаў атрымалі земляныя ці камбінаваныя дрэва-земляныя ўмацаванні новага кшталту (Копысь, Любча, Магільна, Нясвіж, Пячкоўскі Гарадок, Слуцк). Іх характэрнымі асаблівасцямі былі земляныя валы, прыстасаваныя для ўстаноўкі гармат і абароны ад артылерыйскага абстрэлу, магчымасць вядзення фланкіравальнага агню і правільная планіроўка.

У канцы XVI ст. на беларускія землі прыйшлі перадавыя на той час бастыённыя ўмацаванні новаітальянскай фартыфікацыйнай сістэмы. Асноўным тыпам фартэцый гэтага тыпу былі бастыённыя замкі, якія фактычна сталі новай формай абарончых рэзідэнцый з шырокімі магчымасцямі для рэпрэзентацыі высокага статусу іх уласнікаў (Нясвіж).

У 1620–1630-я гг. у ВКЛ распаўсюдзілася старагаландская фартыфікацыйная сістэма, аднымі з найбольш паслядоўных праваднікоў якой былі Радзівілы біржанскай лініі. Выкарыстанне зямлі пры будаўніцтве абарончых умацаванняў гэтага тыпу дазваляла абносіць умацаваннямі вялікія плошчы і ствараць абшырныя фартыфікацыйныя комплексы (Нясвіж, Слуцк). Войны сярэдзіны – другой паловы XVII ст. паказалі непрыдатнасць усіх ранейшых тыпаў абарончых умацаванняў, акрамя фартыфікацый старагаландскага тыпу, якія захоўвалі сваю актуальнасць да пачатку XVIII ст.

Будаўніцтва больш дасканалых абарончых умацаванняў залежала ад значэння рэзідэнцый у структуры зямельнай уласнасці Радзівілаў і эканамічнага патэнцыялу зямельных латыфундый, цэнтрамі якіх яны былі. Умацаванні цэнтральных рэзідэнцый (Нясвіж, Слуцк) мадэрнізаваліся з выкарыстаннем новых тыпаў абарончых умацаванняў на працягу ўсяго разгляданага перыяду. Фартыфікацыі некаторых рэзідэнцый (Глуск, Давыд-Гарадок, Клецк, Мір, Мядзел, Копысь, Койданава, Любча, Пячкоўскі Гарадок, Свіслач) перабудоўваліся ў перыяды, калі гэтыя сядзібы выконвалі ролю цэнтральных або мелі важнае значэнне для асобных прадстаўнікоў роду Радзівілаў. Іншыя рэзідэнцыі (Капыль, Магільна, Свержань, Старое Сяло) з'яўляліся другараднымі і ў азначаны перыяд захоўвалі простыя дрэва-земляныя ўмацаванні або цалкам страцілі абарончы характар.

Будаўніцтва замкаў і фартэцый у XVI–XVII стст., як правіла, суправаджалася закупкай ці вырабам узбраення, якое напрамую адпавядала характару фартыфікацый. Бягучыя змены ў арсеналах былі нязначныя, а колькі-небудзь істотная іх мадэрнізацыя праводзілася толькі ў выпадку пачатку ваенных кампаній, калі ўзровень падрыхтоўкі ўмацаванняў да абароны ўяўляўся нездавальняльным. Пры гэтым мела месца выдаткаванне вялікіх сродкаў на комплексную мадэрнізацыю ўмацаваных рэзідэнцый: узвядзенне новых і паляпшэнне старых умацаванняў, направа і закупка зброі і боепрыпасаў. Таму колькасць, якасць і асартымент узбраення і боепрыпасаў, сабраных у замках і фартэцыях Радзівілаў, сведчаць аб падрыхтоўцы іх да абароны на доўгатэрміновую перспектыву. Вялікія запасы гармат, ручной агняпальнай зброі і боепрыпасаў

да іх Радзівілы пачалі ствараць з другой паловы XVI ст. Пры гэтым працэс назапашвання ўзбраення і боепрыпасаў ішоў поруч з разбудовай рэзідэнцый, абарончы патэнцыял якіх пастаянна ўзрастаў. У другой палове XVI – пачатку XVIII ст. вялікія артылерыйскія паркі, значныя запасы ручной агняпальнай зброі і боепрыпасаў меліся ў Нясвіжы, Слуцку, а таксама Глуску, які толькі ў канцы XVII ст. перайшоў у валоданне Радзівілаў. Таму гэтыя фартэцыі былі здольныя паспяхова вытрымаць аблогу значнага вайсковага злучэння. Нязначная колькасць узбраення ці яго адсутнасць у іншых рэзідэнцыях, пра якія ёсць звесткі ў крыніцах, сведчыць аб слабасці іх абарончага патэнцыялу (Давыд-Гарадок, Клецк, Копысь, Любча, Мір, Пячкоўскі Гарадок, Свіслач). Напачатку Вялікай Паўночнай вайны арсеналы Глуска, Нясвіжа і Слуцка былі цалкам спустошаны, што прывяло да значнага падзення іх абароназдольнасці.

Параўнанне арсеналаў Нясвіжскага замка і Слуцка з арсеналамі радзівілаўскіх замкаў у Біржах і Алыцы ўказвае на важную акалічнасць. Біржанскія Радзівілы значна лепш дбалі пра забеспячэнне сваіх рэзідэнцый – горада-фартэцыі Слуцка і Біржанскага замка – узбраеннем і боепрыпасамі, у адрозненне ад прадстаўнікоў нясвіжскай і алыцкай галінаў. Гэта тлумачыцца тым, што многія прадстаўнікі біржанскай галіны з'яўляліся гетманамі і часта былі вымушаны прыцягваць свае ўласныя рэсурсы для арганізацыі абароны і забеспячэння палявой арміі.

Памер і структура гарнізонаў залежалі ад ваеннай сітуацыі, фінансавых магчымасцей і суб'ектыўных рашэнняў уласнікаў у канкрэтнай сітуацыі. Таму гэты крытэрый сведчыць пра ўзровень падрыхтоўкі да абароны на кароткачасовую перспектыву. У XVI – першай палове XVII ст. сістэма абароны ўмацаваных рэзідэнцый Радзівілаў грунтавалася на практыцы прыцягнення розных груп ваеннабавязанага насельніцтва, якія не служылі пастаянна, а склікаліся ў выпадку ваеннай пагрозы (зямяне, мяшчане, стральцы, татары). Спробай стварэння пастаянных гарнізонаў стала фарміраванне з сялян у канцы XVI–XVII стст. аддзелаў выбранецкай пяхоты, якая несла службу за валоданне зямлёй. Нягледзячы на няўхільнае зніжэнне эфектыўнасці выкарыстання ваеннабавязаных груп насельніцтва, гэтая практыка праіснавала на працягу ўсяго разгляданага перыяду. Разам з тым ужо ў XVI ст. больш эфектыўнымі пры абароне ўмацаванняў лічыліся найманыя жаўнеры, якія мелі лепшую падрыхтоўку і вопыт у ваеннай справе, а таксама адрозніваліся большай дысцыплінаванасцю і вернасцю ўласніку. Высокі кошт найманых падраздзяленняў доўгі час не дазваляў Радзівілам утрымліваць іх на пастаяннай аснове. Толькі з сярэдзіны XVII ст. у галоўных фартэцыях роду (Нясвіж, Слуцк) з'явіліся пастаянныя гарнізоны, у склад якіх уваходзілі пяхота і драгуны. Разам з тым у час войнаў сярэдзіны – другой паловы XVII ст. стала зразумела, што эканамічны патэнцыял зямельных латыфундый Радзівілаў не дазваляў забяспечыць іх рэзідэнцыі залогамі, здольнымі паспяхова супрацьстаяць вялікім арміям новага кшталту. Таму у час Вялікай Паўночнай вайны патэнцыял умацаванняў і ўзбраення радзівілаўскіх фартэцый па прычыне адсутнасці сродкаў на ўтрыманне моцных гарнізонаў фактычна не быў выкарыстаны.

СПІС СКАРАЧЭННЯЎ

БАН	–	Библиотека Российской академии наук
БГА	–	Беларускі гістарычны агляд
БГЧ	–	Беларускі гістарычны часопіс
ГАЗ	–	Гістарычна-археалагічны зборнік
МАБ	–	Матэрыялы па археалогіі Беларусі
НГАБ	–	Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі
ООРК	–	Основная опись рукописных карт
AGAD	–	Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie
AHP	–	Archaeologia Historica Polona
AR	–	Archiwum Radziwiłłów
BCzart	–	Biblioteka Książąt Czartoryskich
HSD	–	Hessisches Staatsarchiv Darmstadt
IS PAN	–	Instytut Sztuki Polskiej Akademii Nauk
MWP	–	Muzeum Wojska Polskiego w Warszawie
TOZP	–	Towarzystwo Opieki nad Zabytkami Przeszłości
LMAVB	–	Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka
MHA	–	Miscellanea Historico-Archivistica
SMHW	–	Studia i Materiały do Historii Wojskowości
SSB	–	Staatsbibliothek zu Berlin
VUB	–	Vilniaus universiteto biblioteka

КРЫНІЦЫ І ЛІТАРАТУРА

Архіўныя крыніцы

Библиотека Российской академии наук
Основная опись рукописных карт. – № 791.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі
Ф. 694. – Воп. 1. – Спр. 55, 56, 287, 300, 301.
Воп. 2. – Спр. 1913, 3135, 3136, 4466, 4468, 7527, 9367, 10729.
Воп. 7. – Спр. 846, 936.

Санкт-Петербургский институт истории РАН.
Ф. – 124. – Оп. 1. – Карт. 1. – Д. 107.

Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie
Archiwum Radziwiłłów. Dz. II. – Ks. 69/14; Sygn. 1433, 2098.
Dz. II. Supl. – Sygn. 716.
Dz. IV. – K. 47, 48, 50.
Dz. V. – Sygn. 63, 5569/I, 6865/I, 6865/II, 6865/III, 6865/IV, 10430, 12044, 14914, 16645, 16828, 17469/I, 17469/II, 17469/III, 17664.
Dz. VI. – Sygn. II–79; P. 36 i 37 / II–82.
Dz. VII. – Sygn. 641, 645, 646, 675, 678, 715.
Dz. XI. – Sygn. 48.
Dz. XV. – T. 19. – Pl. 1.
Dz. XXIII. – T. 28. – Pl. 4; T. 34. – Pl. 2; T. 130. – Pl. 2; T. 133. – Pl. 1; T. 134. – Pl. 2.
Dz. XXV. – Sygn. 1768, 2455/1, 3857.
Dz. XXVI. – Sygn. 51–53, 72, 75, 80, 81, 87, 88, 103, 112, 113, 116, 125, 126, 131, 153, 155, 166, 169, 759, 768, 769, 773, 774.

Armémuseum Stockholm
№ 5378.

Biblioteka Muzeum im. Ks. Czartoryskich w Krakowie
Rkps. 389, 1814.

Hessisches Staatsarchiv Darmstadt
P 2. – Sign. 67/101.

Instytut Sztuki Polskiej Akademii Nauk.
Towarzystwo Opieki nad Zabytkami Przeszłości. – Nr 2998.

Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka
F. 9. – B. 1873.
F. 18. – B. 145.
F. 139. – B. 2148, 3818.
F. 320. – B. 55.

Muzeum Wojska Polskiego w Warszawie
Nr inw. 16613A*.

Sächsische Landesbibliothek
Handschriftensammlung. Mscr. Dresd. – R. 30. – M. II.

Staatsbibliothek zu Berlin
Kartographische Sammlung. – XS49911/10; XS49911/12.

Vilniaus universiteto biblioteka
F. 4. – B. 39747.

Апублікаваныя крыніцы

1. Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией. – Т. 14. – СПб., 1889. – 18 с., 902 стб.

2. Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. – Вильна, 1867. – Т. 3. – 379 с.

3. Грыцкевіч А. Інвентар Мірскага замка 1688 года як гістарычная крыніца / А. Грыцкевіч // Мірскі замак і замкі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Праблемы рэстаўрацыі і музеефікацыі. – Мінск, 2006. – С. 33–35.

4. Інвентарі Олицького замку XVII–XVIII століть : зб. док. / зібр. і підг. В. Александрович. Луцьк, 2007. 275 с.

5. Мицик Ю. А. Два білоруських літописця XVI–XVII ст. / Ю. А. Мицик // Загартована історією. Ювілейний зб. на пошану проф. Надії Іванівни Миронець з нагоди 80-ліття від дня народження. – Київ, 2013. – С. 251–257.

6. Собрание государственных и частных актов, касающихся истории Литвы и соединенных с ней владений (от 1387 до 1710 г.). / ред. М. Крупович. – Вильно, 1858. – Ч. 1. – 164 с.

7. Второе хождение Трифона Коробейникова. С предисловием С. О. Долгова // Чтения в Императорском Обществе Истории и Древностей Российских при Московском Университете. – 1887. – Кн. 1.

8. Bernatowicz T. Monumenta varii Radivillorum: wyposażenie zamku nieświeckiego w świetle źródeł archiwalnych / T. Bernatowicz. – Cz. 1, XVI–XVII wieku. – Poznań, 1998. – 94 s.

9. Kronika polska Marcina Bielskiego. – Sanok, 1856. – T. 3, ks. 6. – S. 1223–1790.

10. Maskiewicz S. Pamiętniki Samuela Maskiewicza początek swój biorą od roku 1594 w lata po sobie idące / S. Maskiewicz. – Wilno, 1838. – 112 s.

11. Mikulski W., Zawadzki J. Opisy zamków białoruskich z inwentarzy dóbr przechowywanych w Archiwum Radziwiłłów w Archiwum Głównym Akt Dawnych / W. Mikulski, J. Zawadzki. – Warszawa, 1999. – 88 s.

12. Naronowicz-Naroński J. Budownictwo wojenne / J. Naronowicz-Naroński ; oprac. J. Nowakowa, red. T. Nowak. – Warszawa, 1957. – 271 s.

13. Niezabitowski S. Dzienniki 1695–1700 / S. Niezabitowski; oprac. A. Sajkowski. Poznań, 1998. 374 s.

14. Radziwiłł B. Autobiografia / B. Radziwiłł; oprac. T. Wasilewski. Warszawa, 1979. 379 s.

15. Przyczynki do historyi domowej w Polsce: (Samuel Korecki, Adam Tarło, Bogusław Radziwiłł) / W. Syrokomla. – Wilno, 1858. – 60 s.

16. Volumina legum. – T. 5. – Petersburg, 1860. – 463 s.

17. Zawadzki J. Siedziby Kiszków i Radziwiłłów na Białorusi w XVI–XVIII wieku: opisy z zasobu Archiwum Głównego Akt Dawnych / J. Zawadzki. – Warszawa, 2002. – 130 s.

Літаратура

1. Аляхновіч Р. А., Рыбчонак С. А., Шаланда А. І. Род Іллінічаў у Вялікім Княстве Літоўскім у XV–XVI стст. : радавод, гербы, уладанні / Р. А. Аляхновіч, С. А. Рыбчонак, А. І. Шаланда ; склад. А. І. Шаланда, нав. рэд. М. Н. Гальпяровіч. – Мір, 2015. 374 с.

2. Археалогія Беларусі : у 4 т. – Т. 4. – Мінск, 2001. – 596 с.

3. Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыкл. – Мінск, 1993. – 702 с.

4. Бабятынскі К. Ад Смаленску да Вільні. Вайна Рэчы Паспалітай з Масковіяй (1654–1655 гг.) / К. Бабятынскі. – Вільня, 2011. – 171 с.

5. Бабятынскі К. Ваенныя дзеянні дапаможнага кароннага корпуса на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага ў 1654–1655 гг. / К. Бабятынскі // Arche. – 2012. – № 6. – С. 223–248.

6. Бабятынскі К. Выдаткі М. К. Радзівіла на абарону Нясвіжа ў 1655–1660 г. / К. Бабятынскі // БГА. – 2011. – Т. 18, сш. 1/2. – С. 43–60.

7. Баггер Х. Реформа Петра Великого в России / Х. Баггер // Царь Петр и король Карл. Два правителя и их народы / науч. ред. А. С. Кан. – М., 1999. – С. 121–155.

8. Бохан Ю. Асаблівасці фарміравання Нясвіжскага арсенала князёў Радзівілаў у XVI ст. / Ю. Бохан // Нясвіжскі палац Радзівілаў: гісторыя, новыя

даследаванні. Вопыт стварэння палацавых музейных экспазіцый. – Нясвіж, 2010. – С. 56–62.

9. Бохан Ю. М. Вайсковая справа ў Вялікім княстве Літоўскім у другой палове XIV – канцы XVI ст. / Ю. Бохан. – Мінск, 2008. – 448 с.

10. Бохан Ю. М. Мястэчкі і працэсы ўрбанізацыі на землях Беларусі ў XV–XVIII стст. / Ю. М. Бохан ; уклад. М. А. Волкаў. – Мінск, 2018. – 292 с.

11. Бохан Ю. М. Наёмнае войска ў Вялікім княстве Літоўскім у XV–XVI стст. / Ю. Бохан. – Мінск, 2004. – 91 с.

12. Бохан Ю. М. Узбраенне войска ВКЛ другой паловы XIV – канца XVI ст. / Ю. Бохан. – Мінск, 2002. – 335 с.

13. Бохан Ю., Скеп'ян А. Побыт феадалаў Вялікага Княства Літоўскага ў XV – сярэдзіне XVII стагоддзя / Ю. Бохан. – Мінск, 2011. – 270 с.

14. Брэжго Б. Замкі Віцебшчыны / Ю. Брэжго. – Вільня, 1933. – 38 с.

15. Бубновский Д., Кравцевич А., Трусов О. Мир / Д. Бубновский, А. Кравцевич, О. Трусов // Неман. – 1985. – № 8. – С. 141–146.

16. Бубноўскі Д. Феномен Мірскага замка / Д. Бубноўскі // Мірскі замак як гісторыка-культурны феномен XV – пачатку XX стагоддзя. Новыя даследаванні / рэд. Н. Ф. Высоцкая. – Мінск, 2004. – С. 6–17.

17. Бубноўскі Д. С. Готыка і рэнесанс Мірскага замка // Помнікі мастацкай культуры Беларусі эпохі Адраджэння / Д. С. Бубноўскі ; рэд. С. В. Марцэлеў. – Мінск, 1994. – С. 160–169.

18. Бутурлин Д. П. Военная история походов россиян в XVIII столетии / Д. П. Бутурлин. – Ч. 1, т. 2. – СПб., 1820. – 744 с.

19. Варонін В. Полацкія путныя слугі ва ўрадавай палітыцы ВКЛ (XV – сярэдзіна XVI ст.) / В. Варонин // БГА. – 2000. – Т. 7, сш. 2. – С. 305–324.

20. Віцько Д. Баявыя дзеянні 1701 года і пачатак супрацоўніцтва Сапегаў са Швецыяй / Д. Віцько // Arche. – 2014. – № 6. – С. 71–107.

21. Віцько Д. Зборы паспалітага рушэння шляхты ВКЛ у 1702 г. // Вялікае Княства Літоўскае і суседзі : Права. Вайна. Дыпламатыя / Д. Віцько ; рэд. С. Ф. Сокаў, А. М. Янушкевіч. – Мінск, 2012. – С. 255–288.

22. Віцько Д. Шведскае наступленне 1702 г. у Вялікім Княстве Літоўскім і спроба рэстаўрацыі Сапегаў / Д. Віцько // Arche. 2011. – № 6. – С. 8–62.

23. Волкаў М. Абарончы комплекс Нясвіжа ў XVI–XVIII стст. / М. Волкаў // Прыватнаўласніцкія гарады Вялікага Княства Літоўскага: лёс праз стагоддзі / уклад. З. Л. Яцкевіч. – Мінск, 2014. – С. 175–187.

24. Волкаў М. Абарончыя храмы ВКЛ: меркаванне аб паходжанні тыпа / М. Волкаў // Історія релігій в Україні : наук. щорічн. – Львів, 2009. – Кн. 2. – С. 385–392.

25. Волкаў М. А. Арганізацыя і забеспячэнне будаўніцтва фартыфікацый у Слуцку пры Багуславе Радзівіле (1654–1669 гг.) / М. Волкаў // Studia Historica Europae Orientalis = Исследования по истории Восточной Европы. – Минск, 2012. – Вып 5. – С. 188–204.

26. Волкаў М. Артылерыя Нясвіжскага замка / М. Волкаў. – Мінск, 2015. – 188 с.

27. Волкаў М. Артылерыя Нясвіжскага замка ў канцы XVI – пачатку XVIII ст. / М. Волкаў // Arche. – 2012. – № 6. – С. 41–91.

28. Волкаў М. А. Брама Мірскага замка як абарончы вузел // Мірскі замак. Крыніцы стварэння музейных экспазіцый : гіст.-дак. матэрыялы і інфармацыйныя тэхналогіі / М. Волкаў. – Мінск, 2013. – С. 177–184.

29. Волкаў М. Будаўніцтва бастыённага замка Яна Караля Хадкевіча ў Ляхавічах // Магнацкі двор і сацыяльнае ўзаемадзеянне (XV–XVIII стст.) / рэд. А. М. Янушкевіч. – Мінск, 2014. – С. 343–356.

30. Волкаў М. Да пытання аб аўтарстве калекцыі малюнкаў сярэдзіны XVII ст. з архіва князёў Радзівілаў / М. Волкаў // БГЧ. – 2012. – № 7. – С. 34–38.

31. Волкаў М. Да пытання аб існаванні герсы ў браме Мірскага замка // Рэстаўрацыя Мірскага замка. Праблема захавання прыроднага і культурнага ландшафтаў/ М. Волкаў. – Нясвіж, 2012. – С. 48–54.

32. Волкаў М. А. Карціны і габелены на батальныя сюжэты XVI–XVIII стст. у аздабленні Нясвіжскага замка / М. Волкаў // Архіварыус. – Мінск, 2016. – Вып. 14. – С. 132–144.

33. Волкаў М. Мірскі замак у XVI–XVIII стст.: гісторыя будаўніцтва і эвалюцыя функцыянальнага прызначэння / М. Волкаў // БГЧ. – 2016. – № 9. – С. 29–45.

34. Волкаў М. А. Мураваны скарбец у Верхнім замку ў Слуцку / М. Волкаў // Архіварыус. – Мінск, 2018. – Вып. 16. – С. 190–198.

35. Волкаў М. Нясвіжская «Саламандра» / М. Волкаў // БГЧ. – 2013. – № 9. – С. 15–21.

36. Волкаў М. Нясвіжскі замак у Вялікай Паўночнай вайне / М. Волкаў // Вялікае Княства Літоўскае і суседзі : Права. Вайна. Дыпламатыя / рэд. С. Ф. Сокал, А. М. Янушкевіч. – Мінск, 2012. – С. 219–238.

37. Волкаў М. А. Слуцк на старых планах / М. Волкаў ; нав. рэд. Д. В. Лісейчыкаў. – Мінск, 2017. – 159 с.

38. Волкаў М. Слуцкая цытадэль XVII–XVIII ст. / М. Волкаў // БГА. – 2012. – Т. 19, сш. 1–2. – С. 31–66.

39. Волкаў М. Фартыфікацыя і ўзбраенне Мірскага замка / М. Волкаў // БГЧ. – 2012. – № 1. – С. 11–24.

40. Волкаў М. А., Ліневіч С. Б. Гісторыя і ваенны патэнцыял Жаберскага замка паводле пісьмовых і археалагічных крыніц / М. А. Волкаў, С. Б. Ліневіч // Архіварыус. – Мінск, 2017. – Вып. 15. – С. 126–140.

41. Волкаў М. А., Плавінскі М. А. Мядзельскі замак у святле пісьмовых і археалагічных крыніц / М. А. Волкаў, М. А. Плавінскі // Архіварыус. – Мінск, 2015. – Вып. 13. – С. 65–92.

42. Габрусь Т. Протарэнесансныя элементы ў абарончым дойлідстве Беларусі // Мірскі замак і замкі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Праблемы рэстаўрацыі і музеефікацыі / Т. Габрусь. – Мінск, 2006. – С. 13–23.

43. Ганецкая І. У. Археалагічнае вывучэнне Глускага замка ў 1996/98 гадах : вынікі і перспектывы / І. У. Ганецкая // Глуская зямля: дыялог з гісторыяй / рэд. І. У. Ганецкая. – Б. м., 1999. – С. 42–59.

44. Ганецкая І. Вежа-брама Глускага замка па дадзеных археалогіі і пісьмовых крыніц / І. Ганецкая // Badania archeologiczne w Polsce północnowschodniej i na zachodniej Białorusi w latach 2000–2001 / red. M. Karczewska, M. Karczewski. – Białystok, 2002. – S. 401–407.

45. Ганецкая І. Гісторыя фартыфікацыі гарадзішча ў в. Гарадок Маладзечанскага раёна / І. Ганецкая // ГАЗ. – 2002. – № 17. – С. 175–180

46. Ганецкая І. У. Глускі замак у святле археалагічных даследаванняў і пісьмовых крыніц / І. У. Ганецкая. – Мінск, 2018. – 415 с.

47. Ганецкая І. У. Стратыграфія і храналогія культурнага пласту Глускага замка / І. У. Ганецкая // МАБ. – Мінск, 2005. – Вып. 9. – С. 42–56.

48. Ганецкая І., Волкаў М. Глуская фартэцыя / І. Ганецкая, М. Волкаў // МАБ. – 2011. – Вып. 20. – С. 209–226.

49. Глебов И. А. Город Слуцк / И. А. Глебов. – Вильна, 1904. – 31 с.

50. Грицкевич А. П. Древний город на Случи : ист. очерк / А. П. Грицкевич. – Минск, 1985. – 158 с.

51. Грицкевич А. П. Материалы из истории слуцких выбранцев как источник по крестианской генеалогии / А. П. Грицкевич // Сов. славяноведение. – 1973. – № 5. – С. 60–69.

52. Грицкевич А. П. Слуцк : ист.-эконом. очерк / А. П. Грицкевич. – Минск, 1970. – 112 с.

53. Грицкевич А. П. Социальная борьба горожан Белоруссии (XVI–XVIII вв.) / А. П. Грицкевич. – Минск, – 1979. – 152 с.

54. Грицкевич А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI–XVIII вв. : социально-экономическое исследование истории городов / А. П. Грицкевич. – Минск, 1975. – 248 с.

55. Грыцкевіч А. Беларускія выбранцы / А. П. Грыцкевіч // Полымя. – 1970. – № 11. – С. 249–253.

56. Гурин М. Ф. Мир. Историко-экономический очерк / М. Ф. Гурин. – Минск, 1985. – 80 с.

57. Даўгяла Зьм. Ів. Сьвіслацкі замак у 1560 г. / Зьм. Ів. Даўгяла // Наш край. – № 6–7. – 1927. – С. 60–64.

58. Дзянісаў У. М., Пазняк З. С. Мінскі кляштар дамініканцаў / У. М. Дзянісаў, З. С. Пазняк // Помнікі мастацкай культуры Беларусі : новыя даследаванні. – Мінск, 1989. – С. 124–130.

59. Дзярновіч А. Замак / А. Дзярновіч // Вялікае княства Літоўскае : энцыклапедыя : у 2 т. – Мінск, 2007. – Т. 1. – С. 643–646.

60. Доўнар А. Б. Сяляне-слугі Беларусі другой паловы XVI – сярэдзіны XVIII ст. / А. Б. Доўнар. – Мінск, 2007. – 193 с.

61. Егоров Ю. А. Градостроительство Белоруссии / Ю. А. Егоров. – М., 1954. – 281 с.

62. Заяц Ю. А. О некоторых особенностях принципов организации обороны Мирского замка (мифы и реальность) / А. Заяц // МАБ. – Мінск, 2006. – Вып. 12. – С. 192–196.

63. Заяц Ю. А. Паняцце «замак», тыпы замкаў / А. Заяц // Археалогія Беларусі : у 4 т. Мінск, 2001. – Т. 4. – С. 66–72.

64. Здановіч Н. І., Краўцэвіч А. К., Трусаў А. А. Матэрыяльная культура Міра і Мірскага замка / Н. І. Здановіч, А. К. Краўцэвіч, А. А. Трусаў. – Мінск, 1994. – 72 с.

65. Иванюк С. А. «Всякия крепости ведает» : майор Степан Келен во время осады Соловецкого монастыря (1672–1676) / С. А. Иванюк // Новые материалы по истории фортификации // сост. и ред. И. М. Гостев. – Архангельск, 2016. – Вып. 2 – С. 219–226.

66. Иодковский И. И. Замок в Мире / И. И. Иодковский // Древности. – 1915. – Т. 6. – С. LIV–LXXII, 13–25.

67. Калнин В. В. Мирский замок / В. В. Калнин. – Минск, 1986. – 51 с.

68. Калнін В. В. Замак у гарадскім пасёлку Мір : архіт.-гіст. даследаванні / В. В. Калнін. 26.V.1994, папраўкі 10.I.2009 і 28.VI.2009 (рукапіс). – 139 с.

69. Калнін В. В., Трэпет Л. В. Мірскі замак / В. В. Калнін, Л. В. Трэпет // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1975. – № 1. – С. 26–32.

70. Калнін В. Хто будаваў Мірскі замак? // Мірскі замак як гісторыка-культурны феномен XV – пачатку XX стагоддзя. Новыя даследаванні / рэд. Н. Ф. Высоцкая. – Мінск, 2004. – С. 35–59.

71. Калнін В. В. Мірскі замак : гіст.-архіт. нарыс // В. В. Калнін. – Мінск, 1995. – 128 с.

72. Калнін В. В. Мірскі замак / В. В. Калнін. – Мінск, 2002. – 160 с.

73. Калядзінскі Л. Археалагічнае вывучэнне Капыля ў 1996–2007 гг. (хроніка палявых работ, асноўныя вынікі і магчымая перспектыва) / Л. Калядзінскі // Капыль : гісторыя горада і рэгіёна : да 360-годдзя надання Капылю прывілея на магдэбургскае права / уклад.: А. А. Скеп'ян, А. Б. Доўнар, І. В. Соркіна. – Мінск, 2012. – С. 335–344.

74. Калядзінскі Л. Верхні замак у Слуцку / Л. Калядзінскі // БГЧ. – 1996. – № 1. – С. 52–57.

75. Калядзінскі Л. Капыльскі замак / Л. Калядзінскі // Вялікае княства Літоўскае : энцыкл. : у 2 т. – Мінск, 2006. – Т. 2. – С. 43.

76. Калядзінскі Л., Ткачоў М. Слуцкія замкі / Л. Калядзінскі, М. Ткачоў // Вялікае княства Літоўскае : энцыкл. : у 2 т. – Мінск, 2006. – Т. 2. – С. 595–596.

77. Калядзінскі Л. У. Археалагічныя дасьледаваньні дзядзінца летапіснага Случаска / Л. Калядзінскі // Случчына : мінулае і сучаснасць : да 885-годдзя заснавання г. Слуцка / уклад. В. Відлога. – Слуцк, 1995. – Вып. 1. – С. 32–37.

78. Калядзінскі Л. У. Капыль – 2007: вынікі палявых даследаванняў / Л. Калядзінскі // ГАЗ. – 2009. – № 24. – С. 246–256.

79. Кананович У. І. Случчына і напады крымскіх татараў / У. І. Кананович // Случчына: мінулае і сучаснасць: да 885-годдзя заснавання г. Слуцка : зама-

лёўкі гіст. мясцін, помнікаў, вуліц, асоб. будынкаў / уклад. В. Відлога. – Слуцк, 1995. – Вып. 1. – С. 52–56.

80. Карлюк К. Пад штандарам дома Аранскіх. Першае «кавалерыйскае падарожжа» Багуслава Радзівіла (1637–1640 гг.) і яго ўдзел у галандскай аблозе Хюлста 1640 г. / К. Карлюк // Arche. – 2012. – № 6. – С. 403–439.

81. Касажэцкі К. Кампанія 1660 году ў Літве / К. Касажэцкі // Arche. – 2006. – № 6. – С. 81–408.

82. Касажэцкі К. Слуцк перад абліччам маскоўскай і казацкай пагрозы падчас вайны з Масквой у 1654–1667 гг. / К. Касажэцкі // Arche. – 2012. – № 6. – С. 285–314.

83. Касажэцкі К. Спробы стварэння ўдзельнага княства Багуслава Радзівіла на падставе падляшскіх і слуцкіх уладанняў у перыяд шведскага і маскоўскага «патопу» на мяжы 1655 і 1656 гг. / К. Касажэцкі // Arche. 2012. – № 6. – С. 249–271.

84. Квитницкая Е. Д. Архитектура [Белоруссии] XIV–XVI вв. / Е. Д. Квитницкая // Всеобщая история архитектуры : в 12 т. – М., 1968. – Т. 6. – С. 453–468.

85. Квитницкая Е. Д. Архитектура [Белоруссии] XVII вв. / Е. Д. Квитницкая // Всеобщая история архитектуры : в 12 т. – Т. 6. – С. 469–502.

86. Клаузевиц К. О войне / К. Клаузевиц. – М., 1998. – 447 с.

87. Колединский Л. Археологические источники о раннем, долетописном периоде истории Копыля (IX–XIII вв.) / Л. Колединский // Гістарыяграфія і крыніцы па гісторыі гарадоў і працэсаў урбанізацыі ў Беларусі : зб. навук. арт. – Гродна, 2009. – С. 63–70, 474–475.

88. Колединский Л. В. Городище средневекового Слуцка (предварительные итоги исследований 1985–1986 гг.) / Л. Колединский // ГАЗ. – 1994. – № 4. – С. 134–139.

89. Копысский З. Ю. Социально-политическое развитие городов Белоруссии в XVI – первой половине XVII в. / З. Ю. Копысский. – Минск, 1975. – 188 с.

90. Краўцэвіч А. К. Гарады і замкі Беларускага Панямоння XIV–XVIII стст.: Планіроўка, культурны слой / А. К. Краўцэвіч. – Мінск, 1991. – 171 с.

91. Краўцэвіч А. К., Якшук Г. М. Стары Мір / А. К. Краўцэвіч, Г. М. Якшук. – Мінск, 1993. – 85 с.

92. Кроль П. Беларуская кампанія 1654 г. (да бітвы пад Шапялевічамі) / П. Кроль // БГА. – 1999. – Т. 6, сш. 1–2. – С. 7–32.

93. Кроль П. Ваенныя дзеянні палкоўніка Івана Нячая ў Беларусі ў 1658–1659 гг. / П. Кроль // Arche. – 2012. – № 6. – С. 315–339.

94. Кроль П. Тактыка барацьбы войска Рэчы Паспалітай з казакамі ў 1591–1638 г. / П. Кроль // БГА. – 2008. – Т. 15, сш. 1–2. – С. 67–99.

95. Крывашэеў Д. Налібоцкая пушча князёў Радзівілаў у XVI–XVIII стст.: фарміраванне тэрыторыі, адміністрацыя і службоўцы / Д. Крывашэеў // Верхняе Панямонне : альм. лакальнай гісторыі. – 2012. – Вып. 1. – С. 30–50.

96. Кулагін А. М. Абарончая і палацава-сядзібная архітэктура XV – пачатку XVIII ст. / А. М. Кулагін // Архітэктура Беларусі: нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце : у 4 т. – Мінск, 2006. – Т. 2. – С. 392–511.

97. Кушнярэвіч А. Тыпалогія мураваных гатычных прыватнаўласніцкіх замкаў ВКЛ / А. Кушнярэвіч / БГЧ. – 2006. – № 9. – С. 16–21.

98. Кушнярэвіч А. М. Мураваная дабастыённая фартыфікацыя Вялікага Княства Літоўскага / А. Кушнярэвіч. – Мінск, 2011. – 230 с.

99. Ласковский Ф. Ф. Материалы для истории инженернаго искусства в России / Ф. Ф. Ласковский. – Ч. 1. – СПб., 1858. – 322 с.

100. Леп'явко С. Козацькі війни кінця XVI ст. в Україні / С. Леп'явко. – Чернігів, 1996. – 286 с.

101. Липа К. Теорія архітектури, містика і війна / К. Липа. – Київ, 2016. – 149 с.

102. Макараў М. Да пытання пра выкарыстанне тэрміну «данжон» (donjon) у беларускай гістарычнай літаратуры / М. Макараў // Гіст. альм. – 2001. – Т. 5. – С. 55–66.

103. Малов А. В. Московские выборные полки солдатского строя в начальный период своей истории / А. В. Малов. – М., 2006. – 624 с.

104. Мальченко О. Є. Арсенали українських замків XV – середини XVII ст. / О. Є. Мальченко. – Київ, 2004. 398 с.

105. Мальченко О. Є. Проблематика оборони українських земель в польській військовій та політичній літературі XVI – середини XVII ст. / О. Є. Мальченко // Наукові записки : зб. пр. молодих вчених та аспірантів. – Київ, 1997. – Т. 2. – С. 66–99.

106. Мальченко О. Є. Укріплені поселення Брацлавського, Київського і Подільського воєводств (XV – середина XVII ст.) / О. Є. Мальченко. – Київ, 2001. – 378 с.

107. Мальченко О. Є. Типологія замкових та міських фортифікаційних систем на південно-східному українському порубіжжі (кінець XIV – середина XVII ст.) / О. Є. Мальченко // Наукові записки : зб. пр. молодих вчених та аспірантів. – Київ, 1997. – Т. 1. – С. 5–23.

108. Мацук А. «Нойбургскія маёнткі» / А. Мацук // Вялікае княства Літоўскае : энцыкл. : у 2 т. – Мінск, 2006. – Т. 2. – С. 363–366.

109. Митянин А. Я. Замок в Мире : автореф. дис. на соискание ученой степени канд. архит. / А. Я. Митянин. – Минск, 1954. – 15 с.

110. Митянин А. Я. Оборонительные сооружения Белоруссии XII–XVI вв. / А. Я. Митянин // Сб. науч. работ Ин-та строительства и гражданской архитектуры АН БССР. – 1958. – Вып. 1. – С. 135–164.

111. Михайлов А. А. Артиллерия Псковской крепости в XVII в. Состав и размещение орудийного парка / А. А. Михайлов // Новые материалы по истории фортификации / сост. и ред. И. М. Гостев. – Архангельск, 2012. – С. 132–147.

112. Молочников А. М. Смоленская артиллерия в 1609 г. // Война и оружие. Новые материалы и исследования / А. М. Молочников. – СПб., 2017. – Ч. 3. – С. 307–314.

113. Мяцельскі А. Пачаткі Нясвіжа / А. Мяцельскі // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2010. – № 12. – S. 5–19.

114. Мяцельскі А. А. Знаходкі агнястрэльнай зброі ў Нясвіжскім замку / А. Мяцельскі // БГЧ. – 2011. – № 2. – С. 43–44.

115. Носов К. С. Русские крепости и осадная техника VIII–XVII вв. / К. С. Носов. – М., 2003. – 173 с.

116. Носов К. С. Русские крепости конца XV–XVII в. / К. С. Носов. – СПб., 2009. – 248 с.

117.Паздняко́ў В. С. Клецк X–XVIII стст. Матэрыяльная і духоўная культура беларускага феадальнага горада / В. С. Паздняко́ў. – Мінск, 2008. – 286 с.

118. Пашкевіч У. Горад Капыль паводле інвентара 1744 г. / У. Пашкевіч // Капыль: гісторыя горада і рэгіёна : да 360-годдзя надання Капылю прывілея на магдэбургскае права / уклад. : А. А. Скеп'ян, А. Б. Доўнар, І. В. Соркіна. – Мінск, 2012. – С. 211–217.

119. Пярвышын У. Фартыфікацыі Нясвіжскага замка ў канцы XVI – XVIII ст. / У. Пярвышын // Нясвіжскі палац Радзівілаў : гісторыя, новыя даследаванні. Вопыт стварэння палацавых музейных экспазіцый. – Нясвіж, 2010. – С. 113–124.

120. Пятраўскас Р. Літоўская знаць у канцы XIV – XV ст. : склад – структура – улада / Р. Пятраўскас. – Смаленск, 2014. – 386 с.

121. Радаман А., Янушкевіч А. Шляхта Новагародскага павета ў паспалітым рушэнні ВКЛ 1567 года / А. Радаман, А. Янушкевіч // Studia z dziejów Wielkiego Księstwa Litewskiego (XVI–XVIII wieku) / red. S. Górzyński, M. Nagielski. – Warszawa, 2014. – S. 337–381.

122. Ракуціс В. Міліцыя Радзівілаў у XVIII ст. / В. Ракуціс // Arche. – 2012. – № 6. – С. 92–137.

123. Раппопорт П. А. Военное зодчество западно-русских земель X–XIV вв. / А. А. Раппопорт. – Л., 1967. – 242 с.

124. Савіцкі М. Артылерыя Жолкаўскага замка ў XVII ст. / М. Савіцкі // Архіварыус. – Мінск, 2010. – Вып. 8. – С. 184–200.

125. Савіцкі М. Артылерыя і смаленскі цэйхгауз (1654 г.) / М. Савіцкі // Архіварыус. – Мінск, 2011. – Вып. 9. – С. 142–154.

126. Савіцкі М. Артылерыя, замак і цэйхгаўз у крэпасці Стары Быхаў у 1692–1707 г. / М. Савіцкі // Гіст. альм. – 2009. – Т. 15. – С. 45–74.

127. Сагановіч Г. М. Невядомая вайна, 1654–1667 / Г. М. Сагановіч. – Мінск, 1995. – 145 с.

128. Сагановіч Г. М. Войска Вялікага княства Літоўскага ў XVI–XVII стст. / Г. М. Сагановіч. – Мінск, – 1994. – 79 с.

129. Свіслацкі замак // Вялікае княства Літоўскае : энцыкл. : у 2 т. – Мінск, 2006. – Т. 2. – С. 558–559.

130. Сергачев С. А. Хозяйственные документы как источник исследования планировочной структуры городов Беларуси XVI–XVII вв. / С. А. Сергачев // Архитектура : сб. науч. тр. – Минск, 2014. – Вып. 7. – С. 40–46.

131. Сергачев С. А. Эволюция пространственной организации Копыля в XVII в. / С. А. Сергачев // Капыль: гісторыя горада і рэгіёна : да 360-годдзя надання Капылю прывілея на магдэбургскае права / уклад. А. А. Скеп'ян, А. Б. Доўнар, І. В. Соркіна. – Мінск, 2012. – С. 40–46.

132. Серно-Соловьевич Ф. Ф. Древне-русский город Слуцк и его святыни / Ф. Ф. Серно-Соловьевич. – Вильна, 1896. – 38 с.

133. Скеп'ян А. А. Дзве ардынацыі – два цэнтры: Клецк і Нясвіж / А. А. Скеп'ян // Мікалай Радзівіл Чорны (1515–1565 гг.): палітык, дыпламат, мецэнат. – Нясвіж, 2016. – С. 140–155.

134. Скеп'ян А. Самакіраванне Капыля ў другой палове XVI ст. (рэканструкцыя па гарадской уставе Петрыкаву 1582 г.) / А. Скеп'ян // Капыль: гісторыя горада і рэгіёна: да 360-годдзя надання Капылю прывілея на магдэбургскае права / уклад. : А. А. Скеп'ян, А. Б. Доўнар, І. В. Соркіна. – Мінск, 2012. – С. 48–58.

135. Скеп'ян А. Інвентар Гальшан 1649 г. / А. Скеп'ян // Ашмяншчына: праблемы рэгіянальнай гісторыі Беларусі. – Мінск, 2011. – С. 203–219.

136. Скеп'ян Н. Закладанне родавых традыцый на прыкладзе Мікалая Мікалаевіча Радзівіла / Н. Скеп'ян // Arche. – 2015. – № 6 (139). – С. 10–24.

137. Скеп'ян Н. Пачаткі будаўніцтва прыватнаўласніцкіх мураваных замкаў у Вялікім княстве Літоўскім / Н. Скеп'ян // Магнацкі двор і сацыяльнае ўзаемадзеянне (XV–XVIII стст.) / рэд. А. М. Янушкевіч. – Мінск, 2014. – С. 54–63.

138. Слюнькова И. Н. Архитектура городов Верхнего Приднепровья XVII – середины XIX в. / И. Н. Слюнькова. – Минск, 1992. – 143 с.

139. Спірыдонаў М. Ф. Беларусь на карце Вялікага княства Літоўскага 1613 г. // Гіст. альм. – 2003. – Т. 8. – С. 3–55.

140. Спірыдонаў М. Ф. Беларусь у другой палове XVI ст. 1:1 500 000 // Нацыянальны атлас Беларусі / М. Ф. Спірыдонаў. – Мінск, 2002. – С. 266–267.

141. Спірыдонаў М. Ф. Рэч Паспалітая ў канцы XVI ст. 1:10 000 000 / М. Ф. Спірыдонаў // Нацыянальны атлас Беларусі. – Мінск, 2002. – С. 267.

142. Спірыдонаў М. Ф. Тры Мядзелы / М. Ф. Спірыдонаў // Памяць : Мядзельскі раён / уклад. і навук. рэд. Я. Г. Звяруга. – Мінск, 1998. – С. 68–73.

143. Ткачев М. А. Замки Беларуси / М. А. Ткачев. – Минск, 2007. – 200 с.

144. Ткачев М. А. Замки Белоруссии / М. А. Ткачев. – Минск, 1987. – 220 с.

145. Ткачоў М. Загінуўшыя абаронцы / М. Ткачоў // Страчаная спадчына: Загінуўшыя абаронцы. Зруйнаваныя святыні. Па колішніх маёнтках. Гарады і час / уклад. Т. Габрусь. – Мінск, 2003. – С. 8–54.

146. Ткачоў М. Любчанскі замак / М. Ткачоў // Вялікае княства Літоўскае : энцыкл. : у 2 т. – Мінск, 2006. – Т. 2. – С. 230.

147. Ткачоў М. А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII–XVIII стст. / М. А. Ткачоў. – Мінск, 1978. – 141 с.

148. Ткачоў М. А. Замкі Беларусі (XIII–XVII ст.) / М. А. Ткачоў. – Мінск, 1977. – 82 с.

149. Ткачоў М. А. Замкі і людзі / М. А. Ткачоў – Мінск, 1991. – 182 с.

150. Трусаў А. Манументальнае дойлідства Беларусі XI–XVIII стагоддзяў : Гісторыя будаўнічай тэхнікі / А. Трусаў. – Мінск, 2001. 203 с.

151. Трусов О. А. Памятники монументального зодчества Белоруссии: XI–XVII вв.: архитектурно-археологический анализ / О. А. Трусов. – Минск, 1988. – 157 с.

152. Чантурия В. А. История архитектуры Белоруссии / В. А. Чантурия. – Минск, 1977. – 319 с.

153. Чантурия В. А. Памятники архитектуры и градостроительства Белоруссии / В. А. Чантурия. – Минск, 1986. – 236 с.

154. Чантурия Ю. В. Градостроительное искусство Беларуси второй половины XVI – первой половины XIX в.: средневековое наследие, Ренессанс, барокко, классицизм / Ю. В. Чантурия. – Минск, 2005. – 375 с.

155. Чантурия Ю. В. Градостроительство XV – начала XVIII в. / Ю. В. Чантурия // Архітэктура Беларусі : нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце : у 4 т. – Мінск, 2006. – Т. 2. – С. 58–135.

156. Чантурыя Ю. Гарады і час // Страчаная спадчына: Загінуўшыя абаронцы. Зруйнаваныя святыні. Па колішніх маёнтках. Гарады і час / Ю. В. Чантурия ; уклад. Т. Габрусь. – Мінск, 2003. – С. 236–345.

157. Чарняўскі І. М. Развіццё палацава-замкавых комплексаў Беларусі ў канцы XV–XVII стст. / І. М. Чарняўскі // Сярэдневяковыя старажытнасці Беларусі : Новыя матэрыялы і даследаванні. – Мінск, 1993. – С. 66–73.

158. Чаропка С. А. Казацка-сялянская вайна на Палессі ўлетку 1648 года / С. А. Чаропка // Изв. Гом. гос. ун-та им. Ф. Скорины. – 2005. – № 2 (29). – С. 138–141.

159. Чаропка С. Палескі паход Януша Радзівіла 1649 г. / С. Чаропка // БГЧ. – 2011. – № 1. – С. 15–22.

160. Чаропка С. Палессе ў полымі войнаў сярэдзіны XVII стагоддзя / С. Чаропка // Arche –. 2011. – № 3 (102). – С. 235–269.

161. Шаблюк В. Замак у Свержні / В. Шаблюк // З глыбі вякоў. – Наш край. 2002. – Вып. 2. – С. 27–31.

162. Шперк В. Ф. История фортификации / В. Ф. Шперк. – М., 1957. – 320 с.

163. Шперк В. Ф. Фортификационный словарь / В. Ф. Шперк. – М., 1956. – 280 с.

164. Шперк В. Ф. Фортификация. Очерки истории и развития / В. Ф. Шперк. – М., 1940. – 80 с.

165. Шчакаціхін М. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва / М. Шчакаціхін. – Мінск, 1993. – 330 с.

166. Якимович Ю. А. Зодчество Белоруссии XVI – середины XVII в. : справ. пособие / Ю. А. Якимович. – Минск, 1991. – 366 с.

167. Якімовіч Ю. А. Драўляныя замкі Беларусі / Ю. А. Якімовіч // Помнікі мастацкай культуры Беларусі : новыя даследаванні : зб. арт. – Мінск, 1989. – С. 120–124.

168. Яковлев В. В. Эволюция долговременной фортификации / В. В. Яковлев. – М., 1931. – 397 с.

169. Якубаў В. У. «Жаўнерскае свавольства» на тэрыторыі ВКЛ у 1600–1604 гг. / В. У. Якубаў // БГЧ. – 2011. – № 1. – С. 9–14.

170. Якубаў В. У. Забеспячэнне войска Вялікага княства Літоўскага падчас вайны ў Інфлянтах 1600–1611 гг. / В. У. Якубаў // Arche. – 2012. – № 6. – С. 211–222.

171. Якубаў В. У. Склад войска Вялікага княства Літоўскага і Польскага каралеўства ў Інфлянтах 1605–1609 гг. / В. У. Якубаў // Весн. Полац. дзярж. ун-та. Сер. А. Гуманіт. навукі. 2009. – № 7. – С. 13–21.

172. Янушкевіч А. М. Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558–1570 гг. / А. М. Янушкевіч. – Мінск, 2007. – 353 с.

173. Adamczyk J. L. Fortyfikacje stałe na obszarze Wielkiego Księstwa Ruskiego / J. L. Adamczyk // W kręgu Hadziacza, A. D. 1658: od historii do literatury / red. P. Borek. – Kraków, 2008. – S. 253–271.

174. Adamczyk J. L. Fortyfikacje stałe na polskim przedmurzu od połowy XV do końca XVII wieku / J. L. Adamczyk. – Kielce, 2004. – 249 s.

175. Adlerfeld G. The military history of Charles XII. King of Sweden / G. Adlerfeld. – Vol. II. – London, 1740. – 338 p.

176. Aftanazy R. Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej : w 11 t. Cz. 1. Wielkie Księstwo Litewskie, Inflanty, Kurlandia. T. 1. Województwa mińskie, mścisławskie, witebskie / R. Aftanazy. – Wrocław, 1993. – 335 s.

177. Aftanazy R. Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej : w 11 t. Cz. 1. Wielkie Księstwo Litewskie, Inflanty, Kurlandia. – T. 2. Województwa brzesko-litewskie, nowogródzkie / R. Aftanazy. – Wrocław, 1992. – 472 s.

178. Aftanazy R. Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej : w 11 t. – Cz. 1. Wielkie Księstwo Litewskie, Inflanty, Kurlandia. – T. 3. Województwo trockie, Księstwo Żmudzkie, Inflanty Polskie, Księstwo Kurlandzkie / R. Aftanazy. – Wrocław, 1992. – 410 s.

179. Aftanazy R. Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej: w 11 t. Cz. 1. Wielkie Księstwo Litewskie, Inflanty, Kurlandia. T. 4. Województwo wileńskie / R. Aftanazy. – Wrocław, 1993. – 547 s.

180. Alexandrowicz S. Kartografia Wielkiego Księstwa Litewskiego od XV do połowy XVIII wieku / S. Alexandrowicz. – Warszawa, – 2012. 344 s.

181. Alexandrowicz S. Kartografia wojskowa Wielkiego Księstwa Litewskiego do połowy XVII w. / S. Alexandrowicz // Kartografia wojskowa krajów strefy bałtyckiej XVI–XX w. / red. S. Alexandrowicz, Z. Karpus, W. Rezmer. – Toruń, 1996. – S. 11–22.

182. Alexandrowicz S., Olejnik K. Charakterystyka polskiego teatru działań wojennych / S. Alexandrowicz // SMHW. 1983. – T. 26. – S. 27–89.

183. Alexandrowicz S. Studia z dziejów miasteczek Wielkiego Księstwa Litewskiego / S. Alexandrowicz. – Toruń, 2011. – 442 s.

184. Artéus G. Szwedzka taktyka walki podczas wielkiej wojny północnej / G. Artéus // SMHW. – T. XXI. – 1978. – S. 347–357.

185. Augusiewicz S. Garnizon Birż w latach 1659–1687 i jego komendant Karol Karlick von Nezetitz / S. Augusiewicz // Ustrój – polityka – kultura : studia ofiarowane Prof. S. Ochmann-Staniszewskiej / red. J. Maroń, R. Kołodziej. – Wrocław, 2011. – S. 261–295.

186. Augustyniak U. Drewniane dwory Radziwiłłów birżańskich w pierwszej połowie XVII wieku – rezydencje czy siedziby? / U. Augustyniak // Rezydencje w średniowieczu i czasach nowożytnych / red. nauk. E. Opaliński, T. Wiślicz. – Warszawa, 2001. – S. 102–124.

187. Augustyniak U. Dwór i klientela Krzysztofa Radziwiłła: (1585–1640): mechanizmy patronatu / U. Augustyniak. – Warszawa, 2001. – 386 s.

188. Baliński M. Nieśwież do czasów księcia Karola Radziwiłła zwanego Panie Kochanku / M. Baliński // Niezapominajki. – R. 8. – 1847. – S. 283–333.

189. Bania Z. «Kazać porobić, byle były jak najmodniejsze». Relacje między inwestorem a budowniczym w polskiej architekturze nowożytnej / Z. Bania // Studia nad sztuką renesansu i baroku. – Lublin, 2005. – T. VI, cz. I. – S. 21–28.

190. Bania Z. Nowożytne zamki polskiej magnaterii. Uwagi o reprezentacji na wybranych przykładach / Z. Bania // Studia nad sztuką renesansu i baroku. – Lublin, 2008. – T. IX. – S. 111–120.

191. Bania Z. Pojęcie rezydencji w architekturze polskiej XVII i XVIII w. na przykładzie Podhorzec i Brodów / Z. Bania // Sztuka ziem wschodnich Rzeczypospolitej XVI–XVIII w. – Lublin, 2000. – S. 381–392.

192. Baranowski I. T. Z dziejów feudalizmu na Podlasiu : Rajgrodzko-Goniądzkie «państwo» Radziwiłłów w pierwszej połowie XVI wieku / I. T. Baranowski // Przegląd Historyczny. –1907. – № 4. – S. 62–74.

193. Baronas D. Fortifications innovations of the Great Dutch of Lithuania during the reign of Sigismundus Augustus (1548–1572) / D. Baronas // Zamek i dwór w średniowieczu od XI do XV wieku / red. J. Wiesiołowski. – Poznań. – S. 80–82.

194. Bernatowicz T. «Nesvisium metropolis ducatus». Nieznany przykład urbanistyki manierystycznej / T. Bernatowicz // Artes atque humaniora: Studio Stanislao Mossakowski sexagenario dicata. – Warszawa, 1998. – S. 161–167.

195. Bernatowicz T. Kościół i klasztor benedyktynek w Nieświeżu / T. Bernatowicz // Sztuka kresów wschodnich. – 1996. – T. 2. – S. 128–137.

196. Bernatowicz T. Miles Christianus et peregrinus: fundacje Mikołaja Radziwiłła «Sierotki» w ordynacji nieświeskiej / T. Bernatowicz. – Warszawa, 1998. – 234 s.

197. Bernatowicz T. Mitra i buława : królewskie ambicje książąt w sztuce Rzeczypospolitej szlacheckiej, 1697–1763 / T. Bernatowicz. – Warszawa, 2011. – S. 557.

198. Biller T. Das «bastionierte Schloß» als Bautypus des 16. Jahrhunderts. Zur Einordnung von Schloß und Festung Homburg / T. Biller // Festung, Ruine, Baudenkmal. – Wesel, 1984. – S. 25–48.

199. Biller T. Die mittelalterliche Stadtbefestigung im deutschsprachigen Raum: Zu Stand und Perspektive der Forschung / T. Biller // Stadt, Burg, Festung. Stadtbefestigung von der Antike bis ins 19. Jahrhundert. – Innsbruck, 1994. – S. 99–137.

200. Bobiatyński K. Działania posiłkowego korpusu koronnego na terenie Wielkiego Księstwa Litewskiego w latach 1654–1655 / K. Bobiatyński // SMHW. – 2004. – T. 41. – S. 61–82.

201. Bobiatyński K. Kampania letnia 1664 roku na terytorium Wielkiego Księstwa Litewskiego – nieznany fragment wojny Rzeczypospolitej z Moskwą 1654–1667 / K. Bobiatyński // Wojsko, wojskowość, miasta: studia poświęcone prof. S. Herbstowi w stulecie urodzin / red. K. Bobiatyński, P. Gawron, M. Nagielski. – Zabrze, 2009. – S. 224–246.

202. Bobiatyński K. Kampania zimowo-wiosenna wojsk Janusza Radziwiłła 1654–1655 / K. Bobiatyński // Staropolska sztuka wojenna XVI–XVII wieku: prace ofiarowane profesorowi J. Maciszewskiemu / red. M. Nagielski. – Warszawa, 2002. – S. 173–198.

203. Bobiatyński K. Prywatne twierdze magnackie w Wielkim Księstwie Litewskim w czasie wojny z Moskwą w latach 1654–1667 – wybrane problemy / K. Bobiatyński // Zamki, twierdze i garnizony Opola, Śląska i dawnej Rzeczypospolitej / red. T. Ciesielski. Zabrze, 2010. – S. 173–186.

204. Bobiatyński K. Twierdze naddnieprzańskie w systemie obrony wschodniej granicy Wielkiego Księstwa Litewskiego – XVI – połowa XVII wieku / K. Bobiatyński // Zamojsko-Wołyńskie Zeszyty Muzealne. – 2004. – T. II. – S. 29–40.

205. Bogdanowski J. Architektura obronna w krajobrazie Polski : od Biskupina do Westerplatte / J. Bogdanowski. – Gdańsk, 2002. – 454 s.

206. Bogdanowski J. Basteje ziemne Małopolski w świetle traktatu Rei tormentariae... (XV–XVI w) / J. Bogdanowski // Bastejowe fortyfikacje w Polsce / red. E. Małachowicz. – Wrocław, 1975. – S. 25–34.

207. Bogdanowski J. Feldbefestigungen in Polen zur Zeit der Schwedischen Kriege im 17. Jahrhundert / J. Bogdanowski // Sicherheit und Bedrohung – Schutz und Enge: Gesellschaftliche Entwicklung von Festungsstädten – Beispiel Stade. – Wesel, 1987. – S. 149–166.

208. Bogdanowski J. Fortyfikacje łańcuckie na tle małopolskiej sztuki obronnej / J. Bogdanowski. – Łańcut, 1976. – 298 s.

209. Bogdanowski J., Holcer Z., Kornecki M. Architektura obronna. Słownik terminologiczny architektury / J. Bogdanowski, Z. Holcer, M. Kornecki. – Warszawa, 1994. – 69 s.

210. Borawski P. Ziemska służba wojskowa Tatarów Wielkiego Księstwa Litewskiego w XV–XVII wieku / P. Borawski. – Zabrze ; Tarnowskie Góry, 2015. – 431 s.

211. Brensztejn M. Zarys dziejów ludwisarstwa na ziemiach b. Wielkiego Księstwa Litewskiego / M. Brensztejn. – Wilno, 1924. – 226 s.

212. Brohl E. Polnische Einflüsse auf den frühen Festungsbau in Mitteldeutschland um 1500 / E. Brohl // Von der Burg zum Schloss: landesherrlicher und adeliger

Profanbau in Thüringen im 15. und 16. Jahrhundert / H. Laß. – Bucha bei Jena, 2001. – S. 117–132.

213. Burger D. Die Festungen der Hohenzollern in Brandenburg und Franken / D. Burger // Von Vestungen – Die brandenburgisch-preußischen Festungen Spandau, Peitz und Küstrin. – Berlin, 2001. – S. 24–47.

214. Ciechanowiecki A. Z dziejów budowy zamku w Birżach // Kwartalnik architektury i urbanistyki / A. Ciechanowiecki. – 1959. – T. 4, z. 1/2. – S. 43–66.

215. Chachaj M. Zagraniczna edukacja Radziwiłłów: od początku XVI do połowy XVII wieku / M. Chachaj. – Lublin, 1995. – 171 s.

216. Dąbkowski P. R. Dobra rodowe i nabyte w prawie litewskim od XIV do XVI wieku / P. R. Dąbkowski. – Lwów, 1916. – 117 s.

217.Durdík T. Burgen des mitteleuropäischen Kastelltyps / T. Durdík // Burgenbau im späten Mittelalter / red. H. Hofrichter, G. U. Großmann. – Berlin ; München, 1996. – S. 177–184.

218. Durdík T. Kastellburgen des 13. Jahrhunderts in Mitteleuropa / T. Durdík. – Wien, 1994. – 259 S.

219. Dybaś B. Fortece Rzeczypospolitej: studium z dziejów budowy fortyfikacji stałych w państwie polsko-litewskim w XVII wieku / B. Dybaś. – Toruń, 1998. – 381 s.

220. Dybaś B. Problematyka budowy i utrzymania fortyfikacji stałych w opiniach i działaniach sejmików województw krakowskiego i ruskiego w okresie wojen w połowie 17 w. / B. Dybaś // Rzeczpospolita w latach potopu / red. J. Muszyński, J. Wijaczek. – Kielce, 1996. – S. 109–131.

221. Dybaś B. Projekt budowy manufaktury zbrojeniowej w dobrach radziwiłłowskich w okolicach Słucka w 1670 roku / B. Dybaś // Europa orientalis: Polska i jej wschodni sąsiedzi od Średniowiecza po współczesność : studia i materiały ofiarowane Prof. S. Alexandrowiczowi w 65 rocznicę urodzin / red. Z. Karpus, T. Kempa, D. Michaluk. – Toruń, 1996. – S. 289–292.

222. Dybaś B. Twierdza czy rezydencja? Militarne znaczenie siedzib magnackich w XVII wieku / B. Dybaś // Rezydencje w średniowieczu i czasach nowożytnych / red. E. Opaliński, T. Wiślicz. – Warszawa, 2001. – S. 69–93.

223. Dybaś B. Znaczenie wojen polsko-szwedzkich dla rozwoju fortyfikacji stałych w Rzeczypospolitej w XVII wieku (na przykładzie wielkich miast Prus Królewskich) / B. Dybaś // Z dziejów stosunków Rzeczypospolitej Obojga Narodów ze Szwecją w XVII wieku / red. M. Nagielski. – Warszawa, 2007. – S. 201–214.

224. Egg E. Der Tiroler Geschützguss 1400–1600 / E. Egg. – Innsbruck, 1961. – 212 s.

225. Ferenc M. Mikołaj Radziwiłł «Rudy» (ok. 1515–1584) : działalność polityczna i wojskowa / M. Ferenc. – Kraków, 2008. – 571 s.

226. Freitag A. Architectura militaris nova et aucta oder Newe vermehrte Fortification von regular Vestugen, von irregular Vestugen und Aussen Wercken, von Praxi Offensiva und Defensiva / A. Freitag. – Leyden, 1631. – 160 s.

227. Frost R. Potop a teoria rewolucji militarnej / R. Frost // Rzeczpospolita w latach potopu / red. J. Muszyński, J. Wijaczek. – Kielce, 1996. – S. 147–165.

228. Frost R. The Northern Wars: War, State and Society in Northeastern Europe 1558–1721 / R. Frost. – Harlow, 2000. – 410 p.

229. Gebuhr R. Burgen und Festungen in Brandenburg. Kulturhistorische Fragen des Befestigungsbaus in der frühen Neuzeit / R. Gebuhr // Erhalt und Nutzung historischer Zitadellen / H.-R. Neumann. – Mainz am Rhein, 2002. – S. 1–10.

230. Gebuhr R. Festung und Repräsentation: zur Sozialgeometrie–These von Henning Eichberg / R. Gebuhr // Technik, Arbeit und Umwelt in der Geschichte / G. Bayerl. – Münster, 2006. – S. 181–200.

231. Gebuhr R., Theissen A., Winter M. Von Vestungen / R. Gebuhr, A. Theissen, M. Winter / R. Gebuhr // Von Vestungen – Die brandenburgisch-preußischen Festungen Spandau, Peitz und Küstrin. – Berlin, 2001. – S. 16–21.

232. Górski K. Historia artylerii polskiej / K. Górski. – Poznań, 2004. – 324 s.

233. Gradowski M., Żygulski Z. Słownik uzbrojenia historycznego / M. Gradowski, Z. Żygulski. – Warszawa, 2000. – 184 s.

234. Grodzicka M. Zabytkowe działa spiżowe w zbiorach polskich / M. Grodzicka // SMHW. – 1960. T. 6, cz. 2. –S. 358–414.

235. Gruszecki A. Bastionowe zamki w Małopolsce / A. Gruszecki. – Warszawa, 1962. –309 s.

236. Gruszecki A. Fortyfikacja zamku w Nieświeżu / A. Gruszecki // Kwartalnik architektury i urbanistyki. – 1965. – T. X, z. 2. – S. 141–145.

237. Gruszecki A. Zamki i pałace małopolskie w XVI wieku: (cechy reprezentacyjno-mieszkaniowe i obronne). – Warszawa, 1986. – 126 s.

238. Gruszecki A. Zamosc – Italienischer Festungsbau des 16. Jahrhundert in Polen / A. Gruszecki // Festungsforschung International. – 2000. – V. 14. – S. 109–124.

239. Herbst S. Historia fortyfikacji: treść, dzieje, metodyka / S. Herbst // Potrzeba historii czyli O polskim stylu życia: wybór pism : w 2 t. – Warszawa, 1978. – T. 2. – S. 77–90.

240. Herbst S. Polski teatr wojny // Potrzeba historii czyli: O polskim stylu życia: wybór pism : w 2 t. / S. Herbst. – Warszawa, 1978. –T. 2. –S. 435–443.

241. Herbst S. Stan badań nad fortyfikacją nowożytną w Polsce / S. Herbst // SMHW. – 1966. – T. 12, cz. 1. – S. 7–37.

242. Herbst S. Urbanistyka i architektura obronna XV–XVII wieku // Potrzeba historii czyli O polskim stylu życia: wybór pism : w 2 t. / S. Herbst. – Warszawa, 1978. – T. 1. – S. 158–166.

243. Herrmann C. Der rote Backstein – Farbe herrschaftlicher Präsentation oder monastischer Bescheidenheit? / C. Herrmann // Backsteinarchitektur im Ostseeraum: neue Perspektiven der Forschung; Katalog zur gleichnamigen Ausstellung / E. Gierlich, C. Herrmann, M. Müller. – Petersberg, 2015. – S. 12–31.

244. Hryckiewicz A. Milicje miast magnackich na Białorusi i Litwie w XVI–XVIII w. / A. Hryckiewicz // Kwartalnik Historyczny. – 1970. – № 1. – S. 47–62.

245. Hryckiewicz A. Warowne miasta magnackie na Białorusi i Litwie / A. Hryckiewicz // Przegląd Historyczny. – 1970. – Z. 3. – S. 428–443.

246. Jacoby J. Boguslaus Radziwill – der Statthalter des grossen Kurfürsten in Ostpreussen / J. Jacoby. – Marburg ; Lahn, 1959. – 310 s.

247. Jelski A. Nieśwież Radziwiłłowski przed ćwierć wiekiem a dziś : (rok 1905) / A. Jelski. – Petersburg, 1908. – 16 s.

248. Kajzer L. Zamki i społeczeństwo: przemiany architektury i budownictwa obronnego w Polsce w X–XVIII wieku / L. Kajzer. – Łódź, 1993. – 265 s.

249. Kalicki B. Bogusław Radziwiłł koniuszy litewski : szkic historyczny / B. Kalicki. – Kraków, 1878. – 194 s.

250. Karvelis D. Radvilų Biržų pilis ir jos arsenalas XVI–XVII a. / D. Karvelis // Karo archyvas. – 2008. – № 13. – P. 39–73.

251. Kempa T. Mikołaj Krzysztof Radziwiłł Sierotka (1549–1616) – wojewoda wileński / T. Kempa. – Warszawa, 2000. – 381 s.

252. Kempa T. Urzędnicy i klienci Mikołaja Krzysztofa Radziwiłła Sierotki / T. Kempa // Lituano-Slavica Posnaniensia : studia historica. – 2003. – № 9. – S. 193–221.

253. Kloza J., Maroszek J. Dzieje Goniądza w 450 rocznicę praw miejskich / J. Kloza, J. Maroszek. – Białystok ; Goniądz, – 1997. – 266 s.

254. Kossarzecki K. Forteca słucka w okresie wojen połowy XVII wieku / K. Kossarzecki // Zamojsko-Wołyńskie Zeszyty Muzealne. – 2000. – T. 2. – S. 41–60.

255. Kossarzecki K. Forteca w Kopysi nad Dnieprem w latach wojny Rzeczypospolitej z Moskwą 1654–1667 / K. Kossarzecki // Studia z dziejów wojskowości. – 2012. – T. 1. – S. 129–175.

256. Kossarzecki K. Fortece i zamki radziwiłłowskie w XVII–XVIII w. na podstawie zachowanych archiwaliów w Archiwum Warszawskim Radziwiłłów / K. Kossarzecki // MHA. – 2010. – T. XV–XVI. – S. 53–68.

257. Kossarzecki K. Próby tworzenia udzielnego władztwa księcia Bogusława Radziwiłła w oparciu o dobra podlaskie i słuckie w okresie zalewu szwedzkiego i moskiewskiego przełomu 1655 i 1656 r. / K. Kossarzecki // SMHW. – 2007. – T. 43. – S. 23–41.

258. Kossarzecki K. Słuck wobec zagrożenia moskwieskiego i kozackiego podczas wojny z Moskwą w latach 1654–1667 / K. Kossarzecki // Materiały do historii wojskowości. – 2004. – № 2. – S. 93–112.

259. Kossarzecki K. Wyprawa korpusu kasztelana połockiego Jana Sosnowskiego pod Stary Bychów (lato-jesień 1659 roku) / K. Kossarzecki // W kręgu Hadziacza, A. D. 1658: od historii do literatury / red. P. Borek. Kraków, 2008. – S. 140–156.

260. Kotarski H. Wojsko polsko-litewskie podczas wojny inflanckiej 1576–1582 / H. Kotarski // SMHW. – 1970. – T. 16, cz. 1. – Cz. 1. – S. 63–123.

261. Kotarski H. Wojsko polsko-litewskie podczas wojny inflanckiej 1576–1582 / H. Kotarski // SMHW. – 1971. – T. 17, cz. 1. – Cz. 2. – S. 51–124.

262. Kotarski H. Wojsko polsko-litewskie podczas wojny inflanckiej 1576–1582 / H. Kotarski // SMHW. – 1971. – T. 17, cz. 2. – Cz. 3. – S. 81–151.

263. Kotarski H. Wojsko polsko-litewskie podczas wojny inflanckiej 1576–1582 / H. Kotarski // SMHW. – 1972. – T. 18, cz. 1. – Cz. 4. – S. 3–92.

264. Kotarski H. Wojsko polsko-litewskie podczas wojny inflanckiej 1576–1582 / H. Kotarski // SMHW. –1972. – T. 18, cz. 2. – Cz. 5. – S. 43–104.

265. Kroll P. Działania zbrojne pułkownika Iwana Nieczaja na Białorusi w latach 1658–1659 / P. Kroll // Materiały do historii wojskowości. – 2007. – № 43. – S. 121–138.

266. Kroll P. Kampania białoruska Janusza Radziwiłła w 1654 roku / P. Kroll // Przegląd wschodni. – 2008. – T. 10. – S. 43–64.

267. Kroll P. Na styku cywilizacji. Wojskowość kozacka i jej przemiany w XVI–XVII wieku / P. Kroll // Człowiek w Europie. Migawki z podróży człowieka poprzez dzieje / red. M. Franz i B. Siek. – Toruń, 2011. – S. 173–191.

268. Kroll P. Obrona Smoleńska w 1654 r. / P. Kroll // Staropolska sztuka wojenna XVI–XVII wieku. – Warszawa, 2002. – S. 151–172.

269. Landers J. The Destructiveness of Pre-Industrial Warfare : Political and Technological Determinants / J. Landers // Journal of Peace Research. – Vol. 42. – No. 4. – 2005. – P. 455–470.

270. Lasek P. Turris fortissima nomen Domini. Murowane wieże mieszkalne w Królestwie Polskim od 1300 r. do połowy XVI w. / P. Lasek. – Warszawa, 2013. – 408 s.

271. Lasek P. Wieża i basteja. Z badań nad wpływem broni palnej na architekturę obronno-rezydencjonalną Królestwa Polskiego w XV–XVI w. / P. Lasek // Interdyscyplinarne badania założeń rezydencjonalnych i obronnych. – Warszawa, 2013. – S. 158–175.

272. Lech M. J. Milicje Radziwiłłów jako oręż feudałow w walce z ruchami chłopskimi na Białorusi i Litwie / M. J. Lech // Rocznik Białostocki. – 1968. – № 3. – S. 33–60.

273. Luh J. Kriegskunst in Europa 1650–1800 / J. Luh. – Köln, 2004. – 298 s.

274. Lulewicz H. Strzelcy z puszcz litewskich / H. Lulewicz // Studia z dziejów Wielkiego Księstwa Litewskiego (XVI–XVIII wieku) / red. S. Górzyński, M. Nagielski. – Warszawa, 2014. – S. 273–286.

275. Lulewicz H. Walka Radziwiłłów z Chodkiewiczami o dziedzictwo słuckie / H. Lulewicz // MHA. – 1989. – T. 3. –S. 201–215.

276. Lynn J. A. The French Army, 1610–1715 / J. A. Lynn. – Cambridge, 1997. – 651 p.

277. Malczewska M. Latyfundium Radziwiłłów w XV do połowy XVI wieku / M. Malczewska. – Warszawa, 1985. – 169 s.

278. Markowski F. Zamek Mikołaja Krzysztofa Radziwiłła Sierotki w Nieświeżu / F. Markowski // Kwartalnik architektury i urbanistyki. – 1964. – T. IX, z. 2. – S. 185–192.

279. Maroszek J. Pogranicze Litwy i Korony w planach króla Zygmunta Augusta: z historii dziejów realizacji myśli monarszej między Niemnem a Narwią / J. Maroszek. – Białystok, 2000. – 648 s.

280. Meierink B. O. Der große Turm : ein Adelssymbol? / B. O. Meierink // Burgen und Schlösser in den Niederlanden und in Nordwestdeutschland / G. von Büren, H. H. Häffner, G. U. Großmann. – München ; Berlin, 2004. – S. 177–184.

281. Mełeń A. Ordynacje w dawnej Polsce / A. Mełeń. – Lwów, 1929. – 63 s.

282. Metel'skij A. A. Fortyfikacje zamku w Nieświeżu z końca XVI – początku XVIII wieku / A. A. Metel'skij // AHP. – 2012. – T. 20. – S. 161–189.

283. Mikocka-Rachubowa K. Rezydencje magnackie w Wielkim Księstwie Litewskim w XVII wieku / K. Mikocka-Rachubowa // Przegląd wschodni. Historia i współczesność Polaków na Wschodzie. – 1997. – T. 4, z. 3 (15). – S. 523–545.

284. Miłobędzki A. Polskie rezydencje wieku XVII – typowe programy i rozwiązania / A. Miłobędzki // Architektura rezydencjonalna historycznej Małopolski / red. T. Hrankowska. – Łańcut, 1982. – S. 7–17.

285. Miłuński M. Zarząd dóbr Bogusława Radziwiłła w latach 1636–1669 / M. Miłuński // Administracja i życie codzienne w dobrach Radziwiłłów XVI–XVIII wieku / red. U. Augustyniak. – Warszawa, 2009. – S. 195–283.

286. Morzy J. Kryzys demograficzny na Litwie i Białorusi w 2 połowie XVII wieku / J. Morzy. – Poznań, 1965. – 405 s.

287. Müller H. Die Bewaffnung: Das Heerwesen in Brandenburg und Preussen von 1640 bis 1806 / H. Müller. – Berlin, 2001. – 240 S.

288. Müller H. Gewehre, Pistolen, Revolver : europäische Jagd- und Kriegswaffen des 14. bis 19. Jahrhunderts / H. Müller. – Berlin, 1997. – 225 S.

289. Nagielski M. Koncepcje prowadzenia działań przeciwko Szwedom w dobie potopu w latach 1655–1660 / M. Nagielski // Z dziejów stosunków Rzeczypospolitej Obojga Narodów ze Szwecją w XVII wieku / red. M. Nagielski. – Warszawa, 2007. – S. 165–182.

290. Nagielski M. Służba wojskowa przedstawicieli rodu Radziwiłłów w XVI–XVIII w. na podstawie zachowanych archiwaliów archiwum warszawskiego Radziwiłłów / M. Nagielski // MHA. – 1997. – T. VII. – S. 37–44.

291. Nordberg J. A. Histoire De Charles XII Roi De Suede / J. A. Nordberg. – T. 2. – La Haie, 1744. – 653 p.

292. Nowak T. M. Arsenały artylerii koronnej w latach 1632–1655 / T. M. Nowak // SMHW. 1967. T. 13, cz. 2. S. 92–135.

293. Nowak T. M. Inwentarz artylerii Wielkiego Księstwa Litewskiego 1676 r. / T. M. Nowak // Zeszyty Naukowe Muzeum Wojska w Białymstoku. – 1988. – T. 1. – S. 107–117.

294. Nowak T. M. Polska technika wojenna XVI–XVIII w. / T. M. Nowak. – Warszawa, 1970. – 399 s.

295. Nowak T. M. Polska technika wojskowa XVI–XVII wieku. Teoria i praktyka artylerii i inżynierii / T. M. Nowak // Technika a wojna X–XX w / red. P. Matusak, J. Piłatowicz. – Siedlce, 2000. – S. 52–89.

296. Nowak T. M. Problem stosowania broni palnej przy obronie i zdobywaniu umocnień przez wojska polskie w XVI–XVII w. / T. M. Nowak // SMHW. – 1966. – T. 12, cz. 1. – S. 50–69.

297. Nowak T. M. Problematyka dziejów i główne etapy rozwoju dawnej artylerii polskiej / T. M. Nowak // – SMHW. – 1984. – T. 27. – S. 225–254.

298. Nowak T. M. Przegląd polskiego piśmiennictwa z dziedziny artylerii do połowy XVII w. // SMHW. – 1958. – T. 4. – S. 249–276.

299. Nowak T. M. Rysunki dział zdobytych przez szwedów w Polsce w XVII i na początku XVIII w. / T. M. Nowak // SMHW. – 1976. – T. 20. – S. 285–333.

300. Nowak T. M. Sprzęt artylerii polskiej XVI wieku w świetle inwentarza z lat 1551–1565 / T. M. Nowak // SMHW. – 1963. – T. 9, cz. 2. – S. 281–302.

301. Nowak T. M. Zagadnienie ujednolicenia sprzętu artylerii i zasady obliczania kalibrów dział w Polsce w połowie XVII w. / T. M. Nowak // SMHW. – 1960. – T. 5. – S. 268–294.

302. Ochmański J. Historia Litwy / J. Ochmański. – Wrocław, 1967. – 346 s.

303. Oleksicki A. Waniewo, z przeszłości dawnego miasta / A. Oleksicki // Biuletyn Konserwatorski Województwa Podlaskiego. – 2001. – Z. 7. – S. 159–174.

304. Organiściak W. Radziwiłłowie jako prawodawcy wojskowi w okresie od XVII do XVIII wieku / W. Organiściak // Radziwiłłowie : obrazy literackie, biografie, świadectwa historyczne / red. K. Stępnik. – Lublin, 2003. – S. 337–346.

305. Pazdniakou W. Założenia urbanistyczne miast Białorusi Południowej w XVI–XVIII wieku / W. Pazdniakou // AHP. – 1996. – T. 3. – S. 273–288.

306. Petrauskas R. Fürsten und Grafen des Heiligen Römischen Reiches: die litauischen Hochadeligen und ihre römischen Titel im Kontext des Wiener Fürstentags / R. Petrauskas // Das Wiener Fürstentreffen von 1515. Beiträge zur Geschichte der habsburgisch-jagiellonischen Doppelvermählung / hrsg. B. Dybaś, I. Tringli. – Budapest, 2019. – S. 213–224.

307. Petrus J. T. Strzelba z roku 1615 w zbiorach wawelskich / J. T. Petrus // Studia do Dziejów Wawelu. – T. 5. – 1991. – S. 450–468.

308. Pilarczyk Z. Fortyfikacje na ziemiach koronnych Rzeczypospolitej w XVII wieku / Z. Pilarczyk. – Poznań, 1997. – 368 s.

309. Pilarczyk Z. Organizacja obrony Poznania od połowy XIII do końca XVIII w. / Z. Pilarczyk // SMHW. – 1988. – T. 30. – S. 43–59.

310. Plewczyński M. Wkład Radziwiłłów w rozwój staropolskiej sztuki wojennej XVI w. / M. Plewczyński // MHA. – 1997. – T. VII. – S. 27–36.

311.Popliński A. Żywot Jaśnie Oświeconego Księcia Bogusława Radziwiłła, Świetego Pánstwa Rzymskiego książęcia... : z rękopismów hr. T. Działyńskiego / A. Popliński. – Poznań, 1844. – 211 s.

312. Rachuba A. Czy każdy Radziwiłł musiał być hetmanem? / A. Rachuba // Biblioteka epoki nowożytnej 5 II/2016: Hortus bellicus. Studia z dziejów wojskowości nowożytnej. Studia ofiarowane Profesorowi Mirosławowi Nagielskiemu / red. K. Bobiatyński. – Warszawa, 2017. – S. 135–150.

313. Rachuba A. Litewskie przygotowania do wojny ze Szwecją w 1635 roku / A. Rachuba // Z dziejów stosunków Rzeczypospolitej Obojga Narodów ze Szwecją w XVII wieku / red. M. Nagielski. – Warszawa, 2007. – S. 33–43.

314. Rachuba A. Siły zbrojne Wielkiego Księstwa Litewskiego w XVII wieku / A. Rachuba // Przegląd wschodni. – 1994. – T. 3, z. 3 (11). – S. 379–410.

315. Rachuba A. Sprawa dóbr Radziwiłłów birżańskich w latach 1655–1662 / A. Rachuba // MHA. – 1997. – T. VII. – S. 51–70.

316. Ragauskienė R. Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės kancleris Mikalojus Radvila Rudasis / R. Ragauskienė. – Vilnius, 2002. – 448 p.

317.Roberts M. The Military Revolution / M. Robert // Essays in Swedich History. – London, 1967. – P. 195–225.

318. Rychlikowa I. Bojarzy pancerni na pograniczu moskiewskim w XVI–XIX wieku / I. Rychlikowa // Przegląd wschodni. – 1994. – T. 3, z. 3 (11). – S. 411–449.

319. Sahanowicz H. Życie codzienne na Białorusi w warunkach wojny według skarg poddanych radziwiłłowskich z lat pięćdziesiątych i sześćdziesiątych XVII wieku / H. Sahanowicz // Biblioteka epoki nowożytnej 5 II/2016: Hortus bellicus. Studia z dziejów wojskowości nowożytnej. Studia ofiarowane Profesorowi Mirosławowi Nagielskiemu / red. K. Bobiatyński i in. – Warszawa, 2017. – S. 315–323.

320. Sajkowski A. Zagraniczne wyjazdy Radziwiłłów po naukę (początek XVII wieku) / A. Sajkowski // MHA. – 1989. – T. 3. – S. 191–200.

321. Sawicki M. Artyleria i cekhauz twierdzy Lachowicze w 1658 roku / M. Sawicki // Людзі і ўлада Навагрудчыны : гісторыя ўзаемадзеяння : (да 500-годдзя надання Навагрудку прывілея на магдэбургскае права) / уклад. А. А. Скеп'ян, В. В. Даніловіч, А. Б. Доўнар. – Мінск, 2013. – С. 191–201.

322. Sawicki M. Artyleria litewska w latach osiemdziesiątych XVII wieku. Organizacja i finansowanie / M. Sawicki // Artyleria polska. Historia – teraźniejszość – przyszłość (myśl wojskowa, szkolnictwo artyleryjskie, technika i uzbrojenie) / red. W. Rezner, M. Giętkowski, J. Ślipiec. – Toruń, 2008. – S. 161–174.

323. Sawicki M. Działania wojenne w Rzeczypospolitej w latach 1700–1713 w świetle pamiętnika Karola Stanisława Radziwiłła / M. Sawicki // Вялікае Княства Літоўскае і суседзі: Права. Вайна. Дыпламатыя / рэд. С. Ф. Сокал, А. М. Янушкевіч. – Мінск, 2012. – С. 239–254.

324. Schmid B. Burgen in Litauen / B. Schmid // Der Burgwart. – 1942. – S. 1–12.

325. Schmidtchen V. Bombarden, Befestigungen, Büchsenmeister / V. Schmidtchen. – Düsseldorf, 1977. – 213 S.

326. Schütte U. Das Schloß als Wehranlage: befestigte Schloßbauten der frühen Neuzeit im alten Reich / U. Schütte. – Darmstadt, 1994. – 430 S.

327. Schütte U. Zur fiktiven und realen Wehrhaftigkeit hessisch-thüringischer Schloßbauten zwischen 1550 und 1750 / U. Schütte // Frühneuzeitliche Hofkultur in Hessen und Thüringen. – Erlangen, 1993. – S. 44–67.

328. Semkowicz W. O litewskich rodach bojarskich zbratanych ze szlachtą polską w Horodle r. 1413 / W. Semkowicz // Rocznik Tow-wa Heraldycznego we Lwowie. – 1920. – T. 5. – S. 39–57.

329. Shawalter D. Gunpowder and Regional Military Systems / D. Shawalter // The Military and Conflict Between Cultures: Soldiers at the Interface / ed. J. C. Bradford. – College Station, 1997. – P. 49–88.

330. Sienkiewicz W. Ziemianie zależni w Wielkim Księstwie Litewskim od połowy XVI do połowy XVIII w. Studium z dziejów feudalizmu litewskiego (Maszynopis pracy doktorskiej) / W. Sienkiewicz. – Warszawa, 1982. – 458 s.

331. Skiepjan A., Skiepjan N. Drogi kształtowania pamięci historycznej rodów magnackich Wielkiego Księstwa Litewskiego w XVI wieku – początkach XVII w. / A. Skiepjan, N. Skiepjan // Tradycja – metody przekazywania i formy upamiętnienia w państwie polsko-litewskim, XV – I połowa XIX wieku / red. U. Augustyniak. – Warszawa, 2011. – S. 47–69.

332. Stefańska Z. Arkiebuz, hakownica, muszkiet (artykuł dyskusijny) // Muzealnictwo wojskowe / Z. Stefańska. – 1989. – T. 4. – S. 215–237.

333. Stefańska Z. Działo «orszańskie» / Z. Stefańska // Muzealnictwo wojskowe. 1959. – T. 1. – S. 359–366.

334. Stefańska Z. Próba ustalenia typów i nazw dział artylerii polskiej XVI i XVII wieku / Z. Stefańska // Muzealnictwo wojskowe. – 1959. – T. 1. – S. 177–228.

335. Syrokomla W. Wędrówki po moich niegdyś okolicach : wspomnienia, studja historyczne i obyczajowe / W. Syrokomla. – Wilno, 1853. – 248 s.

336. Szabluk W. Dwory i folwarki na Zachodniej Białorusi / W. Szabluk // AHP. – 1996. – T. 3. – S. 289–299.

337. Szlezynger P. S. Inwentarze cekhauzów i armaty zamkowej z XVII i XVIII wieku w magnackich fortecach w Wiśniczu, Połonnem, Dubnem i Żółkwi / P. S. Szlezynger // SMHW. – 1988. – T. 30. – S. 283–330.

338. Szymczak J. Początki broni palnej w Polsce (1383–1533) / J. Szymczak. – Łódź, 2004. – 424 s.

339. Szymczak J. Od samostrzelników do grzebieniarzy w Krakowie, czyli rzecz o zmierzchu znaczenia kuszy na przelomie XV i XVI wieku / J. Szymczak // Aetas media, aetas moderna. – Warszawa, 2000. – S. 122–128.

340. Taurogiński B. Z dziejów Nieświeża / B. Taurogiński. – Warszawa, 1937. – 268 s.

341. Ternsmeden L. Organizacja bojowych i administracyjnych jednostek szwedzkich i rozwój taktyki walki w XVII wieku (do okolo 1680 roku) / L. Ternsmeden // SMHW. – 1978. – T. 21. – S. 315–327.

342. Tyszkiewicz E. Birże : rzut oka na przeszłość miasta, zamku i ordynacyi / E. Tyszkiewicz. – St.-Petersburg, 1869. – 213 s.

343. Viganò M. Die Entwicklung historischer Zitadell-Bauten in Italien vom 16. bis zum 19. Jahrhundert / M. Viganò // Erhalt und Nutzung historischer Zitadellen / H.-R. Neumann. – Mainz am Rhein, 2002. –S. 11–30.

344. Wasilewski T. Pochodzenie rodu Radziwiłłów-Ościków / T. Wasilewski // MHA. – 1997. – T. VII. – S. 11–17.

345. Wasilewski T. Budowa zamku i rezydencji Radziwiłłów w Birżach w latach 1586–1654 / T. Wasilewski // Podług nieba i zwyczaju polskiego: studia z historii architektury, sztuki i kultury ofiarowane Adamowi Miłobędzkiemu / red. Z. Bania. – Warszawa, 1988. –S. 263–272.

346. Wimmer J. Wojsko i skarb Rzeczypospolitej u schyłku XVI i w pierwszej połowie XVII wieku / J. Wimmer // SMHW. – 1968. – T. 14. – S. 3–91.

347. Wimmer J. Z zagadnień ekonomiki wojskowej XV–XVIII w. / J. Wimmer. – Warszawa, 1974. – 166 s.

348. Wisner H. Janusz Radziwiłł 1612–1655 : wojewoda wileński, hetman wielki litewski / H. Wisner. – Warszawa, 2000. – 269 s.

349. Wisner H. Wojna inflancka 1625–1629 / H. Wisner // SMHW. – 1970. – T. 16, cz. 1. – S. 27–93.

350. Wisner H. Wojsko litewskie I połowy XVII wieku / H. Wisner // SMHW. – 1973. – T. 19. – Cz. 1. – S. 61–138.

351. Wisner H. Wojsko litewskie I połowy XVII wieku / H. Wisner // 1976. – T. 20. – Cz. 2. S. 5–26.

352. Wisner H. Wojsko litewskie I połowy XVII wieku / H. Wisner // 1978. – T. 21. – Cz. 3. – S. 45–148.

353. Zielińska T. Ordynacje w dawnej Polsce / T. Zielińska // Przegląd Historyczny. – 1977. – T. 68. – Z. 1. – S. 17–30.

354. Żojdź K. Zajęcie Nieświeża przez oddziały Bogusława Radziwiłła jako element zabiegów o utworzenie własnego księstwa pod szwedzką protekcją – wybrane problemy / K. Żojdź // Studia nad staropolską sztuką wojskową. – 2013. – T. 2. – S. 161–168.

355. Żychliński T. Złota księga szlachty polskiej / T. Żychliński. – 1889. – R. 11. – 357 s.

Навуковае выданне

Волкаў Мікалай Аляксандравіч

ЗАМКІ І ФАРТЭЦЫІ РАДЗІВІЛАЎ
НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У XVI – ПАЧАТКУ XVIII ст.

2-е выданне

Ідэя вокладкі належыць К. І. Карлюку

Рэдактар *Т. В. Лапцёнак*

Мастацкі рэдактар *У. У. Дамненкоў*

Тэхнічны рэдактар *В. А. Ткачова*

Камп'ютарная вёрстка *І. У. Счаснюк*

Падпісана да друку 01.03.2021. Фармат 70×100 1/16. Папера афсетная.
Друк лічбавы. Ум. друк. арк. 17,55. Ул.-выд. арк. 15,3. Тыраж 300 экз. Заказ 34.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Выдавецкі дом «Беларуская навука». Пасведчанні аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/18 ад 02.08.2013, № 2/196 ад 05.04.2017.
Вул. Ф. Скарыны, 40, 220141, г. Мінск.



Наваградскае ваяводства за Нёманам
цалкам спустошана. Толькі мае Слуцк
і Нясвіжскі замак з ласкі Божай
трымаюцца, але непрыяцель ніводзін
з маіх бацькоўскіх маёнткаў не пакінуў
некранутым. Прыціснуты, аднак,
прыватнымі і публічнымі рэчамі
я сабраў войска пад тры тысячы
коштам і намаганнямі сваімі
і затрымаў напады непрыяцельскія,
якія гэтых краёў і за Нёман сягалі.

Багуслаў Радзівіл, 1655 г.



ISBN 978-985-08-2700-5
9 789850 827005

Мікола Волкаў

ЗАМКІ І ФАРТЭЦЫІ на беларускіх землях РАДЗІВІЛАЎ у XVI – пачатку XVIII ст.